

Да 80-годдзя БДУ

ПРАЦЫ КАФЕДРЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

ВЫПУСК 1

Да 80-годдзя БДУ

ПРАЦЫ КАФЕДРЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

ВЫПУСК 1

Мінск
БДУ
2001

ЗМЕСТ

Прадмова ... 3

Міхневіч А.Я. Лінгвістыка і культуралогія: пошук шляхоў узаемадачынення ... 4

Агаркава В.А. Праблема варыятыўнасці ў беларускім мовазнаўстве ... 11

Баозевіч З.І. Прэфіксальныя прыметнікі з агульным значэннем 'інтэнсіўнасці, высокай ступені якасці' ў сучаснай беларускай мове ... 13

Белакурская Ж.Я. Праблемы станаўлення правапіснай сістэмы новай беларускай літаратурнай мовы і арфаграфічныя погляды Якуба Коласа ... 21

Важнік С.А. Кантрастыўная граматыка беларускай і польскай моў: актуальны стан, праблемы, перспектывы ... 27

Галубенка І.В. Эквівалентнасць стылістычна маркіраванай лексікі пры мастацкім перакладзе з рускай мовы на беларускую ... 55

Дзергачова Т.Л. Падручнік у сістэме навучання беларускай мове як замежнай: пытанні фонастылістыкі ... 60

Куліковіч У.І. Нармалізацыя арфаграфічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы ў разуменні У. Дубоўкі ... 69

Любецкая К.П. Беларускія эквіваленты да складаных тэрмінаў з нямецкай мовы ў "сямімоўным слоўніку" (Лейпцыг, 1918) ... 77

Ляшук В.М. Моўныя асаблівасці аўтэнтычнага фальклорнага тэксту ... 82

Міхальчанка А.Г. Абазначэнне асобы па сацыяльным статусе і прафесійнай дзейнасці ў беларускім і рускім дзіцячым фальклоры ... 93

Назаранка Ю.В. Моўныя асаблівасці апафегмаў як віду трапных выслоўяў (на матэрыяле выслоўяў Якуба Коласа) ... 98

Паўлоўская Н.Ю. Функцыянальна-семантычнае поле аптатыўнай мадальнасці ў сучаснай беларускай мове ... 102

Пацехіна А.А. Марфаналогія: прадмет і аб'ект даследавання ў рамках новай навуковай парадыгмы ... 114

Радзевіч А.А. Некаторыя заўвагі да праблемы "незалежнасці" акалічнасных кампанентаў у гісторыі сінтаксісу ўсходнеславянскіх моў ... 131

Рамза Т.Р. Семантычная структура лексемы *лёд* ... 141

Рапацэвіч С.Я. Зваротак у паэтычнай мове (функцыянальная многазначнасць) ... 152

Савіцкая І.І. Месца лексікаграфічнай спадчыны М. Гарэцкага ў беларускай лексікаграфіі ... 157

Садоўская А.Л. Чалавек у люстэрку фразеалогіі з кампанентам-арнітонімам ... 163

Сафронава І.М. Аб перспектывах вывучэння маўленчых паводзін у гендэрным аспекце ... 169

Трацякова Г.М. Метафара ў эфектыўнай камунікацыі ... 173

Хазеева І.А. Канцэпт *жыццё і смерць* у беларускай моўнай карціне свету: метафара *дарога* ... 178

Чахоўскі Г.К. Кагнітыўны аналіз палітычнага дыскурса ў Беларусі 1920—1930-х гг. 185

Шкраба І.Р. Роля міжмоўных сувязей у лінгвадыдактыцы ... 202

Якуба С.М. Новыя падыходы да ацэнкі навучальных пісьмовых работ па беларускай мове ... 207

Яўменава І.І. Аб прычынах узнікнення энантыясемій ў сучаснай беларускай мове ... 215

ПРАДМОВА

Першы выпуск "Прац кафедры сучаснай беларускай мовы" філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта адлюстроўвае стан і кірункі навуковых пошукаў у тым выглядзе, як яны склаліся на сумежжы двух стагоддзяў пераважна пад уплывам асабістай навуковай зацікаўленасці кожнага з аўтараў артыкулаў, што ўвайшлі ў зборнік. Таму не варта шукаць сугучнасці ў тэматыцы, накіраванасці ці метадалогіі аб'яднаных у гэтым выданні публікацый. Іх адзінства — у актуальнасці тэм, што распрацоўваюцца выкладчыкамі кафедры і яе аспірантамі.

Кафедра і надалей будзе імкнуцца да таго, каб актуальнасць заставалася найбольш адметнай рысай публікацый у "Працах кафедры сучаснай беларускай мовы", а таксама да таго, каб у іх з'ядналіся дзве розныя, але ўзаемаспалучаныя тэндэнцыі навуковых даследаванняў — калектыўна-кафедральнага адзінства і індывідуальна-адметнай разнастайнасці даследчыкаў. Як уяўляецца, гэта можа быць дасягнута шляхам распрацоўкі агульнакафедральных беларусісцкіх тэм (тэарэтычная граматыка беларускай мовы, культура сучаснага беларускага маўлення і пад.) з адначасовым працягам даследаванняў у межах асабістых навуковых інтарэсаў.

Хочацца спадзявацца, што "Працы кафедры сучаснай беларускай мовы" не застануцца па-за ўвагай не толькі тых, хто працуе ў рэчышчы лінгвістычнай тэорыі, але і выкладчыкаў беларускай і іншых моў. Менавіта два гэтыя адрасаты і меліся на ўвазе пры аб'яднанні вынікаў нашых навуковых намаганняў пад адной вокладкай.

А.Я. Міхневіч

А.Я. Міхневіч

ЛІНГВІСТЫКА І КУЛЬТУРАЛОГІЯ: ПОШУК ШЛЯХОЎ УЗАЕМАДАЧЫНЕННЯ

Праехаць вельмі лёгка ці прайсці
Шашой асфальтавай за плынню руху.
Але як цяжка часам нам брысці
Па вогненнай сцяжыне духу.

С. Дзяргай

Пошук новай гуманітарнай парадыгмы — адметная рыса сумежжа тысячагоддзяў. Няўмольна набліжаецца момант, калі ў разуменні феномена чалавека адбудзецца тэарэтычны прарыў, падобны да скачка ад класічнай арыстоцелевай двухзначнай логікі да "няпэўнай логікі" Л. Задэ, "няпэўнага мыслення" В. Коскі, што прывяло да рэвалюцыйных перамен у сучасных інфармацыйных тэхналогіях [Федоренко, 1999, *137*].

Свой важкі ўклад у стварэнне новай гуманітарнай парадыгмы робяць і дзве галіны ведаў, сувязь паміж якімі адзначалася здаўна, але прынцыповае вытлумачэнне атрымоўвае зараз. Гаворка ідзе аб лінгвістыцы і культуралогіі. На сувязь паміж іх аб'ектамі вывучэння ў свой час вельмі настойліва ўказваў В. Гумбальт. Ён пісаў: "Вывучэнне моў свету — гэта таксама сусветная гісторыя думак і пачуццяў чалавецтва. Яна павінна апісваць людзей усіх краін і ўсіх ступеняў культурнага развіцця; у яе павінна ўваходзіць усё, што тычыцца чалавека" [Гумбольдт, 1985, *349*].

У сярэдзіне XX стагоддзя Луі Ельмслеў паставіў пытанне, якое і сёння надзвычай актуальнае: "Мова так глыбока пусціла карані ў асобу, сям'ю, нацыю, чалавецтва і само жыццё, што мы часам не можам устрымацца ад пытання, ці не ёсць яна не проста адлюстраванне з'яў, але іх увасабленне — тое семя, з якога яны выраслі!" [Ельмслев, 1960, *264—265*].

Лінгвістычна-культуралагічны сэнс гэтага пытання зараз уяўляецца відавочным, але відавочным усяго настолькі, наколькі гэта дазваляе наша сённяшняе разуменне двух феноменаў — мовы і культуры, а таксама разуменне найглыбейшай значнасці прамежкавага паміж імі феномена — камунікавання, зносін, маўленчых кантактаў, што паслужылі зернеткам, з якога вырасла ўся культура ў яе духоўным і матэрыяльным выяўленні. "Культура — гэта форма жыцця, духу (яе можна назваць сацыяльнай), што складваецца на субстраце жыцця істот пераходнай формы, у якой галоўным з'яўляецца семіятычны працэс (камунікацыя, азнакаўленне, формы знакавых паводзін)" [Розин, 1999, *93*].

Такі погляд атрымаў назву культурна-семіятычнай канцэпцыі паходжання чалавека. Галоўная катэгорыя гэтай канцэпцыі — азнакаўленне, сімвалізацыя. Мова сімвалаў — перш за ўсё бясконца шматлікіх слоў натуральнай мовы тых слоў, што, як вядома, "былі напачатку". — гэта мова, якая дае магчымасць чалавеку надаваць сваім унутраным перажыванням, пачуццям, думкам форму выразна адчувальных падзей, з'яў, фактаў знешняга свету. "Гэта адзіная універсальная мова, вынайдзеная чалавекам, адзіная для ўсіх культур ва ўсёй гісторыі" [Фромм, 1992, *183*].

Але, як вядома, сімвалізацыя ўласціва і жывёлам. Сцвярджэнне, "што толькі чалавечыя супольнасці стварылі мовы і што толькі людзі адрозніваюцца сваёй здольнасцю мысліць катэгорыямі і дзейнічаць па аналогіі..., г. зн. адчуваць гісторыю" [Тишков, 1998, *5*], можа быць прынята толькі пры той умове, калі ўлічваецца спецыфіка чалавечай мовы як знакавай сістэмы з "падвойным чляненнем" [Вубрих, 1930, *5*], што не назіраецца ні ў адным іншым відзе біялагічнай камунікацыі. Падвойнае чляненне — гэта структурная іерархія складаючых мовы, г. зн. дыхатамія адрознівальных (фанемных) і значымых (граматычных) адзінак з далейшым падраздзяленнем граматычнай структуры на ўзроўні слова і сказа [Якобсон, 1985, *387*]. Менавіта ўзнікненне падвойнага члянення вылучыла чалавека з жывёльнага свету, дало яму магчымасць бясконца расшырыць практыку камунікавання шляхам выхаду за межы жывёльнага кода, які ў жывёл супадае з усім корпусам магчымых паведамленняў. Пераход ад "зоасеміётыкі" да "семіётыкі падвойнага члянення" з'явіўся якасным скачком у станаўленні homo sapiens. Пры гэтым глотагенез і *знакавыя зносіны* чалавека былі часткай культурагенезу побач з такімі фактарамі антрапагенезу, як *зносіны прадметна-матэрыяльныя* і *зносіны палавыя*, якія ў сваім вызначальным для чалавека фарміраванні таксама спазналі працэс дыхатамічнага члянення. Іншымі словамі, гаворка ідзе пра "тры універсальныя дасягненні, што належаць выключна чалавеку: 1) вытворчасць прылад для стварэння прылад; 2) з'яўленне фаналагічных элементаў для выканання толькі адрознівальнай функцыі, якія не маюць уласнага сэнсу, але выкарыстоўваюцца для пабудовы адзінак, што маюць сэнс, а іменна — марфем і слоў; 3) табуіраванне кровазмешвання, якое пераканальна інтэрпрэтуецца антраполагамі як неабходная папярэдняя ўмова больш шырокага абмену шлюбнымі партнёрамі, у сувязі з чым расшыраюцца разнастайныя сувязі і, далей, узнікаюць эканамічныя, кааператыўныя і абарончыя садружнасці... Менавіта тры гэтыя новаўвядзенні садзейнічалі фарміраванню дапаможных другасных сродкаў, неабходных для ўтварэння чалавечага грамадства з яго матэрыяльнай, моўнай і духоўнай культурай" [Якобсон, 1985, *401*].

Спрошчана кажучы, "вынаходства" фаналагічнай сістэмы стала вытокам чалавечай культуры. У сваю чаргу ўзнікае пытанне пра фактары, што прывялі да фарміравання ўласна чалавечай артыкуляцыі. Менавіта на гэтым шляху даследавання чалавека ў яго першаснай гісторыі ўзнікае магчымасць стварэння рэалістычнай канцэпцыі глотагенезу, якая ляжыць па-за межамі лінгвістыкі [Севастьянов, 1991, *26—32*].

І само з'яўленне чалавека, і далейшае яго развіццё ішло ў рэчышчы адаптавання да новых і новых умоў шляхам удасканалення арыентацыі і рэагавання не на факты, падзеі і адпаведныя сігналы (першая і другая сігнальныя сістэмы), а на знакі, на камунікаванне на падставе "семіётыкі падвойнага члянення", на знакавыя сістэмы — натуральныя мовы і разнастайныя "другасныя мадэлюючыя сістэмы", "мовы" культуры. "Кожная культура — старажытная, антычная, сярэднявечная, новых часоў — адкрывалася своеасаблівым "праектам новага чалавека" [Розин, 1999, *94*].

Еўрапейская філасофія добра ўсведамляла ролю і значнасць зносін у працэсе духоўнага і матэрыяльнага развіцця грамадства. Спашлемся хаця б на наступнае выказванне: "Узаемаадносіны паміж рознымі нацыямі залежаць ад таго, наколькі кожная з іх развіла свае вытворчыя сілы, падзел працы і ўнутраныя зносіны. Гэта палажэнне агульнапрызнанае. Аднак не толькі адносіны адной нацыі да іншых, але ўся ўнутраная структура самой нацыі залежыць ад ступені развіцця яе вытворчасці і яе ўнутранага і знешняга камунікавання, або зносін" [Маркс, Энгельс, 1988, *15*].

Няма сумнення ў тым, што і структура асобы залежыць ад багацця яе знакавых, прадметна-матэрыяльных і біялагічных зносін. І гэтыя зносіны — цэнтральная прадметная вобласць і лінгвістыкі, і культуралогіі. Менавіта тут вытокі іх разнастайных узаемадачыненняў, спарадзіўшых мноства кірункаў вывучэння чалавека ў межах праблемы "мова і культура": лінгвакультуралогію, лінгвакраіназнаўства, семіялінгвістыку, псіхалінгвістыку, прагмалінгвістыку, тэорыю моўнай асобы, кагніталогію, нарэшце этналінгвістыку, якая займаецца вывучэннем працэсаў узаемадзеяння паўсядзённага жыцця і рытуала, даследаваннем практычнай і сімвалічнай функцыі прадметаў, пошукамі культурнай семантыкі слова ў кантэксце розных культур, эпох, тыпаў духоўнай дзейнасці.

Для сучасных даследаванняў праблем узаемасувязі лінгвістыкі і культуралогіі важнае значэнне мае пошук новых методык, фармуляванне нетрывіальных гіпотэз. Але захоўваюць метадалагічнае значэнне і паглыбленае вывучэнне, сучаснае прачытанне, абагульненне і сістэматызацыя поглядаў выдатных замежных і айчынных філосафаў, філола-

гаў, этнолагаў, семіёлагаў, культуролагаў (В. Гумбальт, Э. Сепір, Л. Вітгенштэйн, Б. Уорф, Х. Хойер, Дж. Трэджар, К. Барт, Д. Хаймс, Ж. Дэлёз, а таксама А.А. Буслаеў, А.А. Патабня, А.М. Будагаў, М.І. Талстой і інш.).

Сёння мова разглядаецца "як прадукт чалавечай культуры ў цеснай сувязі з гэтай культурай і на шырокім фоне гісторыі носьбітаў мовы" [Гамкрелидзе, Иванов, 1984, *458*]. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што і ў будучым мова захавае сваё значэнне як найгалоўнейшы фактар культурнага развіцця асобы і грамадства і што багацце знешніх і ўнутраных зносін будзе вызначаць, якім будзе "праект новага чалавека". Гэта дае падставы для пастаноўкі зусім не трывіяльнага пытання аб сутнасці і шляхах фарміравання нацыянальнай моўна-семіялагічнай праграмы. Падобная праграма можа з'явіцца і быць рэалізаванай толькі пры ўмове сучаснага разумення ўзаемадачыненняў лінгвістыкі і культуразнаўства (або мовазнаўства і культуралогіі), а таксама ўсведамлення таго, што само паняцце мовы можа напаўняцца новым зместам, больш шырокім, больш глыбокім, больш асэнсаваным і тэарэтычна распрацаваным у кантэксце сучаснай навукі [Степанов, 1995, *7—34*]. Мэта стварэння памянёнай праграмнай канцэпцыі павінна разглядацца не як нейкі "канчатковы стан", а толькі як вектар змяненняў, што выклікаюцца часам і характарызуюць яго.

Нацыянальная моўна-семіялагічная праграма — гэта пошук адказу на пытанне, колькі і якіх семіясістэм неабходна грамадству для яго максімальна поўнага ўключэння ў кантэкст сусветнай культуры, у працэс міжнацыянальнага культурнага ўзаемадзеяння, а таксама — асобе для дасягнення вышэйшых ступеняў яе сацыялізацыі.

Праграмаванне моўнага развіцця асобы грунтуецца на ўліку трох тыпаў семіялагічных патрэб, якія існуюць настолькі ж рэальна, як і патрэбы матэрыяльныя або духоўныя. Першы тып — калі семіясістэма выступае як сродак гамінізацыі, ачалавечвання немаўляці і ўсвядомліваецца як зыходная і абавязковая ўмова фарміравання homo sapiens. Адсутнасць гэтай умовы вядзе да фарміравання homo feralis (чалавека змярцвелага), што шматразова пацвярджалася выпадкамі выхавання дзяцей жывёламі [Михневич, 2000, *83—88*].

Другі тып запатрабаванасці знакавых сістэм фарміруецца тады, калі чалавек ставіцца да семіясістэм як да матэрыялу камунікатыўнай дзейнасці і выкарыстоўвае іх як інструмент духоўнага ўздзеяння на іншых людзей, як сродак эфектыўных зносін, як ключ да навуковых ведаў, мастацтва і іншых феноменаў культуры, як, нарэшце, шлях і сродак сацыялізацыі асобы. Менавіта такі тып моўных патрэб рэалізуецца ў

працэсе навучання ў агульнаадукацыйнай школе, аб'ектыўнай мэтай якога з'яўляецца не прафесіянальная адукацыя, а расшырэнне камунікатыўнага дыяпазону асобы: школа дае магчымасць першапачатковага авалодвання мноствам моў (роднай і замежнымі; мовамі навук — матэматыкі, хіміі, біялогіі, мовамі мастацтваў; дапаможнымі знакавымі сістэмамі і г. д.), каб далей вызначыцца адносна кірунку прафесійнай спецыялізацыі.

Нарэшце, у трэцім выпадку семіясістэма пераўтвараецца ў аб'ект спецыяльнага канструявання ("вынаходніцтва моў"), у мэту стваральнай дзейнасці індывідуума і калектыву. Так узнікла мноства моў (эсперанта і інш.), а таксама сотні дапаможных знакавых сістэм.

У межах трох тыпаў моўных патрэбнасцей індывіда і соцыуму вылучаецца шэраг кірункаў фарміравання сучаснай моўнай асобы. Перш за ўсё — гэта Родавая Мова homo sapiens, г. зн. другасная сігнальная сістэма з "падвойным чляненнем", незалежна ад таго, якой этнамовай яна прадстаўлена. Родавая Мова чалавека служыць найгалоўнейшым фактарам пераўтварэння біялагічнай істоты ў істоту сацыяльную, члена менавіта чалавечага соцыуму. Важную ролю пры гэтым адыгрываюць інтэнсіўнасць і разнастайнасць моўнага, знакавага, эмацыянальнага камунікавання ў сям'і на самых ранніх этапах жыцця дзіцяці.

Тут адразу на першы план выступае этнамова, або родная нацыянальная мова, як зыходная для дзіцяці форма існавання Родавай Мовы ва ўсіх аспектах яе бытавання: "матчына мова", мова сям'і, мова першасных вербальных зносін, семіётыка духоўнага жыцця этнасу, — што фарміруюць нацыянальны характар, абумоўліваюць этнічную самасвядомасць. Гэты кірунак уключае таксама авалодванне і валоданне нацыянальнай літаратурнай мовай з яе функцыянальна-стылістычнай, жанравай, гістарычнай, сацыяльнай, асобаснай, дыялектнай дыферэнцыяцыяй.

Моўна-семіялагічная праграмаванне развіцця асобы ўключае таксама мовы міжнацыянальных, міжэтнічных, міжрэгіянальных зносін, якія патрабуюць валодання іншанацыянальнымі мовамі, класічнымі мовамі, усходнімі мовамі, "сусветнымі мовамі", мовамі міжнародных арганізацый, мовамі суседніх дзяржаў (для Беларусі — літоўскай, латышскай, рускай, украінскай, польскай) і г. д.

Далей трэба назваць сацыяльныя дыялекты, а таксама "падмовы" ў межах розных этнамоў, у першую чаргу — роднай: семіясістэмы фальклору, рэлігіі, міфалогіі, традыцый, рытуалаў, абрадаў і пад. На гэтым кірунку адкрываюцца магчымасці бясконцага ўдасканалення ў валоданні нават роднай мовай. Праблему добра акрэсліў Э. Фром, заўважыўшы, што чалавек здольны апісаць словамі найскладанейшую машыну,

але не можа апавесці аб сваіх перажываннях, аб адрозненнях на смак чырвонага віна ад белага. "...Сучасны чалавек — гэта рэаліст, што прыдумаў асобнае слова для кожнага тыпу аўтамабіля, але адно слова "любоў" для таго, каб выразіць разнастайныя духоўныя ўзрушэнні" [Фромм, 1992, *183*].

У структуру "моўнай асобы" ўваходзіць і веданне моў навукі: тэрміналагічных сістэм, формульных моў, навуковых стыляў і падстыляў, міжнародных моў навукі і г. д. Да іх прымыкаюць фармалізаваныя мовы для апрацоўкі інфармацыі ў розных сферах чалавечай дзейнасці, камп'ютэрныя мовы розных тыпаў.

Асаблівую значнасць маюць другасныя мадэлюючыя семіясістэмы мастацтва і культуры: мовы слоўнай творчасці, жывапісу, музыкі, кіно, тэатра, тэлебачання і г. д.; семіётыка горада, музея, інтэр'ера, рэкламы, дызайна, моды і інш. Варта падкрэсліць, што падобныя знакавыя сістэмы, як правіла, не перакрываюцца сродкамі натуральнай мовы. Калі б усё, што адбываецца ў душы чалавека, заўважыў кампазітар Сяроў, можна было б перадаць словамі, музыкі не было б на свеце.

Трэба згадаць яшчэ пра неабходнасць вывучаць і ведаць натуральныя і штучныя коды і дапаможныя знакавыя сістэмы: генетычны код як мову біялагічнай спадчыннасці, незлічоныя "мовы" прыроды, коды жывёл, разнастайныя сігнальныя сістэмы, эсперанта і іншыя штучныя мовы. Увогуле цікавасць мае ўся метафорыка тэрміна "мова" як адлюстраванне семіялагічных патрэб чалавека, абумоўленых разнастайнасцю чалавечых зносін, асаблівасцей камунікавання ў розных умовах. Параўн.: мова пахаў, мова жэстаў, мова дружбы, мова прыгнечання, мова кветак, мова спорту і г. д.

Праблема таксанамізацыі знакавых сістэм, якімі карыстаецца чалавек, і якія у сваю чаргу паглыбляюць яго чалавечую сутнасць, значна глыбейшая, чым гэта можа падацца з вышэй зробленага пераліку. Псіхолагі маюць рацыю, калі разглядаюць прыгажосць і гумар як мовы звышсвядомасці [Симонов, 1989, *100—107*]. Не меншай увагі заслугоўвае і аналіз сімвалічнай мовы падсвядомасці. "...Мова сімвалаў, на якой прамаўляе падсвядомасць, — гэта адзіная, універсальная мова, зразумелая сапраўды ўсім. А зразумелая ўсім таму, што ніяк не звязана ні з ладам жыцця, ні з культурным узроўнем, ні са ступенню разумовага развіцця чалавека. Гэта мова — прамое вытворнае ад спрадвечных жыццёвых велічынь: сексуальнага інстынкту, адчування смерці, таямніцы — у чыста фізічным сэнсе — прасторы і падобных... Гэтыя спрадвечныя жыццёвыя велічыні універсальныя, гэта панятці, агульныя для ўсіх людзей" [Дали, 1994, *228*].

Яшчэ адно пацвярджэнне выключнай ролі сімвалізацыі, што забяспечыла расшырэнне камунікавання прадчалавека і ўзнікненне homo sapiens, звязана з новым падыходам да катэгарызацыі пачуццёвага пазнання навакольнага свету. Папулярная ў сучаснай метадалогіі навукі ідэя прысутнасці тэорыі ў эмпірычным вопыце была выказана, у прыватнасці, О. Шпенглерам на пачатку мінулага стагоддзя. Ён пісаў: "...Усякі навуковы вопыт, якім бы ён ні быў, з'яўляецца да ўсяго іншага яшчэ і сведчаннем спосабаў сімвалічнага выяўлення. Усе зафіксаваныя ў слове законы — гэта жывыя, адухоўленыя распарадкі, поўныя самага патаемнага зместу нейкай адной, і пры тым толькі гэтай, культуры" [Шпенглер, 1993, *569*].

Гэта пацвярджаюць і сучасныя філосафы. "...Навука ўвогуле не ведае «голых фактаў», а тыя «факты», што ўключаны ў наша пазнанне, ужо разгледжаны пэўным чынам і, такім чынам, у значнай ступені канцэптуалізаваны" [Фейерабенд, 1986, *149*].

"Самае высокае было б зразумець, што ўсё фактычнае ёсць ужо тэорыя", — заўважыў яшчэ Й. Гётэ [Goethe, 1923, *376*]. І калі гэта так, то мы маем права сказаць, што "ўсё фактычнае" для чалавека заўсёды "аслоўлена" і "акультурана", і ў гэтым — першакрыніца ўзаемадачынення лінгвістыкі і культуралогіі.

"Чалавек гаворыць на многіх мовах — на мовах маўлення, мастацтва, дзеяння, але дух — адзіны..." [Buber, 1963, *64*]. Важна зразумець гэта і на шляхах лінгвістыкі і культуралогіі працягваць пошук "мовы, якой няма" [Михневич, 1998].

ЛІТАРАТУРА

Buber M. I and Thou. New York, 1963.

Goethe. Naturwissenschaftliche Schriften, Bd. 5. Leipzig, 1923.

Бубрих Д. Несколько слов о потоке речи // Бюл. ЛОИКФУН. 1930.

Гамкрелидзе Т.В., Иванов Вяч. Вс. Индоевропейский язык и индоевропейцы. Тбилиси, 1984.

Гумбольдт В. Об изучении языков, или план систематической энциклопедии всех языков // Гумбольдт В. Язык и философия культуры. М., 1985.

Дали С. Сюрреализм и живопись: Набросок лекции // Дружба народов. 1994. № 1.

Ельмслев Л. Пролегомены к теории языка // Новое в лингвистике. Вып. 1. М., 1960.

Маркс К., Энгельс Ф. Немецкая идеология. М., 1988.

Михневич А.Е. Язык, которого нет... Мн., 1998.

Михневич А.Е. Homo sapiens — язык — homo feralis // Современные методы преподавания иностранных языков в неспециальных вузах. Ч. 2. Мн., 2000.

Розин В.М. Культурология. М., 1999.

Севастьянов О. С тыла заползай! // Химия и жизнь. 1991. № 10.

Симонов П.В. Красота — язык сверхсознания // Наука и жизнь. 1989. № 4.

Степанов Ю.С. Изменчивый "образ языка" в науке XX века // Язык и наука конца XX века. М., 1995.

Тишков В.А. Единство и многообразие культур // Народы и религии мира. М.. 1998.
Федоренко Н.Т. Многоцветие моделей нового общества // Беларуская думка. 1999.
Фейерабенд П. Избранные труды по методологии науки. М., 1986.
Фромм Э. Душа человека. М., 1992.
Шпенглер О. Закат Европы: Очерки мифологии мировой истории. М., 1993.
Якобсон Р.О. Избранные работы. М., 1985.

В.А. Агаркава

ПРАБЛЕМА ВАРЫЯТЫЎНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІМ МОВАЗНАЎСТВЕ

Праблема варыятыўнасці моўных адзінак — адна з пастаянных, што тлумачыцца знешнімі (моўная сітуацыя, суіснаванне кадыфікаваных і старых, архаічных нормаў літаратурнай мовы і інш.) і ўнутранымі (бясконцы працэс варыятыўнасці ў мове) фактарамі развіцця мовы.

Варыянты выяўляюцца на розных моўных узроўнях. К.С. Гарбачэвіч вылучыў наступныя іх тыпы: акцэнтныя, фанетычныя, фанематычныя і марфалагічныя. Аб'ектам нашага даследавання з'яўляецца фанетыка-марфалагічная варыятыўнасць фіналей назоўніка ў беларускай мове (*камп'ютэр — камп'ютар — тэатр; санаторый — санаторы — санаторыя*; *Віталь — Віталій і пад.*). Нягледзячы на тое, што ў беларускім мовазнаўстве праблема варыятыўнасці распрацоўвалася многімі даследчыкамі (У.У. Ляпёшкіным, І.Р. Шкрабай, Л.П. Марозавай, А.Г. Лукашанцам, В.І. Сянкевічам, Сцяцко П.У. і інш.), нельга прызнаць яе вырашанай і ўсебакова даследаванай. Увага, з якой навукоўцы ставяцца да вывучэння варыятыўнасці ў мове і "цесна звязаных з ёй з'яў і працэсаў моўнай рэчаіснасці", сведчыць пра тое, што дадзеная праблема мае не толькі чыста лінгвістычны характар, але і сацыяльны. Спынімся на разглядзе сацыяльнага боку даследуемай намі з'явы.

На сённяшні дзень суіснуюць дзве правапісныя традыцыі. Пачынальнік адной з іх — Браніслаў Тарашкевіч, якому беларускае мовазнаўства абавязана стварэннем першай нарматыўнай граматыкі роднай мовы (выйшла ў свет у 1918 годзе). "Беларуская граматыка для школ" лягла ў аснову правапісу, які быў прапанаваны Вінцуком Вячоркам у 1995 годзе. Аўтар "Спробы сучаснае нармалізацыі" лічыць "тарашкевіцу" "клясычным" варыянтам беларускай літаратурнай мовы. Савецкі ж яе варыянт называе "ідэалягізаваным, русыфікаваным".

Працу па ўдакладненню савецкага варыянту беларускай літаратурнай мовы на працягу 1997—1998 гг. ажыццяўляў часовы навуковы калектыў пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук А.І. Падлужнага. Імі быў прапанаваны шэраг змен у арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы: скасаванне некаторых выключэнняў з правілаў (*сямнац-*

цаць, васямнаццаць, дзявяты, дзясяты); напісанне літары э ў запазычаных словах прапанавана ажыццяўляць згодна з вымаўленнем (*экзэмпляр, тунэль, сэрвіс*); у правіле правапісу *і, ы, й* пасля прыставак не ўзгадваецца выпадак, у якім *і* ўтварае склад і інш. Патрэба ва ўдакладненні беларускага правапісу была выклікана мноствам фактараў. Існаванне двух правапісных варыянтаў беларускай літаратурнай мовы ў сукупнасці з сённяшнімі ўмовамі яе існавання і развіцця спараджае цэлы шэраг моўных праблем, у стварэнні якіх правапіс менавіта фіналей назоўнікаў мае даволі істотнае значэнне. Розныя правапісныя традыцыі спрыяюць таму, што ўзнікае велізарная колькасць варыянтаў рэалізацыі адной і той жа моўнай адзінкі. Найбольшую цяжкасць выклікае перадача фіналей у запазычаных словах, правапіс якіх у беларускай мове вызначаецца як характарам даных фіналей, іх гукавым складам, агульнымі заканамернасцямі транслітарацыі, так і сацыялінгвістычнымі падыходамі, якія мелі пашырэнне ў беларускім мовазнаўстве на розных этапах яго развіцця. Будуць разглядацца наступныя тыпы фіналей назоўніка ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку (улічваючы характар моўнага матэрыялу, будзем перадаваць іх лацінскім шрыфтам):

-ter / -tar / -tr: *тэсцер — тэстэр — магістр* і пад.;

-der / -dar / -dr: *аўтсайдэр — аўтсайдар — скафандр* і пад.;

-er / -ar, -el / -al, -ent / -ant: *пэйджэр — пэйджар, менеджэр — менэджар, парламент (парлямэнт) — парлямант* і пад.

-um / -jum , -us / -jus: *калёквіум — калёквіюм; натарыус — натарыюс і пад.*

-io / -ijo: *трыо — трыё, маакія — маакіё* і пад.

Пералік фіналей не з'яўляецца вычарпальным. Выкарыстанне варыянтаў правапісу розных правапісных традыцый дае магчымасць больш поўна разгледзіць з'яву варыятыўнасці.

Сучасная навука дакладна не вызначыла свайго стаўлення да праблемы варыятыўнасці. З "ліберальнага" пункту погляду варыятыўнасць — гэта "аб'ектыўны прадукт моўнай эвалюцыі", абавязковы яе кампанент. Прыхільнікі ж "пурыстычнага" пункту гледжання патрабуюць яе знішчэння: у слоўніках павінен быць толькі адзін спосаб выражэння пэўнага зместу. Слоўнікі, якія былі выдадзены ў апошнія гады, пайшлі па шляху скарачэння варыянтаў практычна да мінімуму. Але ў той жа час яны самі даюць розныя варыянты моўнай адзінкі. Напрыклад, "Арфаграфічны слоўнік" Булыкі А.М. і "Слоўнік беларускай мовы" Ламекі Л.А. і Ламекі Ул.Б. даюць розныя варыянты рэалізацыі на пісьме ненаціскных фіналей *-эль, -эр*: *шніцаль — шніцэль; лідар — лідэр; карцар — карцэр і пад.* Зразумела, што імкненне знайсці абсалютны ін-

варыянт "пазбаўляе дыялектычнага падыходу да мовы як аб'екта, які знаходзіцца ў стане пастаяннай эвалюцыі" [Горбачевич, 1978, *3*], але тэарэтычнае абгрунтаванне перавагі аднаго варыянта над другім з'яўляецца неабходным. Поўны адказ ад пошуку інварыянтнай формы можа прывесці да непажаданых вынікаў. Дэталёвая распрацоўка данай праблемы дазволіць акрэсліць асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай літаратурнай мовы і ўнесці пэўны ўклад у стварэнне тэорыі моўнай нормы.

У якасці матэрыялу для вывучэння і кваліфікацыі варыянтаў будуць выкарыстаны тлумачальныя, арфаграфічныя слоўнікі беларускай мовы, а таксама граматыкі, манаграфіі, навуковыя артыкулы і г. д.

ЛІТАРАТУРА

Арфаграфічны слоўнік для школьнікаў: Дапамож. для агульнаадукац. шк., ліцэяў, гімназій / Аўт.-склад. А.М. Булыка. Мн.: ТАА «Аверсэв», 2000. 239 с.

Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: У 2 т. Мн.: БелЭн, 1999.

Вячорка В. Правапіс: спроба сучаснае нармалізацыі // Спадчына, 1995. № 5. С. 247—288.

Горбачевич К.С. Вариантность слова и языковая норма. Л., 1978. 240 с.

Ламека Л.А., Ламека Ул.Б. Слоўнік беларускай мовы (цяжкасці правапісу, вымаўлення, акцэнтуацыі, словазмянення). Мн.: Сучаснае слова, 2000. 320 с.

Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (праект новай рэдакцыі). Мн., 1999. 160 с.

З.І. Бадзевіч

ПРЭФІКСАЛЬНЫЯ ПРЫМЕТНІКІ З АГУЛЬНЫМ ЗНАЧЭННЕМ 'ІНТЭНСІЎНАСЦІ, ВЫСОКАЙ СТУПЕНІ ЯКАСЦІ' Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Прэфіксальнае словаўтварэнне прыметнікаў у сучаснай беларускай мове з'яўляецца адным са звенняў у агульнай сістэме словаўтварэння — важнейшага сродку папаўнення і ўзбагачэння слоўнікавага складу. Значную групу ў лексічнай сістэме мовы складаюць прэфіксальныя прыметнікі са значэннем 'інтэнсіўнасці, вельмі высокай ступені якасці'. Сюды ўключаюцца прыметнікі з прэфіксамі *архі-, гіпер-, за-, звыш-, пра-, пры-, раз-, супер-, ультра-, экстра-*. Выражаючы агульнае значэнне інтэнсіўнасці, гэтыя прыстаўкі адрозніваюцца некаторымі семантычнымі і стылістычнымі адценнямі, што непасрэдна ўплывае на ступень іх прадуктыўнасці ў сучаснай беларускай мове.

Высокай словаўтваральнай актыўнасцю характарызуецца прэфікс *звыш-*. Непасрэднае ўздзеянне на яго актывізацыю паўплывала сацыяльная рэчаіснасць: хуткае развіццё навукі, тэхнікі, эканомікі, з'яўленне но-

вых, у некаторых выпадках большых па памеры, больш магутных, сучасных механізмаў, прылад, прэпаратаў і г. д. запатрабавала новых абазначэнняў для іх характарыстыкі, дзякуючы чаму і з'явіліся прыметнікі з гэтым прэфіксам [Голанова, 1979, *18*].

Ю.А. Бельчыкаў, даследуючы прыметнікі з прэфіксам *сверх-* у сучаснай рускай мове, адзначае, што "... гэта катэгорыя слоў у XIX стагоддзі не была прадуктыўнай. Яна актыўна развіваецца іменна ў савецкі час, галоўным чынам у сувязі з інтэнсіўным развіццём навукі, тэхнікі, вытворчасці, грамадскага жыцця" [Бельчиков, 1959, *68*]. Гэта ж можна сказаць і аб прыметніках з прыстаўкай *звыш-* у беларускай мове. Сама гэта прыстаўка і з'явілася ў ёй як сродак для калькавання адпаведных рускіх утварэнняў.

Паводле выражаемага значэння прыметнікі з прэфіксам *звыш-* складаюць два тыпы. Да першага адносяцца прыметнікі, якія абазначаюць надзвычай высокую ступень праяўлення прыметы, названай матывавальным словам: *звышвысокі, звышмагутны, звышмодны, звышмоцны, звышнізкі, звышранні* і інш. Мадыфікацыйнае значэнне 'надзвычай высокай ступені праяўлення прыметы' прыметнікі з прыстаўкай *звыш-* атрымоўваюць тады, калі прыстаўка непасрэдна далучаецца да якасных прыметнікаў (у тым ліку і да якасных прыметнікаў, якія развіліся з адносных), якія змяшчаюць у сабе элемент ацэнкі. Пры гэтым зыходнае якаснае значэнне набывае вышэйшую ступень свайго праяўлення, і семантычна такія прыметнікі суадносяцца са словамі *вельмі, самы*. Параўн.: *нізкі* 'малы па вышыні, які знаходзіцца на невялікай вышыні ад зямлі' — *звышнізкі* 'вельмі нізкі'; *сакрэтны* 'які з'яўляецца сакрэтным, невядомым усім' — *звышсакрэтны* 'у вышэйшай ступені сакрэтны'; *ранні* 'які наступае раней, чым звычайна' — *звышранні* 'які адбываецца раней звычайнага, вельмі ранні'.

Матывавальныя прыметнікі дадзенага тыпу з'яўляюцца рознымі па сваёй марфалагічнай структуры. Сярод іх вылучаюцца: 1) невытворныя матывавальныя прыметнікі *(буйны — звышбуйны, гарачы — звышгарачы, магутны — звышмагутны, новы — звышновы, чысты — звышчысты*); 2) суфіксальныя матывавальныя прыметнікі з морфамі *-н- (арыгінальны — звышарыгінальны, моцны — звышмоцны, старанны — звышстаранны); -к-, -ок-/-ёк- (меткі — звышметкі, высокі — звышвысокі, далёкі — звышдалёкі); -лів- (беражлівы — звышберажлівы); -ічн-/-ычн- (гераічны — звышгераічны, патрыятычны — звышпатрыятычны); -л- (чулы — звышчулы); -ов- (паспяховы — звышпаспяховы*); 3) складаныя матывавальныя прыметнікі (*высакаякасны — звышвысакаякасны, дальнабойны — звышдальнабойны).*

Вытворныя гэтага тыпу асабліва актыўна выкарыстоўваюцца ў навуковым стылі як сродак тэрміналагічнай намінацыі. Пры гэтым ступень праяўлення прыметы ў тэрміналагічных абазначэннях мае пэўную ступень дзеяння, якая ўстанаўліваецца мяжой у тэхніцы, вытворчасці: *звышвысокі ціск, звышдакладны хімічны аналіз, звышдалёкі гук, звышправадніковыя электрамагніты, звышранняя пшаніца, звышцяжкая зброя, звышчастотныя электравакуумныя прыборы.*

Ужываюцца прыметнікі з прыстаўкай *звыш-* пераважна ў кніжнай мове, у меншай ступені — у размоўнай. Пры гэтым ступень праяўлення прыметы ў такіх прыметніках не мае абмежавання, а ў некаторых выпадках яны набываюць экспрэсіўнае адценне: *звышаптымістычныя прагнозы, звышберажлівы ўладальнік, звышгеніяльны чалавек, звышразумная ЭВМ.*

Па свайму значэнню прыметнікі з прэфіксам *звыш-* сінанімічныя прыметнікам з запазычанымі прэфіксамі *архі-, супер-, ультра-*, надзеленых такім жа значэннем ‘празмернай, крайняй ступенню праяўлення прыметы’. Маюцца спалучэнні гэтых прыставак з аднатыпнымі (часам аднымі і тымі ж) асновамі, што вядзе да ўзнікнення паралельных утварэнняў тыпу: *звышвысокі — ультравысокі, звышмодны — архімодны — супермодны, звышразумны — архіразумны, звышсучасны — суперсучасны*. Аднак паміж такімі вытворнымі існуе семантычнае і функцыянальнае адрозненне. Прыметнікі з прыстаўкай *звыш-* надзелены больш канкрэтнай семантыкай і пераважна ўжываюцца ў словах канкрэтных па сваім значэнні. *Супер-, ультра-* надзелены больш абстрактнай семантыкай і ўжываюцца ў словах, якія выражаюць абстрактнае паняцце. Паколькі прыстаўка *звыш-* з’яўляецца ў беларускай мове спрадвечнай марфемай для перадачы мадыфікацыйнага значэння ‘надзвычай высокай ступені праяўлення прыметы’, то і сферы ўжывання прыметнікаў з гэтай прыстаўкай даволі разнастайныя. Як ужо адзначалася вышэй, такія прыметнікі шырока выкарыстоўваюцца ў тэрміналогіі (медычнай, ваеннай, фізічнай, сельскагаспадарчай), у газетна-публіцыстычных стылях, мастацкай літаратуры і нават у размоўным стылі. Прыметнікі з прыстаўкамі *архі-, супер-, ультра-* ўжываюцца толькі ў кніжных стылях і адрозніваюцца яркай эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай.

Папаўненне прыметнікаў з прэфіксам *звыш-* у сучаснай беларускай мове адбываецца пад непасрэдным уздзеяннем рускай мовы (асабліва ва ўмовах беларуска-рускага білінгвізму), паколькі большасць з іх з’яўляюцца калькамі рускіх утварэнняў з прэфіксам *сверх-*. Параўн.: *сверхплотный — звышшчыльны, сверхнормальный — звышнармальны, сверхъестественный — звышнатуральны.*

Тып прыметнікаў з прэфіксам *звыш-* з'яўляецца прадуктыўным і развівавальным, паколькі семантычныя мадыфікацыі, якія прыўносіць прыстаўка, можа атрымаць амаль кожны якасны прыметнік.

Другі тып прыметнікаў з прыстаўкай *звыш-* складаюць словы са значэннем перавышэння мяжы таго, што названа матывавальным словам: *звышлімітны, звышпланавы, звышпраграмны, звыштэрміновы, звышштатны і інш.*

Матывавальнымі асновамі для гэтага тыпу вытворных з'яўляюцца пераважна адносныя прыметнікі, якія сваім значэннем суадносяцца з назоўнікамі са значэннем меры, колькаснага абмежавання чаго-небудзь *(камплект — звышкамплектны, ліміт — звышлімітны, план — звышпланавы, тэрмін — звыштэрміновы і інш.*). Семантычна такія прыметнікі ўзводзяцца да прыназоўнікава-склонавых канструкцый "звыш + назоўнік Р. скл". Параўн.: *звышкаштарысны — звыш каштарыса, звышштатны — звыш штату, звышлімітны — звыш ліміту.*

Па характары семантычнай сувязі з матывавальнымі словамі прыметнікі дадзенага тыпу складаюць тры падтыпы.

1. Прыметнікі, якія абазначаюць прымету перавышэння меры, мяжы, названай матывавальным прыметнікам: *натуральны — звышнатуральны, урочны — звышурочны, эмпірычны — звышэмпірычны.* Семантычна такія прыметнікі не суадносяцца з прыназоўнікава-склонавымі спалучэннямі "звыш + назоўнік Р. скл.". Іх значэнне раскрываецца толькі праз матывавальны прыметнік. Так, напрыклад, прыметнік *звышурочны* — 'які праводзіцца звыш устаноўленага рабочага часу' — семантычна суадносіцца не з назоўнікам *урок*, а з прыметнікам *урочны* — 'устаноўлены паводле пэўнай умовы'.

Прыметнікі гэтага падтыпу ўжываюцца пераважна ў якасці тэрміналагічных абазначэнняў: *звышкрытычны, звышнатуральны, звышцякучы, звышдакладны (тэхн.), звышразумны, звышэмпірычны (філас.).*

2. Прыметнікі са значэннем 'перавышэння меры, мяжы або ажыццяўлення яе па-за межамі таго, што названа словам, якім, у сваю чаргу, матываваны суфіксальны матывавальны прыметнік': *звышгукавы, звышкамплектны, звышлімітны, звышпланавы, звыштэрміновы.* Гэта найбольш шматлікая група слоў. У якасці матывавальных часцей выкарыстоўваюцца прыметнікі з суфіксамі *-н-* і *-ов-/-ав-/-ёв-*.

3. Прыметнікі са значэннем 'перавышэння мяжы таго, што названа словазлучэннем з матывавальным прыметнікам у якасці азначальнага': *звышкрытычны* — 'перавышае мяжу крытычных тэмператур', *звышрэактыўны* 'перавышае хуткасць рэактыўных самалётаў', *звышчалавечы* — 'перавышае межы чалавечых магчымасцей'. Гэта група слоў нешматлікая ў сучаснай беларускай мове. Пры ўтварэнні прыметнікаў,

матываваных словазлучэннем з матывавальным прыметнікам у якасці азначальнага, назіраецца семантычнае сцяжэнне. Назоўнік, які ўваходзіць у склад устойлівага спалучэння, апускаецца, а ў структуру вытворнага ўключаецца толькі прыметнік. У такім выпадку вытворнае слова не ўступае ў сінанімічныя адносіны з матывавальным словазлучэннем, паколькі з'яўляецца прыметнікам і выкарыстоўваецца для абазначэння паняцця іншага плану. Прэфікс уступае ў сэнсавыя адносіны не з пасляпрэфіксная часткай, а з назоўнікам, што ўваходзіць у склад матывавальнага словазлучэння і не прадстаўленага ў структуры вытворнага.

Прыметнікі з прыстаўкай *звыш-*, выражаючы значэнне перавышэння мяжы, меры чаго-небудзь, блізкія па значэнню да прыметнікаў з прыстаўкамі *над-, паза-*. Некаторыя з іх маюць паралельныя ўтварэнні з гэтымі прыстаўкамі: *звышкаштарысны — пазакаштарысны, звышчалавечы — надчалавечы, звышштатны — пазаштатны*. Аднак, як вядома, прыметнікі з прэфіксамі *над-, паза-* спецыялізуюцца на выражэнні прасторавых значэнняў. У значэнні перавышэння мяжы, меры чаго-небудзь з прыстаўкамі *над-, паза-* маюцца толькі адзінкавыя ўтварэнні прыметнікаў.

Прыметнікі дадзенага тыпу шырока выкарыстоўваюцца ў навукова-тэхнічнай тэрміналогіі, а таксама ў газетна-публіцыстычнай мове. Прыстаўка *звыш-* выкарыстоўваецца таксама і ў індывідуальна-аўтарскай словатворчасці, што таксама пацвярджае яе словаўтваральную прадуктыўнасць. Напрыклад: *Смялей вяслуй, вястун крылаты! За мір усюды ўстаў народ, каб не крануў ніводнай хаты агонь звышатамных грымот* (А. Вялюгін. Адрас любві); *І залівае залівае даволі стабільна: стаіць на той жа звышнулявой адзнацы* (Вожык); *Пасярод сяброў маіх суровых я, здаецца, крышачку змалеў, бо кавальскім, звышпудовым словам грудзі перагружаны мае* (А. Летка. Грамы на зімоўцы); *Сненне звышфатоннае, што за міг змагло абагнаць зялёнае прошласці святло...* (А. Куляшоў. Сасна і бяроза).

Першым беларускім лексікаграфічным даведнікам, які зафіксаваў прыметнікі з прыстаўкай *звыш-* і зрабіў іх нормай беларускай літаратурнай мовы, быў "Руска-беларускі слоўнік" (1937) А. Александровіча. Тут значыцца 7 такіх прыметнікаў: *звышкамплектны, звышнатуральны, звышкаштарысны, звышпачуццёвы, звыштэрміновы, звышурочны, звышштатны;* у "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" — 12, у "Слоўніку беларускай мовы" (1987) — 17.

У семантычную групу прыметнікаў з агульным значэннем 'інтэнсіўнасці, вельмі высокай ступені якасці' ўваходзяць прыметнікі з лацінскім прэфіксам *ультра-*. Яны абазначаюць крайнюю, празмерную

ступень праяўлення прыметы, названай матывавальным словам: *ультравысокі, ультралевы, ультрарэакцыйны* і інш. Адпаведнае мадыфікацыйнае значэнне прыметнікі з прыстаўкай *ультра-* атрымоўваюць тады, калі прэфікс *ультра-* далучаецца да якасных прыметнікаў. Прыметнікі ў такім выпадку змяшчаюць элемент ацэнкі: *высокі — ультравысокі, кароткі — ультракароткі, модны — ультрамодны*. Ступень спалучальнасці прыстаўкі *ультра-* ў сучаснай беларускай мове не абмежавана. Яна можа далучацца як да спрадвечна беларускіх слоў *(ультралевы, ультраправы, ультрасучасны)*, так і да запазычаных, пераважна французскага і лацінскага паходжання, напрыклад: *ультрамодны, ультрарэакцыйны, ультрарэвалюцыйны*.

У якасці матывавальных для прыметнікаў дадзенага тыпу выкарыстоўваюцца як невытворныя матывавальныя прыметнікі (*ультралевы, ультраправы, ультрачырвоны*), так і суфіксальныя матывавальныя прыметнікі, часцей з суфіксамі *-н- (ультрамодны, ультрарадыкальны, ультрасучасны*), радзей з суфіксамі *-ск- (ультралявацкі, ультрарасісцкі), -ов- (ультрагукавы, ультрафіялетавы), -ічн- (ультрамікраскапічны), -ыўн- (ультракансерватыўны)*.

Утварэнне некаторых прыметнікаў з прэфіксам *ультра-* можна разглядаць дваяка з сінхроннага пункту гледжання. Так, напрыклад, прыметнік *ультрамікраскапічны* можа разглядацца і як прэфіксальнае (пры матывацыі прыметнікам *мікраскапічны*), і як суфіксальнае ўтварэнне (пры матывацыі назоўнікам *ультрамікраскоп*).

Ужыванне прыметнікаў з прэфіксам *ультра-* ў сучаснай беларускай мове абмежавана пераважна навуковай тэрміналогіяй і публіцыстыкай, радзей яны сустракаюцца ў тэкстах мастацкай літаратуры: *...з поўначы націскала ультракаталіцкая Польшча* (Беларусь); *Ультрасучаснаю галавешкаю жазло накіроўча гарыць* (Р. Барадулін. Рум); *Ультрамодны капялюш ледзь пакрываў галаву жанчыны* (Звязда).

Выкарыстанне прыметнікаў з прэфіксам *ультра-* ў якасці тэрміналагічных адзінак характарызуецца набыццём словам асобага значэння. Так, напрыклад, у грамадска-палітычнай лексіцы за прыметнікамі з прэфіксам *ультра-* замацавалася значэнне ‘крайні’ (*ультралевы, ультраправы, ультралявацкі*); у тэрмінах біяхіміі, хіміі, фізіцы — ‘вышэйшай, крайняй ступені малога памеру’ *(ультрагукавы, ультракароткахвалевы, ультрамікраскапічны)*. Тып прыметнікаў з прэфіксам *ультра-* ў сучаснай беларускай мове з’яўляецца прадуктыўным, прычым усе прыметнікі гэтага тыпу ўяўляюць сабой калькі рускіх утварэнняў. Параўн.: *ультравысокі — ультравысокий, ультракароткахвалевы — ультракоротковолновой, ультрасучасны — ультрасовременный*.

Вышэйшай ступенню праяўлення прыметы надзелены прыметнікі з прэфіксам *архі-*: *архіасцярожны, архібанальны, архірэакцыйны*. Дадзеную семантычную мадыфікацыю набываюць тыя прыметнікі, якія змяшчаюць якасную ацэнку: *модны — архімодны, небяспечны — архінебяспечны, цяжкі — архіцяжкі*. Узмацняльнае значэнне такіх прыметнікаў можна перадаць прыслоўямі *вельмі, надзвычай, празмерна*. Параўн.: *архідзіўны — надзвычай дзіўны, архімодны — вельмі модны*.

Усе прыметнікі з прэфіксам *архі-* семантычна суадносяцца з абстрактнымі назоўнікамі як спрадвечна беларускімі (*архіасцярожны, архідзіўны, архідурны*), так і запазычанымі (*архіапартуністычны, архібанальны*). Большасць такіх прэфіксальных прыметнікаў матывуюцца суфіксальнымі прыметнікамі з морфамі *-н-* (*архіасцярожны, архідзіўны*), *-альн-* (*архігеніяльны*), *-ычн-* (*архіапартуністычны*), *-к-* (*архіцяжкі*). Магчыма таксама матывацыя і невытворнымі прыметнікамі (*архімудры, архісмелы*).

Паводле выражаемага значэння прыметнікі з прыстаўкай *архі-* блізкія да прыметнікаў з прыстаўкамі *звыш-, супер-, ультра-*. Магчыма спалучэнне гэтых прыставак з аднатыпнымі (часам аднымі і тымі ж) асновамі: *архімодны — звышмодны, супермодны, ультрамодны; архірэакцыйны — ультрарэакцыйны; архіскладаны — звышскладаны, суперскладаны*. Аднак узаемадзеянне такіх мадэляў прыводзіць да іх размежавання, спецыялізацыі. Прыметнікі з *архі-* шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкай мове, практычна не ўжываюцца ў навукова-тэхнічнай тэрміналогіі, што ўласціва для прыметнікаў з прэфіксамі *звыш-, супер-, ультра-*.

Нешматлікую групу прыметнікаў, якія выражаюць узмацняльнае значэнне інтэнсіўнасці; крайне высокую ступень праяўлення прыметы складаюць прыметнікі з прэфіксам *супер-* (*супервостры, суперсучасны, суперэфектыўны*). Узмацняльнае значэнне гэтага тыпу прыметнікаў можна перадаваць прыслоўямі *вельмі, надзвычай, празмерна: супервостры — 'празмерна востры', суперскладаны — 'надзвычай складаны', суперэластычны — 'надзвычай эластычны'*.

Прыстаўка *супер-* спалучаецца толькі з якаснымі прыметнікамі (у тым ліку з якаснымі, якія развілі сваё значэнне з адносных), у аснове якіх як спрадвечна беларускія карані, так і запазычаныя: *суперсучасны, супертрадыцыйны, суперэфектны* і інш. Узмацняльнае значэнне прыметнікаў з прэфіксам *супер-* выкарыстоўваецца пераважна ў газетна-публіцыстычнай мове, у адзінкавых выпадках як тэрміналагічныя абазначэнні: *суперэластычны (тэхн.), суперэлітны (с.-г.)*.

Як ужо адзначалася, прыметнікі з прэфіксам *супер-* уступаюць у сі-

нанімічныя адносіны з прыметнікамі з прыстаўкамі *архі-, звыш-, ульра-, экстра-*. Аднак кожны з гэтых прэфіксальных тыпаў прыметнікаў мае свае семантычныя і функцыянальныя асабліасці. Прыметнікі з прэфіксам *супер-* змяшчаюць адмоўнае значэнне 'крайняй, найвышэйшай ступені праяўлення прыметы', за выключэннем спецыяльных намінацый. Дадзены тып прэфіксальных прыметнікаў набывае прадуктыўнасць у сучаснай беларускай мове.

Значэнне перавышэння мяжы таго, што названа матывавальным словам, маюць прыметнікі з прэфіксам *гіпер- (ад грэч. hypar — над, звыш): гіпергеаметрычны, гіпердактылічны, гіперкомплексны* і інш. Па характары семантычнай сувязі з матывавальным словам яны складаюць два падтыпы.

1. Прыметнікі, якія абазначаюць перавышэнне мяжы таго, што названа матывавальным суфіксальным прыметнікам: *гукавы — гіпергукавы*.

2. Прыметнікі, якія абазначаюць перавышэнне мяжы таго, што названа словазлучэннем з матывавальным прыметнікам у якасці азначальнага: *гіпербарычны — 'перавышае межы атмасфернага ціску (барычны — 'адносіцца да атмасфернага ціску'), гіпердактылічная рыфма — 'рыфма, якая выходзіць (па колькасці складоў) за межы дактылічнай', гіперкомплексныя лічбы — 'лікі, якія знаходзяцца за межамі комплексных'*.

Сярод матывававльных прыметнікаў часцей выкарыстоўваюцца прыметнікі з суфіксамі *-ічн-/-ычн-, -н-, -ов-* і змяшчаюць у сваёй аснове каранёвыя марфемы іншамоўнага паходжання, што з'яўляецца сведчаннем словаўтваральнай выбіральнасці прыстаўкі *гіпер-* у сучаснай беларускай мове: *гіпергеаметрычны, гіпербарычны, гіпердактылічны, гіперкомплексны*. Ужыванне прыметнікаў аналізуемага тыпу пераважна абмежавана навуковай тэрміналогіяй.

Мадыфікацыйнае значэнне 'празмернай ступені праяўлення прыметы' ўносіць у прыметнікі і прыстаўка *экстра-: экстраардынарны — 'надзвычайны, незвычайны', экстрамодны — 'надзвычай модны'*. Дадзены тып з'яўляецца непрадуктыўнымі ў сучаснай беларускай мове. Гэта, відаць, звязана з аглютынатыўным характарам самой марфемы, якая аддзялілася і ўжываецца як самастойнае слова, раўназначнае прыметніку. Параўн.: *масла экстра — 'самы найвышэйшы гатунак масла', соль экстра — 'самы найвышэйшы гатунак солі'*.

Да непрадуктыўных тыпаў, якія ўтвараюць замкнутыя рады вытворных і выражаюць высокую ступень праяўлення прыметы, адносяцца прыметнікі са спрадвечна беларускімі прэфіксамі *за-, пра-, пры-, раз-: за-*

вузкі, замалады, прамудры, праслаўуты, прыўдалы, развясёлы і інш. Мадыфікацыйнае ўзмацняльнае значэнне такіх прыметнікаў можна перадаць з дапамогай прыслоўяў *надта, празмерна,* а ў некаторых выпадках з дапамогай суфікса суб'ектыўнай ацэнкі *-ават- (завялікі — надта вялікі, велікаваты, прамудры — надта мудры, прыўдалы — надта ўдалы, развясёлы — надта вясёлы).* Ужыванне такіх прыметнікаў абмежавана размоўным стылем, адсюль яны пранікаюць і ў тэксты мастацкай літаратуры і маюць адценні іроніі і фамільярнасці: *Пакойчык быў завузкі...* (В. Мыслявец. Гарачая сталь)*; На лугу прамудрыя дзядзькі...паўздзіралі шапак казыркі і ўпіліся ў сінь нябёсаў* (М. Калачынскі. За палямі, за лясамі)*; І вось у дзень адзін прыўдалы загаманілі перавалы* (Я. Колас. Новая зямля)*; Кох прысеў на крэсла з відам самага разняшчаснага пакутніка* (М. Лынькоў. Векапомныя дні).

Узмацняльнае значэнне прэфіксальных прыметнікаў разгледжанага семантычнага поля шырока выкарыстоўваецца ў сучаснай беларускай мове. Асабліва вялікае распаўсюджанне яны атрымалі ў сферы навуковай тэрміналогіі, дзе і выяўляюцца іх спецыфічныя адценні.

ЛІТАРАТУРА

Бельчиков Ю.А. Об именах прилагательных с приставкой *сверх-* // Вопросы культуры речи. М., 1959.

Голанова Е.И. Активные процессы в префиксации современного русского литературного языка: На материале имен существительных. Дис. ...канд. филол. наук. М., 979.

Ж.Я. Белакурская

ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ ПРАВАПІСНАЙ СІСТЭМЫ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ І АРФАГРАФІЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ ЯКУБА КОЛАСА

Адносіны паміж графікай і арфаграфіяй, як вядома, носяць узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены характар. Спосабы арганізацыі графічнага боку пісьмовых выказванняў і прынцыпы іх рэалізацыі на пісьме пераходзяць адзін у аднаго і вызначаюцца адзін адным як з'явы агульнага парадку — сродку графічнай перадачы гукавой мовы. Разам з тым арфаграфічная норма як паказчык унармаванасці мовы ў цэлым спалучае ў сабе з'явы розных планаў: адлюстроўвае традыцыйныя напісанні, не звязаныя непасрэдна з вымаўленнем, перадае арфаграфію іншых моў ці мае суадносіны фанетычнага характару.

Арфаграфічная сістэма новай беларускай літаратурнай мовы, як і графіка, складвалася паступова. Вылучэнне і афармленне выразных пра-

вапісных тэндэнцый пачынаецца з канца XIX стагоддзя, з прыходам у літаратуру В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, якія ў сваіх творах замацоўвалі на пісьме характэрныя фанетычныя і граматычныя рысы сваіх гаворак. Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы і яе нормаў у гэты перыяд працякала ва ўмовах цесных сувязей яе як з польскай, так і з рускай культурай. Выкарыстанне польскай графікі (лацінкі) ці рускай графікі (грамадзянкі) для мэт беларускай пісьменнасці накладвала своеасаблівы адбітак на тагачасную беларускую арфаграфію. Так, як і ў польскай мове, абазначалася мяккасць зычных перад наступнымі мяккімі, часціцы ***жа, жэ, ш, бы, б*** пісаліся злітна з тым словам, да якога яны адносіліся [Булахаў, 1958, *37*]. Па прыкладу рускага правапісу адлюстроўваліся этымалагічныя напісанні: ужыванне ***ъ***; адсутнасць акання ў некаторых словах і формах слоў; неабазначэнне мяккасці этымалагічных ***д, т***; наяўнасць ***р*** мяккага і мяккіх шыпячых у некаторых выпадках; перадача ***ў*** нескладовага літарай ***в, у***; ужыванне літар ***щ, и, ъ*** і г. д. [Шакун, 1984, *216*]. Што датычыць агульнага стану тагачаснай літаратурнай мовы, то для яе характэрны неўладкаванасць правапісу і графікі, адсутнасць фанетычных і граматычных нормаў, наяўнасць шматлікіх мясцовых рыс [Шакун, 1984, *229*].

На пачатковым этапе літаратурна-пісьмовай традыцыі не было поўнага адзінства ў правапісе ў межах кожнай з дзвюх графічных сістэм, паколькі не існавала выпрацаванай нормы, а таксама аўтарытэтнага органа, які кантраляваў бы правапіс тагачасных выданняў. Сам факт адсутнасці адзінай графічнай сістэмы, у сваю чаргу, ускладняў працэс уніфікацыі і стабілізацыі правапісных нормаў літаратурнай мовы.

Тым не менш, перыяд пачатку XX стагоддзя з 1906 па 1915 год вызначальны ў гісторыі беларускага пісьма, паколькі, на думку даследчыкаў, у гэты час склаліся асноўныя правапісныя і граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы, якія засталіся, па сутнасці, нязменнымі і ў далейшым [Крамко, Юрэвіч, Яновіч, 1968, *52*]. Характэрнай рысай гэтага перыяду было тое, што на змену "спробам" і "знаходкам" стыхійнай моватворчасці пісьменнікаў-адзіночак прыходзіць свядомая дзейнасць мастакоў слова і мовазнаўцаў. Як сведчаць даследчыкі, беларускі літаратурны і грамадскі рух пачатку XX стагоддзя знаходзіўся ў такой цеснай сувязі, што ў пераважнай большасці выпадкаў яны атаясамліваліся [Семашкевіч, 1971, *6*]. Для беларускіх пісьменнікаў таго часу: Якуба Коласа, Янкі Купалы, Цёткі, М. Багдановіча, М. Гарэцкага — паняцці "літаратурная дзейнасць" і "грамадская дзейнасць" з'яўляліся неразрыўным спалучэннем. І іменна гэта акаліч-

насць вымагала стварэння літаратуры на народнай мове, што, у сваю чаргу, спрыяла свядомай мэтанакіраванай працы па уніфікацыі і стабілізацыі правапіснай нормы. У вырашэнне гэтай задачы значны ўклад унеслі першыя беларускія газеты: "Наша доля" (1906), "Наша ніва" (1906—1915), — а таксама беларускія выдавецтвы ў Вільні, Пецярбургу і Мінску. Рэдагуючы дасланыя з розных мясцін творы, карэспандэнцыі і іншыя матэрыялы, супрацоўнікі рэдакцый і выдавецтваў выпрацоўвалі адзіныя спосабы арфаграфічнага і граматычнага афармлення.

Тагачасныя беларускія выдавецтвы ўзялі на сябе ролю кіруючых і арганізуючых цэнтраў па выпрацоўцы правапісных нормаў беларускай літаратурнай мовы. Як сведчылі сучаснікі, беларускія пісьменнікі (прадстаўнікі розных стылёвых кірункаў і носьбіты розных беларускіх дыялектаў), не маючы перад сабой кадыфікаваных правіл арфаграфіі, перад здачай твораў у друк правілі іх згодна з тымі традыцыямі, якіх прытрымліваліся такія выдавецтвы, як "Наша ніва" або "Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ". Апошнія, карыстаючыся як кірыліцай, так і лацінкай, імкнуліся, тым не менш, перадаваць характэрныя асаблівасці беларускай мовы: аканне, яканне, пераход *е* ў *о* з папярэдняй мяккасцю, іншыя спецыфічныя з'явы беларускага вакалізму. Што датычыць кансанантызму, то зычныя перадаваліся ў большасці паводле марфалагічнага прынцыпу (як у рускай мове), аднак з адступленнямі ад таго, каб перадаваць спецыфічныя рысы беларускай фанетыкі [Шакун, 1984, *239*]. Найбольшай паслядоўнасцю ў арфаграфічным афармленні вызначаліся выданні пецярбургскіх выдавецтваў. Сярод іх найперш трэба адзначыць першае беларускае выдавецтва — суполку "Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ" (Пецярбург, 1906—1914), старшынёй якога з'яўляўся В. Іваноўскі, беларускі палітычны і грамадскі дзеяч. Інжынер-тэхнік па адукацыі, ён займаўся і выдавецкай дзейнасцю. Акрамя таго, В. Іваноўскі зрабіў апрацоўку першага буквара беларускай мовы і элементарнай мовазнаўчай тэрміналогіі. Ён быў ініцыятарам увядзення знакаў *č, š, ž* у беларускую лацінку, каб адрозніваць яе ад польскага алфавіта. Фактычным арганізатарам і кіраўніком суполкі быў беларускі мовазнавец Б. Эпімах-Шыпіла, прафесар Пецярбургскага універсітэта, па ініцыятыве якога было распачата выданне першых беларускіх лемантароў і твораў беларускіх пісьменнікаў. У гэтым выдавецтве сумесна з віленскім выдавецтвам "Наша хата" выйшла ў свет "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" Якуба Коласа. Лінгвістычная арыентаванасць кіраўнікоў суполкі і іх моўная кампетэнцыя спрыялі таму, што арфаграфія твораў, асабліва выданняў на лацінцы, якія выдаваліся таварыствам, была дастаткова вытрыманай, наколькі гэта было магчыма ў тагачасных умовах.

Новы этап ва ўнармаванні арфаграфіі звязаны з выхадам "Беларускай граматыкі для школ" Б. Тарашкевіча (1918), якая мела вялікае значэнне ў абагульненні, устанаўленні і сістэматызацыі правіл беларускага правапісу. Яна стала першым нарматыўным падручнікам як для школ Беларусі, так і выдавецтваў. У сваёй граматыцы Б. Тарашкевіч улічыў традыцыі беларускага кнігадрукавання і замацаваў напісанне галосных паводле вымаўлення, а зычных "гледзячы на тое, які зычны ў корані, прыстаўцы ці канчатку" [Тарашкевіч, 1918, *59*]. Б. Тарашкевіч сфармуляваў правілы напісання ***а*** ў перад- і паслянаціскных складах на месцы [*о*] ненаціскнога, перадачы якання ў 1-м пераднаціскным складзе, адлюстраванне асімілятыўнай мяккасці зычных, правапісу спалучэнняў каранёвых [*т*], [*ж*], [*с*] і суфіксальнага [*с*], спалучэнняў ***тц, чц, тц, дч***, а таксама часціцы ***не*** і прыназоўніка ***без***, злітнага напісання прыслоўяў з прыназоўнікамі, часціц ***б, бы, ж, жа*** і інш. Падтрымліваючы правапісныя традыцыі выдавецкай практыкі, Б. Тарашкевіч адзначаў, што адступленні дапускаюцца ў тых выпадках, "калі гэтага вымагае яснасьць сыстэмы або чыстасьць мовы" [Тарашкевіч, 1918, *4*]. З выхадам граматыкі Б. Тарашкевіча заканчваецца перыяд панавання індывідуальных арфаграфій і пачынаецца этап навуковага асэнсавання, арганізаванага рэгулявання беларускага правапісу. Аднак к сярэдзіне 1920-х гадоў, у сувязі з правядзеннем беларусізацыі і пашырэннем сферы выкарыстання беларускай мовы, выявіліся пэўныя недахопы граматыкі Б. Тарашкевіча, што у сваю чаргу патрабавала ліквідацыі правапіснага разнабою і граматычнага паралелізму.

Пытанні далейшага рэканструявання правапісу былі разгледжаны на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ў 1926 годзе. Пастановы, прынятыя на канферэнцыі, не мелі сілы закону, а большасць членаў Правапіснай камісіі, якая была створана для апрацоўкі правапісу і падрыхтоўкі праекта "Беларускага правапісу", была рэпрэсіравана. Аднак выкладанне мовы ў школе, друкарская практыка патрабавалі ўдакладнення многіх правапісных праблем.

У сувязі з набыццём Беларуссю ў пачатку дзевяностых гадоў статуса незалежнай, суверэннай дзяржавы і пашырэннем сфер выкарыстання беларускай мовы паўстала неабходнасць новага ўдакладнення і ўдасканалення правапісу. У першую чаргу гэта датычыць "слабых" участкаў сістэмы, якія да сённяшняга дня маюць хістанні і варыянты (абазначэнне на пісьме асімілятыўнай мяккасці зычных, правапіс ***не/ня, без/бяз,*** правапіс ***і/й***, правапіс іншамоўных слоў і г. д.). Пры вырашэнні многіх з гэтых правапісных праблем нельга не лічыцца з думкамі Якуба Коласа, абгрунтаванымі ім у "Методыцы роднай мовы".

Станаўленне і замацаванне правапісных тэндэнцый на пісьме (кадыфікацыя) эксплiцытна і імпліцытна адлюстроўвае асноўныя прынцыпы, вакол якіх і на аснове якіх складваюцца канкрэтныя правілы напісання. Як вядома, у пэўныя перыяды развіцця пісьменнасці, калі няма правіл, якія кадыфікуюць тое ці іншае напісанне, гэтыя ідэі звычайна становяцца адзіным кіраўніцтвам пры выбары напісання. Калі правілы прыняты, гэтыя кіруючыя ідэі ўжо непасрэдна ўвасабляюцца ў іх.

Фарміраванне правапісных ідэй, на якіх грунтуецца беларуская арфаграфія, складвалася паступова. Вызначальнай тэндэнцыяй, як вядома, было жывое беларускае вымаўленне. Пры гэтым правапісныя нормы ўсталёўваліся на аснове дзвюх графічных сістэм — кірыліцы і лацінкі. Практычнай асновай для іх з'яўлялася вымаўленне ў сярэднебеларускіх гаворках, у пэўнай ступені традыцыя пісьма мінулых эпох, арыентацыя на арфаграфію рускай і (у рэдкіх выпадках) польскай моў. Фактычна, гэтыя моўныя "арыенціры" аформіліся пазней, чым прынцыпы беларускай арфаграфіі.

Што датычыць самога тэрміна "прынцып арфаграфіі", то ўпершыню ў беларускай лінгваметодыцы яго выкарыстаў Якуб Колас у падручніку "Методыка роднай мовы" (1926). На думку Якуба Коласа, у аснове арфаграфіі могуць быць розныя прынцыпы: гістарычны, этымалагічны, фанетычны, якія могуць злучацца ў розныя камбінацыі. У аснову беларускага правапісу, як адзначае пісьменнік, пакладзены такія прынцыпы, як фанетычны, этымалагічны, прынцып традыцыі, прынцып напісання чужаземных слоў, а таксама прынцып напісання складаных слоў. Вылучаючы пяць прынцыпаў арфаграфіі, пісьменнік падкрэсліваў, што паслядоўна правесці той ці іншы прынцып складана. Асабліва гэта датычыцца фанетычнага прынцыпу, бо паступовае правядзенне гэтага прынцыпу "зрабіла б непатрэбным і сам правапіс". Тым больш, што "правапіс, які будзе фанетычным для аднаго дыялекту мовы, можа не быць фанетычным для другога" [Колас, 1976, *442*]. Паводле значнасці фанетычны прынцып пастаўлены пісьменнікам на першае месца. Тым не менш, відавочна імкненне Якуба Коласа лагічна вывесці неабходнасць як фанетычнага прынцыпу "пісаць так, як вымаўляецца", так і этымалагічнага (фанематычнага), які дае магчымасць "пісаць словы згодна іх паходжання, згодна з гісторыяй мовы" [Колас, 1976, *442—443*], гэта значыць, з захаваннем марфалагічных частак слова. Уключэнне ў пералік прынцыпаў этымалагічнага прынцыпу сфарміравалася ў Якуба Коласа пад уплывам рускай арфаграфіі, у якой гэты прынцып пераважае. Як настаўнік-метадыст, Якуб Колас звязваў цяжкасці ў навучанні мовы з наяўнасцю ў беларускім правапісе "мно-

ства прынцыпаў", і апошняя акалічнасць вымагала "правядзення рэформы правапісу". Але "рэформа не навучыць пісаць правільна". Арфаграфічна-правільнаму пісьму, на думку пісьменніка, спрыяюць такія фактары, як 1) правільна ўспрынятае на слых слова; 2) правільнае вымаўленне слова; 3) від напісанага слова; 4) рух, што выконваецца на пісьме; 5) веданне правіл правапісу [Колас, 1976, *443*]. Вылучэнне гэтых фактараў грунтуецца найперш на разуменні цеснай сувязі паміж фанетыкай, арфаэпіяй і правапісам і на глыбокім асэнсаванні пісьменнікам дасягненняў не толькі ў галіне лінгвістыкі і методыкі, але і псіхафізіялогіі пісьма нямецкіх вучоных Лая і Мэймана, а таксама рускага вучонага А. Томсана. Якуб Колас акцэнтуе ўвагу на вывучэнні правіл правапісу, падкрэсліваючы гэта практычнымі патрэбамі. "На практыцы могуць быць такія выпадкі, дзе здарыцца патрэба мець нейкую мерку, нейкі крытэрый-норму, з якімі і трэба падысці для развязвання таго ці іншага правапіснага пытання. А такою меркаю і можа быць тое ці іншае правіла правапісу" [Колас, 1976, *448*]. "Свядомае", граматнае пісьмо Якуб Колас разумеў як "вынік работы мыслі", "складаны псіхафізічны працэс", а не механічны акт. Навучанне арфаграфіі пісьменнік рэкамендаваў пачынаць на аснове выкарыстання сінтэтычнага метаду, пры якім "дзеці пераходзяць да пісьма слоў пасля ўсваення элементаў літар і ўжо тады прыступаюць да пісьма слоў" [Колас, 1976, *440*], а на далейшых ступенях выкарыстоўваць аналітычны метад, калі "адразу прышчапляюць навыкі пісьма цэлых слоў" [Колас, 1976, *440*]. Багаты ўласны метадычны вопыт дазволіў Якубу Коласу распрацаваць стройную метадычную сістэму метадаў і прыёмаў навучання арфаграфіі: дыктанты, пісьмовыя стылістычныя работы, спісванне, лісты (пісьмы). Аднак задачы навучання правапісу заключаюцца не толькі ў навучанні арфаграфічна правільнаму пісьму, але і ў "развіцці пісьменнай «жывой» мовы вучняў". Такі від пісьма Якуб Колас называе "пісьмом вышэйшага парадку". Пісьменнік падкрэслівае, што "ступень граматнасці павінна вызначацца не ўменнем пісаць штучна падабраныя словы і сказы, а уменнем граматна складаць свае мыслі пры адвольным пісьме. Адгэтуль трэба паставіць у цесную сувязь навучанне правапісу з навучаннем правільна складаць свае мыслі на пісьме" [Колас, 1976, *453*].

У падручніку "Методыка роднай мовы". Якуб Колас упершыню ў беларускім мовазнаўстве даў навуковае вызначэнне правапісу: "Правапіс — гэта ёсць пэўная сістэма правіл, якія ўстанаўліваюць аднастайныя спосабы перадачы мовы ў гукавым пісьме" [Колас, 1976, *441*], прычым у адрозненне ад традыцыі разглядаць правапіс ў кантэксце граматыкі,

пісьменнік разумеў арфаграфію як асобы раздзел мовазнаўства, адрозны ад граматыкі. "Змешванне пытанняў правапісу з пытаннямі граматыкі вельмі шкодна адбіваецца на выбары метаду навучання правапісу і ўскладняе і без таго трудную справу навучыць пісаць правільна [Колас, 1976, *441*].

Важнасць і актуальнасць навучання правільнаму пісьму і клопаты аб арфаграфічнай унармаванасці мовы ў разуменні Якуба Коласа звязваліся з практыкай школьнага выкладання мовы. "Стан арфаграфічнай граматнасці ў нашых школах унушае боязь за цэласнасць нашай літаратурнай мовы, за цэласнасць нашай культуры" [Колас, 1976, *442*].

Вучэбна-метадычны дапаможнік "Другое чытанне для дзяцей беларусаў", складзены на аснове ўласных лінгва-педагагічных набыткаў аўтара, меў у пачатку XX стагоддзя не толькі асветнае значэнне. Як адзначаў Якуб Колас у "Методыцы роднай мовы", "невялікія, звязаныя, добра падабраныя тэксты вельмі патрэбныя і незаменныя пры навучанні арфаграфіі" [Колас, 1976, *449*].

ЛІТАРАТУРА

Булахаў М.Г. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX—XX ст. ва ўзаемаадносінах з іншымі славянскімі мовамі. Мн.: Выд-ва Акад. навук БССР, 1958.

Колас Я. Методыка роднай мовы // Зб. тв.: У 14 т. Мн.: Маст. літ., 1976. Т.12.

Крамко І.І., Юрэвіч А.К., Яновіч А.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: У 2 т. Мн.: Навука і тэхніка, 1968. Т. 2.

Семашкевіч Р.М. Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе: Канец XIX — пач. XX ст. Мн.: Выд-ва БДУ, 1971.

Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. Вільня: Выд-ва Беларускага камітэту, 1918.

Шакун Л.М. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: Вучэб. дапам. 2-е выд., перапрац. Мн.: Універсітэцкае, 1984.

С.А. Важнік

КАНТРАСТЫЎНАЯ ГРАМАТЫКА БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ МОЎ: АКТУАЛЬНЫ СТАН, ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

1. Кантрастыўная лінгвістыка: даследаванні ў рэчышчы сінтаксісу

У апошнія дзесяцігоддзі супастаўляльная праблематыка яўна дамінуе ў славістыцы. Пра гэта выразна сведчаць матэрыялы XII Міжнароднага кангрэса славістаў (Кракаў, 27.VIII.—2.IX.1998) [XII Miedzynarodowy, 1998; Мячкоўская, 1998, *74—75*].

Адметнай рысай кантрастыўных даследаванняў 80—90-х гг. стала тое, што ў якасці аб'ектаў даследавання "пераважна разглядаюцца моўныя з'явы, якія маюць, з аднаго боку, функцыянальна-семантычную, з другога боку, — множную прыроду (г. зн. уяўляюць сабой лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя катэгорыі, або класы)" [Кіклевіч, 1997, *302*]. Звяртаюць на сябе ўвагу шматлікія спробы стварэння кантрастыўных граматык славянскіх моў у рэчышчы т. зв. **тэарэтычнай супастаўляльнай лінгвістыкі**. Яны маюць пераважна аксіяматычны (або дэдуктыўны) характар, г. зн. у асноўным праводзяцца ў напрамку ад агульнага (ад агульных тэарэтычных палажэнняў) да канкрэтнага (да канкрэтнага моўнага матэрыялу). Адным з найбольш характэрных прыкладаў такой граматыкі з'яўляецца супастаўляльнае даследаванне балгарскай і польскай моў: "Gramatyka konfrontatywna bulgarsko-polska" (пяць тамоў), у прыватнасці, манаграфічнае даследаванне М. Карыткоўскай "Туру pozycji predykatowo-argumentowych" (1992). Аксіяматычны (дэдуктыўны) падыход пры правядзенні кантрастыўных даследаванняў падаецца і нам вельмі прадуктыўным.

Нягледзячы на значныя дасягненні кантрастыўнай лінгвістыкі канца XX ст., усё больш відавочнай становіцца неабходнасць распрацоўкі тэарэтыка-метадалагічных падстаў, прынцыпаў супастаўлення розных моў, неабходнасць уніфікацыі паняційна-тэрміналагічнага апарата гэтага "магістральнага" напрамка сучаснай лінгвістыкі. Без такіх уласна тэарэтычных напрацовак наўрад ці магчымы новыя супастаўляльныя даследаванні. Перадусім маецца на ўвазе перспектыва стварэння кантрастыўнай граматыкі беларускай і польскай моў, што з'яўляецца адной з найбольш актуальных задач сучаснага беларускага і польскага мовазнаўства.

Паралельнае вывучэнне сінтаксісу розных славянскіх моў стала ўжо традыцыйным напрамкам у славістыцы. Яно праводзілася ў трох асноўных аспектах: **1) параўнальна-гістарычным; 2) тыпалагічным; 3) сінхронна-супастаўляльным (кантрастыўным, канфрантатыўным)**. Метад параўнання (супастаўлення) уласцівы ўсім адзначаным вышэй лінгвістычным дысцыплінам. Тым не менш, яны адрозніваюцца паміж сабой **стратэгіяй супастаўлення**.

Сучасным кантрастыўным даследаванням, якія базуюцца выключна на сінхраніі і праводзяцца з мэтай выяўлення адрозненняў і падабенстваў паміж мовамі, незалежна ад ступені іх генетычнай блізкасці [Гак, 1983, *7*], папярэднічалі параўнальна-гістарычныя і тыпалагічныя даследаванні.

Найбольш магутна ў славістыцы прадстаўлены **параўнальна-гіста-**

рычныя даследаванні сінтаксісу славянскіх моў. Вялікае значэнне ў плане станаўлення такога падыходу мелі працы А. Шлейхера, П. Шафарыка, Ф. Міклашыча, В. Ягіча, А.А. Патабні, А.А. Мее, В. Вондрака, І. Зубаты, Ф.Ф. Фартунатава, А.А. Шахматава, Я.Ф. Карскага, Т. Лера-Сплавіньскага, В. Паржэзіньскага, В.У. Вінаградава, Л.А. Булахоўскага, В.І. Баркоўскага, Ц.П. Ломцева, З. Шціберa, Е. Курыловіча, З. Клеменсевіча, С. Шобэра, А.С. Мельнічука, С. Сяткоўскага, Й. Шрэнка, Б. Гаўранка, Р. Ружычкі, С.Б. Бернштэйна, Д. Бразовіча, І. Лекава, Я. Баўэра, Ю.С. Сцяпанава і многіх іншых (гл. агляд прац у [Мразек, 1990, *11—18*], а таксама бібліяграфію ў [Гаспаров, Сигалов, 1974, *472—494*]).

Існуе істотная розніца паміж параўнальна-гістарычным і сінхронна-супастаўляльным падыходамі. Адпаведныя падыходы адрозніваюцца перспектывай супастаўлення. Так, параўнальна-гістарычнае мовазнаўства вырашае праблемы вызначэння ступені генетычнай блізкасці моў, агульнасці іх паходжання, рэканструкцыі мовы-асновы. У сувязі з гэтым параўнальна-гістарычнае мовазнаўства, абапіраючыся пераважна на факты дыяхраніі, арыентавана на пошук у блізкароднасных мовах падабенстваў, універсалій, якія пацвярджаюць факт паходжання і далейшага развіцця славянскіх моў з адзінай крыніцы. Аднак, на думку А.А. Рэфармацкага, протауніверсаліі, вылучаемыя ў сучасных славянскіх мовах, вельмі часта дэіндывідуалізуюць даследуемыя мовы. Супастаўляльны ж метад, па словах А.А. Рэфармацкага, зыходзіць з устанаўлення спецыфікі той ці іншай мовы і павінен "асцерагацца" падабенстваў, бо менавіта яны нівелююць індывідуальнае ў кожнай мове [Реформатский, 1987, *41*].

Даволі ўнушальную традыцыю маюць і **тыпалагічныя даследаванні** сінтаксісу славянскіх моў. Асноўныя прынцыпы лінгвістычнай тыпалогіі распрацаваны ў працах В. Гумбальта, Э. Сэпіра, Б. Уорфа, Л. Ельмслева, Ш. Балі, Ф. Фінка, Д. Грынберга, Е.Д. Паліванава, Л.У. Шчэрбы, І.І. Мешчанінава, А.В. Ісачанкі, Р. Якабсона, Ф. Данеша, В. Скаліčкі, Р. Мразека, В.Д. Аракіна, А.І. Смірніцкага, С.К. Шаўмяна, В.М. Ярцавай, Б.А. Успенскага, С.Д. Кацнельсона, Б.А. Сярэбранікава, І.І. Рэўзіна, Ю.В. Раждественскага, У.Р. Гака і многіх іншых. У беларускім мовазнаўстве звяртаюць на сябе ўвагу супастаўляльна-тыпалагічныя даследаванні А.Я. Супруна, А.Я. Міхневіча, В.У. Мартынава, Б.Ю. Нормана, Г.А. Цыхуна, А.К. Кіклевіча і некаторых іншых.

Паводле У.Р. Гака, задача лінгвістычнай тыпалогіі зводзіцца да ўстанаўлення *"моўнага тыпу"*, пад якім разумеецца сукупнасць найбольш агульных моўных заканамернасцей адпаведнай мовы, якія якраз і складаюць спецыфіку гэтай мовы [Гак, 1989, *7*; Гак, 1983, *9*].

Кантрастыўная лінгвістыка, пра якую як пра асобы лінгвістычны напрамак пачалі пісаць у англамоўнай літаратуры яшчэ ў 60-я гг., у цяперашні час уяўляе сабой асобную мовазнаўчую дысцыпліну са сваімі мэтамі, задачамі, аб'ектам і метадамі даследавання. Яна ўзнікла на стыку структурнай тыпалогіі моў і лінгвадыдактыкі і першапачаткова мела практычнае ці нават, больш дакладна, прагматычнае прызначэнне. Вынікі кантрастыўнага аналізу выкарыстоўваліся пераважна для аптымізацыі працэсу навучання замежным (няродным) мовам або для ажыццяўлення адэкватнага перакладу з адной мовы на другую [Ярцева, 1960, *3*; Koseska-Toszewa, 1991, *7*; Реформатский, 1987, *41*]. З цягам часу ўласна прыкладныя праблемы кантрастыўнай лінгвістыкі атрымалі і належнае тэарэтычнае асэнсаванне. Пра тое, як, у якіх напрамках развівалася і развіваецца зараз супастаўляльнае мовазнаўства, можна меркаваць па матэрыялах, змешчаных у зборніках "Новое в зарубежной лингвистике / Контрастивная лингвистика" (1989) і "Problemy teoretyczno-metodologiczne badań konfrontatywnych języków słowiańskich" (1991), а таксама на матэрыялах XII Міжнароднага кангрэса славістаў [XII Międzynarodowy, 1998]. Так, тэматычна вылучаюцца працы, прысвечаныя: 1) тэорыі і методыцы правядзення кантрастыўных даследаванняў; 2) метадам кантрастыўнай лінгвістыкі; 3) прымяненню кантрастыўнага (сінхронна-супастаўляльнага) аналізу пры выкладанні замежных моў; 4) выпрацоўцы тэарэтыка-метадалагічных падстаў супастаўляльных даследаванняў сінтаксісу славянскіх моў; 5) тэорыі і практыцы перакладу і некаторым іншым.

Звяртаюць на сябе ўвагу шматлікія кантрастыўныя даследаванні менавіта ў **рэчышчы сінтаксісу**. Выбар найвышэйшага ўзроўню моўнай сістэмы ў якасці аднаго з найбольш прыярытэтных аб'ектаў даследавання не выпадковы. "Сінтаксіс найбольш звязаны з мысленнем, з сацыяльнымі паводзінамі і дзеяннямі носьбітаў канкрэтнай мовы, таму найбольш важную і істотную канфрантатыўную інфармацыю можа даць менавіта вывучэнне формы, структуры і зместу камунікатыўных адзінак — выказванняў і тэкстаў" [Кіклевіч, 2000]. Менавіта на сінтаксічным узроўні праз спецыфічныя для кожнай мовы "спосабы спалучэння паняццяў" рэалізуецца функцыя захоўвання, акумулявання і трансляцыі вопыту, традыцый і культуры пэўнага народа [Серебренников, 1988, *57*; Толстой, 1990, *239*, *242*, *249*; Мечковская (а), 2000, *81*; Чумак 1994, *5*, *7*; Чумак (а), 1994, *81—82*; Чумак, 2000]. Кожная мова мае свой **уласны вопыт** пазнання свету, абумоўлены розным бачаннем (вымярэннем, асэнсаваннем, чляненнем) тым ці іншым моўным калектывам пазамоўнай рэчаіснасці.

"Свет, — як зазначае Л.У. Шчэрба, — пазнаецца розным чынам у розных мовах, нават у тых, на якіх гавораць народы, што ўяўляюць сабой пэўнае адзінства з пункту гледжання культуры..." [Щерба, 1958, *49*]. У лексемах і катэгорыях адной мовы фіксуюцца адны аб'екты (або іх уласцівасці ці адносіны паміж імі), а другой — зусім іншыя, адрозныя аб'екты. Спрацоўвае свайго роду **выбіральнасць** кожнай канкрэтнай мовы пры ўспрыманні рэчаіснасці, якая выяўляецца ў прыярытэтным вылучэнні і "фіксацыі" ў моўных адзінках рознага ўзроўню адных аб'ектаў і невылучэнні іншых. Як заўважаецца ў спецыяльнай літаратуры, такая выбіральнасць непасрэдна звязана з адрозненнем прыродных, культурных, сацыяльна-эканамічных умоў, у якіх жывуць носьбіты адпаведных моў, а таксама з практычнымі патрэбамі носьбітаў пэўнай мовы. Такім чынам, нават пры супастаўленні дзвюх блізкароднасных моў мы маем справу з двума рознымі тыпамі светабачання [Гумбольдт, 1984, *80* і інш.; Щерба, 1958, *49*; Гак, 1983, *19*, Уфимцева, 1972, *434—435*]. У сувязі з адзначаным справядліва і адваротнае палажэнне: "мова, сапраўды, не можа не аказваць вядомага адваротнага ўплыву на мысленне і пазнавальную дзейнасць чалавека" [Панфилов, 1982, *33*, *29*; параўн.: Потебня, 1976, *260*]. Як вядома, ідэю В. Гумбальта аб мове як фактары, які вызначае характар чалавечага мыслення, далей, у рэчышчы амерыканскай этналінгвістыкі, развівалі Э. Сэпір і Б. Уорф. Паводле амерыканскіх даследчыкаў, прадстаўнікі розных нацыянальна-моўных калектываў бачаць свет па-рознаму — праз прызму сваёй роднай мовы. Такое палажэнне ляжыць у аснове тэорыі "лінгвістычнай адноснасці" Э. Сэпіра і Б. Уорфа. Nota bene: калі пытанне аб тым, што розныя мовы — гэта розныя спосабы бачання свету, суадносныя са спецыфічнымі (ідыяэтнічнымі) карцінамі свету, з'яўляецца відавочным, то пытанне аб адваротным уплыве мовы на мысленне і культуру застаецца пакуль што адкрытым [Мечковская, 2000, *61*, *64*, *67*].

Паказальна, што яшчэ Я. Лёсік у сваім "Сынтаксе" звяртаў увагу на нацыянальна-культурную рэлевантнасць граматычнага ўзроўню беларускай мовы: "граматыка беларускай мовы дасьледжвае тыя спосабы і сродкі, якімі беларускі народ выражае свае думкі, сваё мысьленьне, свае пачуваньні ці перажываньні" [Лёсік, 1926, *7*].

У сувязі з адзначанымі вышэй асаблівасцямі сучасныя кантрастыўныя даследаванні ў галіне сінтаксісу звязваюцца пераважна "з праблемамі культурнага ўзаемаўплыву і фарміравання адрознівальных нацыянальна-культурных параметраў, якія адлюстроўваюць адрозненні ў нацыянальным менталітэце, культуры, светаўспрыманні... У сувязі з такой парадыгмай навуковага пазнання паняцце інтэрферэнцыі выступае

ўжо не як просты механічны перанос навыкаў з роднай мовы ў вывучаемую мову, а як з'ява, што дэтэрмінуецца этнакультурнымі фактарамі" [Чумак, 2000, *83*]. Іншымі словамі, супастаўляльнае апісанне сінтаксісу выходзіць на **якасна новы ўзровень**. Пры гэтым вырашаюцца не проста пытанні ўзаемадзеяння моў, а пытанні "параўнання этнічных культур і ўласцівых ім спосабаў камунікацыі" [Кіклевіч, 2000]. Гэта вельмі важная заўвага, бо пры кантрастыўным аналізе пераважна на сінтаксічным узроўні (у сілу яго спецыфікі) магчымы выхад на **"дыялог культур"** праз "дыялог моў".

Прынята лічыць, што сінтаксічныя структуры розных славянскіх моў адрозніваюцца вельмі нязначна і маюць пераважную большасць агульных, універсальных, рыс, чым спецыфічных [Мейе, 1951, *380*; Грепль, 1967, *63*; Рабчинская, 1977, *260*; Борковский, 1981, *231*; Кононенко, 1980, *39—40*; Андерш, 1987, *36*, *170*; Норман, 1988, *9—11*, *13*, *15*, *26*; Конюшкевич, 1989, *3*; Мразек, 1990, *41*, *24—28*; Чумак, 1994, *7*; Norman, 1998, *245—247*; Плотнікаў, 1999, *21*; Чумак, 2000, *84*].

І ўсё ж, як паказваюць кантрастыўныя даследаванні, мовы адрозніваюцца не столькі тым, што яны маюць ці чаго яны не маюць, колькі тым, як яны выкарыстоўваюць тое, што маюць [Гак, 1983, *20*; Kiklewicz, 1995, *83*]. Так, "знешне падобная граматычная канструкцыя функцыянуе ў розных мовах звычайна трошачкі не так. Гэтае «трошачкі» з'яўляецца вельмі важным для асэнсавання спецыфікі кожнай мовы" [Будагов, 1980, *14*; параўн.: Сигалов, 1978, *45*]. Такім чынам, фармальнае падабенства сінтаксічных канструкцый яшчэ не азначае іх семантычнай тоеснасці або падабенства пры выкарыстанні. Больш за тое, у розных мовах нават эквівалентныя словы, якія супадаюць па дэнатату, вельмі часта адрозніваюцца сваім лексічным фонам або канататыўнай семантыкай (канататам: эмацыянальна-ацэначным адценнем). Поўнае супадзенне лексічных фонаў або канататаў — з'ява рэдкая [Мечковская, 2000, *53—55*].

Нягледзячы на адноснае дамінаванне універсальных прымет у сінтаксісе славянскіх моў, абумоўленых адзінствам бачання свету прадстаўнікамі розных культур [Мечковская, 2000, *51*], у кожнай нацыянальнай мове, тым не менш, існуюць і своеасаблівыя спосабы выражэння думкі, прадвызначаныя спецыфікай успрымання, бачання свету тым ці іншым нацыянальна-моўным калектывам, што "дэманструе нам самабытнасць і арыгінальнасць нацыянальнага вербальнага мыслення" [Норман, 1988, *7*; параўн.: Kawka, 1980, *15*; Конюшкевич, 1989, *14*]. Было б таксама, відаць, памылкай бачыць у кожнай адрознай форме выражэння "іншую семантычную функцыю" або адмысловы "нацыя-

нальна-культурны кампанент семантыкі, які мае выхад у этнаментальнасць", як гэта прапануе рабіць Л.М. Чумак [Чумак, 2000, *86*]. Так, фармальныя адрозненні ў канструкцыях тыпу (1) *смеяться над кем-либо // смяяцца з каго-небудзь*; (2) *жениться на ком-либо // ажаніцца з кім-небудзь* і некаторых іншых Л.М. Чумак звязвае "з рознымі этычнымі нормамі, аб'ектыўнымі ментальнымі станамі" носьбітаў адпаведна рускай і беларускай моў. У выніку кантрастыўнага лінгвакультуралагічнага аналізу адзінкавых прыкладаў даследчыца прыходзіць да высновы, што, у адрозненне ад рускай мовы, "станоўчае маральнае і псіхалагічнае ўздзеянне на аб'ект у беларускай мове акцэнтуецца, а адмоўнае — змякчаецца". Прычым "адценне перавагі над аб'ектам-асобай не адпавядае талерантнаму нацыянальнаму мысленню беларусаў" [Чумак, 2000, *85*]. Для рускай жа мовы ў выпадку (1) канстатуецца "ўласна аб'ектнае значэнне з адценнем гвалту, здзеку, якое ў рускай мове выражаецца формай меснага склону з прыназоўнікам *над*" (?); а ў выпадку (2) — "уласна аб'ектнае значэнне …з ярка выражаным адценнем перавагі, што падкрэслівае ролю мужчыны ў грамадстве, [Чумак, 2000, *84—85*; параўн.: Чумак, 1997, *54—56*; *59*, *94*, *98—99*, *101—102* і інш.; Прохорова, 1991, *54—56*; Прохорова, 1994, *78*]. Наўрад ці можна пагадзіцца з такім "гіпербалізаваным" разуменнем карэляцыі паміж асаблівасцямі нацыянальнага менталітэту і фармальна-сінтаксічнымі адрозненнямі супастаўляемых моў.

Нацыянальна-культурная спецыфіка той ці іншай мовы выяўляецца на ўсіх моўных узроўнях, у тым ліку на ўзроўнях графікі і арфаграфіі, нягледзячы на іх асемантычнасць [Мечковская, 1998; 2000а, *82*]. Найбольшай "тлумачальнай" сілай, аднак, для разумення нацыянальна-культурнай спецыфікі пэўнай мовы валодаюць, на думку Н.Б. Мячкоўскай, лексічныя і фразеалагічныя адзінкі. Гэта мае сваё "анталагічнае" вытлумачэнне: намінатыўныя адзінкі лексічнага і фразеалагічнага ўзроўняў непасрэдна звязаны з пазамоўнай рэчаіснасцю [Мечковская, 2000, *52*]. Сінтаксічныя адзінкі валодаюць не меншай прагнастычнай сілай. Перш за ўсё маюцца на ўвазе спецыфічныя, уласцівыя толькі адной нейкай мове звароты, канструкцыі, словаспалучэнні, сінтаксічныя мадэлі, якія кожная нацыянальная мова назапашвае ў выніку шматвяковага развіцця. Услед за А.Я. Міхневічам будзем звязваць такія сінтаксічныя адзінкі з паняццем *"нацыянальная сінтаксічная ідыяматыка"* [Міхневіч, 1994, *485—486*]. Хоць, заўважым пры гэтым, існуе і праблема нацыянальна-культурнай рэлевантнасці міжмоўных адрозненняў на ўзроўні сінтаксісу, якая патрабуе спецыяльнага вывучэння з прыцягненнем як мага большай колькасці аднатыпных моўных фактаў.

Безумоўна, сінтаксічны ўзровень і яго прэдыкатыўныя адзінкі з'яўляюцца **культурна значнымі, нацыянальна маркіраванымі**, таму пры супастаўленні рознамоўных сінтаксічных фактаў усе яны, па сутнасці, выконваюць функцыю этна-культурна-моўнай ідэнтыфікацыі. Іншая справа, што для атрымання дакладных даных павінен прымяняцца сістэмны падыход, дзякуючы якому можна заўважыць вельмі тонкія, самыя глыбінныя нацыянальна-культурныя канатацыі. У адваротным выпадку немагчыма, відаць, прыйсці да правільнага разумення сінтаксічнай спецыфікі адпаведнай мовы пры яе кантрастыўным апісанні.

У кола асноўных задач кантрастыўнай (супастаўляльнай) лінгвістыкі ўваходзіць **вылучэнне рыс падабенства і адрознення** пры супастаўленні фактаў дзвюх ці больш моў [Исаченко, 1963, *109*; Кононенко, 1980, *39*; Гак, 1983, *5*, *7—10*; Андерш, 1987, *35*; Норман, 1988; Гак, 1989, *7—9*; Конюшкевич, 1989, *12*, *17—26*; Мразек, 1990, *7*, *9*; Koseska-Toszewa, 1991, *7*; Korytkowska, 1992, *327—328*; Шчэрбін, 1994, *544*; Кіклевіч, 1997, 2000; Norman, 1998, *246*; Плотнікаў, 1999, *106*]. Аднак не ўсе лінгвісты пагаджаюцца з такім разуменнем паняцця *"кантрастыўная лінгвістыка"*. Некаторыя аўтары супрацьпастаўляюць кантрастыўную лінгвістыку — канфрантатыўнай лінгвістыцы, яўна звужаючы разуменне першага паняцця. Так, напрыклад, Г. Хэльбіг [Хельбиг, 1989] зазначае, што кантрастыўная лінгвістыка займаецца пераважна адрозненнямі паміж мовамі і мае больш практычную скіраванасць. Паняцце ж *"канфрантатыўная лінгвістыка"* больш шырокае. Яно, паводле вядомага нямецкага даследчыка, супадае па сваім аб'ёме з тэрмінам *"супастаўляльнае мовазнаўства"*, асноўныя прынцыпы якога распрацоўваліся савецкімі моваведамі. Маюцца на ўвазе працы Л.У. Шчэрбы, Е.Д. Паліванава, А.А. Рэфармацкага, А.І. Смірніцкага, В.М. Ярцавай, В.Д. Аракіна, У.Р. Гака, Б.А. Сярэбранікава і многіх іншых. Канфрантатыўная лінгвістыка цікавіцца як падабенствамі, так і адрозненнямі і мае, на думку Г. Хэльбіга, больш тэарэтычны характар.

У польскай лінгвістычнай традыцыі таксама мае месца размежаванне паняццяў *"językoznawstwo kontrastywne"* і *"językoznawstwo konfrontatywne"*. Адзначанае "супрацьстаянне" ўпершыню было зафіксавана ў працы Л. Заброцкага [Zabrocki, 1970] . Тым не менш у паланістыцы досыць часта тэрмін *kontrastywny* ужываецца ў значэнні *'konfrontatywny'* [Zabrocki, 1970; Fisiak, 1981; Koseska-Toszewa, 1991; параўн.: Андерш, 1987, *36*]. Такі падыход адпавядае і нашаму разуменню паняцця *кантрастыўная лінгвістыка*. Пры супастаўленні моў непазбежна вылучаюцца як адрозненні, так і падабенствы, хоць пры практычным выкарыстанні вынікаў супастаўляльнага аналізу, напрыклад,

пры выкладанні замежных моў, безумоўна, большы акцэнт робіцца менавіта на адрозненнях, чым на падабенствах. Больш за тое, спецыфіка кожнай мовы выяўляецца нават у зоне фармальна тоесных ці фармальна падобных элементаў і ў асноўным тычыцца семантычных, функцыянальных і стылістычных асаблівасцей іх выкарыстання [Гак, 1983, *8*, *20*; Конюшкевич, 1989, *11—12*].

Такім чынам, "праводзіць мяжу паміж *«канфрантатыўным»* і *«кантрастыўным»* мовазнаўствам няма падстаў, абодва падыходы выкарыстоўваюць адны і тыя ж метады даследавання, і справа тут у тым, што ўлічваецца ў першую чаргу пры выкарыстанні яго вынікаў [Гак, 1989, *9*].

Мы, тым не менш, вымушаны спыніцца на тэрміне *кантрастыўнае даследаванне*, бо сінтаксічная спецыфіка той ці іншай мовы вызначаецца толькі праз "паслядоўнае вылучэнне кантрастаў і адрозненняў свайго і чужога" [Реформатский, 1987, *41*].

2. Тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы супастаўлення сінтаксічных сістэм беларускай і польскай моў

Супастаўляльнае мовазнаўства як лінгвістычная дысцыпліна, якая традыцыйна лічыцца "адной з найбольш яскравых і эфектыўных форм сувязі паміж фундаментальнай лінгвістыкай і прыкладнымі аспектамі мовазнаўства" [Гак, 1989, *17*], выпрацавала цэлы комплекс агульных тэарэтыка-метадалагічных палажэнняў (прынцыпаў) кантрастыўнага аналізу, якія абавязкова павінны быць улічаны пры супастаўленні розных моў. Такімі "аксіёмамі" агульнай тэорыі кантрастыўнай лінгвістыкі з'яўляюцца наступныя прынцыпы.

2.1. Прынцып сінхраніі. Адной з асноўных характарыстык найноўшых кантрастыўных даследаванняў з'яўляецца той факт, што пераважная іх большасць праводзіцца ў аспекце сінхраніі, г. зн. з пункту гледжання сучаснага стану развіцця моў [Реформатский, 1987, *41*; Андерш, 1987; Матезиус, 1989, *18*; Конюшкевич, 1989, *7*; Мразек, 1990, *30*; Koseska-Toszewa, 1991, *7*; Вольнич-Павловска, 1998, *184*]. Такі падыход, на думку даследчыкаў, з'яўляецца адзіна магчымым і дазваляе атрымаць поўныя і несупярэчлівыя даныя.

Тым не менш, нельга не ўлічваць і т. зв. "гістарычны фактар": факты генетычнай блізкасці моў, факты "міжмоўных" кантактаў старажытнай пары, факты парабенства (блізка)роднасных моў у іх гістарычных лёсах [Конюшкевич, 1989, *8*].

2.2. Прынцып сістэмнасці. Прынцып сістэмнасці з'яўляецца цэнтральным тэарэтыка-метадалагічным палажэннем супастаўляльнага мо-

вазнаўства. Яго сутнасць у тым, што "супастаўленне не можа абапірацца на адзінкавыя, асобныя «адрозненні» дыспаратных фактаў, а павінна зыходзіць з сістэмных проціпастаўленняў катэгорый і радоў свайго і чужога" [Реформатский, 1987, *41*]. Такое вытлумачэнне "сістэмнага падыходу" ў асноўных рысах адпавядае многім аўтарскім канцэпцыям [параўн.: Исаченко, 1960, *44—46*; Ярцева, 1960, *4*; Daneš, 1965; Грепль, 1974, *3*; Ярцева, 1986, *3*; Кононенко, 1980, *43*, *45*; Реформатский, 1987, *41—43*; Скаличка, 1989, *27*; Конюшкевич, 1989, *11*, *15*; Мразек, 1990, *7*; Koseska-Toszewa, 1991, *8*; Кіклевіч, 1997, *302*, *304*; Плотнікаў, 1999, *55—56*].

Калі зыходзіць з палажэння аб тым, што мова — гэта сістэма, і ўсё ў ёй падпарадкавана сістэме [Супрун, 1978, *41* і інш.], то становіцца зразумелым, чаму пры кантрастыўным апісанні моў нельга апераваць адзінкавымі, асобнымі, ізаляванымі, а значыць, у пэўнай ступені выпадковымі фактамі, вырванымі з сістэмы. Безумоўна, кантрастыўны аналіз дзвюх моў "найбольш эфектыўны ў тых выпадках, калі супастаўляюцца цэласныя сістэмы гэтых моў з усімі іх унутранымі сувязямі і заканамернасцямі іх структурнай арганізацыі" [Ярцева, 1986, *3*; параўн.: Исаченко, 1960, *44*; Реформатский, 1987, *43*]. Такім чынам, сапраўдным аб'ектам супастаўляльных сінтаксічных даследаванняў варта прызнаць, відаць, не проста асобныя сінтаксічныя адзінкі, а сінтаксічныя адзінкі ў іх сістэмных адносінах — парадыгматычных і сінтагматычных сувязях.

Аднак не заўсёды "ўстаноўка" на сістэмны падыход цалкам выконваецца ў кантрастыўных даследаваннях. Як трапна заўважыў А.А. Рэфармацкі, "у большасці супастаўляльных работ выклад будуецца па сістэме старога анекдота пра тое, як размаўлялі два хлопцы: *«А ў нас бліны!»*, *«А ў нас салдат прыйшоў!»* Такім спосабам нельга пабудаваць супастаўляльную методыку" [Реформатский, 1987, *51*].

Іншымі словамі, простым пералікам моўных фактаў адной мовы ізалявана ад другой нельга рэалізаваць на практыцы прынцып сістэмнасці пры супастаўленні дзвюх моў. Супастаўляць можна толькі аднапарадкавыя — раўназначныя і раўнацэнныя — моўныя факты. Толькі так можна забяспечыць аднолькавы падыход, перш за ўсё — аднолькавыя зыходныя ўмовы супастаўлення.

Вельмі часта сістэмны падыход у супастаўляльным мовазнаўстве звязваецца з паняццем **катэгорыі** (семантычнай, граматычнай), якая па сваёй сутнасці мае сістэмны характар [Кіклевіч, 1997, *302*, *304*]. Асабліва актуальна гэтае палажэнне гучыць якраз у кантэксце **сінтаксічных** кантрастыўных даследаванняў, бо, як заўважыў А.А. Шахматаў, "катэгорыя граматычная пазнаецца ў сінтаксісе" [Шахматов, 1941,

420; 1952, *29*], г. зн. выяўляецца, эксплікуецца ў тых ці іншых сінтаксічных канструкцыях, як, напрыклад, катэгорыя адушаўлёнасці / неадушаўлёнасці ў т. зв. транзітыўнай мадэлі [Важнік, 2000]. Гэта ж тычыцца і тых паняційных катэгорый, якія не маюць у той ці іншай мове адмысловых фармальных сродкаў выражэння, а значыць, маюць імпліцытны характар. Яны выяўляюцца толькі на ўзроўні словаспалучальнасці: пры аналізе сінтагматычных структур праз устанаўленне рэлевантных селекцыйных прымет (селекцыйных апазіцый), уласцівых пэўнай мове [параўн.: Михневич, 1969, *101—102* і інш.].

Як заўважыў А.В. Ісачанка [1960, *44*], супастаўленне асобных форм не дае нічога, акрамя ўстанаўлення "банальнай ісціны", што пэўныя формы ў тых ці іншых мовах адрозніваюцца або супадаюць. У першую чаргу трэба супастаўляць "з'явы катэгарыяльныя", "з'явы сістэмныя". Менавіта на "катэгарыяльным" узроўні заўважаюцца тыя спецыфічныя ўласцівасці кожнай мовы ("тонкія" адрозненні, паўтоны, дэталі і г. д.), якія традыцыйная граматыка не ў стане "ўлавіць" пры ўнутрымоўным аналізе і якія выяўляюцца толькі праз супастаўленне дзвюх ці больш моў. Адсюль "катэгарыяльная" спецыфіка той ці іншай мовы можа быць абумоўлена некалькімі фактарамі.

1. Фактарам рознага члянення моўных элементаў унутры агульных катэгорый (агульных апазіцый). Так, **агульнай** для беларускай і польскай моў катэгорыяй з'яўляецца катэгорыя адушаўлёнасці/неадушаўлёнасці. Аднак аб'ём гэтай катэгорыі ў адзначаных мовах не супадае: у беларускай мове яна эксплікуецца ў адзіночным (назоўнікі мужчынскага роду) і множным ліках; у польскай мове — толькі ў адзіночным ліку. Несупадзенне адбываецца таксама за кошт уласна польскай катэгорыі — катэгорыі мужчынскай асобы.

2. Фактарам адсутнасці ў адной з моў катэгорыі, уласцівай якой-небудзь іншай мове, а значыць, фактарам наяўнасці ў адной з моў і адсутнасці ў другой спецыфічнай апазіцыі селекцыйных прымет [Исаченко, 1960, *45*; Гак, 1983, *19*, *23*]. Так, у польскай мове, калі яе разглядаць у беларускамоўным дачыненні, такой спецыфічнай катэгорыяй з'яўляецца катэгорыя мужчынскай асобы, "пабудаваная" на аснове бінарнай апазіцыі *+Pers. Masc. // –Pers. Masc. (+Pers. Fem.)*.

Недастатковае засваенне катэгарыяльных адрозненняў адной мовы ад другой з'яўляецца асноўнай крыніцай памылак пры вывучэнні замежных моў. Адзначаныя вышэй катэгарыяльныя адрозненні вельмі часта прыводзяць да скрытай **міжмоўнай інтэрферэнцыі**. Яна праяўляецца ў тым выпадку, калі нейкая катэгорыя замежнай мовы або адсутнічае ў роднай мове, або з'яўляецца больш шырокай/вузкай па сваім

аб'ёме, чым у роднай мове. Пры недастатковым веданні замежнай мовы спрацоўвае механізм замяшчэння "чужой" катэгорыі "сваёй" — і прывычнае значэнне пры гэтым перадаецца сродкамі роднай мовы (або сродкамі той мовы, якую чалавек ведае лепей). Вынікі такога "замяшчэння" заўважаюцца, напрыклад, у мове (яе вуснай і пісьмовай форме) студэнтаў Люблінскага універсітэта, якія вывучаюць беларускую мову і штогод прыязджаюць у БДУ на моўную практыку. У беларускай мове студэнтаў-палякаў багата элементаў роднай для іх польскай мовы (фанетычных, акцэнталагічных, словаўтваральных, лексічных, марфалагічных і сінтаксічных паланізмаў). Найбольшую цікавасць з пункту гледжання катэгарыяльнай спецыфікі ўяўляюць сінтаксічныя паланізмы. Параўн.: *(1) Дзяўчаты пайшлы ў госці; (2) Вольга і Агнешка хадзілы ў кіно,* але: *(3) Хлопцы напісалі лісты.* Апазіцыя форм *пайшлы, хадзілы // напісалі* выразна сведчыць аб сэнсавай апазіцыі, "перанесенай" у беларускі тэкст з польскай мовы. Дзеяслоўны канчатак *-у* ў сучаснай польскай літаратурнай мове з'яўляецца паказальнікам (маркерам) селекцыйнай прыметы [–Pers. Masc. Plur], а канчатак *-і* — прыметы [+Pers. Masc. Plur] (параўн.: *Kobiety przyszły — Mężczyźni przyszli*). Значыць, дзеяслоўны канчатак *-ы* ў выпадках (1) і (2) з'яўляецца ні чым іншым, як паказальнікам прыметы [–Pers. Masc. Plur] (па аналогіі з польскай мовай), што, аднак, супярэчыць граматычным нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Сінтаксічныя паланізмы найбольш выразна вылучаюцца таксама і ў мадэлях дзеяслоўнага кіравання. Параўн.: **чакаць на яго* (па аналогіі з *czekać na kogo/co*); **слухаць музыкі (słuchać czego); *вучыцца мовы (uczyć się czego); *шукаць патрэбнай кнігі (szukać czego); *пытаць аб аўтобус (pytać o co); *віншаваць брату дня нараджэння (winszować komu-czego)* і іншыя. Як бачым, і тут спрацоўвае механізм міжмоўнай інтэрферэнцыі, калі ўласна беларускія элементы ў беларускім маўленні польскіх студэнтаў "замяшчаюцца" сродкамі роднай для іх мовы.

Выпадкі беларуска-польскай міжмоўнай інтэрферэнцыі найбольш падрабязна апісаны ў працах І. Федарук [Федорук, 1986], А.К. Кіклевіча, А.А. Пацехінай [Paciechina, 1997; Кіклевіч, Пацехіна, 2000], Б. Сегеня [Сегень, 1998].

Такім чынам, услед за А.А. Рэфармацкім падкрэслім, што моўныя факты трэба браць у тых катэгорыях, у якіх яны прадстаўлены ў адпаведнай мове. Тым самым павінна праводзіцца "супастаўляльнае вывучэнне не фактаў, а катэгорый свайго і чужога" [Реформатский, 1987, *43*].

Сістэмны падыход, на думку У.І. Кананенкі, прадугледжвае таксама апісанне моўных з'яў, што знаходзяцца не толькі "ў цэнтры" моўнай

сістэмы, але і на перыферыі [Кононенко, 1980, *45*]. Зварот да маргінальных элементаў (адзінак) моўнай сістэмы асабліва важны для кантрастыўнага апісання сінтаксічных адзінак, перадусім сказаў і іх сінтаксічных мадэлей. Якраз на перыферыі сінтаксічных мадэлей (у т. зв. факультатыўных пазіцыях) у найбольшай ступені выяўляецца сінтаксічная спецыфіка той ці іншай мовы. Яна (спецыфіка) тычыцца таксама рэдкаўжывальных канструкцый і сфразеалагізаваных мадэлей [Грепль, 1967, *63*; Norman, 1998, *247*]. Так, на думку М. Грэпля, "чым больш мы спускаемся «ўніз», да больш прыватных тыпаў, тым больш разыходжанняў назіраецца паміж асобнымі славянскімі мовамі (у прадстаўленасці тыпаў і ў іх фармальным выглядзе, у функцыянальным выкарыстанні, у стылістычнай значнасці і г. д.); менавіта тут багатае поле дзейнасці для супастаўляльнага даследавання" [Грепль, 1967, *63*]. Аднак гэта не азначае, што сапраўдныя адрозненні на ўзроўні сінтаксічных мадэлей звязваюцца толькі з маргінальнымі элементамі. Свае спецыфічныя асаблівасці выяўляюцца і ў цэнтральнай (аблігаторнай) частцы сінтаксічных мадэлей [Важнік, 2000].

2.3. Прынцып комплекснасці супастаўлення. Сінтаксічныя адзінкі ўяўляюць сабой двухбаковыя структуры з узаемаабумоўленымі планам зместу і планам выражэння, паміж якімі, аднак, няма адназначнай адпаведнасці. Бінарная прырода сінтаксічных адзінак выклікае правядзенне кантрастыўнага аналізу з улікам як глыбінных, так і паверхневых структур, што вельмі часта ставіць даследчыка перад выбарам **перспектывы** (зыходнай пазіцыі, напрамку) **супастаўлення**. Супастаўляльны аналіз моўных адзінак у напрамку ад плана зместу (глыбінных структур) да плана выражэння (паверхневых структур) — т. зв. **анамасіялагічны падыход** — падаецца нам найбольш карысным пры кантрастыўным апісанні моў. У сучасных супастаўляльных даследаваннях з поспехам даказваецца, што любое кантрастыўнае апісанне моў праз паняцці "эквівалентнасць"/"неэквівалентнасць", "рысы падабенства"/"рысы адрознення", "універсальнае"/"спецыфічнае" павінна грунтавацца на значэнні (структуры зместу), г. зн. праводзіцца ў напрамку ад аналізу плана зместу да аналізу плана выражэння [Rytel-Kuc, 1991, *73*; Гак, 1989, *10*; Korytkowska, 1992, *8*, *10*; Кіклевіч, 1997, *303*; Кшешовский, 1989, *327—328*]. Інакш кажучы, пры кантрастыўным апісанні сінтаксічных сістэм славянскіх моў зручней ісці ад логіка-семантычных прапазіцый, асноўны склад якіх адзіны для славянскага моўнага свету. Прапазіцыі ў такім разе "ўтвараюць агульную базу для супастаўлення рознамоўнага матэрыялу" [Норман, 1988, *5*], з'яўляючыся своеасаблівай "кропкай адліку", (інварыянтным) эталонам супастаўлення.

Спецыфіка сучасных сінтаксічных даследаванняў у тым, што на першы план у іх выходзіць **функцыя** моўных адзінак [Грепль, 1974, *6—7*]. Супастаўленне моўных адзінак з пункту гледжання рэалізуемых/выконваемых імі функцый з'яўляецца ключавым момантам і для сучасных кантрастыўных даследаванняў. Пры гэтым даследчыкі вельмі часта адмаўляюцца ад традыцыйнай сістэмы членаў сказа, а ў сувязі з гэтым — і ад традыцыйнай апазіцыі галоўных/даданых членаў сказа, аддаючы перавагу адпаведным семантычным функцыям актантаў. Відавочна, пры правядзенні сінтаксічных даследаванняў, такім чынам, больш зручна ўлічваць не столькі дыхатамічную апазіцыю *значэнне — форма*, колькі трыхатамічную: *функцыя — значэнне — форма*, дзе другі і трэці кампаненты разглядаюцца як патэнцыяльныя ўзроўні рэалізацыі той ці іншай семантычнай функцыі (той ці іншай прапазіцыйнай структуры) у мове. Стратэгія супастаўлення пры такім "трыхатамічным" падыходзе адпавядае наступнаму алгарытму: *ад семантычнай функцыі — праз план зместу — да плана выражэння*. Улік усіх названых вышэй аспектаў у сукупнасці дазваляе назваць такі падыход **комплексным**.

2.4. Паняцце мовы-пасрэдніцы. Як паказвае вопыт кантрастыўных даследаванняў апошніх дзесяці гадоў (гл. працы В. Касэскі-Тошэвай, М. Карыткоўскай, З. Грэня, Д. Рытэль-Куц і іншых), найбольш карысным і зручным з'яўляецца супастаўленне дзвюх ці больш моў на аснове наўмысна "збудаванай" агульнай тэарэтычнай мадэлі, або на аснове т. зв. **мовы-пасрэдніцы**.

В. Касэска-Тошэва і М. Карыткоўска называюць мову-пасрэдніцу *"novum metodologiczne"* [Koseska-Toszewa, 1991, *10*; Korytkowska, 1992, *5*]. У чым жа навізна гэтага паняцця? Справа ў тым, што ў ранейшых супастаўляльных даследаваннях апісанне праводзілася ў асноўным ад мовы А да мовы В (або наадварот). Пры гэтым падкрэслівалася, што больш зручна зыходзіць з фактаў роднай, лепей вывучанай мовы, г. зн. адштурхоўвацца ад *свайго*, каб з найбольшай нагляднасцю на фоне *свайго* паказаць *чужое* для авалодання гэтым *чужым* [Исаченко, 1960, *44*; Реформатский, 1987, *51*; Конюшкевич, 1989, *16*].

Сучасная тэарэтычная кантрастыўная лінгвістыка па сутнасці адмовілася ад практыкі апісання адной мовы на фоне іншай. Сёння прынята апісваць супастаўляемыя мовы на фоне мовы-пасрэдніцы, якая ўяўляе сабой агульную тэарэтычную мадэль. Мова-пасрэдніца, такім чынам, дазваляе апісваць супастаўляемыя мовы як раўнапраўныя аб'екты. Пры гэтым выключаецца факт перавагі адной мовы над другой пры кантрастыўным аналізе [Korytkowska, 1992, *327*].

Паняцце мовы-пасрэдніцы з'яўляецца ключавой праблемай для тэа-

рэтычнай кантрастыўнай граматыкі. Сам тэрмін быў уведзены ў навуковы ўжытак Л. Сэлінкерам у 1969 г. падчас выступлення на другім Міжнародным кангрэсе па прыкладной лінгвістыцы ў Кембрыджы. Прыкладам найбольш паспяховага прымянення гэтага паняцця ў славістыцы можна лічыць тэарэтычную канфрантатыўную граматыку балгарскай і польскай моў [Косеска-Тошева, Гаргов, 1990; Koseska-Toszewa, Gargow, 1991; Korytkowska, 1992].

Як паказвае вопыт кантрастыўнага апісання балгарскай і польскай моў, для мовы-пасрэдніцы характэрны наступныя ўласцівасці.

1. Мова-пасрэдніца з'яўляецца штучным (умоўным) утварэннем. Яна выконвае ролю своеасаблівага інструмента для паралельнага (адначасовага) апісання натуральных моў. Пры гэтым апісанне ажыццяўляецца праз супастаўленне натуральных моў з мовай-пасрэдніцай, дзе апошняя па сутнасці з'яўляецца *"паміж-мовай"* (параўн. з тэрмінам *interlanguage*, прынятым у англамоўнай літаратуры [Selinker, 1972; Krzeszowski, 1976]).

2. Мова-пасрэдніца ствараецца ў выніку непасрэднага, адначасовага супастаўлення мовы А з мовай В.

3. Мова-пасрэдніца павінна мець простыя правілы, што, у сваю чаргу, залежыць ад тэорыі, якая ляжыць у аснове адпаведнай тэарэтычнай мадэлі [Koseska-Toszewa, 1991, *11—12*; Косеска-Тошева, Гаргов, 1990, *5—6*; Rytel-Kuc, 1991a, *239*].

Па назіраннях А.К. Кіклевіча, на практыцы мова-пасрэдніца зводзіцца, як правіла, да той ці іншай версіі *лагічнай семантыкі*. За аснову бяруцца таксама і некаторыя прынцыпы моўнага апісання, прынятыя ў *семантычным сінтаксісе* [Киклевич, 1995, *110—111*; 1996, *107, 111*]. Па словах В. Касэскі-Тошэвай, у тэарэтыка-метадалагічную аснову мовы-пасрэдніцы ў "Канфрантатыўнай балгарска-польскай граматыцы" легла т. зв. *сітуацыйная семантыка* Дж. Бэрвіса і Дж. Перы, *тэорыя азначальнай дэскрыпцыі* Б. Расэла і Х. Рэйхэнбаха, а таксама *тэорыя логікі прэдыкатаў першага парадку* [Koseska-Toszewa, 1991, *12*]. Сітуацыйная семантыка сёння звязваецца перш за ўсё з імёнамі Дж. Бэрвіса і Дж. Перы, хоць многія ідэі ўзыходзяць да Л. Вітгенштэйна. Аднак да гонару польскай навукі заўважым, што ключавыя палажэнні лагічнай семантыкі, якія трохі пазней склалі ядро лінгвістычнай тэорыі рэферэнцыі, распрацоўваліся ў рэчышчы польскай логікі, матэматыкі, філасофіі і семіётыкі незалежна ад Дж. Бэрвіса і Дж. Перы (гл. працы Я. Лукасевіча, Т. Катарбіньскага, К. Айдукевіча, С. Лесьнеўскага, А. Тарскага, Я. Пэльца і іншых).

Сітуацыйная семантыка прадвызначыла, па сутнасці, і кола найваж-

нейшых паняццяў, на якіх базуецца сама мова-пасрэдніца. Такімі ключавымі паняццямі з'яўляюцца *паняцці сітуацыі, прапазіцыі, прэдыката і прэдыкатара, прэдыкатна-аргументнай структуры* і некаторыя іншыя. Так, напрыклад, апісанне ў працы М. Карыткоўскай [1992] адбываецца згодна з палажэннем, адносна якога *прэдыкат* на семантычным узроўні і *прэдыкатар* — на сінтаксічным узроўні прадвызначаюць структуру той ці іншай сінтаксічнай канструкцыі. Прэдыкат уплывае на характар семантычнай структуры, а прэдыкатар, з'яўляючыся ядром сказа, — прадвызначае яго фармальную структуру. Пры гэтым семантычная (прэдыкатна-аргументная) структура сказа павінна быць непасрэдна звязана з канкрэтнай пазамоўнай сітуацыяй.

Адзінкай кантрастыўнага апісання сінтаксічных сістэм беларускай і польскай моў прапануем лічыць **дзеяслоўную дыстрыбуцыйную мадэль (ДДМ)**, якая ў нашай канцэпцыі выконвае ролю своеасаблівай мовы-пасрэдніцы — агульнай тэарэтычнай мадэлі супастаўлення [Важнік, 2000а; 2000б; 2000в].

Якраз на фоне ДДМ, праз яе пасрэдніцтва і адбываецца супастаўленне дыстрыбуцыйных формул беларускіх і польскіх дзеяслоўных прэдыкатаў. Пры гэтым мы не выключаем магчымай праекцыі адной мовы на другую. Такім чынам, ДДМ з'яўляецца рэлевантнай не толькі для "ўнутранага" апісання сінтаксічных уласцівасцей дзеясловаў у адной з моў. Яна можа выкарыстоўвацца і ў кантрастатыўным плане, калі праз паўзроўневае супастаўленне дыстрыбуцыйных формул польскага і беларускага дзеясловаў, якія ўтвараюць **кантрастыўную пару,** адзначаюцца рысы падабенства/адрознення на чатырох узроўнях супастаўлення: логіка-семантычным (прапазіцыйным), катэгарыяльна-семантычным, фармальна-сінтаксічным і лексічным. Пры гэтым адна формула нібы "накладваецца" на другую. Так, напрыклад, супаставім дыстрыбуцыйныя формулы польскага дзеяслова *czytać* і яго беларускага адпаведніка *чытаць*:

czytać			
1.1	1.2	2.1	2.2
Ag	[+Pers]	N_{nom}	*Jan*
Pred	Інтэлектуальная дзейн.	V_f	*czyta*
Pat	[–Anim]	N_{acc}	*książkę* *list* *gazetę*
(Ben)	[+Pers]	N_{dat}	*dziecku* *Marii*
(Comit)	[+Pers]	z N_{instr}	*z Kasią*
(Loc)	[–-Anim]	w N_{loc}	*w czytelni*

Чытаць			
1.1	1.2	2.1	2.2
Ag	[+Pers]	N_{nom}	*Ян*
Pred	Інтэлектуальная дзейн.	V_f	*чытае*
Pat	[–Anim]	N_{acc}	*кнігу* *ліст* *газету*
(Ben)	[+Pers]	N_{dat}	*дзіцяці* *Марыі*
(Comit)	[+Pers]	з N_{instr}	*з Кацяй*
(Loc)	[–Anim]	в N_{loc}	*у чытальні*

Як бачым, на ўсіх чатырох узроўнях супастаўлення назіраецца супадзенне дыстрыбуцыйных формул беларускага і польскага дзеясловаў.

2.5. Прынцып аднапарадкавасці супастаўлення. Лагічным працягам сістэмнага падыходу з'яўляецца прынцып аднапарадкаванасці супастаўлення, згодна з якім супастаўляцца павінны аднапарадкавыя з'явы, бо толькі ў гэтым выпадку можна дакладна вызначыць ступень падабенства/адрознення пэўных з'яў у розных мовах.

У самым агульным сэнсе **крытэрыем супастаўляльнасці** служыць **эквівалентнасць** моўных з'яў [Krzeszowski, 1967, *37*; Хельбиг, 1989, *315*; параўн.: Конюшкевич, 1989, *7*]. Інакш кажучы, супастаўляцца могуць тыя моўныя з'явы, якія ў дзвюх мовах з'яўляюцца **эквівалентнымі**.

Праблема эквівалентнасці вырашаецца ў спецыяльнай літаратуры дастаткова проста. Факт эквівалентнасці вызначаецца праз перакладальнасць: эквівалентнымі лічацца канструкцыі, якія могуць узаемна перакладацца [Хельбиг, 1989, *315*; КшешовскийЯ, 1989, *327*; параўн.: Конюшкевич, 1989, *14—15*]. Перакладальнасць, такім чынам, з'яўляецца своеасаблівым тэстам для вызначэння эквівалентнасці, а значыць, і супастаўляльнасці адпаведных моўных з'яў.

Як паказваюць даследаванні Л.У. Шчэрбы, А.Р. Гака, В. Дарашэўскага, А.А. Уфімцавай і некаторых іншых, няма абсалютна тоесных паняццяў у розных мовах, а значыць, і пераклад (сутнасць якога ў пераўтварэнні выказвання адной мовы ў моўную структуру другой пры абавязковым захаванні норм і правілаў гэтай мовы [Сопост. изуч. грамматики, 1983, *6*]) ніколі не бывае дакладным ці цалкам адэкватным [Щерба, 1958, *49*; Doroszewski, 1982, *136—137*]. Так, напрыклад, няма поўнай перакладальнасці ў выпадку: польск. *śmiać się do kogoś* — беларус. *усміхацца да каго-небудзь (*смяяцца да каго-небудзь)*. Відавочна, дзеясловы *śmiać się* і *ўсміхацца* адрозніваюцца сваёй семантыкай,

таму ў прыведзеным выпадку мы вымушаны канстатаваць не ўласна **семантычную эквівалентнасць**, а хутчэй **эквівалентнасць функцыянальна-семантычную**.

Выпадкі няпоўнай перакладальнасці В. Дарашэўскі звязвае з ідыяматычнасцю моў. Аналізуючы рускія канструкцыі тыпу *дремучий лес, серый волк*, вучоны прыходзіць да высновы, што іх польскія "літаральныя адпаведнікі" *(lasy zadrzemane, szary wilk)*, заснаваныя на тым жа метафарычным матыве, не выклікаюць, аднак, такога ж стылістычнага эфекту, гучаць блякла, невыразна і нелагічна, бо не маюць за сабой адпаведнай культурнай традыцыі ("традыцыі асяроддзя"). Яны не выклікаюць агульных перажыванняў (рэакцый), звязаных з аднолькавымі пунктамі пазамоўнага аднясення, а значыць, перадаюць розны вопыт пазнання пазамоўнай рэчаіснасці. Так, семантыка рускага спалучэння *серый волк* непарыўна звязана з кантэкстам, з культурным фонам народнай казкі, чым абумоўлена яго выразнасць і вобразнасць, чаго нельга зазначыць у дачыненні да польскага адпаведніка *(?) szary wilk* [Doroszewski, 1982, *136—137*, *144—145*]. Відавочна, ідыяматычнасць той ці іншай мовы выяўляецца не толькі на ўзроўні яўна выражанай фармальнай дыстрыбуцыі пэўнай моўнай адзінкі: праз яе непасрэднае акружэнне. Ідыяматычнасць выяўляецца таксама праз вертыкальны (культурна-гістарычны) кантэкст, г. зн. праз гісторыка-культурнае акружэнне пэўнай адзінкі. Яе ўжыванне (функцыянаванне) звязваецца пры гэтым з адпаведнай культурнай традыцыяй, з адпаведнай гістарычнай эпохай. Толькі так можна патлумачыць розніцу паміж руск. *добрый молодец* (легендарны герой рускіх былін) і польск. *dobrzy chłopcy* (назва разбойнікаў у гуральскіх паданнях).

Даследчыкі прыводзяць часам і факты **неперакладальнасці**. У якасці прыкладаў "неперакладальных" канструкцый часцей за ўсё называюцца фразеалагізмы [Doroszewski, 1982, *142*], а таксама канструкцыі тыпу *невыездной писатель, закрытые города, тринадцатая зарплата, книга памяти, "гуманитарное" мясо, "хлебный" бум, "мусорная" мафия, "колбасная" драма* і іншыя [Чумак, 1994, *13*; Чумак, 1997, *45—49*], якія вельмі часта маюць аказіянальны характар і ўяўляюць сабой сінтаксічныя кампрэсівы. Як зазначае Л.М. Чумак, гэта ўсё выпадкі т. зв. "сацыякультурнай спалучальнасці", якія адлюстроўваюць спецыфіку сацыяльнага і нацыянальна-культурнага жыцця таго ці іншага нацыянальна-моўнага калектыва.

Роля сінтаксісу як культурна маркіраванага моўнага ўзроўню, на якім найбольш поўна адлюстроўваецца культура таго ці іншага народа, досыць падрабязна апісваецца ў працах Л.М. Чумак [Чумак, 1994, 1997,

2000]. Паводле Л.М. Чумак, адзначаныя вышэй прыклады ўяўляюць сабой якраз той самы выпадак, калі "нацыянальна-культурны кампанент" рэалізуецца і на сінтаксічным узроўні: "адлюстроўваюцца тыя своеасаблівыя спосабы спалучэння паняццяў, якія характэрны для носьбітаў адпаведнай мовы і культуры ў канкрэтны перыяд іх гістарычнага развіцця, што фарміруе ў шэрагу выпадкаў іх безэквівалентны, неперакладальны … характар" [Чумак, 1994, *13*].

Важна вызначыць таксама дакладныя **параметры эквівалентнасці**. Маюцца на ўвазе канкрэтныя тыпы міжмоўнай эквівалентнасці. Найбольш поўная тыпалогія міжмоўных эквівалентаў прадстаўлена ў працы М.І. Канюшкевіч [1989, *17—24*]. Базуючыся на канцэпцыі В. Барнета [Барнет, 1983], М.І. Канюшкевіч вылучае сістэмныя, функцыянальныя, стылістычныя, семантычныя, камунікатыўныя, узуальныя і сітуацыйныя эквіваленты. Іх улік у кантрастыўных даследаваннях дазваляе больш дакладна вызначаць факты тоеснасці, падабенства і адрознення супастаўляемых моў. Так, **тоеснымі** М.І. Канюшкевіч называе такія моўныя адзінкі, што супадаюць паводле чатырох асноўных параметраў эквівалентнасці — фармальнага, семантычнага, стылістычнага і функцыянальнага. Несупадзенне ж адзінак хаця б па адным з названых параметраў дазваляе казаць толькі пра **падабенствы** адпаведных моўных адзінак.

Стала ўжо традыцыяй вылучаць два асноўныя тыпы сінтаксічных адпаведнасцей. У розных аўтарскіх канцэпцыях яны называюцца парознаму: **адпаведнасць тоеснасці/адпаведнасць адрознення** [Ломтев, 1958, *3*]; **універсальнае/спецыфічнае** [Норман, 1988]; **ізамарфізм** (падабенства)/**аламарфізм** (разыходжанне) [Гак, 1983, *27*]. На думку М.І. Канюшкевіч, бінарная градацыя міжмоўных адпаведнасцей з'яўляецца занадта агульнай. Пры супастаўленні блізкароднасных сістэм патрэбна больш дыферэнцыраваная, больш дробная шкала міжмоўных адпаведнасцей, якая б улічвала і малапрыметныя адпаведнасці на мяжы паўпадабенстваў/паўадрозненняў [Конюшкевич, 1989, *25—26*]. Такую "шкалу" ўвёў у навуковы ўжытак вядомы фінскі лінгвіст А. Мустайокі [Mustajoki, 1983, *177*]. Ён вылучыў тры асноўныя разнавіднасці сінтаксічных адпаведнасцей:

і-адпаведнасці (або *адпаведнасці тоеснасці*), якія тычацца тых рэдкіх выпадкаў, калі пры супастаўленні моўныя адзінкі супадаюць па ўсіх параметрах супастаўлення (фармальных, семантычных, стылістычных, функцыянальных і некаторых іншых);

але-адпаведнасці (або *адрозненні*), пра якія ідзе гаворка тады, калі адпаведны моўны факт ёсць толькі ў мове А, але адсутнічае ў мове В.

а-адпаведнасці (або *падабенствы*) — найбольш шматлікая група міжмоўных адпаведнасцей: адпаведны моўны факт фіксуецца як у мове А, так і ў мове В пры нязначных (мінімальных) адрозненнях на адпаведным узроўні супастаўлення. (Аналагічнай тыпалогіі прытрымліваецца і М.І. Канюшкевіч [1989, *2б*].)

Кантрастыўнае даследаванне дыстрыбуцыйных уласцівасцей дзеясловаў мае сваю спецыфіку. Цяжка максімальна поўна апісаць дыстрыбуцыю дзеясловаў, прымаючы ў разлік толькі два ці тры тыпы міжмоўных адпаведнасцей. Патрэбна яшчэ больш дробная шкала для "вымярэння" міжмоўных падабенстваў/адрозненняў.

Як паказвае наш уласны вопыт супастаўлення ДДМ беларускіх і польскіх дзеясловаў [Важнік, 2000а, 2000б, 2000в], больш зручна зыходзіць з традыцыйнай бінарнай сістэмы міжмоўных адпаведнасцей (тоеснасць/нятоеснасць (адрозненне)), прапанаванай Ц.П. Ломцевым [Ломтев, 1958], але прымяняючы гэтую сістэму на **кожным канкрэтным узроўні супастаўлення**.

Параметрамі супастаўлення прапануем лічыць усе тыя ўзроўні, што былі вылучаны ў структуры ДДМ, а іменна логіка-семантычны (прапазіцыйны), катэгарыяльна-семантычны, фармальна-сінтаксічны і лексічны. Пры гэтым на кожным з чатырох названых узроўняў супастаўлення будзем зыходзіць з бінарнай сістэмы міжмоўных адпаведнасцей, вылучаючы **тоесныя** (цалкам падобныя, ізаморфныя) і **нятоесныя** (адрозныя, аламорфныя) элементы.

Згодна з асноўнай мэтай супастаўляльных даследаванняў, сфармуляванай А.А. Рэфармацкім, асноўная ўвага павінна надавацца адрозненням, бо толькі на аснове відавочных адрозненняў можна казаць пра нацыянальную спецыфіку кожнай з супастаўляемых моў. Пры ўмове абавязковага ўліку **тоеснасці/нятоеснасці** дыстрыбуцыі дзеясловаў адной кантрастыўнай пары на ўсіх узроўнях супастаўлення ў комплексе відавочна вылучэнне наступных тыпаў кантрастыўных адносін на ўзроўні ДДМ. Усе яны могуць быць зведзены ў адну табліцу, якая, па сутнасці, уяўляе сабой матрычную класіфікацыйную сетку (знак " + " абазначае тоеснасць ДДМ дзеясловаў адной кантрастыўнай пары на адпаведным узроўні супастаўлення; знак "–" — нятоеснасць).

Матрычная класіфікацыйная сетка ўтрымлівае шаснаццаць **тэарэтычна** магчымых тыпаў кантрастыўных адносін на ўзроўні чатырохузроўневых ДДМ. Усе разам яны складаюць своеасаблівую тыпалогію сінтаксічных адрозненняў:

		план зместу		план выражэння	
		1.1 логіка-семантычны ўзров.	1.2 катэгарыяльна-семантычны ўзровень	2.1 фармальна-сінтаксічны ўзровень	2.2 лексічны ўзровень
A. Тоеснасць ДДМ на ўсіх узроўнях супастаўлення	1	+	+	+	+
B. Нятоеснасць ДДМ на адным узроўні супастаўлення	2	+	+	+	–
	3	+	+	–	+
	4	+	–	+	+
	5	–	+	+	+
C. Нятоеснасць ДДМ на двух узроўнях супастаўлення	6	+	+	–	–
	7	–	–	+	+
	8	+	–	+	–
	9	–	+	–	+
	10	–	+	+	–
	11	+	–	–	+
D. Нятоеснасць ДДМ на трох узроўнях супастаўлення	12	+	–	–	–
	13	–	–	–	+
	14	–	–	+	–
	15	–	+	–	–
E. Нятоеснасць ДДМ на чатырох узроўнях супаст	16	–	–	–	–

Відавочна, не ўсе з шаснаццаці тэарэтычна магчымых тыпаў сінтаксічных адносін пацвердзяцца на канкрэтным моўным матэрыяле. Толькі кантрастыўны аналіз ДДМ канкрэтных дзеяслоўных прэдыкатаў дазволіць нам высветліць, якія з названых тыпаў атрымаюць рэалізацыю ў супастаўляемых мовах, а якія — не.

Вызначым асноўныя параметры эквівалентнасці для дадзенай працы. Улічваючы спецыфіку дадзенага даследавання, сфармулюем праблему эквівалентнасці наступным чынам: якія дзеяслоўныя дыстрыбуцыйныя мадэлі можна лічыць **эквівалентнымі**, а якія варта прызнаць **неэквівалентнымі**. **Эквівалентнымі** ДДМ услед за Т. Кшэшоўскім будзем лічыць такія мадэлі, якія маюць "ідэнтычныя глыбінныя структуры, нават калі іх паверхневыя структуры моцна адрозніваюцца адна ад другой" [Кшешовский, 1989, *328*]. Пры гэтым заўважым, што ў прэдыкатную пазіцыю **эквівалентных мадэлей** могуць уваходзіць: а) дзесловы, якія з'яўляюцца **семантычнымі эквівалентамі (СЭ)**, а значыць, маюць тоеснае лексічнае значэнне (параўн.: беларуск. *чытаць* і польск. *czytać*; б) дзеясловы, якія з'яўляюцца **функцыянальна-семантычнымі эквівалентамі (ФСЭ)**, г. зн. маюць не тоеснае, а блізкае лексічнае значэнне, што дазваляе ім функцыянальна замяшчаць адпаведную прэдыят-

ную пазіцыю ў эквівалентнай ДДМ. Параўн.: польск. *śmiać się do kogoś ('wyrażać swoją sympatię do kogoś za pomocą śmiechu')*: *Nie* ***śmiałam się*** *z ciebie, tylko* ***do ciebie***; *On* ***śmieje się do*** *swego* ***odbicia***, дзе *śmiać się* — прэдыкат адносін з дадатнай ацэнкай. Беларускі дзеяслоў *смяяцца* не можа лічыцца эквівалентным да польскага *śmiać się*, ужытага ў адпаведным значэнні. Прэдыкат *смяяцца* выступае ў беларускай мове або (1) як прэдыкат праяўлення пэўнага эмацыянальнага стану, напрыклад, весялосці, радасці (*Унь пяе,* ***смяецца з радасці*** *народ* (З. Бядуля)), або (2) як прэдыкат адносін з адмоўнай ацэнкай (***З другой смяецца***, *а самой і блін не ўдаецца* (народн.)). Значэнне прэдыката адносін з дадатнай ацэнкай беларускаму дзеяслову не ўласціва (**смяяцца да каго*) [Важнік, 2000, *17*]. Гэты факт дазваляе лічыць, што паняційны аб'ём польскага дзеяслова больш шырокі: польскі дзеяслоў "апісвае" на адну пазамоўную сітуацыю больш, чым яго беларускі аднакарэнны адпаведнік. Беларускім эквівалентам да польскага *śmiać się* ў выпадку *śmiać się do kogoś* будзе дзеяслоў (ФСЭ) *усміхацца*, здольны ў прэдыкатнай пазіцыі эквівалентнай ДДМ рэалізаваць тыповае значэнне прэдыката адносін з дадатнай ацэнкай. Параўн.: *усміхацца* 'усмешкай выражаць свае адносіны да каго-, чаго-небудзь' (*[Зося]* ***ўсміхалася Галене*** *і з замілаваннем глядзела, як тая вітаецца з бацькам яе* (Чорны)) [ТСБМ].

Адпаведна, **неэквівалентныя ДДМ** маюць нятоесныя глыбінныя структуры. Перадусім маюцца на ўвазе адрозненні на ўзроўні (1.1) ДДМ. Неэквівалентнасць як кантрастыўная характарыстыка ДДМ можа быць абумоўлена не толькі **дэнататыўнымі** прычынымі (адсутнасцю ў пазамоўнай рэчасінасці тых ці іншых рэалій), але і **сігніфікатыўнымі** (спецыфікай успрымання свету носьбітам той ці іншай мовы) [Норман, 1994, *75*].

Спецыфічны "вопыт" успрымання пазамоўнай рэчаіснасці, накоплены той ці іншай мовай за ўсю гісторыю, выяўляецца ў прапазіцыйнай нятоеснасці ДДМ: у квантытатыўных (колькасных) і/або якасных характарыстыках прапазіцыйных структур. Адсюль тыпалогія неэквівалентных ДДМ будзе наступнай.

1. Квантытатыўная неэквівалентнасць абумоўлена адрознай колькасцю (аблігаторных) актантных пазіцый, імплікаваных праз прэдыкаты адной кантрастыўнай пары; аблігаторны/факультатыўны характар гэтых пазіцый. Так, напрыклад, польскі дзеяслоў *głaskać* адкрывае месцы для трох актантаў: *Ag—Pa—(Body Part/Loc): Ona głaskała* ***go (po rękach)***. Яго беларускія адпаведнікі *гладзіць/лашчыць* — толькі для двух: *Ag—Pat: Яна гладзіла/лашчыла (яго) рукі,* дзе слова *яго* адносіцца да валентнасці слова *рукі*.

2. Функцыянальна-семантычная неэквівалентнасць звязана з якасна рознай камбінацыяй актантаў у ДДМ дзеясловаў, што з'яўляюцца семантычнымі эквівалентамі і ўтвараюць адну кантрастыўную пару. Так, для польскіх дзеясловаў змянення становішча тыпу *siadać, usiąść, położyć się, wylądować, położyć* itd. характэрны прапазіцыйныя структуры з лакатыўным "пашыральнікам", што пацвярджаюць наступныя прыклады: — *Kto następny? — pyta fryzjer i już kolejny klient* ***siada na fotelu****; Maria* ***położyła*** *dłoń* ***na ustach****; Jan* ***położył się na łóżku****; Okazja trafiła się, gdy któregoś dnia kotlet* ***wylądował*** *mu* ***na spodniach*** *(Na żywo)* itd. Іх беларускія адпаведнікі замест *Loc* будуць мець у адпаведнай пазіцыі семантычную функцыю *Dir* (або *Obj*): *легчы на ложак, сесці на крэсла, пакласці руку на плячо* і г. д.

3. **Гіперфункцыянальная неэквівалентнасць:** працэс стварэння спецыфічных "мысленчых узораў" (адрозных прапазіцый) прынята звязваць у сучасным мовазнаўстве са з'явай **нейтралізацыі семантычных функцый**, што назіраецца звычайна на перыферыі сінтаксічных адзінак. Так, "апісанне такіх своеасаблівых «гіперфункцый» тыпу «суб'ект/адрасат» ці «аб'ект/лакатыў» складае найбольш важную перадумову для вывучэння спецыфікі сінтаксічных сістэм славянскіх моў". Параўн. руск.: *Пахнет розами; Стену пробило* ***пулей*** *(Sub/Instr/Caus);* славацк.: ***Ruže*** *vohaju; Stenu prerazila* ***gul'ka*** *(Sub)* [Норман, 1998, *16—17*; Norman, 1998]. З'ява нейтралізацыі семантычных функцый як найважнейшая перадумова неэквівалентнасці ДДМ выяўляецца і пры кантрастыўным апісанні беларускага і польскага матэрыялу. Супаставім ДДМ польскага дзеяслова *rzucać (rzucić)* і яго беларускага адпаведніка *кідаць (кінуць)*:

rzucić				
1.1	**Ag**	**Pred**	**Pat**	**Instr**
1.2	[+Pers]	Фізічная дзейнасць	[±Anim]	[–Anim]
2.1	N_{nom}	V_f	w N_{acc}	N_{instr}
2.2	*Jan*	*Rzucił*	*w szybę* *w psa* *w Piotra*	*Kamieniem* *piłką* *gałęzią*
Кінуць				
1.1	**Ag**	**Pred**	**Pat**	**Pat/Itstr**
1.2	[+Pers]	Фізічная дзейнасць	[±Anim]	[–Anim]
2.1	N_{nom}	V_f	у N_{acc}	N_{acc}
2.2	*Ян*	*Кінуў*	*у шыбу* *у сабаку* *у Пятра*	*Камень* *мяч* *кій*

Як бачым, у польскай мадэлі форма N_{instr} выражае ўласна семантычную функцыю *Instr*. У беларускай ДДМ імя ў форме N_{acc} з'яўляецца выразнікам гіперфункцыі *"пацыенс/інструмент"*. Польскі дзеяслоўны прэдыкат можа ўтвараць, аднак, і яшчэ адну прэдыкатна-актантную структуру [Kawka, 1980, *173—174*]:

1.1	**Ag**	**Pred**	**Pat**	**(Instr)**	**(Loc/Dir)**
1.2	[+Pers]	Фізічная дзейн.	[–Anim]	[–Anim]	[±Anim]
2.1	N_{nom}	V_f	N_{acc}	N_{instr}	Do N_{gen} Na N_{acc}
2.2	*Jan*	*rzucił*	*kamień* *piłkę* *ziemniaki*	*Łopatą* *widłami*	*do ogrodu* *na balkon* *do Piotra*

Прынцып аднапарадкавасці супастаўлення прадугледжвае ўлік яшчэ аднаго вельмі важнага аспекта. На думку М.І. Канюшкевіч, адной з перадумоў паспяховага супастаўлення тых ці іншых моў з'яўляецца наяўнасць папярэдніх апісанняў супастаўляемых моў, выкананых з агульных ці блізкіх тэарэтыка-метадалагічных пазіцый [Конюшкевич, 1989, *7—8*]. У выпадку кантрастыўнага апісання беларускага і польскага сінтаксісу гэтае "патрабаванне" М.І. Канюшкевіч фактычна з'яўляецца нездзяйсняльным. Беларуская сінтакталогія і польская сінтакталогія — гэта па сутнасці два палярныя, дыяметральна процілеглыя падыходы да сінтаксічных даследаванняў, дзве розныя навуковыя школы, якія адрозніваюцца перадусім перспектывай лінгвістычнага аналізу. Так, паводле традыцыйнага беларускага сінтаксісу, семантычны кампанент у адносінах да паверхнева-сінтаксічнага (фармальнага) мае другасны, інтэрпрэтацыйны характар. У польскім сінтаксісе прынята адваротная іерархія: ад глыбінна-сінтаксічных структур да іх рэалізацыі на паверхнева-сінтаксічным узроўні. Такі падыход не выпадковы для паланістыкі, хутчэй — заканамернасць. Важнейшай сферай польскай граматыкі доўгі час быў і застаецца план зместу мовы, а ў сувязі з гэтым — распрацоўка менавіта семантычных праблем. Найбольш паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца "Граматыка сучаснай польскай мовы" [Gramatyka/Składnia, 1984, Gramatyka/Morfologia, 1984], напісаная ў рэчышчы функцыянальнай граматыкі. Заўважым пры гэтым, што **функцыяналізм** заўсёды адрозніваў польскую лінгвістычную традыцыю. "Граматыка"-84 ва многіх адносінах "прадвызначыла шляхі развіцця граматычнай думкі ў польскай лінгвістыцы канца XX ст., стварыла тэарэтычныя перадумовы для ўдакладнення шэрагу дэфініцый, канкрэтызацыі тэарэтычных палажэнняў, пастаноўкі новых праблем" [Киклевич, 1996, *83—89*].

Нягледзячы на адзначаныя вышэй відавочныя адрозненні паміж беларускай і польскай сінтаксічнымі навукамі, варта, тым не менш, падкрэсліць: стан распрацаванасці беларускага і польскага сінтаксісу дастатковы, каб праводзіць кантрастыўныя даследаванні накшталт нашага. Тэарэтыка-метадалагічная і метадычная база для супастаўлення ў пэўнай ступені падрыхтавана як у паланістыцы, так і ў беларусістыцы. Тым больш, што супастаўляльныя даследаванні сінтаксічных сістэм беларускай і польскай моў, як гэта ні дзіўна, раней не праводзіліся. Яны толькі пачынаюцца. І, відаць, знамянальна, што пачынаюцца якраз у рэчышчы семантычнага сінтаксісу і функцыянальнай граматыкі.

ЛІТАРАТУРА

Daneš F. K systematickému syntaktickému popisu slovanských jazyku // SS. 1965. № 26. S. 112–118.

Doroszewski W. O idiomatyczności języków // Doroszewski W. Język. Myślenie. Działanie / Rozważania językoznawcy. Warszawa, 1982. S. 130—148.

Fisiak J. Kilka uwag o kontrastywnej analizie // BPTJ. 1981. № 38. S. 71—79.

Gramatyka współczesnego języka polskiego / Składnia. Warszawa, 1984.

Gramatyka współczesnego języka polskiego / Morfologia. Warszawa, 1984.

Grzesiak R., Jędrzejko E. Walencja czasownika jako problem leksykograficzny (Na przykładzie "Słownika syntaktyczno-generatywnego czasowników polskich" pod red. K Polańskiego) // Walencja czasownika a problemy leksykografii dwujęzycznej. Wrocław, 1991. S. 107—115.

Kawka M. Słownik syntaktyczno-semantyczny czasownikyw polskich / Czasowniki bezprzedrostkowe. Kraków, 1980.

Kiklewicz A. Konfrontatywne stosunki polsko-wschodniosłowiańskie w zakresie semantyki logicznej // Białostocki przegląd kresowy / Kontakty językowe pogranicza kultur narodowych, 1995. T. 3. S. 83–95.

Korytkowska M. Gramatyka konfrontatywna bułgarsko-polska / Typy pozycji predykatowo-argumentowych / Pod red. V. Koseski-Toszewej i I. Penčewa, Warszawa, 1992. T. 5. Cz.1.

Korytkowska M. Gramatyka konfrontatywna bułgarsko-polska / Typy pozycji predykatowo-argumentowych / Pod red. V. Koseski-Toszewej i I. Penčewa, Warszawa, 1992. T. 5. Cz.1.

Korytkowska M. Problemy konfrontatywnego opisu czasowników bułgarskich i polskich na płaszczyźnie semantycznej i syntaktycznej // Prace Slawistyczne / Problemy teoretyczno-metodologiczne badań konfrontatywnych języków słowiańskich. 1991. № 89. S. 79—89.

Koseska-Toszewa V. Contrastive (confrontative) linguistics and typology // XII Międzynarodowy Kongres Slawistów / Streszczenia referatów i komunikatów / Językoznawstwo. Warszawa, 1998. S. 327—328.

Koseska-Toszewa V. O języku-pośredniku i badaniach konfrontatywnych // Prace Slawistyczne / Problemy teoretyczno-metodologiczne badań konfrontatywnych języków słowiańskich. 1991. № 89. S. 7—19.

Koseska-Toszewa V., Gargow G. The Semantic Category of Definitess / Indefinitessin Bulgarian and Polich. Warszawa, 1991.

Krzeszowski T.P. Fundamental principles of structural contrastive studies // Glottodidactica. 1967. № 2. S. 33—39.

Krzeszowski T.P. Interlanguage and contrastive generative grammar // Interlanguage studies bulletin, 1976. T 1. S. 58—78.

Mustajoki A. Systematic differences in government of verbs between Russian and Finnish // IX Международный съезд славистов / Резюме докладов и письменных сообщений. М., 1983. С. 177.

Norman B. O specyficznych schematach składniowych w języku polskim i rosyjskim // Kieleckie Studia Rusycystyczne, 1998, T. 8. S. 245—250.

Paciechina A. Projekt dystrybutywnego słownika polsko-białoruskiego // Język polski w kraju i za granicą / Materiały Międzynarodowej konferencji naukowej polonistów. W., 1997, T. 2. S. 116—119.

Rytel-Kuc D. Projekt czesko-polskiego słownika walencyjnego czasowników / Założenia opisu semantycznego // Walencja czasownika a problemy leksykografii dwujęzycznej. Wrocław, 1991. S. 67—75.

Rytel-Kuc D. Teoria i metodologia badań konfrontatywnych języków słowiańskich // SFPS. 1991a. № 29. S. 239—242.

Selinker L. Interlanguage // Iral, London, 1972. Vol. 10. № 3. S. 209—231.

XII Międzynarodowy Kongres Slawistów (Kraków, 27. VIII-2.IX 1998) / Streszczenia referatów i komunikatów / Językoznawstwo / Opracowanie J. Rusek, J. Siatkowski, Z. Rusek. Warszawa, 1998.

Zabrocki L. Uwagi o problemach spornych gramatyki kontrastywnej (konfrontatywnej) // Lingua Posnaniensis, 1970. XIX. S. 2—23.

Андерш Й.Ф. Типологія простих дієслівних речень у чеській мові в зіставленні з українською. Київ, 1987.

Барнет В. К проблеме языковой эквивалентности при сравнении // Сопоставительное изучение грамматики и лексики русского языка с чешским и другими славянскими языками / Под ред. А.Г. Широковой и Вл. Грабье. М., 1983. С. 9—29.

Борковский В.И. Синтаксис сказок / Русско-белорусские параллели. М., 1981.

Будагов Р.А. К теории сходств и различий в грамматике близкородственных языков // ВЯ. 1980. № 4. С. 3—20.

Важнік С.А. Транзітыўная мадэль як паказальнік безэквівалентнасці сінтаксісу беларускай мовы (пры супастаўленні з польскай мовай) // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. № 4. 2000. № 1. С. 43—47.

Важнік С.А. Кантрастыўная тыпалогія дзеяслоўных мадэлей (беларуска-польскія паралелі) // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія / Матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Віцебск, 2000а. С. 16—17.

Важнік С.А. Методыка кантрастыўнага апісання беларускага і польскага дзеясловаў (вопыт супастаўляльна-дыстрыбуцыйнага аналізу) // Язык, слово, действительность / Материалы II Международной научной конференции. Мн., 2000. Ч. 1. С. 45—47.

Важнік С.А. Кангруэнтнасць, эквівалентнасць, неэквівалентнасць і безэквівалентнасць як кантрастыўныя характарыстыкі дзеяслоўных мадэлей // Мова ў святле класічнай спадчыны і сучасных парадыгм / Тэзісы дакладаў VIII Міжнародных Карскіх чытанняў. Гродна, 2000а. С. 71—74.

Важнік С.А. Дзеяслоўная мадэль і паэтычная метафара // Беларуская лінгвістыка, 2001. Вып. 50. С. 25—31.

Вольнич-Павловска Э. Вокруг проблемы сравнительного описания близкородственных языков // XII Międzynarodowy Kongres Slawistów / Streszczenia referatów i komunikatów / Językoznawstwo. Warszawa, 1998. S. 184.

Гак В.Г. О контрастивной лингвистике // Новое в зарубежной лингвистике / Контрастивная лингвистика. М., 1989. С. 5—17.

Гак В.Г. Сравнительная типология французского и русского языков. М., 1983.

Гаспаров Б., Сигалов П. Сравнительная грамматика славянских языков: В 2 ч. Тарту, 1974.

Грепль М. Из теоретического опыта описания синтаксической системы // Грамматическое описание славянских языков / Концепции и методы. М., 1974. С. 3—8.

Грепль М. К сущности типов предложений в славянских языках // ВЯ. 1967. № 5. С. 60—68.

Гумбольдт В. О различии строения человеческих языков и его влияние на духовное развитие человечества // Гумбольдт В. Избранные труды по языкознанию. М., 1984. С. 37—298.

Исаченко А. Опыт типологического анализа славянских языков // Новое в лингвистике. М., 1963. Вып. 3. С. 106—121.

Исаченко А.В. Грамматический строй русского языка в сопоставлении с словацким / Морфология. Братислава, 1960. Ч. I.

Киклевич А. (рец.) Косеска-Тошева В., Гаргов Г. Българско-полска съпоставителна грамматика. Т. 2. Семантичната категория определеност/неопределеност. София: БАН, 1990. 182 с. // Славяноведение. 1995. № 2. С. 110—111.

Кіклевіч А., Пацехіна А. Беларуская літаратурная норма: дынаміка і інавацыі (на матэрыялах сучаснага беларускага друку) // Slavia Orientalis. 2000. T. XLIX. № 1. S. 93—105.

Киклевич А.К. Проблемы грамматической семантики в современной польской лингвистике // Новые исследования в зарубежной лингвистике. Мн., 1996. С. 83—130.

Кіклевіч А.К. Польска-беларускі супастаўляльны сінтаксіс: актуальны стан, праблемы, перспектывы // III Міжнародны кангрэс беларусістаў. Мн., 2000 (у друку).

Кіклевіч А.К. Супастаўляльнае апісанне граматыкі і сістэмны падыход // Slavia Orientalis. 1997. T. XLVI. № 2. S. 301—316.

Кононенко В.И. К сопоставительному исследованию синтаксиса восточнославянских языков // ВЯ. 1980. № 1. С. 39—48.

Конюшкевич М.И. Синтаксис близкородственных языков: тождества, сходства, различия. Мн., 1989.

Косеска-Тошева В., Гаргов Г. Българско-полска съпоставителна грамматика. Т. 2. Семантичната категория определеност/неопределеност. София, 1990.

Кшешовский Т.П. Эквивалентность, конгруэнтность и глубинная структура // Новое в зарубежной лингвистике / Контрастивная лингвистика. М., 1989. С. 327—340.

Лёсік Я. Сынтакс беларускае мовы. Мн., 1926.

Ломтев Т.П. О синтаксических соответствиях тождества и различия в глагольно-именных сочетаниях в славянских языках. М., 1958.

Матезиус В. О лингвистической характерологии (на материале современного английского языка) // Новое в зарубежной лингвистике / Контрастивная лингвистика. М., 1989. С. 18—26.

Мейе А. Общеславянский язык. М., 1951.

Мечковская Н.Б. В какой мере разные классы языковых феноменов релевантны для понимания культур? // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Сер. 1. 2000а. № 3. С. 79—83.

Мечковская Н.Б. Зачем одному народу две азбуки? (Кириллица и латиница в коллизиях белорусского возрождения) // Slavia Orientalis. 1998. T. XLVII. № 2. S. 277—292.

Мечковская Н.Б. Язык и культура // Мечковская Н.Б. Социальная лингвистика. М., 2000. С. 49—67.

Міхневіч А.Я. Сінтаксіс // Беларуская мова / Энцыклапедыя. Мн., 1994. С. 484—486.

Михневич А.Е. О взаимодействии семантики и синтаксиса (Понятийная категория и ее языковое выражение) // Научные доклады высшей школы / Филологические науки. 1969. № 6. С. 101—108.

Мразек Р. Сравнительный синтаксис славянских литературных языков. Brno, 1990.

Мячкоўская Н.Б. XII Міжнародны кангрэс славістаў // Веснік БДУ. Сер. 4. 1998. № 3. С. 74—75.

Норман Б.Ю. Универсальное и специфическое в синтаксических моделях славянских языков. Мн., 1988.

Панфилов В.З. Гносеологические аспекты проблемы взаимоотношения языка и мышления // Панфилов В.З. Гносеологические аспекты философских проблем языкознания. М., 1982. С. 18—46.

Плотнікаў Б.А. Беларуская мова ў сістэме славянскіх моў. Мн., 1999.

Потебня А.А. Эстетика и поэтика. М., 1976.

Прохорова С.М. Синтаксис переходной русско-белорусской зоны: Ареально-типологические исследования / Науч. ред. П.П. Шуба. Мн., 1991.

Прохорова С.М. Вертикальные синтаксические поля и национально-культурный компонент // Национально-культурный компонент в тексте и языке / Тез. докл. Междунар. науч. Конф: В 2 ч. Мн., 1994а. Ч. 1. С. 77—79.

Рабчинская И.А. Типологический анализ некоторых явлений в области синтаксиса (на материале восточнославянских языков) // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеяння славянскіх літаратур. Мн., 1977. С. 260—261.

Реформатский А.А. О сопоставительном методе // Реформатский А.А. Лингвистика и поэтика. М., 1989. С. 40—52.

Сегень Б. Дыялектныя асаблівасці беларускай прыназоўнікавай сістэмы (на матэрыяле гаворкі вёскі Трывежа на Беласточчыне) // Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя. Мн., 1998. С. 211—214.

Серебренников Б.А. Роль человеческого фактора в языке. Язык и мышление. М., 1988.

Сигалов П.С. Задачи и возможности сопоставительного и сравнительно-исторического изучения способов действия славянского глагола // Вопросы сопоставительной аспектологии. Л., 1978.

Сопоставительное изучение грамматики и лексики русского языка с чешским и другими славянскими языками / Под ред. А.Г. Широковой и Вл. Грабье. М., 1983.

Супрун А.Е. Лекции по языковедению. Мн., 1978.

Толстой Н.И. Язык и культура. Некоторые проблемы славянской этнолингвистики // Zeitschrift fur Slavische Philologie. Heidelberg, 1990. Bd. 50.

Уфимцева А.А. Лексико-семантическая система языка // Общее языкознание / Внутренняя структура языка. М., 1972. С. 417—445.

Федорук И. Польские языковые элементы в белорусском языке Белостотчины (на материале изданий Белорусского общественно-культурного общества в Белостоке) / Автореферат ...канд. дис. Мн., 1986.

Хельбиг Г. Языкознание — сопоставление — преподавание иностранных языков // Новое в зарубежной лингвистике / Контрастивная лингвистика. М., 1989. С. 307—326.

Храковский В.С. Проблемы типологии родственных языков // XII Międzynarodowy Kongres Slawistów / Streszczenia referatów i komunikatów / Językoznawstwo. Warszawa, 1998. S. 197—198.

Чумак Л.Н. Национальный менталитет и этнокультурная интерференция (на базе синтаксических прототипов) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Сер. 1. 2000. № 3. С. 83—86.

Чумак Л.Н. Синтаксические единицы языка как носители национально-культурной информации / VIII конгресс МАПРЯЛ / Доклады. Мн., 1994.

Чумак Л.Н. Синтаксис русского и белорусского языков в аспекте культурологии. Мн., 1997.

Чумак Л.Н. Национально-культурный компонент реляционных (синтаксических) языковых единиц // Национально-культурный компонент в тексте и языке / Тез. докл. Междунар. науч. конф.: В 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1. С. 81—83.

Щерба Л.В. О понятии смешения языков // Щерба Л.В. Избранные работы по языкознанию и фонетике. Т. 1. Л., 1958.

Шчэрбін В.К. Супастаўляльная лінгвістыка // Беларуская мова / Энцыклапедыя. Мн., 1994. С. 543—544.

Шахматов А.А. Из "Синтаксиса русского языка" // Из трудов А.А. Шахматова по современному русскому языку / Учение о частях речи. М., 1952. С. 29—138

Шахматов А.А. Синтаксис русского языка. М., 1941.

Ярцева В.Н. О сопоставительном методе изучения языков // Научные доклады высшей школы / Филологические науки. 1960. № 1.

Ярцева В.Н. Сопоставительная лингвистика и проблема вариативности языка // Научные доклады высшей школы / Филологические науки. 1986. № 5. С. 3—11.

І.В. Галубенка

ЭКВІВАЛЕНТНАСЦЬ СТЫЛІСТЫЧНА МАРКІРАВАНАЙ ЛЕКСІКІ ПРЫ МАСТАЦКІМ ПЕРАКЛАДЗЕ З РУСКАЙ МОВЫ НА БЕЛАРУСКУЮ

Як вядома, паняцце *стылістычная маркіраванасць* уключае ў сябе два кампаненты: 1) аднесенасць пэўнага слова да аднаго з функцыянальных стыляў маўлення; 2) яго эмацыянальна-ацэначную афарбоўку, што вылучаецца на фоне нейтральных моўных сродкаў. Гэта значыць, што кожная слоўная адзінка мае не толькі ўласна стылістычную (функцыянальна-стылявую) маркіраванасць, але і эмацыянальна-экспрэсіўную. Пры гэтым пад уласна стылістычнай маркіраванасцю разумеецца афарбаванасць асобных слоў ці цэлых моўных пластоў, звязаных з іх пераважным выкарыстаннем у пэўнай сферы або форме зносін. Эмацыянальна-экспрэсіўная маркіраванасць у сваю чаргу ўказвае на характар і ступень выяўлення якасных ці ацэначных прымет, якія называюць з'явы, асоб, дзеянні і г. д.

Стылістычная афарбаванасць слоўных адзінак разам з іх семантыкай адыгрывае адметнае значэнне пры агульным успрыманні аўтарскага тэксту, яго тэмы і ідэі, асабліва — у мастацкім тэксце, асноўнае прызначэнне якога заключаецца ў выкананні эстэтычнай функцыі. Мастацкі стыль характарызуецца вобразнасцю, эмацыянальнасцю, экспрэсіўнасцю, якія дасягаюцца праз шырокае ўжыванне найбольш выразных і эмацыянальна афарбаваных адзінак усіх узроўняў і стыляў, а таксама іх спалучэнне. З гэтага пункту погляду становіцца відавочнай іх значнасць пры перакладзе зыходнага мастацкага тэксту са сваімі нацыянальна-спецыфічнымі сацыякультурнымі традыцыямі і прыярытэтамі на іншую мову.

Такім чынам, вобразнасць і эмацыянальна-экспрэсіўная насычанасць арыгіналу, выражаныя праз адбор і камбінаванне моўных адзінак рознай стылістычнай маркіраванасці, якія выконваюць эстэтычную функцыю, патрабуюць адпаведнага ўзнаўлення ў перакладзе. Стылістычная афарбаванасць асобных слоў, словазлучэнняў і сказаў мастацкага тэкставага ўтварэння набывае асаблівую значнасць, калі датычыцца перакладчыцкіх трансфармацый з блізкароднасных моў — напрыклад, з рускай на беларускую.

Абедзве мовы маюць суадносныя разгалінаваныя функцыянальна-стылістычныя сістэмы і вызначаюцца іх адметнай лексічнай напоўненасцю: адно і тое ж слова можа характарызавацца прыналежнасцю да розных стылявых пластоў і асаблівай эмацыянальна-экспрэсіўнай маркіраванасцю ў рускай і беларускай мовах. Існаванне такой сітуацыі можна растлумачыць спецыфікай развіцця моўных сістэм (з пункту погляду фарміравання літаратурных моў і засваення слоўных рэсурсаў). Дасягненне эмацыянальна-экспрэсіўнай раўнавагі і вобразнай насычанасці мастацкага матэрыялу, абранага ў якасці аб'екта аналізу і трансфармацыі на мову новага сацыякультурнага асяроддзя, аб'ектыўна патрабуе выяўлення і кампенсацыі лексіка-стылістычнай неадпаведнасці.

Відавочна, каб кампенсаваць розніцу (у тым ліку і стылістычную) паміж моўнымі сістэмамі арыгінальнага і перакладнога тэкстаў пры адборы суадносных лексічных адзінак, перакладчык вымушаны выкарыстоўваць цэлы шэраг прыёмаў: падбор слоў з іншай стылістычнай маркіраванасцю (функцыянальнай і эмацыянальна-экспрэсіўнай), перастаноўкі, замены, дабаўленні, пропуск слоў і г. д. Аналіз практычнага матэрыялу паказвае, што лексіка-стылістычная эквівалентнасць (як частка перакладчыцкай эквівалентнасці) рускамоўнага арыгіналу і яго перакладу на беларускай мове дасягаецца, як правіла, шляхам: 1) стылістычнага пераносу (вынаходжанне прамых лінгвістычных адпаведнікаў); 2) праз замену стылістычна маркіраваных (зыходных лексем з паметамі "размоўнае", "прастамоўнае", а часам і "кніжнае") нейтральнымі адпаведнікамі; 3) пераўвасаблення рускіх нейтральных слоўных адзінак беларускімі з паметай "размоўнае". Пры гэтым усе названыя трансфармацыі звычайна суправаджаюцца зменамі на граматычным узроўні, прадвызначаюць іх, ад іх залежаць. Растлумачым.

Стылістычны пераност (паводле тэрміна А. Паповіча [Попович, 1980, *196*], *стылістычнае калькаванне*) — адзін з найбольш прадказальных і распаўсюджаных прыёмаў пры руска-беларускім перакладзе — гэта запазычанне ўжо гатовых, распрацаваных схем і метадаў з арыгіналу і іх перанос у пераклад, якія ажыццяўляюцца на макра- (схе-

мы і метады) і мікра- (асобныя словы, словазлучэнні ці сказы) ўзроўнях. Перакладчыкі з блізкароднасных моў рэалізуюць яго па аб'ектыўных прычынах, звязаных з даступнасцю аўтарскага тэксту для чытача, паколькі лексічны фонд і функцыянальна-стылістычныя сістэмы рускай і беларускай моў з'яўляюцца блізкімі, суадноснымі. Мова перакладу прапануе гатовы ці адрозны па некаторых параметрах (стылістычная маркіраванасць, напрыклад) адпаведнік арыгінальнаму слову, выразу, які гарманічна можа ўпісацца ў агульную форму мастацкага тэксту, не парушаючы пры гэтым яго зместу і эстэтычнай каштоўнасці. Напрыклад: *...и допустил* ***нелепое*** (нейтр.) *написание.*(Ю. Т.) [Тынянов, 1980, *479—507*] — *...і дапусціў* ***бязглуздае*** (нейтр.) *напісанне* (А. В.) [Рускае савецкае апавяданне, 1988, *163—189*]; *В Павловском было* ***большое смятение*** (нейтр.)... (Ю. Т.) — *У Паўлаўскім быў* ***страшэнны перапалох*** (нейтр.)... (А. В.); *Но она мгновенно* ***растолкала*** (разм.) *заснувшего...* (Ю. Т.) — *Яна імгненна* ***раскатурхала*** (разм.) *соннага...*(А. В.); *...выработать* ***особую, внушающую уважение*** (нейтр.), ***повадку*** (разм.)... (М. Б.) [Булгаков, 1990] — *выпрацаваць* ***асаблівую, што надае павагі*** (нейтр.), ***завядзёнку*** (разм.)...(Я. С.) [Рускае савецкае апавяданне, 1988, *120—132*].

Такім чынам, рускія лексемы перакладаюцца прамымі стылістычнымі адпаведнікамі, якія, аднак, могуць змяняць граматычную форму, падпарадкоўваючыся перакладчыцкаму імкненню гарманічна ўвасобіць арыгінал на беларускай мове, адначасова адлюстраваць яго спецыфіку і даць яму новае жыццё ў іншай культурнай прасторы.

Улік сістэмных асаблівасцей рускай і беларускай моў, эстэтычных якасцей арыгіналу, прагматычных умоў сітуацыі перакладу, творчых густаў перакладчыка прадвызначаюць і падбор для нейтральных рускамоўных адзінак пэўным чынам маркіраваных беларускіх адпаведнікаў (2); пераклад арыгінальных слоў са стылістычнымі паметамі (функцыянальная прыналежнасць і эмацыянальна-экспрэсіўная афарбаванасць) нейтральнымі адзінкамі (1), калі, дзякуючы вар'ірванню сэнсавых адценняў і стылістычнай маркіраванасці, іншамоўны тэкст набывае асаблівы каларыт і натуральнае гучанне. Пры гэтым вылучаныя пазіцыі змяшчаюць пэўныя класіфікацыйныя варыянты:

1. а) "устарэлае" > "нейтральнае". *Он нашел секрет, как* ***избыть*** (устар.) *их.* (Ю. Т.) — *Ён вынайшаў сакрэт, як ад іх* ***пазбавіцца*** (нейтр.) (А. В.); *Он исчез без остатка, рассыпался в* ***прах*** (устар., высок.) (Ю. Т.). — *Ён знік канчаткова, як* ***попел*** (нейтр.) (А. В.); *Он привык* ***внимать*** (устар., высок.) *словам приказов как особым словам* (Ю. Т.). — *Ён быў звычайны* ***слухаць*** (нейтр.) *словы загаду як асаблівыя словы* (А. В.).

б) "кніжнае" > "нейтральнае". ***Некогда*** (кніж.) *он видел такую гравюру* (Ю. Т.). — ***Некалі*** (нейтр.) *ён бачыў такую гравюру* (А. В.); ***Надлежало*** (кніж.) *увеличить караулы* (Ю. Т.). — ***Трэба было*** (нейтр.) *павялічыць каравулы* (А. В.); *...потом (полотенце)* ***странствовало*** (кніж.) *со мной* (М. Б.). — *...потым (рушнік)* ***падарожнічаў*** (нейтр.) *са мною* (Я. С.).

Падобныя з'явы вынікаюць з нераўнамернасці развіцця функцыянальна-стылістычных сістэм беларускай і рускай моў: калі першая мае ў сваёй аснове жывую народную гаворку, то другая, у якасці літаратурнай, характарызуецца сталай кніжнай традыцыяй. З гэтай прычыны відавочнымі падаюцца суадносіны арыгінальных слоў з рознымі памятамі (а)—б)) з беларускімі стылістычна нейтральнымі адзінкамі.

З другога боку, факт перадачы размоўных і прастамоўных рускіх лексем нейтральнымі беларускімі і рускіх прастамоўных беларускімі размоўнымі словамі звязаны з натуралізацыяй сітуацыі моўных зносін (яе ўвасабленне традыцыйнымі для беларускага выказвання сродкамі) (в)—д)):

в) "размоўнае" > "нейтральнае": *...если к шести часам приказ не* ***поспеет*** (разм.) (Ю. Т.). — *...калі да шасці гадзін загад не* ***будзе гатовы*** (нейтр.) (А. В.); *О пальцах на ногах говорить не* ***приходится*** (разм.) (М. Б.). — *Пра пальцы на нагах гаварыць не* ***трэба*** (нейтр.) (Я. С.); *...* ***остервенело*** (разм.) *защищался я.* — *...* ***азвярэла*** (нейтр.) *абараняўся я* (Я. С.);

г) "прастамоўнае" > "нейтральнае". *На этих (брюках)* ***эвон*** (праст.) *где* (М. З.) [Зощенко, 1983, *104—106*]. — *А на гэтых* ***вунь*** (нейтр.) *дзе* (Я. С.) [Рускае савецкае апавяданне, 1988, *77—80*]; *...чтоб не* ***враз*** (праст.) *потерять* (М. З.). — *...каб* ***тут жа*** (нейтр.) *не згубіць* (Я. С.); *...не смогли* ***сыскать*** (праст.) *того человека...* (Ю. Т.) — *не здолелі* ***знайсці*** (нейтр.) *таго чалавека* (А. В.);

д) "прастамоўнае" > "размоўнае": *...* ***шарахнув*** (праст.) *меня по ногам* (М. З.) — *...* ***жахнуўшы*** (разм.) *мяне па нагах* (Я. С.); *Что* ***глазеете*** (разм.)? (Ю. Т.) — *Што* ***вылупіліся*** (разм.)? (А. В.). На наш погляд, такога кшталту перакладчыцкія трансфармацыі можна лічыць раўназначнымі па перадачы імі эмацыянальнасці выказвання, тым больш, што часта даволі складана вызначыць мяжу паміж размоўнай і прастамоўнай плынямі ў жывым маўленні і тэкстах, якія яго перадаюць. Таксама гэтыя адрозненні страчваюць важнасць, калі лексемы арыгінальнага і перакладнога тэкстаў супадаюць у сваім значэнні, ролі ў кантэксце і набліжаюцца адна да адной у фанетычным плане.

2. Трэба мець на ўвазе, што працэс змянення стылістычнай маркі-

раванасці слоў у перакладзе, у параўнанні з арыгіналам, не з'яўляецца аднабаковым, паколькі стылістычна нейтральным рускім лексемам адпавядаюць размоўныя беларускія слоўныя адзінкі. Гэтая з'ява менш распаўсюджаная, чым раней названая (гл. 1.). Напрыклад: "нейтральнае" > "размоўнае": *...и* ***округлый*** (нейтр.) *купидон в углу смотрел на него* (Ю. Т.). — *...і* ***круглявы*** (разм.) *купідон на рагу глядзеў...* (А.В.); *И адъютант задом* ***удалился*** (нейтр.) *в дверь* (Ю. Т.). — *І ад'ютант задам* ***падаўся*** (разм.) *да дзвярэй.* (А. В.); *...но любил и* ***блеснуть*** (нейтр.) *и показать все в лучшем виде* (Ю. Т.). — *...ён часам любіў і* ***шыкануць*** (разм.)*, і пахваліцца.* (А. В.).

Такія трансфармацыі маюць пад сабой пэўную падставу — як правіла, імкненне перакладчыка вылучыць, на яго думку, найбольш змястоўна і эмацыянальна значны элемент ці фрагмент тэксту, узмацніць экспрэсіўнасць ці дасягнуць стылістычнай раўнавагі паміж арыгіналам і перакладам, якая можа парушыцца з-за папярэдніх перакладчыцкіх трансфармацый.

Акрамя таго, на што ўжо звярталася ўвага і, як паказваюць прыведзеныя намі прыклады, змены ў стылістычнай маркіраванасці лексем звычайна не толькі выклікаюць трансфармацыі на іншых моўных узроўнях (марфалагічным, сінтаксічным), але і залежаць ад іх праз пэўныя кантэкстныя суадносіны — адбываецца працэс свядомай творчай апрацоўкі аўтарскага тэксту.

Такім чынам, стылістычна маркіраваная лексіка арыгіналу знаходзіць адметнае ўвасабленне ў культурна-моўнай сістэме перакладу. Яе трансфармацыя з рускай мовы на беларускую адрозніваецца сваімі заканамернасцямі, мае пэўнае тлумачэнне і служыць асноўным мэтам — дасягнення эквівалентнасці зыходнага і перакладнога тэкстаў на ўсіх узроўнях (лексіка-семантычным, лексіка-стылістычным, прагматычным і г. д.), перадачы эстэтычнай функцыі.

ЛІТАРАТУРА

Булгаков М. Полотенце с петухом / Избранные произведения. Т. 2. Мн., 1990.
Зощенко М. Баня / Избранное. Т. 1. Мн., 1983. С.104—106.
Попович А. Проблемы художественного перевода. М., 1980. С. 196.
Тынянов Ю. Подпоручик Киже / Смерть Вазир-Мухтара. М., 1980. С. 479— 507.

Т.Л. Дзергачова

ПАДРУЧНІК У СІСТЭМЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК ЗАМЕЖНАЙ: ПЫТАННІ ФОНАСТЫЛІСТЫКІ

Мова — не толькі сродак зносін паміж людзьмі, але і як культурная з'ява. Цікавасць да беларускай культуры, гісторыі з'яўляецца адной з прычын таго, што выкладанне беларускай мовы іншаземцам пашыраецца. Да беларускай мовы звяртаюцца ў асноўным перакладчыкі, славісты, сацыёлагі, сацыялінгвісты, псіхалінгвісты, гуманітарыі іншых спецыяльнасцей. Без звестак аб беларускай мове будзе недакладным уяўленне пра ўсходнеславянскія мовы, культуры, этнасы.

Пытанне аб выкладанні беларускай мовы як замежнай амаль не распрацавана, хоць на Беларусі лінгваметодыка замежных моў развіваецца дастаткова плённа. Мы імкнемся акрэсліць агульныя палажэнні ў лінгваметодыцы пра месца і ролю падручнікаў у сістэме навучання беларускай мове як замежнай праз характарыстыку іх уласцівасцей, функцый, зместу і структуры з мэтай вызначэння аб'ёму і формаў прэзентацыі фанетычнага матэрыялу ў практыцы навучання іншаземцаў беларускай мове.

У рабоце аналізуюцца тэарэтычныя і практычныя часткі падручнікаў "День за днём. Русский язык. Учебник для иностранных учащихся. I. Экспресс", "Вводный фонетико-грамматический курс русского языка для лиц, говорящих по-английски" Т.В. Шусцікавай, "Дебют: Уроки 1—11: Учебное пособие". Асаблівая ўвага звяртаецца на выданні беларускіх даследчыкаў: "Белорусский язык для говорящих по-русски" А.А. Крывіцкага, А.Я. Міхневіча, А.І. Падлужнага, "Учебник белорусского языка: Для самообразования" А.А. Крывіцкага і А.І. Падлужнага, "Гаворым па-беларуску" пад рэдакцыяй Л.І. Сямешкі.

У падручніку рэалізуюцца змест, прынцыпы, мэты (агульнаадукацыйныя, выхаваўчыя і практычныя) і сучасныя метады навучання [Рябова, 1989, *78*]. Толькі падручнік з'яўляецца тым сродкам, які спрыяе найбольш поўнай рэалізацыі функцый выкладчыка ў іх сукупнасці (выхаваўчую, навучальную, стымулюючую, інфармацыйную, кантролю, арганізацыйную і ацэначную). Ён выконвае інфармацыйную, сістэматызацыйную, інтэгравальную, каардынацыйную, развіццёва-выхаваўчую, самаадукацыйную функцыі, а таксама функцыі замацавання і самакантролю.

У метадычнай літаратуры вылучаюць некалькі тыпаў падручнікаў, якія адпавядаюць розным мэтам навучання [Вятютнев, 1984]. Метадычная сфера граматыка-перакладных падручнікаў (першы тып) была

скіраваная на навучанне чытанню, перакладу і аналізу тэкстаў, але моўныя ўзроўні асвятляліся ізалявана.

У другім (структуральным) тыпе падручнікаў мэтай выступае азнаямленне са структурнымі асаблівасцямі мовы праз яе сістэмны падзел, пры якім не ўлічваліся матывацыйныя і камунікатыўныя патрабаванні.

У падручніках трэцяга тыпу, трансфармацыйных, падавалася абстрактная сістэма без уліку камунікатыўнага аспекту, хоць у практыкаваннях асноўная ўвага скіроўвалася на пабудову сказаў.

У камунікатыўных падручніках (чацвёрты тып) навучанне арыентавана на маўленчую дзейнасць, у сувязі з чым улічваюцца сітуацыі, у якіх рэалізуецца маўленне. Гэтыя падручнікі грунтуюцца на наступных метадычных катэгорыях: практычная накіраванасць мэтаў навучання, функцыянальны падыход да адбору і падачы моўнага матэрыялу, сітуацыйна-тэматычная рэпрэзентацыя навучальнага матэрыялу, вывучэнне лексікі і марфалогіі на сінтаксічнай аснове, канцэнтрычнае размяшчэнне навучальнага матэрыялу. Да камунікатыўных можна аднесці такія працы беларускіх вучоных, як "Белорусский язык для говорящих по-русски" А.А. Крывіцкага, А.Я. Міхневіча, А.І. Падлужнага, "Учебник белорусского языка: Для самообразования" А.А. Крывіцкага, А.І. Падлужнага, "Русско-белорусский разговорник" А.Я. Міхневіча, навучальны дапаможнік "Гаворым па-беларуску" пад рэдакцыяй Л.І. Сямешкі.

Эфектыўнасць сучаснага падручніка ў значнай меры залежыць ад яго камунікатыўнай скіраванасці, рэалізацыі такіх панятцяў, як матывацыя і індывідуалізацыя.

Паспяховае навучанне замежнай мове залежыць ад актыўнай дзейнасці навучэнцаў, аснову якой стварае матыў — тое, дзеля чаго гэтая дзейнасць выконваецца. Для найбольш істотных фактараў, якія забяспечваюць высокую матывацыю, можна аднесці наступныя:

1) адбор тэм заняткаў і сітуацый, якія забяспечваюць камунікатыўныя запатрабаванні. Пры гэтым варта ўлічваць і такую асаблівасць, пры якой мова адлюстроўвае не толькі сучасныя рэаліі, але і захоўвае асаблівасці нацыянальнай культуры;

2) наяўнасць адпаведнага маўленчага матэрыялу — тых адзінак мовы і маўлення, граматычных форм, якія навучэнцы павінны засвоіць. "Адзінкамі метадычнай арганізацыі матэрыялу называюць адзінкі мовы або маўлення, выбраныя ў якасці зыходных для фарміравання маўленчых навыкаў і ўменняў" [Миньяр-Белоручев, 1990, *41*]. Такімі адзінкамі мовы з'яўляюцца фанемы, марфемы, словы, устойлівыя словазлучэнні. Найбольш значным аспектам выступае мінімалізацыя матэрыялу: для

навучання замежнай мове адбіраюць словы, фразы, граматычныя формы і структуры, неабходныя для дасягнення пастаўленай мэты навучання;

3) забеспячэнне індывідуальных стратэгій засваення матэрыялу, якія могуць быць рэалізаваны праз выкананне спецыяльных практыкаванняў, улічваючы псіхічныя асаблівасці кожнага навучэнца.

Індывідуалізацыя з'яўляецца адным з асноўных падыходаў у навучанні, які дазваляе ўлічыць аб'ём ведаў, схільнасці і ўменні кожнага вучня, узровень прыстасаванасці матэрыялу падручніка да асобасных якасцей.

Адзін са сродкаў стварэння індывідуалізацыі ў падручніку — творчыя заданні і практыкаванні, з дапамогай якіх вучань можа пранікаць у механізм функцыянавання мовы, у выніку чаго ствараецца найбольш высокая ступень самастойнасці працы. Да таго ж магчымасць самім навучэнцам выбіраць мэты, аб'ём новай інфармацыі; тэмп і тэхніку навучання павялічвае каштоўнасць матэрыялу, а значыць, і працэнт актыўнага засваення інфармацыі.

Праблемнае навучанне, на думку А.І. Рабавай [Рябова, 1989], дапамагае актуалізаваць моўную і культурную інфармацыю. Яно абапіраецца на мысленне, ахоплівае псіхалагічныя механізмы, што ляжаць у аснове ўсіх відаў маўленчай дзейнасці (слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо), якія актывізуюцца пры стварэнні і вырашэнні праблемнай сітуацыі.

Мы лічым, што навучэнцы павінны атрымаць цэласнае ўяўленне пра розныя з'явы беларускай мовы ўжо ў фанетычным курсе, паколькі навучанне не можа зводзіцца толькі да аналізу асобных моўных узроўняў — яно патрабуе адзінства вывучэння фанетыкі, графікі, арфаграфіі, арфаэпіі, склада слова і г. д. Нельга забывацца і пра тое, што дзейснасць падручніка залежыць і ад уліку псіхічных фактараў, індывідуалізацыі і наяўнасці матывацыі. Усё гэта сведчыць пра комплексную канцэпцыю сучаснага падручніка. Акрэслім рысы, характэрныя для комплексных падручнікаў:

- грунтоўная лінгватэарэтычная канцэпцыя;
- суаднясенне прыёмаў у методыцы навучання з функцыянальным, зместавым і фармальным мінімумамі, арыентаванымі на пэўны кантынгент навучэнцаў;
- вучэбны матэрыял падаецца як сістэма ўзаемазвязаных элементаў;
- вызначальным фактарам выступае камунікатыўная накіраванасць падручніка;
- улічваецца спецыфіка функцыянавання моўнага матэрыялу ў канкрэтных сітуацыях;

- рэалізуецца прынцып паслядоўнага ўвядзення матэрыялу, прынцып сістэмнасці, упарадкаванасці;
- паралельнае, сістэмнае развіццё відаў маўленчай дзейнасці: слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьма;
- практыкаванні маюць творчы характар;
- праца навучэнцаў звязваецца з дыялогамі, тэкстамі, а не з іх элементамі;
- наяўнасць сістэмы паўтораў, абагульнення вучэбнага матэрыялу і кантролю яго засваення вучнямі.

Калі ацэньваць у камунікатыўным аспекце працы, створаныя беларускімі вучонымі, у дачыненні да выкладання беларускай мовы як замежнай, то можна заўважыць некаторыя іх агульныя асаблівасці, якія мы прааналізуем на прыкладзе асобных выданняў.

Тэарэтычным матэрыялам трэцяга перавыдання падручніка "Белорусский язык для говорящих по-русски" А.А. Крывіцкага, А.Я. Міхневіча, А.І. Падлужнага з'яўляюцца звесткі з графікі, фанетыкі, арфаграфіі, марфалогіі, сінтаксісу, якія падаюцца супастаўляльным метадам. Асобны раздзел складаецца з ведаў па графіцы, фанетыцы, арфаграфіі. Навучанне скіравана на адлюстраванне літар на пісьме (адрозненне паміж беларускімі і рускімі галоснымі і зычнымі гукамі), на гучанне і правілы выкарыстання гукаў у пісьмовай мове. Такая накіраванасць на першы план ставіць чытанне, а не гаварэнне.

У раздзеле, прысвечаным стылістыцы, падаюцца звесткі пра функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы, ідыяматычнасць маўлення, прыводзяцца прыклады тэкстаў розных стыляў, праўда, без характарыстыкі іх уласцівасцей, што ўскладняе практычную рэалізацыю і актуалізацыю ведаў.

Адзнакай камунікатыўнасці вызначаецца раздзел "Моўны этыкет", у якім паралельна на дзвюх мовах (рускай і беларускай) прыводзяцца прыклады зваротаў, запрашэнняў, падзяк, пажаданняў, віншаванняў, камунікатыўных пытанняў і г. д. Асобную ўвагу аўтары надаюць ідыяматычным выразам, якія перакладаюцца на рускую мову. У падручніку паслядоўна рэалізуецца супастаўляльны метад. Паралельна з ім выкарыстоўваецца перакладны метад навучання, адлюстраваны ў вучэбным руска-беларускім слоўніку.

Эўрыстычны матэрыял заключаны ў выбранай бібліяграфіі па беларусістыцы, змешчанай у падручніку. Ён накіроўвае навучэнцаў да самастойнага адкрыцця новага на аснове свайго вопыту, раней атрыманых ведаў з мэтай глыбейшага пазнання беларускай мовы.

Прадмова нясе гістарычныя звесткі пра культуру беларусаў, пра іх

лёс і мову. У гэтым падручніку комплекснага тыпу выбрана лінейная падача матэрыялу, засваенне якога было б больш прадуктыўным пры пашырэнні сістэмы практыкаванняў і кантролю, увядзенні ілюстрацыйнага матэрыялу, ключоў.

У 1994 годзе выйшаў "Учебник белорусского языка: Для самообразования" А.А. Крывіцкага і А.І. Падлужнага, таксама прызначаны для тых, хто валодае рускай мовай. Матэрыял пададзены на рускай мове трыма блокамі. У першым аб'яднаны звесткі з фанетыкі, арфаэпіі, арфаграфіі, у другім — звесткі з марфалогіі, у трэцім — з сінтаксісу. Такая лінейнасць ускладняе выпрацоўку камунікатыўных навыкаў, якія канстатуюцца ў раздзеле "Деловые бумаги", дзе прыводзяцца ўзоры заяў, даручэнняў, распісак, даведак, актаў, пратаколаў, загадаў і г. д. Аднак гэтыя навыкі не маюць практычнага замацавання.

Багаты фактычны матэрыял нясе раздзел "Для красного словца", які склалі прымаўкі і прыказкі, упарадкаваныя тэматычна, жарты, фразеалагізмы (на рускай і беларускай мовах), параўнанні, устойлівыя выразы, перыфразы і афарызмы.

Лексічная сістэматызацыя падручніка праведзена ў тэматычным слоўніку, які ахоплівае словы з розных тэматычных сфер: сям'я, расліны, жывёлы, абутак, адзенне, гандаль і інш.

Кніга пабудавана па ўрочнай сістэме. Кожны ўрок змяшчае тэарэтычныя звесткі, маўленчыя выразы, тэкст з лексічным каментарыем да яго і практыкаванні для самастойнай працы. Аднак грунтоўнасць тэарэтычных ведаў не з'яўляецца гарантыяй гаварэння, бо асноўная ўвага скіравана не на развіццё маўленчых навыкаў, а на авалоданне тэорыяй. Узмацнілі б камунікатыўны аспект творчыя практыкаванні, сродкі стварэння праблемных сітуацый, дыялогі і заданні на актывізацыю маўлення тыпу: *"Адкажыце на пытанні", "Апішыце малюнак", "Складзіце фразы, выкарыстоўваючы словазлучэнні"* і г. д.

Фанетычны матэрыял у вучэбным дапаможніку "Гаворым па-беларуску" пададзены суцэльна, без падзелу на заняткі (урокі). Гэта можа выклікаць пэўныя цяжкасці, паколькі гэты дапаможнік разлічаны і на самастойнае вывучэнне іншаземцамі беларускай мовы.

Заданні да практыкаванняў разлічаны на актывізацыю маўлення праз імітацыйную, а не творчую працу. Яны фармулююцца наступным чынам: *"Слухайце і паўтарайце", "Чытайце", "Паўтарайце", "Гаварыце паводле мадэлі", "Чытайце, выразна вымаўляючы", "Вымаўляйце".*

На наш погляд, вельмі карысным у дапаможніку быў бы займальны матэрыял. Практыкаванні маглі б будавацца згодна з прынцыпам "гуль-

ні", дзе б абыгрываліся розныя гукі, словы. Багата такога матэрыялу можна знайсці ў творах беларускіх пісьменнікаў: В. Віткі, Р. Барадуліна, А. Наўроцкага і інш.

Дапаможнік "Гаворым па-беларуску" разлічаны на пачатковы этап навучання замежных слухачоў, таму карысна было б пачынаць кожныя заняткі з фанетычнай размінкі, якая здымала б цяжкасці ў маўленні.

У вышэйназваных падручніках, прызначаных як для вывучэння беларускай мовы рускамоўнымі жыхарамі Беларусі ("Белорусский язык для говорящих по-русски", "Белорусский язык: Для самообразования"), так і арыентаваных на практычнае знаёмства замежнага чытача і засваенне беларускай мовы іншаземцамі ("Гаворым па-беларуску"), змяшчаюцца агульныя звесткі пра асноўныя фанетычныя з'явы сучаснай беларускай літаратурнай мовы і некаторыя практыкаванні на засваенне арфаэпічных нормаў. Мы лічым, што абавязковым элементам комплекснага падручніка беларускай мовы для замежных навучэнцаў павінен быць паўрочны фанетычны курс.

Фанетычны курс беларускай мовы для замежных навучэнцаў грунтуецца на фанетыка-арфаграфічным прынцыпе навучання апраксімаванаму вымаўленню, пазбаўленаму фаналагічных памылак. Мэта гэтага курса — даць сістэматызаваны выклад звестак пра найбольш істотныя асаблівасці беларускай фанетыкі і садзейнічаць максімальна эфектыўнаму засваенню навыкаў прымальнага вымаўлення гука, склада, слова. На падставе гэтай мэты ставяцца наступныя задачы:

1) азнаёміць навучэнцаў з графікай, гукавым і інтанацыйным ладам сучаснай беларускай мовы;

2) вучыць правільнаму вымаўленню;

3) развіваць маўленчы і інтанацыйны слых.

У працэсе вывучэння фанетычнага курса слухачы знаёмяцца з фанемным складам беларускай мовы, а таксама атрымліваюць асноўныя звесткі аб найбольш частотных складовых мадэлях, слоўным націску і інтанацыі (фразавы, тактавы, лагічны націск, узыходны і зыходны тоны, падзел сказаў на інтанацыйна-сэнсавыя групы).

Зыходзячы з аналізу зместу ўрокаў і колькасці гадзін у працы А.А. Крывіцкага і А.І. Падлужнага "Учебник белорусского языка: Для самообразования" (у якім раздзел "Фонетика, орфоэпия, орфография" складаецца з 12 урокаў, што разлічаны прыкладна на 24 гадзіны) і ў падручніку "День за днём. Русский язык. Учебник для иностранных учащихся. I. Экспресс" (у ім на вывучэнне фанетыкі адведзена каля 30 гадзін), мы прыйшлі да высновы, што аб'ём фанетычнага курса пры вы-

кладанні беларускай мовы як замежнай можа быць разлічаны на 32 гадзіны з улікам сістэмы навучальных тэм.

Увесь матэрыял курса прапануем падзяліць на 15 заняткаў, зыходзячы з чатырох асноўных відаў маўленчай дзейнасці ў межах мінімалізаванага фанетычнага матэрыялу, суадноснага з лексікай і граматыкай. Такія асаблівасці тлумачацца тым, што структура фанетычнага курса звязана з камунікатыўна-дзейнаснай мадэллю навучання.

Вялікая ўвага надаецца паэтапнаму ўвядзенню матэрыялу на занятках. Кожны ўрок пачынаецца з фанетычнай размінкі, выконваючы якую навучэнцы працуюць не толькі над пастаноўкай голасу, станаўленнем артыкуляцыйнай базы, але і паўтараюць вывучанае на папярэдніх занятках. На наш погляд, найбольш прыдатнымі для трэнінгу будуць словы, якія складаюцца з аднаго—трох складоў і якія яскрава ілюструюць фанетычныя з'явы беларускай мовы: *балота, рака, вярба, шэры, джала, воўк, леў, сем, голуб, дзень, цень* і інш.

Фанетычная размінка выконваецца на пачатку кожнага ўрока і можа складацца з практыкаванняў на артыкуляторную гімнастыку, на развіццё фанематычнага і інтанацыйнага слыху і на фарміраванне вымаўленчых навыкаў [Настольная книга, 1999, *7—12*]. Спецыялісты прапануюць комплекс артыкуляторнай гімнастыкі, з якога для трэнінгу беларускага маўлення найбольш прыдатнымі выступаюць наступныя:

- трымайце ніжнюю сківіцу нерухомай. Папераменна ўпірайце кончык языка ў альвеолы верхніх зубоў і затым у верхнія зубы. Вусны свабодныя, не напружаныя;
- упірайце кончык языка папераменна, з вытрымкай, ва ўнутраную паверхню правай і левай шчакі;
- максімальна выцягніце вусны наперад;
- падціснiце вусны, потым расслабце іх;
- выцягніце вусны наперад, узмацніце і аслабце лабіялізацыю;
- максімальна высуньце язык наперад, потым адцягніце яго назад да кораня;
- дакраніцеся кончыкам языка да верхняга і ніжняга краю альвеол;
- зрабіце круг языком на ўнутранай акружнасці зубоў пры апушчанай сківіцы.

Можна выкарыстаць наступныя практыкаванні на развіццё фанематычнага і інтанацыйнага слыху:

- вызначце большую і меншую выразнасць вымаўлення дыктараў. Вызначце тэмп дзвюх фанаграм (больш хуткі ці больш запаволены);
- вусна падзяліце пачутае слова на гукі і назавіце іх;

- вызначце колькасць складоў у пачутых словах;
- знайдзіце ў калонках і адзначце адпаведнымі нумарамі пачутыя словы ў той паслядоўнасці, у якой яны гучаць;
- вылучыце на слых з тэксту словы з зададзеным гукам і запішыце іх арфаграфічным пісьмом.

Фанетычная размінка можа ўключаць наступныя практыкаванні на фарміраванне вымаўленчых навыкаў:

- праслухайце паслядоўнасць гукаў і падыміце руку, калі пачуеце зададзены гук;
- у радзе слоў (словазлучэнняў, сказаў) падкрэсліце тое, якое вымаўляе дыктар;
- вымавіце за дыктарам гукі (словы, склады), звяртаючы ўвагу на вымаўленне гукаў;
- назавіце словы, у якіх маецца пэўны гук;
- назавіце прадметы, адлюстраваныя на малюнках, звяртаючы ўвагу на вымаўленне зададзенага гука.

Мы лічым, што словы для засваення варта падаваць у невялікім тэматычным слоўніку пасля кожнага ўрока. Такое размеркаванне слоў па тэматычных групах дазваляе:

1) сістэматызаваць новыя веды;

2) лепш запомніць новыя словы, паколькі паміж імі існуе логіка-семантычнае падабенства.

Кожныя заняткі змяшчаюць характарыстыку гукаў беларускай мовы, рэпрэзентацыя якіх пры першасным замацаванні адбываецца шляхам транскрыпцыі гукаў, правілы іх вымаўлення і абагульняльныя практыкаванні. Абавязковымі кампанентамі практыкаванняў з'яўляюцца выразнае чытанне, гукавы аналіз, назіранне над асаблівасцямі інтанацыйнага афармлення сказа. Асноўная ўвага пры іх выкананні скіроўваецца на настройку моўнага апарату навучэнцаў, падрыхтоўку яго да вымаўлення гукаў беларускай мовы (фарміраванне артыкуляцыйнай базы паралельна з фанетычным слыхам) пры паступовым ускладненні маўленчага матэрыялу. Праца над правільнай пастаноўкай націску і прымальнага вымаўлення працягваецца ў асноўным (лексіка-граматычным) курсе.

Названыя акалічнасці ўлічаны ў распрацаваным намі плане-праспекце фанетычнага курса беларускай мовы, пададзеным ніжэй. У ім адлюстраваны змест, аб'ём і паслядоўнасць актуалізацыі фанетыка-арфаграфічных асаблівасцей.

№ ур.	Гадз.	Тэматыка заняткаў
1	2	Беларускі алфавіт. Гукі і літары. Галосны гук [а]. Асноўныя складовыя мадэлі (зычны + галосны [а], галосны [а] + зычны).
2	2	Зычныя гукі [м], [н], [л]. Галосныя гукі [о], [э]. Слоўны націск. Аканне пасля цвёрдых зычных.
3	2	Зычныя гукі [в], [ў]. Галосны гук [у]. Рытміка двухскладовага слова. Беларуская інтанацыя (агульная характарыстыка). Інтанацыя апавядальных сказаў тыпу *"Гэта дом"*.
4	2	Галосныя гукі [і], [ы]. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі [б]—[б'], [в]—[в'], [г]—[г'], [г]—[г'], [з]—[з'], [к]—[к'], [л]—[л'], [м]—[м']. Інтанацыя пытальных сказаў тыпу *"Гэта студэнт?"*
5	2	Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі [д]—[дз'], [н]—[н'], [п]—[п'], [с]—[с'], [т]—[ц'], [ф]—[ф'], [х]—[х']. Дзеканне і цеканне. Аканне пасля мяккіх зычных.
6	2	Няпарныя па цвёрдасці-мяккасці гукі [дж], [ж], [р], [ч], [ш], [й]. Фразавы націск. Інтанацыя пытальных сказаў тыпу *"Хто гэта?", "Як вас завуць?"*
7	4	Звонкія і глухія зычныя гукі [б]—[б']—[п], [г]—[х], [д]—[т], [дз']—[ц'], [дж]—[ч], [ж]—[ш], [з]—[с], [з']—[с']. Аглушэнне і азванчэнне. Значэнне прыставак *аб-, ад-* і іх ужыванне.
8	2	Няпарныя звонкія гукі [в], [в'], [л], [л'], [м], [м'], [н], [н'], [р], [й], [ў]. Лагічны націск. Інтанацыйная канструкцыя тыпу *"Я люблю чытаць. — А вы?", "Ваш білет?"*
9	2	Няпарныя глухія гукі [к], [к'], [ф], [ф'], [ц]. Рытміка трохскладовага слова. Інтанацыя пытальных сказаў тыпу *"Ці маеце вы? (Ці ёсць у вас?)"*.
10	2	Зычны гук [й]. Спалучэнні гукаў [jэ], [jо], [jу], [jа] і іх графічнае адлюстраванне. Апостраф і мяккі знак. Інтанацыя пабуджальных сказаў тыпу *"Зачыні дзверы!", "Прыязджай часцей!"*
11	2	Прыстаўныя зычныя гукі [в], [γ], [j] і ўстаўныя зычныя гукі [в], [й]. Асноўныя складовыя мадэлі (зычны + галосны + зычны, зычны + зычны + галосны).
12	2	Прыстаўныя галосныя гукі [а], [і]. Асноўныя складовыя мадэлі (галосны + зычны + зычны). Артыкуляцыйная база беларускай мовы. Інтанацыя клічных сказаў тыпу *"А кветак тут колькі!", " Як цікава!"*
13	2	Змены гукаў моўнай плыні (акамадацыя, асіміляцыя, дысіміляцыя). Асноўныя правілы беларускага літаратурнага вымаўлення (сч, зч → [шч]).
14	2	Змены гукаў у моўнай плыні (падаўжэнне). Падоўжаныя зычныя ў беларускай мове [ж], [ш], [ч], [с'], [з'], [ц'], [дз'], [л'], [н']. Асноўныя правілы беларускага літаратурнага вымаўлення (шс, жс → [с'с']; сш, зш → [шш]; зж → [жж]; дч, тч → [чч]).
15	2	Змены гукаў у моўнай плыні (сцяжэнне, спрашчэнне). Асноўныя правілы беларускага літаратурнага вымаўлення (дс, жс, тс, цс, чс, кс → [ц], чц → [шц], дц → [шц], тц → [шц]). Табліца "Ад літары да гука".

Распрацоўка фанетычнага курса — досыць складаная праблема, паколькі пры навучанні неабходна даць не толькі асноўныя звесткі пра гукі беларускай мовы, іх узаемадзеянне, паняцце пра склад і націск, але і паказаць узаемасувязь, цэласнасць розных моўных узроўняў. Канцэп-

цыя курса будзе канчаткова вывераны пры практычным карыстанні ім як абавязковым складнікам працэсу развіцця метадычнай думкі і пашырэння ведаў пра Беларусь і мову беларусаў.

ЛІТАРАТУРА

Вятютнев М.Н. Теория учебника русского языка как иностранного. М., 1984.

Гаворым па-беларуску: Вучэб. дапам. па бел. мове для замежн. навучэнцаў / Пад рэд. Л.І. Сямешкі. Мн., 1999.

Дебют: Уроки 1—11: Учебное пособие. СПб., 1998.

День за днём. Русский язык. Учебник для иностранных учащихся. I. Экспресс. М., 1994.

Кривицкий А.А., Михневич А.Е., Подлужный А.И. Белорусский язык для говорящих по-русски. Мн., 1990.

Кривицкий А.А., Подлужный А.И. Учебник белорусского языка: Для самообразования. Мн., 1994.

Миньяр-Белоручев Р.К. Методика обучения французскому языку. М., 1990.

Михневич А.Е. Русско-белорусский разговорник. Мн., 1991.

Настольная книга преподавателя иностранного языка. Мн., 1999.

Рябова А.И. Проблемность как один из способов реализации взаимосвязанного обучения видам речевой деятельности // Русский язык за рубежом. 1989. № 4.

Сичкарь А.Ю. Системная универсальная модель как способ адекватного описания учебника русского языка для иностранцев // Русский язык за рубежом. 1987. № 2.

У.І. Куліковіч

НАРМАЛІЗАЦЫЯ АРФАГРАФІЧНАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ Ў РАЗУМЕННІ У. ДУБОЎКІ

1. Правапіс у, ў. Даўняй, вядомай яшчэ з XIII ст., выразнай рысай гукавога ладу беларускай мовы з'яўляецца ўжыванне ў беларускім маўленні гука [ў], які, нягледзячы на старажытнасць свайго паходжання, стаў перадавацца на пісьме спецыфічнай літарай *ў* толькі з XIX ст. [Выгонная, 1991, *32*]. Паслядоўнасці ж яе напісання, аднак, не назіралася ні ў творах В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, ні ў публікацыях "Нашай долі" і "Нашай нівы" [Гапоненка, 1993, *87—88*, Яновіч, 1987, *22*].

Першая спроба ўнармавання правапісу літар *у, ў* назіраецца ў 1917 годзе. А. Луцкевіч — адзін з арганізатараў і заснавальнікаў "Нашай нівы" — у невялічкай брашуры *"Jak prawilna pisać pa bielarusku"*, надрукаванай лацініцай польскай мадыфікацыі, рэкамендаваў пры напісанні гэтых літар улічваць не толькі характар папярэдніх гукаў (галосны ці зычны), але і колькасць зычных пасля іх. *"...nielga pisać u u pacatku słowa ći pierad słowam,* — адзначаў А. Луцкевіч, — *kali dalej iduć dwa ći*

bolej sugalosnych: *jana byla u stachu; dzicia uzlezlo na stol"* [Luckiewič, 1917, *10*]. У наступным годзе ў выдадзеным сумесна з Я. Станкевічам падручніку "Bielaruski prawapis" такая дэталізацыя сфармуляванага ім арфаграфічнага закона адносна ўжывання *у, ў* адсутнічае.

Яшчэ праз год Б. Тарашкевіч у сваёй "Беларускай граматыцы для школ" падае наступную рэдакцыю правіла правапісу *у, ў*, якое аб'яднана з правілам напісання [і].

"На пачатку слова, — гаворыцца ў кнізе, — дзеля вялікшай складнасьці *у, і* замяняюцца на кароткае *ў, й*, калі яны стаяць пасля галоснага гуку... Галосныя *у, і* дзеля складовасьці замяняюцца на *ў, й*, калі папярэдняе слова канчаецца галосным... пасля зычнага *у* і *і* не замяняюцца на *ў* і *й*. Ад гэтага правіла дзеля верша дужа часта адступаюць" [Тарашкевіч, 1919, *54*].

У моўнай практыцы 20-х гадоў XX ст. ад гэтага правіла адступалі не толькі "дзеля верша". Таму і з'явілася ідэя перагляду, якая знайшла сваё выражэнне ў шэрагу канкрэтных прапаноў: ад скасавання ў нашым алфавіце літар *ў* і *й* [Працы, 1927, *149*], да частковага ўдакладнення іх правапісу, ініцыіраванае Антонам і Язэпам Лёсікамі.

У сваіх публікацыях браты Лёсікі завастрылі ўвагу навуковай грамадскасці на беспадстаўнасці аб'яднання ў адным правіле правапісу *ў* і *й*, бо названыя гукі, на іх погляд, з'яўляюцца рознымі "паміж сабою як сваёй прыродай, так і сваім значэньнем" [Лёсік, 1925, *129*]. Недарэчным здалося ім і ўведзенае Б. Тарашкевічам паняцце "складнасьці", якое кожны разумее так, як яму здаецца, а "на пісьме кожны значок, кожная літара павінны падлягаць пэўнаму цьвёрдаму правілу, каб кожны аднолькава разумеў значэньне й месца гэтых літар і значкоў на пісьме" [Лёсік, 1925, *189*]. Акрамя гэтага, Я. Лёсік прапаноўваў у якасці выключэнняў замацаваць напісанні пачатковага *у* ў словах іншамоўнага неславянскага паходжання (Уругвай, *унівэрсытэт, унівэрсал, узурпатар*), а таксама ў словах тыпу *ўвага, уважліва, умова, угода, урад, урадавы, упадак, уклад, уціск, ухвала, устава* і некаторых іншых, што, паводле яго назіранняў, абумоўлена спецыфікай беларускага вымаўлення [Лёсік, 1925, *132*]. Такая рэдакцыя існуючага правіла не знайшла належнай падтрымкі сярод настаўніцтва і навукоўцаў, пра што сведчаць публікацыі ў тагачасным друку [Багдановіч, 1925, *154—157*], аднак гэта не спыніла Антона і Язэпа Лёсікаў у пошуку аптымальных шляхоў выхаду з арфаграфічнага крызісу.

На акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (1926) Я. Лёсік у сваім дакладзе "Да рэформы беларускага правапісу" гаварыў наступнае: "Хоць правіла аб скарачэньні *у*, калі яно

стаіць асобна ці на пачатку слова пасьля галоснага перад зычным, механізаваць можна, бо гэтае правіла асаблівых практычных перашкод не сустракае, але было-б зусім нелёгічна і непаступова ніколі не скарачаць асобнага і пачатковага *і*, а заўсёды скарачаць у такіх разох *у*...скарачэньне *у* пасьля галосных перашкаджае механічнасьці, бо кожны раз трэба спыняцца і думаць або глядзець, на які гук кончылася папярэдняе слова" [Працы, 1927, *205—206*]. "Уласьцівасьць беларускай мовы стане больш выразнаю, — працягвае думку брата А. Лёсік, — калі мы будзем пісаць *"прышлі у хату"*, чым *"прышлі ў хату"*, бо апошняе напісаньне набліжае беларускае выражэньне да расійскага *"в хату"* (*ў* бліжэй да *в*, чым *у*)" [Працы, 1927, *309*].

Большасць удзельнікаў канферэнцыі (П. Бузук, Я. Воўк-Левановіч, С. Некрашэвіч, П. Растаргуеў), якія прымалі ўдзел у абмеркаванні Лёсікавых арфаграфічных паправак, не падтрымалі іх, выказаўшыся за замацаванне правіла, устаноўленага Б. Тарашкевічам.

Але дыскусія адносна напісання *у* і *ў* на гэтым не скончылася. Распачаў яе ўжо пасля акадэмічнай канферэнцыі ў сваім артыкуле "Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасці нашае мовы" У. Дубоўка, прапануючы ўнесці два ўдакладненні ў рэдакцыю Тарашкевічавай фармулёўкі арфаграфічнай нормы.

Першае ўдакладненне датычылася неабгрунтаванага, на яго погляд, выключэння з правіла правапісу *у* і *ў* для паэтычнай мовы, устаноўленага моўнай практыкай і замацаванага "Беларускай граматыкай для школ". "Чамусьці лічаць, — пісаў У. Дубоўка, — што для поэзіі павінна быць нейкае выключэньне, што пасьля слоў з адкрытым канчаткам можа стаяць *у* поўнае, а з закрытым і зьмякчаным *ў* нескладовае. Погляд такі памылковы. Нашы літаратары павінны пільна прытрымлівацца *агульнага* правіла. Што-б сказалі расейцы, каб іх поэты заместа *в* стаўлялі *у*? Гэткая зьява разглядалася-б як грубая памылка і няведаньне мовы. Тым больш павінен асуджацца адыход ад правільнага ўжываньня *у* ў нас, асабліва ва ўжываньні *ў* нескладовага пасьля слоў з закрытым і зьмякчаным канчаткам, бо такі адыход шкодна адбіваецца на ўспрыйманні ды на рытме" [Дубоўка, 1927, *90*].

Другое ўдакладненне адносілася да кадыфікацыі напісаньня *у* і *ў* у пачатку слова. "На мой погляд, — адзначаў паэт, — можна вызначыць такое практычнае правіла: калі пасля *у* на пачатку слова ідуць два (ці больш) зычныя гукі, павінна пакідацца на пісьме *у* складовае (*адна установа, хмара ускрыла*); калі пасьля *у* на пачатку слова ідзе адзін зычны, — павінна ўжывацца *ў* нескладовае (*павінна ўжывацца*)" [Дубоўка, 1927, *90*].

Першая Дубоўкава прапанова хоць і не набыла статуса арфаграфічнага закона ў нашых граматыках ні ў 30-я гады, ні на сучасным этапе развіцця беларусістыкі, аднак у апошнія дзесяцігоддзі атрымала належную ацэнку з боку літаратуразнаўцаў. Так, В. Рабкевіч, аналізуючы маладую паэзію 80-х, сярод мноства хібаў у мове адзначаных даследчыкам творах указваў і на няправільнае ўжыванне *ў*. "У беларускай мове, — адзначаў ён, — гэты гук пазіцыйны —утвараецца пасля галосных. Актыўныя намаганні многіх аўтараў утварыць *ў* (нескладовае) пасля зычных марныя — наш моўны аппарат не забяспечвае ўтварэння ў (нескладовага) пасля зычных гукаў" [Рабкевіч, 1980, *127*].

Прыкметай высокай культуры верша, якая ўласціва найбольш таленавітым паэтам (А. Куляшоў, П. Панчанка, М. Танк), высокай адказнасцю перад народам і яго мовай назваў правільнае ўжыванне ў паэзіі *у* (складовага) і *ў* (нескладовага) вядомы беларускі вершазнаўца І. Ралько. "Аднак ёсць сярод старэйшых паэтаў (і нават сярод маладзейшых), — працягвае ён, — такія, якія дзеля захавання рытму (метрычнай схемы) ідуць на ўсё — *ў* (кароткіх) у іх столькі, што цяжка прачытаць вершаваны радок. Недаравальна для айчыннай прасодыі рабіць гучанне слова, музыку верша не такой мілагучнай, як гэта ёсць на самай справе" [Ралько, 1986, *246*].

Другое Дубоўкава ўдакладненне правапісу *у, ў,* якое нельга назваць зусім новым, арыгінальным у гісторыі беларускага мовазнаўства, таксама не стала правапіснай нормай беларускай літаратурнай мовы. Але ў адрозненне ад першай рэкамендацыі яно не знайшло адабрэння сярод нармалізатараў арфаграфічных правілаў, прычынай чаму з'яўляецца схематызм, недакладнасць адзначанай прапановы, якая зводзіць напісанне літар *у, ў* да механічнага падліку колькасці зычных пасля іх, пакідаючы без увагі літаратурнае вымаўленне, месца націску, наяўнасць/адсутнасць знакаў прыпынку. Прапаноўваючы такую папраўку, адноўленую з часоў першых спроб фармулявання арфаграфічных правіл у беларускай літаратурнай мове, У. Дубоўка, на наш погляд, ставіў мэту уніфікаваць напісанні пачатковага *у* ў словах іншамоўнага і ўласнабеларускага паходжання.

Менавіта замацаваць аднастайнае напісанне *у, ў* у словах рознага паходжання імкнуліся ў пазнейшы час аўтары Праекта беларускага правапісу (1930), распрацаванага правапіснай камісіяй беларускай Акадэміі навук, калі спрабавалі ўзаконіць прапановы братоў Лёсікаў [Беларускі правапіс, 1930, *13*], а таксама даследчыкі другой паловы XX ст. [Вячорка, 1991, *265—267*].

І толькі на сучасным этапе развіцця беларускага мовазнаўства рас-

працоўшчыкі Праекта новай рэдакцыі правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі ліквідавалі неапраўданае выключэнне напісання *у* пасля галосных у пачатку запазычаных лексічных адзінак [Правілы, 1999, *29*].

Такім чынам, прапановы У. Дубоўкі адносна ўдасканалення правапісу пачатковага *у, ў* хоць і не набылі ў нашым мовазнаўстве адпаведнага статуса, але засталіся карыснымі лінгвістычнымі фактамі ў падыходзе да выбару базы і прымет арфаграфічнай нормы, паказчыкамі мовазнаўчай інтуіцыі паэта.

Першая з Дубоўкавых прапаноў засведчыла яго схільнасць да атаясамлівання моўных законаў паэтычнага і празаічнага твораў з моўнымі законамі беларускай фанетычнай сістэмы, што, безумоўна, з'яўляецца слушным, а ў дачыненні да ўжывання *у, ў* нават апраўданым. Другая прапанова, якую можна кваліфікаваць як аматарскую, указвае, тым не менш, на прыхільнасць паэта да стварэння адзіных арфаграфічных законаў для слоў рознага паходжання, падзел якіх на ўласнабеларускія, даўно і нядаўна запазычаныя, па ўсёй верагоднасці, усведамляўся У. Дубоўкам як суб'ектыўная падстава для выпрацоўкі адпаведнага правіла.

2. Правапіс прыстаўных галосных. Прыстаўныя галосныя *а, і* складаюць адну з асаблівасцей беларускай мовы. Паводле Я. Карскага, яны развіліся фанетычна перад санорнымі *р, л, м* у выніку страты рэдукаваных з мэтай пазбегнуць немілагучных спалучэнняў [Юргелевіч, 1958, *50*]. Аднак дакладныя правілы іх перадачы на пісьме адсутнічалі не толькі ў старажытнасці, але і на працягу першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя, што засведчыла моўная практыка гэтых перыядаў, дзе ўжыванне прыстаўных галосных характарызавалася значнай непаслядоўнасцю.

У 20-я гады XX ст. адпаведныя законы правапісу прыстаўных галосных, якія ў поўнай меры паспрыялі б ліквідацыі непажаданага разнабою, таксама не былі сфармуляваны. Аўтары першых практычных дапаможнікаў па беларускай мове звярталі ўвагу, найперш, на канстатацыю з'яўлення ў маўленні пратэтычных галосных, чым на стварэнне дакладнага арфаграфічнага правіла, якое, паводле назіранняў У. Дубоўкі, калі і падавалася, то "без належнага тлумачэньня або з тлумачэньнямі невыстарчальнымі" [Дубоўка, 1927, *89*]. Так, у падручніку Р. Астроўскага, скампеляваным з распрацовак Б. Тарашкевіча і Я. Лёсіка, указвалася толькі на тое, што "прыдыханьне *і, а* часта зьяўляецца перад злучэньнем двух або трох зычных на пачатку слова: *іржа, імгла, імжачка, ільняны (альняны)*" [Беларускі правапіс, 1925, *12*]. Пра ўмовы рэалізацыі правіла нічога не гаварылася.

"Гэтая прыстаўка гукаў *і—о (а)* аб'ясняецца тым, — адзначаў Я. Лёсік, — што даўней у такіх словах пасьля *р, л, в* і *м* стаяў глухі зычны *ъ* або *ь*; з стратаю гэтых ненаціскных глухіх вытварыўся цяжкі для вымаўленьня зьбег зычных, які разьбіваецца цяпер прыстаўнымі гукамі *і — а.*

Прыстаўное *і* можа зьявіцца і перад іншым зьбегам зычных на пачатку слова, напр., *істужка, ігруша, ільецца*, але гэта *і* не фонэтычнае, і скарэй скажуць: *стужка, груша, скрыпка, льецца"* [Лёсік, 1926, *68; 69*].

Падобныя неканкрэтныя рэкамендацыі адносна правапісу прыстаўных уносілі блытаніну ў арфаграфію тагачасных беларускіх выданняў. Але, нягледзячы на гэта, факты адвольнага ўжывання пратэтычных *а, і* не сталі аб'ектам усебаковага абмеркавання ні ў друку, ні на акадэмічнай канферэнцыі па рэформе азбукі і правапісу (1926).

Адным з першых, хто звярнуў увагу грамадскасці на размытасць граніц існуючых фармулёвак, быў у 20-я гады У. Дубоўка, які лічыў, што далейшая распрацоўка правапісу прыстаўных галосных не ўскладніць вывучэнне нашай арфаграфіі, у той час як "дэталяваньне і большая яснасьць паслужаць на карысьць, а не на шкоду" [Дубоўка, 1927, *90*].

Падмуркам для выпрацоўкі ўласнага бачання канкрэтызацыі правіла напісання прыстаўных галосных сталі даследаванні Я. Карскага і А. Шахматава, дзе навукоўцы абгрунтоўвалі наяўнасць адзначаных гукаў у беларускай мове "ўхіленьнямі няўдобнага зачыну слова" [Дубоўка, 1927, *89*].

Менавіта на падставе гэтага сцвярджэння, пра што сведчаць спасылкі на адпаведныя працы названых даследчыкаў, паэт падкрэсліваў: "Трэба раз назаўсёды ўстанавіць адно: прыстаўныя галосныя, прыдыханьні, падвойныя формы некаторых склонавых канчаткаў (напр., канчаткі прыметнікаў роднага склону, жаночага роду ў адзіночным ліку — *ае, ай*...) зьяўляюцца ў народнай мове не выпадкова, а дзеля мэты ўхіленьня нямілагучных гуказлучэньняў" [Дубоўка, 1927, *89*].

Другім важным крытэрыем, які нельга ігнараваць навуковай думцы падчас стварэння аб'ектыўнага арфаграфічнага правіла для пратэтычных галосных, паводле асабістага назірання У. Дубоўкі, павінен быць факт шырокага ўжывання прыстаўнога *і* перад любым збегам зычных. "Можна было б налічыць вялікую колькасьць выпадкаў, — пісаў ён, палемізуючы з Я. Лёсікам, — калі ў літаратурнай мове гэтае *і* якраз ужываецца" [Дубоўка, 1927, *89*]. Праўда адпаведныя прыклады для пацверджання сваёй думкі паэт не прыводзіць.

У выніку вышэй адзначаных зыходных меркаванняў, што, на думку У. Дубоўкі, не могуць і не павінны выклікаць ніякіх спрэчак, і быў складзены ім праект канкрэтызацыі правіла напісання прыстаўных галосных. Згодна з гэтым праектам, каб правільна пісаць прыстаўныя галосныя ў тым ці іншым слове, патрабавалася ўлічваць толькі два істотныя моманты.

Першы датычыўся збегу зычных, што пачынаецца літарамі *р, л, в.* У такім выпадку перад імі, паводле прапановы паэта, прыстаўныя *і, а* неабходна пісаць заўсёды, паколькі ў такой пазіцыі галосныя "зьнітаваліся на цягу часу з асновaю і не выпадаюць ні пры якіх зьіначаньнях" [Дубоўка, 1927, *91*].

Другая заўвага датычылася напісання прыстаўных галосных перад іншымі зычнымі і перад *м,* калі за ім не ідуць шыпячыя (*імшара*). Прапаноўвалася пры перадачы на пісьме пратэтычных *а, і* ўлічваць характар папярэдняга гука. "Калі папярэдняе слова, — пісаў У. Дубоўка, — мае адкрыты канчатак, прыстаўное *і* ня ўжываецца, калі закрыты ці зьмякчаны — ужываецца (*белая стужка; шмат істужак; вялікая груша; на вялікай ігрушы*)" [Дубоўка, 1927, *91*].

Моўная практыка і далейшыя тэарэтычныя распрацоўкі пытанняў арфаграфіі не ва ўсім пацвердзілі довады У. Дубоўкі адносна напрамку кадыфікацыі правіла напісання прыстаўных галосных. І для гэтага, безумоўна, былі свае аб'ектыўныя прычыны. Адна з іх — паспешлівы, без належнага, грунтоўнага асэнсавання фактычнага моўнага матэрыялу вывад паэта адносна шырокага ўжывання прыстаўных галосных перад любым збегам зычных, што прывяло, фактычна, да памылковых абагульненняў і бяздоказных арфаграфічных рэкамендацый. Навуковыя крыніцы сучаснага мовазнаўства сведчаць пра адваротнае. Так, паводле дадзеных А. Падлужнага, лексіка-граматычная сфера пашырэння прыстаўных галосных вельмі абмежаваная ў сувязі з абмежаванай лексіка-граматычнай рэалізацыяй такіх спалучэнняў зычных, перад якімі яны могуць мець месца [Крывіцкі, Падлужны, 1984, *146*].

Разам з тым, на наш погляд, асобныя палажэнні правіла перадачы на пісьме прыстаўных галосных, сфармуляванага У. Дубоўкам, нягледзячы на аўтарскі суб'ектывізм і некаторую памылковасць, аказалі пэўны ўплыў на далейшае ўдакладненне адпаведнага арфаграфічнага закона, пра што сведчаць дапаўненні, якія ўносілі і працягваюць уносіць наступныя нармалізатары беларускай літаратурнай мовы. Так, у чарговым перавыданні падручніка "Беларускі правапіс", які выйшаў пасля публікацыі Дубоўкавых заўваг, Я. Лёсік хаця і не падтрымлівае прапановы паэта, аднак у адрозненне ад папярэдніх выданняў гэтай кнігі

інтэрпрэтуе правіла напісання прыстаўных галосных больш дакладна і канкрэтна, на чым, уласна кажучы, настойваў У. Дубоўка.

Згодна з Я. Лёсікам, пратэтычныя *а, і* патрэбна заўсёды пісаць перад збегам зычных, які пачынаецца з в, л, м, р, і ніколі не пісаць перад іншымі спалучэннямі зычных [Лёсік, 1929, *26*].

Вялікую ролю адыграла ідэя У. Дубоўкі ўлічваць пры напісанні прыстаўных галосных характар папярэдняга гука ў спалучэнні зычных. "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" і па сённяшні дзень рэкамендуюць нязменна захоўваць прыстаўныя галосныя перад збегам зычных, што пачынаецца з *м* (*імчаць, імклівы, амшара*), а ў пачатку слова перад групай зычных, у якой першымі выступаюць *р* або *л*, улічваць знакі прыпынку і характар папярэдняга гука.

Не адыходзяць ад гэтага прынцыпу і аўтары індывідуальных праектаў рэфармавання беларускага правапісу. "Калі спрадвечнабеларускае слова, — адзначае В. Вячорка, — пачынаецца на зьбег зычных гукаў, першы зь якіх — санорны *л, м, р*, а другі шумны *б, в, г, д, дз, дж, ж, ш, с*, у пачатку слова перад такім зьбегам вымаўляецца й пішацца прыстаўны *і* або *а*: *ільгота, амшара, Амсьціслаў*. Але калі папярэдняе слова ў сказе сканчаецца на галосную літару, прыстаўныя галосныя, як правіла, не вымаўляюцца й ня пішуцца" [Вячорка, 1991, *254*].

Аднак і па сённяшні дзень у нашай пісьмовай практыцы назіраюцца адступленні ад існуючай арфаграфічнай нормы. Прычынай таму, згодна з вывадамі Б. Пятровіча, усё тая ж недасканаласць фармулёўкі, якая, на думку даследчыка, грашыць абсалютызмам, паколькі ў беларускай мове ёсць вялікая колькасць слоў, дзе прыстаўны *і* перад групай зычных з першым санорным *м* не пішацца (*мроіць, мружыць, млява*) [Пятровіч, 1991, *10*], акрамя таго, маюцца літаратурныя варыянты: *мчаць — імчаць* інш.

Такім чынам, У. Дубоўка быў адным з першых дзеячаў культуры 20-х гадоў XX ст., хто ініцыіраваў неабходнасць удасканалення правіла напісання прыстаўных галосных *а, і*. Нягледзячы на памылковасць сваіх вывадаў адносна шырокага ўжывання ў маўленні прыстаўных галосных, паэт тым не менш, на наш погляд, часткова прадвызначыў лёс іх правапісу ў нашым мовазнаўстве. А ідэя ўлічваць характар папярэдняга гука застаецца адным з асноўных крытэрыяў напісання прыстаўных галосных перад зычнымі *р, л*.

ЛІТАРАТУРА

Багдановіч А. Аб неўстаноўленых выпадках нашага правапісу // Полымя. 1925. № 7. С. 154—157.

Беларускі правапіс. Вільня, 1925. С. 12.

Беларускі правапіс: Проект. Мн., 1930. С. 13.
Выгонная Л.Ц. Ад гука да літары. Мн., 1991. С. 32.
Вячорка В. Правапіс: Спроба сучаснае нармалізацыі // Спадчына. № 4. С. 265—267.
Гапоненка І.А. Арфаграфія беларускіх выданняў пачатку XX стагоддзя: Дыс... канд. філал. навук: 10.02.01/ БДУ. Мн., 1993. С. 87—88;
Дубоўка У. Некаторыя прыватныя выпадкі мілагучнасьці нашае мовы // Узвышша. 1927. № 4. С. 90.
Крывіцкі А.А., Падлужны А.І. Фанетыка беларускай мовы. Мн., 1984. С. 146.
Лёсік Я. Беларускі правапіс. 8-е выд. выпр. Мн., 1929. С. 26.
Лёсік Я. Граматыка беларускай беларускае мовы: Фонэтыка. Мн., 1926. С. 68—69.
Лёсік Я. Неўстаноўленныя выпадкі нашага правапісу // Полымя. 1925. № 2. С. 129.
Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (Праект новай рэдакцыі). Мн., 1999. С. 29.
Працы акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі. Мн., 1927. С. 149.
Пятровіч Б. Не рэформа, а ўдасканаленне // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1991. № 7—8. С. 10.
Рабкевіч В. Верш і літаратурная норма // Вобраз-81: Літ.-крытыч. артыкулы. Мн., 1980. С.127.
Ралько І.Д. Верш і мова: Праблемы тэорыі і гісторыі беларускага верша. Мн., 1986. С. 246.
Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. Выданне другое. Вільня, 1919. С. 54.
Юргелевіч П.Я. Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Мн., 1958. С. 50.
Яновіч А.І. Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы новага перыяду // Беларуская лінгвістыка. 1987. Вып. 31. С. 22.
Luckiewič A. Jak prawilna pisać pa bielarucku. Wilnia, 1917. S.10.

К.П. Любецкая

БЕЛАРУСКІЯ ЭКВІВАЛЕНТЫ ДА СКЛАДАНЫХ ТЭРМІНАЎ З НЯМЕЦКАЙ МОВЫ Ў "СЯМІМОЎНЫМ СЛОЎНІКУ" (ЛЕЙПЦЫГ, 1918)

Сярод арыгінальных лексікаграфічных выданняў пачатку XX стагоддзя звяртае на сябе ўвагу "Сямімоўны слоўнік" ("Sieben-Sprachen Wörterbuch". Лейпцыг, 1918). Гэты перакладны слоўнік ствараўся, як адзначаюць укладальнікі, для вайсковых мэт. Ён павінен быў дапамагчы прадстаўнікам нямецкіх улад у зносінах з мясцовым насельніцтвам на акупаванай тэрыторыі Расіі.

Вядома, вялікай навуковай вартасці даведнік не мае. Найперш па той прычыне, што ў час яго выдання не існавала ўсталяваных літаратурных нормаў у беларускай мове, і яго стварэнне адбывалася ў неспрыяльных умовах вайны без удзелу вучоных-лінгвістаў. Але, як слушна адзначаў у свой час вядомы лінгвіст і літаратуразнаўца М. Байкоў, сам факт такога выдання заслугоўвае ўвагі.

Паняційны змест рэестравых слоў, а таксама характар распрацоўкі

сведчаць, што слоўнік з'яўляецца перакладным тэрміналагічным. Гэта пацвярджаюць і самі ўкладальнікі, адзначаючы ва "Уступе", што спіс нямецкіх слоў быў спецыяльна выбраны з ваеннай, кіраўнічай сфер для штодзённай працы на акупаванай тэрыторыі. Паколькі падчас укладання перакладнога даведніка беларуская мова яшчэ не ўвайшла ў шырокі ўжытак, у навуковыя сферы, не мела кадыфікаванай тэрміналогіі, то перад аўтарамі "Сямімоўнага слоўніка" стаяла задача пошуку беларускіх эквівалентаў да нямецкіх тэрмінаадзінак. Вопыт складальнікаў слоўніка стаўся адным з першых у справе перакладу нямецкіх тэрміна-адзінак на беларускую мову і, адпаведна, распрацоўкі беларускай тэрміналогіі.

Як вядома, структура нямецкай мовы вызначаецца кампактнасцю выражэння складаных панняцяў у складаных словах, якія даволі багата прадстаўлены і ў "Сямімоўным слоўніку". Цікава вызначыць, якія эквіваленты да нямецкіх тэрмінаў прапаноўваліся аўтарамі слоўніка ў беларускай частцы. Значная частка нямецкіх тэрмінаадзінак у перакладным даведніку — гэта складаныя па структуры субстантывы. У якасці тэрміна-ўтваральнай базы ў іх выступаюць пераважна два паўназначныя словы, напрыклад: *Verzollungspflicht (Verzollung i Pflicht), Druckfehler (Druck i Fehler), Verwaltungsbehörde (Verwaltung i Behörde), Strafgefangener (Straf i Gefangener), Gemeindemitglied (Gemeinde i Mitglied).* Сярод складаных назоўнікаў вылучаюцца і такія кампазіты (але іх у слоўніку няшмат), у саставе якіх больш за дзве асновы (3 або 4), напрыклад: *Zivilversorgungsschein (zivil, Versorgung i Schein), Buchführungspflicht (Buch, Fьhrung i Pflicht), Feldoberpostdirektion (Feld, ober, Post i Direktion).*

Для нямецкіх кампазітаў, незалежна ад колькасці ўваходзячых адзінак, характэрна розная ступень "злітнасці" кампанентаў. Даволі значную групу ўтвараюць тыя складаныя словы, значэнне якіх не вынікае прама з значэнняў кампанентаў. Такія складаныя тэрміны ўяўляюць сабой семантычна непадзельныя адзінкі, напрыклад: *Zweigstelle — addziel, Brombeer — ажына.* Эквівалентам да нямецкіх кампазітаў, якія характарызуюцца "семантычнай злітнасцю" кампанентаў, семантычнай нераскладальнасцю выступае ў беларускай частцы часцей за ўсё **лексічная адзінка, простая** або **вытворная** (суфіксальная, прэфіксальна-суфіксальная) **па структуры,** напрыклад: *apawieščiennie — Merkblatt, bor — Nadelwald, asuška (ralli) — Trockenlegen (des Ackers), sacha — Hakenpflug.* У шэрагу выпадкаў беларускімі адпаведнікамі з'яўляюцца словы, якія ўтвораны шляхам чыстага складання двух слоў у адно слова і пішуцца праз злучок, напрыклад: *aficer-weterynar — Veterinäroffizier, hienerał-feldmaršałak — Generalfeldmarschall, hienerał-hubernatarstwa — Generalgouvernement, soceał-demokrat — Sozialdemokrat.*

Пры перакладзе нямецкіх кампазітаў аўтары слоўніка часам калькуюць структуру нямецкага тэрміна. Змадэляваная словаўтваральная калька супадае з калькуемым аб'ектам па спосабу ўтварэння, па колькасці і парадку размяшчэння словаўтваральных адзінак, параўн.: *супара — paradak — Rangordnung, lesapilnia — Sägemühle, samapomač — Selbsthilfe, samahubiec — Selbstmörder.*

Другую групу нямецкіх складаных тэрмінаў у слоўніку ўтвараюць кампазіты, словаўтваральнае значэнне якіх вынікае з сумы значэнняў уваходзячых кампанентаў. Сэнсавыя адносіны паміж кампанентамі нераўназначныя. Значэнне першага кампанента з'яўляецца ўдакладняльным, дадатковым, значэнне другога канцавога, апорнага — асноўным. Беларускімі адпаведнікамі такіх нямецкіх складаных тэрмінаў выступаюць у слоўніку словазлучэнні розных мадэлей: "назоўнік + прыметнік", "назоўнік + залежны назоўнік без прыназоўніка ў родным склоне", прыназоўнікавыя і склонава-прыназоўнікавыя канструкцыі. Словазлучэнні выступаюць як своеасаблівыя складаныя або разгорнутыя назвы з'яў.

Самай прадуктыўнай сталася мадэль «**назоўнік + прыметнік**», схематычна A←S і S→A, напрыклад: *абжаленy sud — Berufungs — oder Beschwerdegericht, admnistracijny urad — Verwaltungsbehörde, asabowaja karta — Personalblatt, chrybietny stoúb — Rückgrat, tyfus plamisty — Flecktyphus.* Першы кампанент нямецкага складанага слова перакладаецца на беларускую мову пераважна адносным прыметнікам. Функцыянальна яны падобныя, паколькі знаходзяцца ў падпарадкавальнай сувязі і выконваюць ролю азначальнага элемента, характарызуючы субстантыў. Паводле значэння адносіны да другога прадмета, якія выражаюцца прыметнікам і адпаведна першым кампанентам у нямецкім тэрміне, наступныя: адносіны да матэрыялу, з якога зроблены прадмет: *wiarowačny tawar, papierowyje hrošy, siarebrany rubiel;* да рэчыва, з якога ён складаецца: *žytni chleb, žytniaja muka, alejnaje siemia*; да дзеяння: *pišucaja mašyna, drukarskaja mašyna, ahrewalnaje ustrojstwa, pramakalnaja papiera*; да прызначэння: *handlowaja haspoda, kuchannaja pryłada*; да месца знаходжання: *lasny prastupak*; да прасторы: *marskaja mila*; па прыналежнасці (не індывідуальнай) аднаго прадмета другому: *panskaja rada, adwakackaja rada, kupiecki sud.*

Шырокае выкарыстанне прыметніка ў беларускай частцы абумоўлена тым, што менавіта ён як адзін з асноўных сродкаў класіфікацыі і спецыялізацыі прадметаў, з'яў навакольнага асяроддзя выражае прымету відавога адрознення, можа адлюстроўваць ускладненую структуру рэалій. Параўнайце прыведзеныя ў слоўніку спалучэнні на-

зоўнікаў *умова, устава* (родавыя паняцці) і прыметнікаў, якія абазначаюць відавыя адрозненні, напрыклад:

umowa praúnaja	*umowa miestowaja*
umowa mytnaja	*ustawa spławiecaja*
umowa padłožnaja	*ustawa sudowaja*
umowa ślubnaja	*ustawa mytnaja*

Двухкампанентныя тэрміналагічныя словазлучэнні "назоўнік + прыметнік" падаюцца ў слоўніку двума спосабамі: азначальны кампанент знаходзіцца ў прэпазіцыі і ў постпазіцыі да азначанага. Формы прыметнікаў дапасуюцца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне. Параўн.: *raznosny promysl — Hausiergewerbe, promysiel antałažny — Spitzenindustrie, promysl handlowy — Handelsgewerbe; wyniatkawaje prawa — Alleinrecht, prawa uhaloúnaje — Strafrecht.*

У беларускай частцы слоўніка зафіксаваны таксама словазлучэнні назоўнікаў з якаснымі прыметнікамі. Яны суадносяцца з нямецкімі складанымі тэрмінамі, першы кампанент якіх з'яўляецца таксама якасным прыметнікам. Параўн.: *wialikaje napruženie — Hochspannung.*

Даволі багата прадстаўлена ў беларускай частцы лексікона група **"назоўнік + залежны назоўнік без прыназоўніка ў родным склоне"**, схематычна S→S2. Словазлучэнне "назоўнік + залежны назоўнік без прыназоўніка ў родным склоне" ў беларускай мове адпавядае тым нямецкім складаным па структуры тэрмінам, дзе апорны кампанент — аддзеяслоўны назоўнік і абазначае працэс дзеяння, а першы кампанент — агульны назоўнік, аб'ект дзеяння, напрыклад: *Gesetzesversetzung — narušennie zakona, Preisdrücker — panižalnik cany, Zahlungseinstellung — spyn płacieży, Güterabfertigung — atpraúka tawaraú;* апорны кампанент — агульны назоўнік, а першы кампанент — аддзеяслоўны назоўнік, які з'яўляецца аб'ектам дзеяння, напрыклад: *Einnahmekapitel — addzieł prychodaú, Eröffnungsbilanz — biłans atkryccia, Verpflegungskosten — košty strawawannia, Herstellungsort — miejsce wyrabu;* апорны і першы кампанент — агульны назоўнік, напрыклад : *Kreditbedürfnis — patreba pawieru, Gewinnanteil — casc dachodu, Prozentsatz — razmier procentu, Abschnittsführer — načalnik dzieli.*

Актыўнае выкарыстанне падобных канструкцый можна тлумачыць семантычнай ёмістасцю роднага азначальнага, магчымасцю пры яго дапамозе адлюстраваць розныя відавыя прыметы, больш дакладна ахарактарызаваць шматлікія ўласцівасці новых з'яў. Параўн., напрыклад, спалучэнні з назоўнікам *права*:

prawa *asoby*	*— Personenrecht*	***prawa*** *zakładu*	*— Pfandrecht*
-«- hołasu	*— Stimmrecht*	*-«- zatrymannia*	*— Zurückbehaltungsrecht*
-«- kupli	*— Güterrecht*	*-«- zwyčaju*	*— Gewohnheitsrecht*

-«- валадзеннія — Besitzrecht -«- ydawiectwa — Verlagsrecht
-«- wykupa — Rückkaufsrecht -«- zahadywannia — Verfügungsrecht.

Па характары семантыка-сінтаксічных значэнняў вызначаюцца наступныя значэнні: суб'ектныя (*albom prastupnikaú, pakazannie swiedak);* аб`ектныя (*wypyty swiedak, zwarot koštu)*; азначальныя (*ustanowa apieki, ustanowa fundacii).* Галоўны кампанент тэрміналагічных словазлучэнняў кіруе формай роднага склону залежнага назоўніка і стаіць у прэпазіцыі да яго.

Разнастайнасцю ў сваім афармленні характарызуюцца **прыназоўнікавыя і склонава-прыназоўнікавыя канструкцыі**. Прыназоўнікі ў словазлучэннях з'яўляюцца сродкам выражэння структурна-семантычных адносін паміж кампанентамі словазлучэння і перадаюць шырокае кола семантыка-сінтаксічных значэнняў і іх адценняў, напрыклад, атрыбутыўна-аб'ектныя: *aznajmiennie ab štrafie — Strafbescheid, zabiaspieka ad nieščaścia — Unfallversicherung*; прычынныя: *arešt za daúhi — Schuldhatt*, прызначэння і мэты: *karta na palewannie — Jagdschein*, сумеснасці: *kraža z uzłomam — Einbruchs-Diebstahl* і інш. Асноўны тып сувязі паміж назоўнікамі — прыназоўнікавае кіраванне; парадак слоў характарызуецца постпазіцыяй залежнага кампанента. Найбольш багата выкарыстана ў слоўніку мадэль S → (для, дзеля) S2. Канструкцыі гэтай мадэлі маюць азначальна-аб'ектнае значэнне, напрыклад: *hornica dla pryjma — Sprechzimmer, bilet dziela prajezdu — Fahrkarte, hadzina dla pryjma — Sprechstunde, aficer dla razwiedki — Nachrichtenoffizier.*

У беларускай частцы шматмоўнага лексікону эквівалентам нямецкаму кампазіту выступае часам не адзін, а некалькі адпаведнікаў. Гэта могуць быць альбо сінанімічныя словы аднаго лексіка-граматычнага класа слоў, альбо слова і словазлучэнне, напрыклад: *fond, kapitał — Fondsüberschreibung, kupiec, handlar — Handelsmann, paruka, zakład — Sicherheitsleistung; hramadzki zbor, padatak — Gemeindesteuer, raspiska ab pryniaćci, kwitok — Empfangs-bescheinigung, skarbny, rendant kasy — Kassenrendant, cena za prajezd, taksa — Fahrpreis.* На першым месцы можа стаяць і аднаслоўны эквівалент нямецкаму кампазіту, і словазлучэнне.

У заключэнне трэба адзначыць, што адпаведнікамі да нямецкіх складаных па структуры тэрмінаў у беларускай частцы з'яўляюцца пераважна словазлучэнні. Сярод прапанаваных мадэлей словазлучэнняў колькасным багаццем у беларускай частцы вызначаюцца наступныя: "назоўнік + прыметнік", "назоўнік + залежны назоўнік без прыназоўніка ў родным склоне" і прыназоўнікавыя канструкцыі.

В.М. Ляшук

МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АЎТЭНТЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРНАГА ТЭКСТУ

Фальклор у культуры кожнага народа займае адметнае месца, адлюстроўваючы ў сістэме сваіх жанраў праз спецыфічную мастацкую В рэалізацыю багаты пласт ведаў, назапашаных у працэсе працяглага гістарычнага развіцця, увасобленых у арыгінальную моўную форму. У дачыненні да літаратурных моў позняга фарміравання, да якіх належаць беларуская, македонская, сербская, славацкая і іншыя, нацыянальны фальклор мае анталагічнае значэнне, выступаючы спецыфічнай сферай стандартызацыі маўлення пры вылучэнні і адборы пэўных моўных сродкаў з наддыялектнымі характарыстыкамі. Наддыялектнасць, як вядома, належыць да адной з трох прыкмет літаратурнай мовы (дзвюма іншымі з'яўляюцца апазіцыя вуснай і пісьмовай формы і стылістычная полівалентнасць, таксама ў пэўнай меры ў пэўных элементах рэалізаваныя ў фальклоры, што выяўляецца пры яго асэнсаванні ў навуковым дыскурсе, звязаным з пісьмовай фіксацыяй і сітуацыйнай скіраванасцю рознажанравых тэкстаў).

Навуковы дыскурс аб'ектыўна ахоплівае лінгвістычныя асаблівасці тэкстаў, на што ў большай ці меншай меры звярталі ўвагу ўсе збіральнікі беларускага фальклору, надаючы яму пісьмовую ўпарадкаванасць і тым уплываючы на ўстойлівасць і спрыяючы стандартызацыі яго моўных структур. Аднымі з найбольш рэпрэзентаваных і дакладных у лінгвістычным аспекце выступаюць запісы А.К. Сержпутоўскага, выбраная ім сістэма адлюстравання матэрыялу, пры тлумачэнні якой падкрэсліваецца, што "была звернута асобая ўвага на верную перадачу фігур маўлення апавядальніка і па магчымасці на дакладнае ўзнаўленне вымаўлення" [Сержпутовский, 1999, *24*]. Пры гэтым аўтар падкрэслівае арганічную сувязь фальклору з паўсядзённымі рэаліямі народа: "<...> Уласцівая людзям патрэба адшукаць адказы на жыццёвыя пытанні выпрацавала ў простага чалавека любоў да апавяданняў, казак і да т. п. твораў народнага мастацтва" [Сержпутовский, 1999, *26*]. Значэнне дзейнасці А.К. Сержпутоўскага падкрэслівалі яго сучаснікі і ў далейшым пераемнікі пры навуковым асваенні фальклору.

Аўтэнтычнасць запісаных гэтым навукоўцам тэкстаў заключаецца найперш у захаванні суб'ектыўных адзнак маўлення, звязаных з яго лінейным разгортваннем у часе і выкарыстаннем спецыфічных для вуснай формы мовы сродкаў. На макраўзроўні гэта пэўныя жанры і тыпы маўлення, на мікраўзроўні — службовыя адзінкі ў функцыі канектараў,

актуалізаваная ў тэксце сістэма намінацыі: абазначэнне суб'ектаў (казачных герояў і асоб, што паслужылі крыніцай ведаў у рэальным для апавядальніка універсуме) звязана з дынамікай дзеяння, апісаннем яго вынікаў і фона. Маўленчая асоба з'яўляецца важнай характарыстыкай тэкстаўтварэння казак і народных аповесцей і вызначае элемент суб'ектыўнасці ў казачным разгортванні — у выглядзе падрабязнай дэталізацыі (лірычных адступленняў), мемуарных эпізодаў у зачыне, у выкарыстанні народнай ідыяматыкі. У аўтэнтычных казачных тэкстах, як у любых творах вербальнай дзейнасці, вычляняюцца тры семантычныя тэкставыя зоны, звязаныя з рознымі рэпрэзентацыйнымі характарыстыкамі, якія вызначаюць вылучэнне: 1) базавага тэксту, што абазначае аб'екты і іх адносіны ў пэўным універсуме, у тым ліку адрозным ад рэальнага (такім выступае казачны); 2) кантактавага тэксту, што абазначае ўдзельнікаў маўлення, звязаныя з імі аб'екты і іх дачыненні ў актуальным універсуме сітуацыі маўлення; 3) метатэксту, што абазначае моўны выбар тэксту і яго элементаў [Cejka, 1980, *27—28*].

Кожная з названых зон мае для выражэння спецыфічныя граматычныя і лексічныя сродкі, актуалізаваныя ў аўтэнтычных фальклорных тэкстах і зменены (у большай або меншай меры) пры іх літаратурнай апрацоўцы, якая ў максімальным аб'ёме ахоплівае фанетычны ўзровень, тычыцца выроўнівання да асноўных фанетычных асаблівасцей літаратурнай мовы — поўнага акання — у словах з ненаціскным [о] (*гэто, такого, ведамо, доўго, давялосо; братко, бацько, тато, мамо* і інш.) і ненаціскным [э] (*гожэ, пекне; лецець, седзець; ены, его, ему; не хочэ, пішэ, нема, сельцэ; крэўные, родные* і інш.), які паходзіць з каранёвага [а] (*светы*)[1]; падоўжаных (у словах *зелье, насене, жыце; адчапітца, баітца, здаетца, смеютца* і інш.); прыстаўных (*ось, от, онь*). Пад фанетычныя змены падпалі нелітаратурныя рэфлексіі [о] → [а] (*та—то*), [ы] → [а] (*дак—дык, да—ды*)[2]; [о]/[а] → [у] (*ладун, на голуй землі*) і іншыя з'явы. У сучасных перавыданнях не захоўваюць дыфтонгаў. Прыкладам мінімальнага і максімальнага фанетыка-арфаграфічнага змянення пададзім зачын казкі "Шаптуха":

У якомсь сельцы жыла старэнькая баба. Была ена адна, бы тая былінка ў полі. Усе ея крэўные да сваякі даўно паўміралі, а ена як асталаса, дак і ліпіць, як тое гнілое да старое дзераво. Сельцэ было маленькае, моо якіх дымоў дзесяць. На самом канцы стаяла бабіная хат-

---

[1] Гэта слова выступае адным з найчасцейшых прыкладаў названай фанетычнай з'явы ў старажытных беларускіх пісьмовых помніках. Гл.: [Карский, 1955, *105—107*].

[2] Адсутнасць пераходу *а* ў *ы*, апісанага Я.Ф. Карскім на прыкладзе названых слоў. Гл.: [Карский, 1955, *102*].

ка. Ена была такая старэнькая, як і сама баба. Скрывілася да зморшчылася баба, пакрывілася й ее хатка. Нашоўся якісь добры чалавек, што нарабіў у бабіной хатцы падпорак да аблажыў ее загатаю; от і стаіць старэнькая, абросшая мохам, бы ее хаджайка, хатка, стаіць і не варухнется, бо не ведае, у які бок павалится [Сержпутовский, 1999, *182*].

У якімсьці сяльцы жыла старэнькая баба. Была яна адна, бы тая былінка ў полі. Усе яе крэўныя ды сваякі даўно паўміралі, а яна як асталася, так і ліпіць, як тое гнілое ды старое дрэва. Сяльцо было маленькае, мо якіх дымоў дзесяць. На самым канцы стаяла бабіна хатка. Яна была такая старэнькая, як і сама баба. Скрывілася ды зморшчылася баба, пакрывілася і яе хатка. Знайшоўся якісь добры чалавек, што нарабіў у бабінай хатцы падпорак ды аблажыў яе загатаю; от і стаіць старэнькая, аброслая мохам, бы яе гаспадыня, хатка, стаіць і не варухнецца, бо не ведае, у які бок паваліцца [Беларускія народныя казкі, 1986, *419*].

У ім дэталёвае апісанне пабудавана на лексіка-семантычным і сінтаксічным паралелізме з падкрэсленнем няпэўнымі займеннікамі абагульненасці казачнага хранатопа. У другой цытаце адзначаецца лексічная замена дыялектнай адзінкі на літаратурную — *гаспадыня*. Нелітаратурнае *загата* тлумачыцца ў слоўніку з указаннем на матывацыю: *Загата — прызба, уцяпленне для хаты. Ад гаціць — засыпаць зямлёю з галлём і ламаччам* [Беларускія народныя казкі, 1986, *505*]. Пры літаратурнай апрацоўцы А. Якімовіч скараціў тэкст за кошт часткі дэталізацыі:

Жыла ў адным сяльцы старэнькая бабка. Сяльцо было маленькае, хат з дзесяць. І на самым канцы яго стаяла бабчына хатка. Была яна такая ж старэнькая, як і сама бабка. Знайшоўся якісьці добры чалавек, нарабіў бабінай хатцы падпорак і абклаў яе прызбаю. Вось і стаіць яна, бо не ведае, у які бок паваліцца [Ад казкі да казкі, 1964, *56*]. Пры гэтым рэгулярная нейтральная форма арыгінала — лексема *баба* — замяняецца дэмінутывам *бабка*, ад якога ўтвараецца і прыналежны прыметнік *бабчына* (хатка). На лексічным узроўні актуалізуецца літаратурны сінонім *прызба*. Большыя зрухі выяўляюцца ў сінтаксісе (тэндэнцыя да ініцыяльнай пазіцыі дзеяслова ў сказе; замена складаназалежнага сказа на сказ з аднароднымі выказнікамі) і стылі (абмежаванне параўнанняў з актуалізаванай традыцыйнай лексікай, мінімалізацыя моўнага паралелізму, змяншэнне разнастайнасці ў рэалізацыі лінейнасці сказаў).

Высокую частотнасць у казачных тэкстах маюць найменні роднасці і сваяцтва. Ідэя блізкага сваяцтва становіцца базай разгортвання тэксту, найперш у сюжэце адсутнасці ў сям'і дзяцей, жадання іх мець, іх

незвычайнага нараджэння. У аўтэнтычных тэкстах выяўляецца дэталёвая дакладнасць у абазначэнні сямейнікаў, якое перадае дынаміку іх жыцця. Так, старыя бяздзетныя муж і жонка абазначаюцца паводле прафесійнай прыналежнасці мужа, *каваль — каваліха* ("Каваль багатыр" [Сержпутовский, 1999, *39*]) або агульнымі найменнямі *дзед — баба* ("Асілак" [Сержпутовский, 1999, *102*]), цяжарную жанчыну і яе мужа, якога забралі ў рэкруты, называюць адпаведна *жанчына* (затым *маладзіца*) *— (яе) гаспадар*, ("Каваль" [Сержпутовский, 1999, *161; 162*]). Пасля факта нараджэння дзіцяці ў тэксце, як правіла, актуалізуюцца найменні *бацько, матка, сынок (сын)*, а ў дачыненні дзіцяці выкарыстоўваюцца яшчэ градацыйныя найменні паводле яго сталення, уплываючы на дынамічнае разгортванне зместу: *дзіця — (гожы) хлапчук — хлопец — кавальчук — кавалёў сын — Багатыр — каваль Багатыр* ([Сержпутовский 1999, *39*; *40*]); *хлапчук — хлопец — дзецюк* ([Сержпутовский, 1999, *47*]) і інш.

Дэталізацыя праяўляецца ў дачыненні да абазначэння розных ступеняў роднасці і сваяцтва, а таксама звычаёвых асаблівасцей, звязаных з нараджэннем дзіцяці, што адлюстроўвае выраз *бабіць дзяцей* і кплівая мянушка *бабіч*, якія семантызуюцца ў кантэксце казкі "Асілак":

Часта маладзіцы прасілі бабу, каб ена бабіла ў іх дзяцей. Але баба ўсе атпіраласа, бо ведамо, ена баяласа, што як родзіцца ў ее дзіця, то его будуць званъ бабічам да насміхатца [Сержпутовский, 1999, *101*]. Параўн.: *Дзіця ў бабкі-павітухі* [Тураўскі слоўнік, I, *32*]. *Дзіця жанчыны, якая ўжо бабіла* [Матэрыялы, 1970, *19*].

Пры ўказанні на сацыяльныя адрозненні дзяцей выкарыстоўваюцца словы са спецыфічнымі суфіксамі *кавальчук, паніч, шляхтунец* (ад *шляхтун*) [Сержпутовский, 1999, *131; 154*]; для ўказання толькі на малы ўзрост ужываюцца назоўнікі *хлапчук,* не ўскладнены іншымі семамі, *падшпарак, блазен* — ацэначныя найменні: *А ў запечку лежаў* ***хлапчук****, гэтак гадоў дванаццаці* ***падшпарак****, да вельмі цікавы. Хочэтца ему ведаць, як гэто Нічыпар глядзіць на зоры* ("Атрабляне", [Сержпутовский, 1999, *78*]).

Слова *падшпарак* не зафіксавана ў "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" (1979—1984), "Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы (1999), аднак адлюстроўваецца ў дыялектнай лексікаграфіі ў значэнні "падлетак, падшыванец" [Чыгрын, 1979, *36*].

Ступень дэталізацыі закранае народную сістэму тэрмінаў кроўнасці і сваяцтва, уключаючы хрэсьбінныя, — *хрэшчык* (літаратурнае *хроснік/хрэснік*). Пры літаратурнай арацоўцы яны замяняюцца на апісальныя (дакладныя або кантэкстуальныя) найменні з празрыстай маты-

вацыяй: *браціха* [Сержпутовский, 1999, *120*] — *жонка брата* [У трыдзевятым царстве, 1995, *402*]; *хрэшчык* [Сержпутовский, 1999, *120*] — *дзіця брата* [У трыдзевятым царстве 1995, *402*].

Слова — *дзянна* а) дзядзькава жонка; б) цётка, старэйшая жанчына [Тураўскі слоўнік, II, *21*], якое ў аўтэнтычным тэксце паслужыла словаўтваральнай асновай прыналежнага прыметніка: *"Дзянішная доля"* [Сержпутовский, 1999, *120*], пры літаратурнай апрацоўцы было заменена на семантычна не тоесную апісальную канструкцыю: *"Я доля гэтага дзіцяці"* [У трыдзевятым царстве, 1995, *402*] з адначасовай зменай ініцыяльнай пазіцыі.

У сінтагматыцы слова *брат* прасочваецца актуалізацыя семы тоеснасці, кроўнага сваяцтва праз спалучэнне з колькаснымі лічэбнікамі, якасным прыметнікам *родны* (у форме множнага ліку).

Жылі-былі два браты, два родные браты. Ены разам радзіліса, разам хрысціліса, адзін бацько з маткаю іх гадаваў, да не аднакую ім Бог долю даў. За што старшы ні возьметца, усе ему йметца. А малодшы што ні робіць, як ні б'етца, а ему нічого не даетца [Сержпутовский, 1999, *120*].

Апазіцыя *старшы-малодшы* выкарыстоўваецца ў тэксце ў адзіночным ліку ў якасці азначэння да экспліцытна або імпліцытна пададзенага назоўніка *брат*. У аналізаваным тэксце прадстаўлены два варыянты клічнай формы *братко* і *браце* з кантэкстуальнай фіксацыяй першага з іх як формы звароту малодшага брата да старэйшага, другога — у адказе старэйшага брата малодшаму [Сержпутовский, 1999, *120*]. Паралельна выкарыстоўваецца апазіцыя *большы* (брат) — *меньшы* (брат) з выразнай семантыка-стылістычнай матывацыяй — актуалізацыяй семы абстрактнай колькасці (адпаведна вялікай і малой) — у прамой залежнасці з ростам багацця аднаго і поўным збядненнем другога брата. Прычым дэталёвае апісанне звязана з перадачай прычын, працэсу і меры збяднення, пры актуалізацыяі другога элемента абедзвюх лексічных апазіцый (*малодшы*, *меншы*).

Большы брат штодзень та багацее, а малодшы, як ніпрацуе, а штодзень, та усе беднее. То карова голаў падвернула, та ў жанчыны села скула: некаму ні жаць, ні абед падаць. Кожын дзень — неўзгода; кожын крок — прыгода. "Боская воля. Такая, — кажэ, — мая доля".

От гэ ж меньшы брат біўса, біўса да й саўсім пражыўса [Сержпутовский, 1999, *120*].

У далейшым разгортванні сюжэту, звязаным толькі з малодшым братам, для абазначэння апошняга выкарыстоўваецца рэгулярны прыметнік *бедны*, адзінкавыя назоўнікі *бядняк* і *пан* (як фінальны элемент

семантычнай градацыі, актуалізаваны ў простай мове): *Доля знікла, бы туман, а золато зззяе. Згроб яго ён да кішэні й кажэ: "От цепер я — пан"* [Сержпутовский, 1999, *121*].

Адсутнасць дзяцей парушае заведзеную пераемнасць пакаленняў, этапы якой фармулююцца ў чатырох сказах аднатыпнай граматычнай структуры са строгай лінейнасцю і афармляюцца як рытарычныя пытанні ў маналогу дзеда, звернутым да жонкі: *Хто нам на старасці вады падась? Хто нам вочы закрые? Хто нас пахавае? Хто нас будзе памінаць?* [Сержпутовский, 1999, *39*].

У аналагічнай сітуацыі ўзнаўляецца першае з рытарычных пытанняў: *"Хто нам на старасці вады падась?" — часто гаварыла баба й хвартухом уцірала слёзы* [Сержпутовский, 1999, *101*]. Улічваючы, што гэтыя тэксты запісаны ад розных інфармантаў, можна гаварыць пра факт стандартызацыі моўных сродкаў фальклорам, што назіраецца і ў частковай лексічнай адпаведнасці пры апісанні адзнак старасці: *Скрывілася да* ***зморшчылася*** *баба <...>* [Сержпутовский, 1999, *182*]; *<...> дармо, што твар бы раля ўвесь* ***зморшчыўся*** [Сержпутовский 1999, *101*]. Лексічны паралелізм выяўляецца пры апісанні жыцця ў згодзе: *Жылі ены ў згодзе: любіліса-кахаліса ўсе жыце. Разам* ***гаравалі, працавалі,*** *разам аддыхалі* [Сержпутовский, 1999, *101*]; *У яком-тось краю жылі людзі бы ў раю:* ***гаравалі, працавалі*** *да й* ***беды не малі*** [Сержпутовский, 1999, *157*]. Суадноснымі лексічнымі і граматычнымі сродкамі апісваецца і жыццё звычайнага працаўніка: *Жыў ён як усе людзі:* ***гараваў, працаваў, а достаткаў не маў*** [Сержпутовский, 1999, *175*]; *Жыў сабе адзін чалавек. Быў ён не то штоб багаты, а так сабе добры гаспадар;* ***гараваў****, не ленаваўся, дак і* ***маў кусок хлеба*** *й грош пра патрэбу* [Сержпутовский, 1999, *36*]. У апісанай сітуацыі пры сюжэтнай матывацыі актуалізуецца і семантыка шанцавання з выкарыстаннем адпаведнага дзеяслова: *Жыў сабе адзін багаты чалавек. Не то ўжэ, каб ён быў вельмі старэнны або* ***працавіты****, але* ***ему*** *ва ўсём* ***шанцавало*** [Сержпутовский, 1999, *48*]; *Было два браты: адзін багаты, а другі бедны. Абудва ены гаспадаравалі. Што ні зробіць багаты — усе добрэ, усе ў руку, бо* ***ему шанцавало****. А бедны* ***больш яго гараваў****, але што б ні зрабіў — усе з рук плыве: так* ***ему не шанцавало****. Мабыць, ужэ его была такая доля* [Сержпутовский, 1999, *56*].

Прыведзеныя кантэксты ўказваюць не толькі на частотнасць дзеяслова *гараваць*, але і на яго шырэйшую семантыку, чым тая, якая перададзена ў "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы": 1. Жыць бедна, цярпець гора. 2. Сумаваць, тужыць па чым-н.; перажываць якое-н. няшчасце [Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, II, *27*]. Адсутнасць у частцы кантэкстаў антаніміі паміж дзеясловам *гараваць* і выразам *бяды*

не маць, а таксама выкарыстанне першага без адмоўнай канатацыі сведчыць пра наяўнасць у яго семантыкі "цяжка працаваць". Такое значэнне падтрымліваецца сінанімічнымі і словаўтваральнымі актуалізацыямі: ***Працуюць*** *людзі,* ***загаруюць*** *што кольвек, а тут налеціць Змей, аберэ ўсе* <...> [Сержпутовский, 1999, *158*].

Апісанне як добрага, так і дрэннага жыцця звязана з працай, з рознымі яе вынікамі: *Але, пеўне, хутко тое будзе, што кожын сам сабе панам будзе. Усе людзі будуць* ***роўно гараваць****, будуць роўно панаваць* [Сержпутовский, 1999, *104*]; *забраў матку да й паехаў у чужы край, у тое царство, гдзе ўсе людзі* ***роўно працуюць****,* ***з працы жывуць****, адзін другому памагаюць, а затым і* ***ліха не маюць*** [Сержпутовский, 1999, *173*]; *Даўным-даўно спрадвеку жылі сабе людзі, пажывалі, ніякага ліха не зналі. Свет велікі; усюды волно; як* ***патрудзіўся****, так і пажывіўся* [Сержпутовский 1999, 134]; *Так да тых час мужыкі* ***гаруюць****, мужыкі* ***працуюць****,* ***а хлеба не маюць****, часам голадам падыхаюць, бо што ні зробляць, та паны здзіраюць* [Сержпутовский, 1999, *136*].

Пры гэтым слова *гараваць* ужываецца таксама ў кадыфікаваным "Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы" (1979—1984) значэнні і актуалізуецца разам з аднакаранёвым прэдыкатыўны прыслоўем, у тым ліку і ў форме кампаратыву: *Жыў сабе каваль з каваліхаю. Пабраліся ены рано, але да самае старасці не мелі дзецей. Вельмі* ***гаравалі*** *ены, што не даў Бог ім уцехі.* ***Горно****, што ўсе людзі як людзі, а толькі іх пакараў Бог* <...>. *Плача баба й толькі ешчэ* ***гарэй*** *ёй, моташно на сэрцы* [Сержпутовский, 1999, *39*]. Лексічную аманімію раскрываюць часам і заўвагі самога казачніка, як у зачыне казкі "Багатыр": *І той* ***багатыр****, хто* ***мае много*** *ўселякаго* ***дабра****, й той, хто* ***вельмі дужы да здаравенны*** [Сержпутовский, 1999, *185*]. Такое ўдакладненне мае непасрэднае дачыненне да казачнага зместу і заключнага абагульнення: *Тагды пазналі людзі, што дзе багатство, там шчасця немаш, што багатыр ад багатства гіне* [Сержпутовский, 1999, *188*]. Выкарыстаны паўтор мае выразную стылістычную матывацыю — сцвярджэнне недастатковасці празмернага багацця для шчасця, што тлумачыцца праз апісанне (таксама на аснове паўтору) перажыванняў багатыра: *Адно толькі* ***грызло*** *его,* ***грызло*** *й не давало ему ні есці, ні спаць.* ***Грызло*** *его тое ліхо, што калі* ***добрэ****, дак хочэтца ешчэ* ***лепш****, а тут* ***нельга*** *нічого* ***лепшаго*** *прыдумаць. От і пачаў той* ***багатыр*** *схнуць да петрэць, што ад* ***дабра нельга*** *найці* ***дабра*** [Сержпутовский, 1999, *185*].

Суадноснымі лексічнымі і граматычнымі сродкамі перадаецца стан прыгнечанасці, безвыходнасці — у безасабовых канструкцыях з устойлівым лексічным напаўненнем: ***Моташно*** *Семку* ***на сэрцу****,* ***мота-***

шно** й страшно* [Сержпутовский, 1999, *51*]; ***Горно** зрабіласо маскалю, што так людзі кажуць за его дабро* <...> [Сержпутовский, 1999, *52—53*]; *Пахадзіў, пахадзіў маскаль па небу, бачыць, што светые не кураць люляк, не п'юць гарэлкі, не смеютца, ні песень не паюць, і **моташно** ему **стало [Сержпутовский, 1999, *30*]. *Плача баба і толькі **гарэй** ёй, **моташно на сэрцы*** [Сержпутовский 1999, *39*]; *От раз **зрабіласо** ему так **моташно**, што й жыць не мажэ: ходзіць засмуцоны, бы пад землею* [Сержпутовский, 1999, *172*]. Як бачым, устойлівыя элементы спалучаюцца з варыянтнымі ***моташно** стало/зрабіласо/∅*; ***горно/моташно** зрабіласо* і інш. Вылучаныя сродкі належаць у сучаснасці да літаратурных: Горна. *Разм.* 2. *безас. у знач. вык.* Пра цяжкі, прыгнечаны стан, у якім знаходзіцца хто-н., перажываючы гора [Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, II, *71*]; Моташна, *безас. у знач. вык.* 1. Млосна, нядобра (пра стан здароўя). 2. перан. Агідна, прыкра. 3. перан. Аб адчуванні тугі, адзіноты [Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, III, *175*].

Сітуацыі ладу ў сям'і і яго адсутнасці таксама звязаны з устойлівымі стандартнымі лексічнымі і граматычнымі сродкамі: *Жылі сабе дзед і баба. Жылі ены ў згодзе да й ладу, **ніколі не сварыліся, не зневажалі адно другого*** [Сержпутовский, 1999, *83*]; *Жалітца адна маладзіца, што ёй ад гаспадара жыткі нема: як толькі сыдутца, та перш **сваратца**, клінутца, **зневажаюць адно другого**, а потым гаспадар давай ее біць* [Сержпутовский, 1999, *62*].

Аналізаваны матэрыял сведчыць, што важным сродкам разгортвання ў фальклоры выступаюць аднародныя рады, як правіла трохчленныя, з сінанімічнай або тэматычнай лексічнай сістэмнасцю: *Адных **падмовілі**, другіх **застрашылі**, а трэйціх **падпалілі*** [Сержпутовский, 1999, *103*]; ***Падышоў, схіліўса да** дзедочку **пакланіўса*** [Сержпутовский, 1999, *120*]; *Бачыць, аж хлапчук ужэ стаў дзецюком, да такім **гожым, разумным да ўдалым**, што й не ўвазнаць* [Сержпутовский, 1999, *145*]. Двухчленныя аднародныя рады вызначаюцца семантыка-стылістычнымі асаблівасцямі, звязанымі са сродкамі сувязі, якія ўказваюць на сукупнасць: *Паранку пав'ёў ведзьмар **дзеда й бычка** напаіць вадою з свенцонае крыніцы* [Сержпутовский, 1999, *144*]; паслядоўнасць: ***Прыйшоў** дзед да гасподы **да расказвае**, якое з ім было дзіво* [Сержпутовский, 1999, *145*]; *Перш вядзьмар штось шаптаў, загаворваў тую воду, потым **напіўся сам і напаіў** дзеда* [Сержпутовский, 1999, *145*]; паслядоўнасць з адценнем выніковасці: *От **сабраўся** дзед **да й паехаў** з бабаю* [Сержпутовский, 1999, *145*]; ***Лёг да й заснуў**, бы камень* [Сержпутовский, 1999, *169*]; ***Усхапіўся** ён **да й пытае**, ці нема цюцюну й люлькі* [Сержпутовский, 1999, *30*].

Дынаміку разгортвання і пэўнае семантыка-стылістычнае адценне перадаюць у аўтэнтычным фальклорным тэксце паўторы. Без сродкаў сувязі яны ўказваюць на інтэнсіўнасць і працягласць дзеяння/прыметы: *Той* ***пытаў, пытаў*** *і нічога не дапытаўся* [Сержпутовский, 1999, *146*]; ***Ішоў*** *ён,* ***ішоў****, заглядзеўся й упаў з раю ўніз* [Сержпутовский, 1999, *30*]. Злучнік *да* ўплывае на запаволенне разгортвання і абазначае ўстойлівае працяглае дзеяне: ***Ідзе ён да ідзе*** *цёмным лесам і вайшоў у такую гушчэчу, што й свету Божаго не бачно: нельга йці далей* [Сержпутовский, 1999, *40*]; *От* ***едуць*** *ены* ***да едуць*** [Сержпутовский, 1999, *172*].

Акрамя ўстойлівых і пераходных формул з адпаведным граматычным афармленнем [Бараг, 1967, *217—232*], аўтэнтычныя тэксты ўключаюць разнастайныя паводле сінтаксічнай структуры сродкі, суадносныя з аўтарскім мастацкім маўленнем: *От раз быў светы дзень. Весна. Чуць зайшло сонца. Вечар цёплы, пагодны. Павечэралі каваль з кавалі-хаю да й паселі на прызьбе* [Сержпутовский, 1999, *39*]. Індывідуалізаванасць такога маўлення, належнага, паводле класіфікацыі тэкставых зон, да кантактавага актуальнага тэксту, пацвярджае факт яго поўнага фармальнага змянення пры літаратурнай апрацоўцы: *Сядзелі неяк веснавым вечарам яны на прызьбе* [У трыдзевятым царстве, 1995, *318*].

Значны аб'ём кантактнай актуальнай тэкставай зоны звязаны з мемуарным кампанентам, моўныя сродкі ўвасаблення якога набліжаюцца да сродкаў базавай зоны: *Даўно. Я ешчэ быў* ***падшпаркам****. "Што ему дома рабіць, — кажэ* ***бацько****, вечны пакой, — нехай бегае ў Міхаля падпасычам" <...> І якіх только казак ён не знаў!* [Сержпутовский, 1999, *81*; *82*]; *Калі тое было — не ведаю. Мабыць, вельмі даўно, бо от ужэ мне больш капы гадоў, а я ешчэ без парток бегаў, як, бывало, мой* ***дзед****, каб ему лёгенько йкнуласо на том свеце, злезе з печы, апране кажушок да высунетца з хаты на* ***прызбу****, сядзе на сонейку да й кажэ нам казкі. А мы,* ***падшпаркі****, абступім его адусюль і слухаемо тые казкі* [Сержпутовский, 1999, *112*].

У першую чаргу неабходна адзначыць выкарыстанне інфармантамі спецыяльных памінальных фраз у дачыненні да сваіх памерлых сваякоў як факт звычаёвы, што пераклікаецца з тэкставай актуалізацыяй базавай зоны — цытаванымі вышэй рытарычнымі пытаннямі бяздзетнага дзеда: *Хто нас будзе памінаць?* [Сержпутовский, 1999, *39*]. Мемуарнасць як жанравая асаблівасць тэксту ўключае ў сябе скіраванасць на адрасанта, на яго вопыт, у тым ліку і моўны — у сувязі з асноўнымі культурнымі аксіялагічнымі фактарамі, што знаходзіць выражэнне ў дыялагічна арыентаваных рэпліках-стымулах, належных таксама да кантактавай (актуальнай) тэкставай зоны. Яны разлічаны на сітуацыю запісвання

казкі і актыўнае ўспрыманне адрасата-збіральніка, дасведчанага ў пэўных сюжэтна-значных паўсядзённых рэаліях жыцця, на якія скіроўваецца ўвага апавядальніка: *Бачыце, якая тут нетра, якая тхлань: цэлы тыдзень ідзі, та да краю не дацягнешса. Даўней тут была чыстая вада, усе лелело да блішчало на сонейку, бы шкло* ("Чортаво балото", [Сержпутовский, 1999, *177*]); *Бачыце, цепер у нас такая павадэнца, што пакуль цягнетца веселье, малады й маладая трэйко кланяютца кожнаму, каго сустрэнуць. Маладые паклонятца, а стрэчны паблагаславіць іх шчасцем да доляю, трэйко пацалуетца з імі да тагды толькі йдзе далей* ("Ганья", [Сержпутовский, 1999, *173*]); *Гэто было ешчэ за паньшчыну. Вы ўжэ не памятаеце, бо пэўне тагды ешчэ не радзіліся на свет* ("Жаласлівая пані", [Сержпутовский, 1999, *152*]); *Гэто было моо ўжэ за вашу памець от тут недалеко, кале Слуцька. Моо ведаеце, там на шляху стаіць карчомка. Эгэ! Дак у гэтой карчомцы жыў Мендаль <...>* ("Знахадка", [Сержпутовский, 1999, *140*]).

Кантактавая зона тэксту звязана і з іншымі формамі маўленчых стымулаў, напрыклад, пытаннем або загадам: ***Слухайце бо!*** *Скажу вам не казку, а шчырую праўду* ("Пану навука", [Сержпутовский, 1999, *116*]); ***Ці ведаеце,*** *скуль узяўса медзведзь? Медзведзь перш быў такі ж самы мужык, як і ўсе мы, гарапашнікі. Даўно тое было* ("Медзведзь", [Сержпутовский, 1999, *88*]).

Абагульненне выказвання да ўзроўню народнай ідыяматыкі або філасофскіх разважанняў вызначае метатэкставую зону, сігналізатарам якой выступаюць спецыфічныя пабочныя словы або сінтаксічныя структуры абсалютнага сцвярджэння. Прыкладам першага тыпу выступаюць сказы з пабочнымі словамі *ведамо* і *кажуць*: ***Кажуць,*** *што край, та абычай, што село, та нораў, а што галава, та розум* [Сержпутовский, 1999, *45*]; ***Кажуць,*** *даўней быў вельмі вялікі паморак на людзей* [Сержпутовский, 1999, *53*]; *У млыне,* ***ведамо,*** *заўсёды чэрці жывуць* [Сержпутовский, 1999, *70*]; *Але не рады людзі зраджаю, бо,* ***ведамо,*** *наш брат так прывык к уселякой бедзе, што его й добрае палохае* [Сержпутовский, 1999, *149*] і інш. Прыклады другога тыпу, адрозніваючыся сінтаксічнай структурай, маюць выразныя лексічныя паралелі: ***Праўду людзі кажуць****: не вер каню ў дарозе, а жонцы дома* [Сержпутовский, 1999, *33*]; *Цепер куды ні зірні, усюды ліхо на свеце* [Сержпутовский, 1999, *134*]; *Якое толькі плягі нема на людзей!* [Сержпутовский, 1999, *149*].

Суадноснасць тэкставай рэалізацыі ўплывае на аб'яднанне гэтых тыпаў у выказванні: *Бо,* ***ведамо,*** *калі свет захочэ, та й разумнаго здурыць. Не то дурэнь, каго завуць дурнем, а то дурэнь, хто чужым ро-*

зумам жыве. ***Бо праўду казалі старые людзі****: людзей слухай, а свой розум май і ні на кого не зважай* [Сержпутовский, 1999, *112*].

Да метатэкставых сродкаў належаць адзінкі рэгулярнага сігналізавання пунктаў разгортвання з адценнем наратыўнасці. У аналізаваных аўтэнтычных тэкстах гэта часціца *то*, якая адносна раўнамерна ўзнаўляецца ў разгортванні сюжэта з прасторава-падзейнай дынамікай: ***От*** *Бортнік адагнаў крумкачоў, дабіў медзведзя, а з его шкуры зрабіў сабе кажух.* ***От*** *разглядае Бортнік тую пчалу, што медзведзі задралі, бачыць, аж гэто его пчала. Узяў гэто ён ее дрэбы да й давай іх паліваць медовым сокам з кветак. Аблівае да аблівае, а косці ўсе абрастаюць мясам.* ***От*** *пчала заварушылася й ажыла* [Сержпутовский, 1999, *125*].

Цытаваны фрагмент уключае і менш рэгулярную ўзмацняльную часціцу *гэто* ў тоеснай функцыі. Названыя сродкі маюць паралелі ў іншых славянскіх мовах, напрыклад, чэшскай (указальныя часціцы *oto*, *co*). У сувязі з гэтым патрабуюць аналізу ўкраінскія фальклорныя тэксты, паколькі "некаторыя сюжэтныя матывы атрымалі агульную своеасаблівую форму толькі ў беларускіх і ўкраінскіх казках" [Бараг, 1967, *223*].

Такім чынам, гаворачы пра спецыфіку аўтэнтычнага фальклорнага тэксту, неабходна ўлічваць семантычную стратыфікацыю, узаемадзеянне і ўзаемапранікненне зон і фармальную іх рэпрэзентацыю моўнымі сродкамі. Аспекты ўстойлівасці, рэгулярнасці, наддыялектнасці апошніх выяўляюцца на ўсіх узроўнях і звязаны з сітуацыйнай і культурнамоўнай актуалізацыяй семантычнай сістэмы нацыянальнай мовы. Структура тэкстаў фальклорных жанраў належыць да спецыфічных стылістычна ўстойлівых форм, займае аўтаномную культурную сферу, якая мяжуе (перасякаецца) з дыялектнай і літаратурнай сферамі і, выканаўшы ролю анталагічнай базы фарміравання літаратурнай мовы, застаецца актуальнай для асэнсавання навуковым дыскурсам у плане выяўлення механізмаў і аспектаў моўнай дынамікі.

ЛІТАРАТУРА

Cejka M. Funkce a sémantika lexikálních metatextových prostredku v mluveném jazyce // Dialektologický zborník I. Bratislava, 1980.

Ад казкі да казкі: / Складальнік І.І. Разанаў. Мн., 1964.

Бараг Л. Стыль беларускай народнай казкі // Полымя. 1967. № 10.

Беларускія народныя казкі. 2-е выд., дап. / Склад. Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў. Мн.: Навука і тэхніка, 1986.

Карский Е.Ф. Белорусы. Язык белорусского народа. Вып. 1. М.: Изд-во АН СССР, 1955.

Матэрыялы да слоўніка Мінска-маладзечанскіх гаворак / Пад рэд. М.А. Жыдовіч. Мн., 1970.

Сержпутовский А.К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков: Материалы к изучению творчества белорусов и их говора (переизд.). Мн.: Універсітэцкае, 1999.

Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. Мн., 1999.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. (6 кн.). Мн., 1979—1984.

Тураўскі слоўнік: У 5 т. Мн., 1982—1987.

У трыдзевятым царстве: Бел. нар. казкі / Уклад. У.К. Касько, А.С. Фядосік. Мн.: Універсітэцкае, 1995.

Чыгрын І.П. Яшчэ з лексікі нашай вёскі (Чамяры, Слонімскі р-н) // Народная словатворчасць. Мн.: Навука і тэхніка, 1979.

А.Г. Міхальчанка

АБАЗНАЧЭННЕ АСОБЫ ПА САЦЫЯЛЬНЫМ СТАТУСЕ І ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІМ І РУСКІМ ДЗІЦЯЧЫМ ФАЛЬКЛОРЫ

На сучасным этапе актуальным з'яўляецца вывучэнне мовы вуснай народнай творчасці, выяўленне спецыфічных і універсальных рыс у сістэмнай арганізацыі лексікі ў беларускім і рускім дзіцячым фальклоры.

Аналіз лексікі, заснаваны на сістэмным вылучэнні лексіка-семантычных груп (ЛСГ) з улікам семантычных, граматычных, функцыянальных характарыстык іх элементаў, дазваляе вылучыць найбольш функцыянальна і вобразна значныя сукупнасці пры параўнанні іх выкарыстання ў беларускай і рускай мовах, у выніку якога акрэсліваюцца універсальныя і спецыфічныя асаблівасці, звязаныя з лексічнымі, семантычнымі значэннямі.

Аналіз лексічных адзінак у межах ЛСГ у рэпертуары забаўлянак паказвае, што асаблівую ролю выконваюць назоўнікі, якія абазначаюць асноўных суб'ектаў дзеяння пры разгортванні сюжэта. У дзіцячым фальклоры актуалізаваны назвы асоб паводле некалькіх характарыстык: уласныя імёны, назвы роднасці і сваяцтва, назвы асобы па іх сацыяльным статусе і прафесійнай дзейнасці.

ЛСГ назоўнікаў сацыяльнага статусу асобы складаецца:

- са слоў агульных для беларускай і рускай моў: *баба/бабка, пан, поп;*
- слоў, якія адрозніваюцца арфаграфічным напісаннем у беларускай і рускай мовах:

1) (блр.) *мужык/мужычок* — (рус) *мужик/мужичок;*
(блр.) *мальчык* — (рус.) *мальчик;*
(блр.) *маладзічка* — (рус.) *молодичка;*
(блр.) *рабята/рабяткі* — (рус.) *ребята/ ребятки;*
2) (блр.) *дзеўка* — (рус.) *девушка/ девица;*
(блр.) *цётка* — (рус.) *тетушка;*

(блр.) *стары* — (рус.) *старик;*
(блр.) *папіха* — (рус.) *попадья;*
(блр.) *пан/паночак* — (рус.) *пан/паня.*

• рознакарэнных слоў: (блр.) *хлопец/ хлопчык* (рус.) *парень, мальчик;*

• слоў, якія не маюць адпаведнікаў у гэтых мовах :

(блр.) ∅ — (рус.) *старушка ;* (блр.) ∅ — (рус.) *сиротка;*
(блр.) ∅ — (рус.) *нянька/ нянюшка;*
(блр.) *панік/ паніч; паночак; паненка/паненачка* — (рус.) ∅ ;
(блр.) *паповіч* — (рус.) ∅ ;
(блр.) ∅ — (рус.) *барин / барыня / барчата;*
(блр.) ∅ — (рус.) *боярин/ боярыня;*
(блр.) ∅ — (рус.) *князь;*
(блр.) ∅ — (рус.) *сударушка;*
(блр.) ∅ — (рус.) *батрачишечка*;
(блр.) ∅ — (рус.) *холоп;*
(блр.) *кароль, гасудар* — (рус.) ∅;
(блр.) *слуга* — (рус.) ∅ ;
(блр.) ∅ — (рус.) *нищенка.*

Багацце і разнастайнасць лексем, што ўказваюць на сацыяльна-асобасныя адносіны, ствараюць паралельны лексічнай сістэме сваяцтва і роднасці план, звязаны з сацыяльнымі ўзаемаадносінамі паміж людзьмі. Вылучаюцца лексіка-семантычныя гнёзды, элементамі якіх перадаюцца градацыйныя адносіны (па ўзросту, полу, сацыяльнаму стану.

(блр.) *рабяткі — хлопчык — хлопец;* (рус.) *парень — мужик — старик;*

(блр.) *панік — паночак — паніч — пан;*

(блр.) *мужык — пан — кароль;* (рус.) *мужик — пан — барин — боярин.*

Лексема *кароль* звязвае беларускія забаўлянкі з жанрам казкі. Суадноснай з названай лексемай паводле найвышэйшай ступені іерархіі з'яўляецца лексема *бог*, ва ўжыванні якой адлюстроўваецца своеасаблівае збліжэнне плана паўсядзённага жыцця і рэлігійнай сферы, прычым у накірунку да матэрыяльнага свету персанажы забаўлянак выконваюць *у бога* нейкую звычайную для сялянскага побыту працу.

На такую творчую інтэрпрэтацыю скіроўвае і абазначаны назоўнікам суб'ект дзеяння — някідкі звярок *мышка — ласачка.* Ужыванне гэтых тэматычных лексем звязана з тэкстамі тоеснай структуры і/ці тэматыкі "Мышка, дзе была?..", "Ласачка…"

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была *ў пана караля.*
— Што рабіла? — Лыжкі мыла…
[Дзіцячы фальклор, 1972, *390*]

—Ласачка, дзе была?
— *Ў бога!*
— Што дзелала?
— Кросны ткала!
[Дзіцячы фальклор, 1972, *392*]

Рускім лексемам, што абазначаюць пэўныя саслоўі вышэйшага сацыяльнага статусу (*поп, пан, барин, боярин і г. д.*) супрацьпастаўлены лексемы *слуга, холоп, батрачишка, нищенка*, што вызначаюць ніжэйшы сацыяльны статус.

…Выскочил *холоп*
Из господских ворот,..
[*Шейн,* 1900, *117*]

… А бабушкин *батрачишечка*
Он дрова сечет.
[*Шейн,* 1900, *127*]

…А на горке на горе,
У Егорки на дворе.
Две *нищенки* подрались…
[*Шейн,* 1900, *160*]

Нешматлікія лексемы з семантычным кампанентам значэння "сукупнасць людзей" прэзентуюць нацыянальную спецыфіку. Гэта рускія лексемы *народ, попрядушка* і беларускія *талака.*

З пэўнай сукупнасцю людзей звязаны і лексемы *базар — кірмаш.*

— Чэ-чэ-чэ, сарока!
— Дзе была? — Далёка.
— Была ў пана на таку,
— Відзела там *талаку.*
[Дзіцячы фальклор, 1972, *341*]

… В лесу на опушке
На *попрядушке*
[Русский детский фольклор, 1987, *105*]

"Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы" падае наступнае значэнне слова *талака* — "калектыўная дапамога пры выкананні сельскагаспадарчых работ. Раней была пашырана форма ўзаемадапамогі" [Тлумачальны слоўнік, 1999, *651*].

Руская лексема *попрядушка* суадносіцца з беларускай — *вячоркі*, на якіх прадуць [Тлумачальны слоўнік, 1999, *484*]. Тлумачальны слоўнік У. Даля падае адпаведнае тлумачэнне "супрядки, посиделки, вечерки, помочь на пряжу" [Толковый словарь, 1955, *307*].

Лексема *народ* уласціва рускай лексічнай сістэме забаўлянак і абазначае "люди вообще; чернь, простолюдье, толпа" [Толковый словарь, 1955, *461*].

Поповы ребята
Горох молотили…
Ударили восполох –
Всполошили весь *народ*.
[Русский детский фольклор, 1987, *89*]

ЛСГ назоўнікаў са значэннем "асобы па роду прафесійнай дзейнасці" прадстаўлена лексемамі: (блр.) *пастух/ пастушок* — (рус.) *пастух/ пастушок;* (блр.) *каваль / кавалёк* — (рус.) *кузнец;* (блр.) *касец* — (рус.) ∅; (блр.) *дрывасек* — (рус.) ∅; (блр.) *пісар* — (рус.) ∅; (блр.) *дзьяк* — (рус.) *дьякон;* (блр.) ∅ — (рус.) *пономарь.*

Лексема *кузнец* належыць рускай мове, беларускія забаўлянкі змяшчаюць адпаведнік *каваль/кавалёк.*

Коў-коў, *кавалёк,*
Падкуй сапажок.
— Я не буду каваць:
Мае ручкі баляць.
[Калыханкі і забаўлянкі, 1992, *36*]

Идет *кузнец* из кузницы,
Несёт *кузнец* два молота.
Тук, тук, тук,
Да ударил разом вдруг.
[ДФ — ВПА, *36*]

— Сіўка-варонка, далі гойда!
— Куды ляцела?
— К *кавалю* на двор.
— Нашто табе *каваль?..*
[Калыханкі і забаўлянкі, 1992, *37*]

Лексема *пастух* да агульнанароднай лексікі актыўна функцыянуе і ў фальклорных тэкстах, і ў літаратурнай мове.

— Сіўка-варонка, далі гойда!
— Куды ляцела?..
— *Пастухоў* карміць.
— А дзе ж тыя *пастухі?*
— На вайну пайшлі…
[Калыханкі і забаўлянкі, 1992, *37*]

Ішоў казёл мастом,
Ківаючы хвастом.
— А куды ідзеш, казёл?..
— *Пастушкоў* карміць.
— А нашто тыя *пастушкі?*
— Будуць свінак пасвіць.
[Калыханкі і забаўлянкі, 1992, *38*]

Туру-туру, *пастушок.*
— Далеко ли отошел?
— От моря до моря…
[*Шейн,* 1900, *91*]

Выкарыстанне назваў рэлігійных асоб больш уласціва рускім забаўлянкам. Сюды варта аднесці ўжо ўзгаданыя лексемы *поп, дьякон, пономарь.*

Валяй, валяй, каравай.
Пришел к бабе *пономарь.*
[Русский детский фольклор, 1987, *124*]

Дьякон из печи
Ободрал плечи…
[Мудрость народная, 1991, *105*]

Беларуская лексема *пісар* належыць да ўстарэлых, зафіксавана ў адным тэксце, яе лексічным варыянтам з'яўляецца слова *кавалеры.*

Кую, кую, ножку.
Паеду ў дарожку. …
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.
Зачапіўся за пень,

Прастаялі цэлы дзень.
Каб не тыя *пісары*,
Дык стаяў бы да зары.
[Калыханкі і забаўлянкі, 1992, *42*]

Каб не тыя *кавалеры,*
Прастаялі б дзве нядзелі…
[Дзіцячы фальклор, 1972, *384*]

Такім чынам, аналіз лексем у межах дадзеных лексіка-семантычных груп дазваляе сцвярджаць, што лексіка беларускіх забаўлянак карэлюе з лексічнай сістэмай сучаснай беларускай літаратурнай мовы паводле стылістычнай маркіраванасці і ўжывальнасці. Абласныя і ўстарэлыя адзінкі маюць перыферыйны характар. Лексіка рускіх забаўлянак мае меншую сувязь з сучаснай рускай літаратурнай мовай, перадае ўласцівасці сістэмы больш ранняга перыяду яе існавання.

ЛІТАРАТУРА

Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры: Мін. вобл. / Укладальнік В.Д. Ліцвінка: Уклад. муз. часткі Г.Р. Курова. Мн.: Універсітэцкае, 1995.

Беларускі фальклор. Хрэстаматыя.: Выд-е 4-е, перапр. / Склад. К.П. Кабашнікаў, А.С. Ліс, А.С. Фядосік, І.К. Цішчанка. Мн.: Вышэйшая школа, 1996.

Даль В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. М., 1955.

Дзіцячы фальклор. Хрэстаматыя / Уклад. Г.А. Барташэвіч. Мн.: Навука і тэхніка, 1972.

Калыханкі і забаўлянкі. Фальклорны зборнік / Уклад. В.Д. Ліцвінка. Мн., 1992.

Мудрость народная. Жизнь человека в русском фольклоре: В 10 вып. Вып. 1: Младенчество. Детство / Составление, подготовка текстов. вступ. ст. и комм. Аникин В.П. М.: Художественная литература, 1991.

Русский детский фольклор / Сост. М.Н. Мельников. М.: Просвещение, 1987.

Шейн П.В. Великорусс в своих песнях, обрядах, обычаях, сказках, легендах и т. п. Т. 1. Вып. 2 / Изд. Имп. Акад. Наук, 1900.

Ю.В. Назаранка

МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АПАФЕГМАЎ ЯК ВІДУ ТРАПНЫХ ВЫСЛОЎЯЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЫСЛОЎЯЎ ЯКУБА КОЛАСА)

Мы павінны мець мову прыгожую, гучную, простую, але гнуткую і выразную.
Якуб Колас

Выслоўе — з'ява унікальная і шматмерная. Яно можа існаваць як самастойная адзінка (мікратэкст), а таксама з'яўляцца складовай часткай буйнейшага твора.

Немагчыма ўявіць які-небудзь больш-менш значны твор літаратуры без выкарыстання парэміялагічных адзінак (прыказак, прымавак) або афарызмаў — "сціслых, глыбокіх па змесце і закончаных у сэнсавых адносінах выказванняў, якія належаць пэўнаму аўтару і заключаны ў вобразную форму, што лёгка запамінаецца" [5, *3*].

Творчасць Якуба Коласа — самае рэпрэзентатыўнае ў гэтым плане поле дзейнасці для даследчыка, бо адзінкамі, якія трапна, сцісла, ёмістa, часам вельмі іранічна, а часам сур'ёзна акрэсліваюць тую ці іншую асаблівасць паводзін чалавека, яго зносін з навакольлем, насычаны, у залежнасці ад тэмы твора і задумы аўтара, амаль кожны яго твор.

Выслоўе як вельмі старажытны жанр літаратуры (мы і сёння актыўна выкарыстоўваем у паўсядзённым жыцці выслоўі Эсхіла, Сенекі, Арыстоцеля, Піфагора, Платона і інш.) з'яўляецца агульнай крыніцай для шэрагу паняццяў: апроч афарызма яно абазначае яшчэ сентэнцыю, максіму, апафегму, гному, мініяцюру, аўтарскую прыказку і адзінкі іншых малых жанраў.

Такім чынам, выслоўі не абмяжоўваюцца толькі агульнавядомым і звыклым нават для неспецыяліста тэрмінам "афарызм". Выслоўі — "агульная назва для ўсіх відаў трапных выказванняў" [3, *115*]. Яшчэ канчаткова не вырашана пытанне аб класіфікацыі выслоўяў, не выпрацаваны дакладны і агульнапрыняты паняційны апарат, і, як слушна адзначана ў "Гісторыі замежнай літаратуры XVII—XVIII стст.", "афарызм як літаратурны жанр не знайшоў яшчэ ні свайго гісторыка, ні свайго тлумачальніка. Між іншым, гэты жанр трывала зацвердзіўся ў літаратуры" [1, *107*]. Але самыя яркія прыметы, якія трэба браць пад увагу пры вычляненні разнавіднасцяў выслоўяў, наступныя: 1) мастацкая форма; 2) сэнсавая нагрузка; 3) мэта і задума аўтара.

Мы спынімся больш падрабязна на такой разнавіднасці трапных выказванняў у творчасці Якуба Коласа, як апафегма.

Апаф(т)егма (грэч. apophtegma, ад apophtegmai — кажу прама, непасрэдна) — кароткае павучальнае выслоўе, блізкае да сентэнцыі (выслоўе маральна-павучальнага зместу), "упісанае звычайна ў канкрэтную сітуацыю" [2, *15*] і "выказанае ў форме звароту да чытача" [4, *60*].

Усе віды трапных выслоўяў падразумяваюць неардынарную, цікавую форму, выражаную з дапамогай розных моўных сродкаў (найперш стылістычных фігур і тропаў), якая афармляе думкі рознай камунікатыўнай накіраванасці, з вельмі разнастайнымі канатацыямі. З гэтага пункту гледжання Коласавы апафегмы (дарэчы, як і іншыя віды трапных выказванняў у ягоных творах) падзяляюцца найперш на *павучальна-сур'ёзныя* і *камічныя*:

1. Хто з грашамі
   І мажа збоку, — той і едзе,
   Так вось і робіцца, суседзе! (VI, *261*)*
2. Людцы вы мае, у кожным часе
   Затоены свой нейкі план (VIII, *304*).
3. Самае галоўнае, друг ты мой, гэта тое, каб не страціць усведамлення сваіх памылак... (IX, *190*).

1. Ты лепш, браток, падашукай маю жонку, але не ашуквай мяне за чаркаю гарэлкі (IX, 43).
2. Яшчэ на дзеда паглядзеце,
   Калі дзед вып'е на банкеце (VI, *90*).
3. Не валяйся, брат, пад плотам
   З адным лапцем, з другім ботам! (III, *105*).

Што ж тычыцца вычлянення апафегмаў з моўнай тканкі твора, то значная частка адзінак не выклікае сумнення ў прыналежнасці да апафегмаў (наяўнасць звароту да чытача і ўпісанасць у канкрэтную сітуацыю):

1. Праўда, гэта, брат, тое, у што ты веруеш так, што і другіх прымусіш паверыць (IX, *546*).
2. Трэба, брат, многа павучыцца, каб ведаць маленькае (VII, *47*).
3. І праўда, брат, няма культуры там, дзе трудна жыць настаўніку (X, *10*).

Але ёсць нямала выслоўяў, якія цяжка кваліфікаваць адназначна і немагчыма катэгарычна залічваць у тую або іншую групу выказванняў, бо яны дэманструюць прыметы розных моўных адзінак:

1. Ну, ты скажаш! Лепш маўчы,
   Вады ў ступе не таўчы! (III, *67*).

---

* Спасылкі ў тэксце (том, старонка) даюцца па выданню: Колас Якуб. Зб. тв.: У 12-ці т. Мн., 1961—1964.

2. Вярзеш, брат, грушу на вярбе (VI, *236*).

У дадзеных выказваннях разам са зваротам (прымета апафегмы) ёсць устойлівы выраз, які па форме і зместу нагадвае прыказку (1) або фразеалагізм (2).

А вось выслоўе *Ой, Піліп, ой, Піліп! // І выпілі б, каб далі б* (VIII, *114*) блізкае да прымаўкі (вядома, аўтарскай).

Таксама сустракаюцца:

а) ***выслоўі-заклікі***: Прападаць — прападай!
Пі, валі, не шманай
Як пусціўся ў дарогу — не стой! (III, *120*)

— Браткі! Гуляйма! Калі свята,
— Дык трэба выпіць хоць багата! (VI, *69*)

б) ***выслоўі-канстатанты*** (мы ўзялі гэты тэрмін для абазначэння выказванняў, якія не з'яўляюцца чыста павучальнымі, але ўяўляюць сабой сцвярджэнне, падагульненне, моўнае ўвасабленне папярэдняй сітуацыі):

Мой браце беларус! Тваёй сіле,
Цярпенню твайму — пакланіцца (III, *370*).

Мілыя паэты! Дазвольце выказаць вам спачуванне... і пасведчыць перад усім светам, што вы — вялікія пакутнікі на зямлі. (VII, *20*)

І твайго там "алілуя" ніхто нават не пачуе... (III, *160*)

в) ***выслоўі-просьбы***:

Не крычы ты, не крычы
На мяне, Гануля,
І мянушак не лічы,
Языка не муляй! (I, *308*)

г) ***выслоўі-пытанні:***

Ну як табе ўжо не абрыдне
Казаць адно сто раз на тыдні? (VI, *96*)
Ці ты лепшых слоў не маеш
Апроч гэтых жорсткіх слоў? (III, *60*)
Можа лепей замест казкі
расказаць вам адну быль? (III, *167*)

На нашу думку, адзінкі такога кшталту трэба залічыць у разрад субапафегмаў (кожная з іх утрымлівае зварот, але далёка не ўсе маюць маральна-павучальны змест, хаця ўсіх іх аб'ядноўвае магчымасць абазначаць канкрэтную сітуацыю, ужо не менавіта тую, пра якую вядзецца гаворка ў творы).

А зараз паспрабуем вылучыць асноўныя моўныя асаблівасці апа-

фегмаў і субапафегмаў. Асноўная ўласцівасць апафегмаў — зварот да чытача — афармляецца наступнымі спосабамі.

1. Ужыванне неразвітага зваротку (які найчасцей выражаны назоўнікам *"брат"* і сінанімічнымі формамі *"браток"*, *"браце"*, радзей — назоўнікамі ў множным ліку *"браткі"*, *"хлопцы"*, *"сябры"*):

Што ж, брат, каб гэтую смерць узяла другая
смерць, дык зноў бы смерць засталася (IV, *101*).

Стойце, хлопцы, давай
Шанаваць парадак! (VIII, *276*)

Зрэдку ў якасці звароткі выкарыстана ўласнае імя (*Піліп, Гануля* — выслоўі з імі прыводзіліся вышэй).

2. Ужыванне развітага звароткі (*мілыя паэты, мой браце беларус, людцы вы мае* — прыклады гл. вышэй).

3. Ужыванне загаднага ладу дзеясловаў (*прападай, гуляйма* — прыклады вышэй).

4. Ужыванне пабочнага слова:

Усякая, лічы, вантроба прагне гарэлкі (IV, *144*).

5. Ужыванне асабовых займенніка ў (*ты, вам, твайго* і інш. — прыклады вышэй).

6. Ужыванне дзеясловаў у форме будучага часу:

І не намолішся — пагрэшыш
Ды чорта лысага пацешыш (VI, *18*).
Яшчэ на дзеда паглядзеце,
Калі дзед вып'е на банкеце (VI, *90*).

7. Кантамінацыя двух і больш вышэйпрыведзеных сродкаў звароту:

А. Зваротак + форма загаднага ладу дзеяслова:

Не валяйся, *брат*, пад плотам
З адным лапцем, з другім ботам! (III, *105*)

Пі, але розум **май**,
Меру, *браце*,
І парадак **трымай, вядзі** ў хаце! (III, *78*)

Б. Уласны займеннік + зваротак + форма заг. ладу дзеяслова:

Ты лепш, *браток*, **падашукай** маю жонку,
але **не ашуквай** мяне за чаркаю гарэлкі (IX, *43*).

Такім чынам, кантакт з суразмоўцам (чытачом) можа ўстанаўлівацца не толькі з дапамогай звароткі, але і іншымі спосабамі. Трэба адзначыць, што месца звароткі залежыць ад якасці выслоўя — у "чыс-

тых" апафегмах яно звычайна размяшчаецца ў сярэдзіне, а ў субапафегмах зваротак у большасці выпадкаў "прымацаваны" да пачатку сказа.

Падсумоўваючы нашы развагі, трэба адзначыць, што апафегма займае ўвогуле значнае месца сярод выслоўяў Якуба Коласа і вызначаецца не толькі надзвычайнай разнастайнасцю тэматыкі (ад філасофскіх падагульненняў да "гарэлачнага пытання"), але і разнароднасцю моўных сродкаў, а таксама "дазваляе глыбей пранікнуць у эстэтычны свет самога творцы" [4, *64*].

ЛІТАРАТУРА

1. *Артамонов С.Д.* и др. История зарубежной литературы XVII—XVIII вв. М., 1967.
2. *Ахманова О.С.* Словарь лингвистических терминов. М.: Сов. Энциклопедия, 1966.
3. Беларуская мова: Энцыкл./Беларус. энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мн., 1994.
4. *Міхневіч А.Я.* Афарыстыка Якуба Коласа (Да пастаноўкі праблемы) / Беларуская лінгвістыка. 1993. Вып. 22. С. 59—66.
5. *Федоренко Н.Т., Сокольская Л.И.* Афористика. М.: Наука, 1990.

Н.Ю. Паўлоўская

ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СЕМАНТЫЧНАЕ ПОЛЕ АПТАТЫЎНАЙ МАДАЛЬНАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Жаданне ёсць клопат розуму з прычыны недахопу дабра.
Дж. Лок

Аптатыўнасць — адна з шматлікіх мадальных катэгорый, якая грунтуецца на феномене суб'ектыўнасці і яскрава праяўляецца ў мове. Вызначэнне кагнітыўнай структуры аптатыўнасці, эксплікацыя, інтэрпрэтацыя саставу аптатыўных адзінак на лексічным, марфалагічным, сінтаксічным, кансітуатыўным узроўнях, характарыстыка кантэкстуальных і прагматычных умоў выкарыстання аптатываў з'яўляецца важнай часткай таксанамічнай работы, накіраванай на пабудову фрагмента канцэптасферы беларускай мовы.

Базавым для катэгорыі аптатыўнасці з'яўляецца паняцце жаданя — імкненне моўцы да здзяйснення дзеяння, маніфеставанага выказваннем.

Праблематыка аптатываў цікавіла філосафаў яшчэ ў далёкай старажытнасці. Так, Арыстоцель адзначаў, што "жаданне ёсць імкненне да прыемнага" [1, *399*]. Найвышэйшыя прадметы жадання і думкі ён лічыў тоеснымі, таму што прадмет жадання — гэта тое, што здаецца цудоўным. Паводле Арыстоцеля, чалавек хутчэй жадае таго, што яму здаецца добрым: жаданне — "гэта безжурботнае імкненне да дабра" [2, *480*].

Плённа выкарыстоўваючы філасофскую спадчыну мінулага, мова-

знаўцы нашага часу таксама класіфікуюць адзінкі з сігніфікатыўным значэннем жадання на аснове паняццяў геданістычнага дабра. Але "прынцыпіяльная асаблівасць *добра* (*дрэнна*) жадання выводзіцца з таго, што гэта не актуальнае *добра*, а гіпатэтычнае *добра*, такое ж ірэальнае, як і прэдыкат, што яго выклікае" [3, *175*]. Ірэальная, а дакладней, патэнцыяльная прырода *жадання* фіксуецца слоўнікамі як "цяга да ажыццяўлення чаго-небудзь, унутранае імкненне, прадмет захаплення, мары" [4, *197*].

Жаданне наўрад ці можна атаясамліваць толькі з прыемным, і гэта пацвярджаецца мовай, калі часам гавораць: *нясцерпнае*, *пякельнае* і нават *агіднае* жаданне. Такім чынам, жаданне чалавека можа вынікаць і з адмоўных пачуццяў ці выклікаць іх у сувязі з неажыццёўленасцю чагосьці.

Традыцыйна аптатывы разглядаліся як адна з марфалагічных форм дзеяслоўнага ладу (Ф.І. Буслаеў, А.А. Патабня). Але ўжо ў працах А.А. Шахматава і Я.Ф. Карскага аптатывы аналізуюцца з боку семантыкі і функцыяніравання, што дазволіла ўбачыць іх уваходжанне ў парадыгму сказа, прасачыць кантэкстуальную залежнасць значэнняў гэтых адзінак. На працягу XX стагоддзя аптатыўныя канструкцыі ў розных мовах даследаваліся з улікам іх сістэмна-структурных, семантычных, функцыянальных характарыстык, аднак сучасныя формы беларускіх аптатываў застаюцца пакуль што па-за ўвагай даследчыкаў.

Не выклікае разыходжанняў сярод лінгвістаў прыналежнасць аптатываў да катэгорыі *модусу*, дакладней, мадальнасці, хаця некаторыя аўтары адмаўляюць ім у мадальным статусе, мяркуючы, што ў семантыцы адзінак са значэннем жадання ярка выражаны эмацыянальны кампанент (У.М. Бандарэнка, У.З. Панфілаў]. "Ацэнка ў сітуацыі жадання, — піша І.Б. Шатуноўскі, — мае не рацыянальны, а пачуццёвы характар" [5, *294*], але, характарызуючы ацэнкавыя значэнні жадання, побач з эмацыянальным *добра* ён, услед за Н.Д. Арыонавай, вылучае і "інтэлектуальнае *добра*, добра для розуму — у жаданнях розуму, якімі з'яўляюцца жаданні ведаць, разумець, знайсці разгадку, прачытаць цікавы артыкул ці адкласці ў бок нудны" [5, *295*].

Б. Расел, аналізуючы адпаведнае паняцце, вызначыў *жывёльнае* (прыналежнае жывёлам), *прымітыўнае* (неўсвядомленае) і *свядомае* жаданне чалавека [6, *83*]. Калі мець на ўвазе апошнія два тыпы жадання, у іх адзінках пэўным чынам праяўляюцца элементы псіхічнай дзейнасці ч а л а в е к а, куды, акрамя мыслення, ведаў, памяці, успрымання, безумоўна, уваходзяць і эмоцыі.

У аснову класіфікацый аптатыўнай мадальнасці даследчыкі кла-

дуць самыя розныя прынцыпы. Напрыклад, Н.Ю. Шведава, Г.А. Золатава, Л.С. Ермалаева разглядаюць гэтыя структуры ў канструктыўна-сінтаксічным аспекце індыкатыву, г. зн. у семасіялагічным плане сінтаксічнай катэгорыі. Р. Мразек, Й. Светлік, І.П. Распопаў уключаюць аптатывы ў рамкі самастойнай мадальнай катэгорыі камунікатыўнага тыпу, якая патрабуе анамасіялагічнага аналізу. Н.Д. Аруцюнава, аналізуючы тыпы модусных значэнняў, да валітыўных адносіць модусы жадання і волевыяўлення [7, *411*].

Такая разнастайнасць думак зусім не з'яўляецца перашкодай пры даследаванні, а, наадварот, служыць на карысць больш глыбокаму аналізу лінгвістычных адзінак. "Слова можа быць элементам прынцыпова розных семантычных сістэм, паколькі семіятычная семантыка і сінтактыка ўяўляюцца рознымі па сваёй прыродзе сістэмаўтваральнымі фактарамі" [8, *115*].

Найбольш адэкватнай, на наш погляд, з'яўляецца канцэпцыя *ўключэння аптатываў у функцыянальна-семантычнае макраполе мадальнасці волевыяўлення*. У той жа час у семантыцы аптатываў "дастаткова выразна праступаюць скрыжаванні/проціпастаўленні з іншымі семантычнымі вобласцямі («наяўнасць у розуме»/«наяўнасць у аб'ектыўнай рэчаіснасці»; …'сэнсарная/рацыянальная ацэнка')" [5, *296*], узаемадзеянне з мадальнымі палямі магчымасці, неабходнасці, катэгорыяй афірматыўнасці/негатыўнасці і інш.

Падставамі для ўключэння аптатыўнай мадальнасці ў макраполе волевыяўлення з'яўляецца агульнасць канцэптуальных характарыстык волі і жадання — патэнцыяльнасці, крэатыўнасці, валітыўнасці [9, *99*; *100*].

Сапраўды, варта лічыць патэнцыяльнай сітуацыю, якую імкнецца ажыццявіць моўца, жадаючы яе; гэта імкненне з'яўляецца выражэннем волі і яе разнавіднасці — жадання, каб мела месца пазначаная сітуацыя.

Крэатыўныя асаблівасці жадання праяўляюцца ў тым, што, як і воля, жаданне абумоўлена магчымасцю выбару: калі б не было магчымасці і здольнасці выбіраць з шэрагу жыццёвых сітуацый, чалавек наўрад ці мог іх ацэньваць і такім чынам жадаць ці не жадаць.

Для мадальных паказчыкаў волевыяўлення ў выглядзе імператыўных і аптатыўных адзінак агульнай з'яўляецца наяўнасць валітыўнай семы, якая каўзіруецца семай жадання: воля эксплікуецца толькі тады, калі яна падсілкоўваецца жаданнем. Пра наяўнасць элемента волі ў аптатыўных выказваннях гаварыў О. Есперсен [10, *370—372*].

Аптатывы, як і ўсе іншыя маркёры волевыяўлення, адносяць дзеянне ў план будучага. "Жадаць магчыма толькі тое, што адсутнічае, і

немагчыма жадаць таго, што ўжо маецца,"— піша А.А. Івін, у пацвярджэнне сваёй думкі прыводзячы словы Сакрата: немагчыма жадаць таго, што ўжо маеш, але можна жадаць захавання ў будучым таго, што ўжо ёсць [11, *123*].

Паняцці *волі* і *жадання* маюць пэўныя сэнсавыя адрозненні: "чым мацнейшы, чым у большай ступені выбар дэтэрмінуецца жаданнем, тым менш ён з'яўляецца свабодным і тым менш ён з'яўляецца актам выбару, актам волі" [5, *298*]. Можа, з гэтай прычыны чалавека, які кіруецца сваімі жаданнямі, называюць слабахарактарным, бязвольным.

Жаданне ў параўнанні з воляй ацэньвае не толькі падкантрольныя, але і непадкантрольныя і нават немагчымыя сітуацыі, што даказвае больш шырокую сферу яго дзеяння.

Адрозненне імператываў (мадальных адзінак волевыяўлення, якія маюць прататыпны эфект) і аптатываў у тым, што імператыўны прэдыкат неэлементарны, г. зн. ён складаецца з двух кампанентаў — жадання дзеяння і яго каўзацыі; у той жа час аптатыўны прэдыкат уключае толькі кампанент жадання. На думку Т.І. Распопавай, імператыўныя і аптатыўныя мадальныя адзінкі розняцца паводле прыкметы адрасаванасці/неадрасаванасці волевыяўлення. Калі імператывы заўсёды з'яўляюцца адрасаванымі да пэўнага выканаўцы дзеяння, то аптатывы могуць быць як адрасаванымі, так і неадрасаванымі да кагосьці [12, *142*]. У гэтым выпадку трэба адрозніваць паняцці *адрасаванае волевыяўленне*, характэрнае для імператываў, і *адрасаванае паведамленне*, якое мае месца ў аптатыўных структурах. Увогуле, у імператыўных выказваннях адрасаванасць волевыяўлення і адрасаванасць паведамлення зліваюцца разам.

Пры размежаванні імператыўных і аптатыўных адзінак карысны ўлік ступені выражанасці намераў моўцы змяніць экстралінгвістычную сітуацыю, інакш кажучы, ступені інтэнсіўнасці волевыяўлення, што тлумачыцца, галоўным чынам, узроўнем залежнасці дзеянняў адрасата ад волі моўцы. Калі імператыўныя выказванні характарызуюцца найбольшай інтэнсіўнасцю волевыяўлення, то аптатыўныя імкнуцца да зоны яго мінімальнай сілы.

Аналіз ФСП аптатыўнасці належыць весці з улікам аптатыўнай катэгарыяльнай сітуацыі, якая ўключае: 1) суб'ект жадання, у большасці выпадкаў карэферэнтны моўцу; 2) прапазіцыю ў форме прэдыката з семай жадання, часцей за ўсё ў выглядзе двухкампанентнай структуры — інфінітыва са значэннем дзеяння і аптатыўнай мадальнай адзінкі; 3) суб'ект пажаданага дзеяння, адушаўлёны ці неадушаўлёны, які таксама ў пэўных выпадках можа быць карэферэнтным моўцу.

У самым агульным выглядзе формула аптатыўнай сітуацыі будзе наступнай: *S хоча P*.

Для семантычнага чляненне ФСП аптатыўнасці рэлевантнымі з'яўляюцца наступныя інварыянтныя і варыянтныя семантычныя прыкметы: 1) наяўнасць семантычнага інварыянта жадання як усвядомленага адчування патрабавання чалавека, каб мела месца пэўная сітуацыя; 2) футуральна-прэзентная перспектыва; 3) частковая непадкантрольнасць/падкантрольнасць дзеяння; 4) неадрасаванасць (нейтральныя мадальныя адносіны паміж моўцам і адрасатам; тое, што Н.Ю. Шведава трапна пазначыла як "адцягненую накіраванасць да нейкай рэчаіснасці ў цяперашнім, прошлым, будучым" [13, *457*]) / адрасаванасць жадання; 5) бенефактыўнасць (карысць) пажаданага дзеяння; 6) неаблігатарнасць (нізкая ступень верагоднасці рэалізацыі пажаданага дзеяння)/аблігатарнасць выканання дзеяння.

Спецыфіка функцыянальна-семантычнага поля аптатыўнасці заключаецца ў адлюстраванні яго моўнымі кампанентамі вельмі складанага фрагмента знешняга свету, звязанага з псіхічнай дзейнасцю чалавека, якая характарызуецца дыфузнасцю, нерасчлянёнасцю фактаў, што фіксуецца ў семантыцы адпаведных моўных адзінак. ФСП аптатыўнасці з улікам прыведзеных характарыстык будуецца як слаба цэнтраваная структура дыфузнага тыпу.

Ядро поля аптатыўнасці складаюць два цэнтры — лексіка-марфалагічны і сінтаксічны, моўныя адзінкі якіх аптымальна канцэнтруюць прататыпныя семантычныя прыкметы: наяўнасць семы жадання, футуральна-прэзентную перспектыву, частковую падкантрольнасць, неадрасаванасць, неаблігаторнасць, бенефактыўнасць выканання дзеяння.

Першы цэнтр уключае дзеяслоўныя лексемы *хацець, жадаць* і іх дэрываты ў першай, радзей трэцяй асобе адзіночнага і множнага ліку абвеснага ладу (часцей за ўсё ў спалучэнні з інфінітывамі), якія выконваюць функцыю прэдыката: *Я* ***хачу навярстаць*** *страчанае,* ***вярнуць*** *гады, якія ў нас укралі* (І. Шамякін). *А сэрца руху, шуму* ***хоча*** (Я. Колас). — ***Не жадаю, не жадаю*** *я больш. Не трэба мне вашых двух стрэлаў.* ***Не жадаю!***— *крычаў я, як дзіцёнак, і ледзь не тупаў нагамі...*(У. Караткевіч).

Вельмі ўжывальнымі з'яўляюцца выказванні з безасабовымі формамі названых дзеясловаў у спалучэнні з інфінітывам ці без яго, якія таксама ўваходзяць у лексіка-марфалагічнае ядро ФСП аптатыўнасці: *І ўсё ж я шляхціц, — з гонарам сказаў Яноўскі. — Няма жыцця. Дзякуй табе, харошая, але сёння мне* ***хочацца*** *смерці. — Сёння яму* ***хочацца****... Можа, заўтра табе яе зусім* ***не захочацца****, ды позна будзе* (У. Каратке-

віч). *Андрэю раптам* ***расхацелася даводзіць*** *справу да канца* (М. Капыловіч). *Так* ***жадалася вярнуць*** *зноў усё пражытае, усё былое...* (М. Лынькоў).

У адрозненне ад адпаведных дзеясловаў першай і трэцяй асобы, якія маюць у сваёй структуры семантычны кампанент мэтанакіраванасці, гэтыя формы выражаюць жаданне як вынік унутранага стану суб'екта. Безасабовыя формы прэдыката сведчаць пра неагентыўнасць выказвання, што яскрава эксплікуе няздольнасць моўцы кантраляваць жыццёвыя падзеі, адчуванне таго, што людзям непадуладна асабістае жыццё.

На мяжы лексіка-марфалагічнага ядра аптатыўнай мадальнасці размяшчаюцца выказванні з эліптаванымі формамі мадальных дзеясловаў *хацець, жадаць* у спалучэнні з інфінітывамі, якія ў адпаведнасці з кантэкстам часам могуць актуалізаваць сему неабходнасці: *Сярод гамонкі —* ***анямець,*** *// З паўтораў* ***выбіцца,*** *з кружэння, // І — бы ўваскрошання* ***хацець*** *сабе, // Не ўдачы — паражэння* (А. Разанаў). ***Піць*** *малако... //* ***Не ведаць*** *млосці, //* ***Не вандраваць*** *па гарадах, //* ***Быць маладым*** *у маладосці // І* ***памяркоўным*** *у гадах. //* ***Піць*** *малако* (А. Разанаў). *Дажыць да світання* (В. Быкаў). *Стаць перад богам* (А. Трусаў).

Што да канструкцый з дзеясловамі жадання другой асобы адзіночнага і множнага ліку, выказванняў, якія выражаюць імкненне, непасрэдна адрасаванае слухачу, то яны, паводле гэтай прыкметы, эксплікуюць імператыўную сему, тым самым губляючы статус ядзерных кампанентаў поля аптатыўнасці: *Вы* ***хочаце,*** *каб ён быў вашым каралём, а не думаеце, ці зможа ён быць ім пасля такога* (У. Караткевіч). *Тым часам* ***ты*** *такіх вершаў* ***не хочаш пісаць?*** (У. Дубоўка). *(Курбатаў)* ***Хочаш*** *да мяне ў роту пасля вучэбкі?* (А. Дудараў).

Другі цэнтр ядзерных мадальных адзінак са значэннем жадання складаюць выказванні з прэдыкатамі, выражанымі спрагальнай формай дзеяслова прошлага часу на *-ў(-л)* ці інфінітывам у спалучэнні з мадальнымі часціцамі *бы, хаця б (хоць бы), каб, каб хоць (каб хаця), каб толькі (толькі каб), толькі б, калі б, няхай бы (хай бы), абы (толькі), от бы* і інш. Гэта так званыя формы незалежнага кан'юнктыву, ці спецыялізаваныя сінтаксічныя аптатыўныя структуры: *З дзіваотнай вечнасцю ў хаўрусе да супярэчнасцей прывыкну.//***Застацца каб!** — не застануся.//Бясследна* ***знікнуць бы*** *— не знікну* (А. Разанаў). *Усё жыццё буду каталаць сябе за свой тон падчас той размовы. Нібы чуў, як чалавек унутрана ўздыхае: "О-ох,* ***пажыць бы"...*** (У. Караткевіч). ***Мар'яна б да нас*** *замест дзяўчат.* ***Быў бы*** *цалкам кавалерскі па'езд* (У. Караткевіч). *(Панна Зося) ...Тут гутарка ідзе пра іншыя самародкі. (Пані Марцэля)*

Хоць бы нам пашэньціла знайсці б** аднаго* (У. Дубоўка). *Ад крыўды і голаду моцна засмактала ... пад грудзьмі: "**Хаця б** адну бульбінку **з'есці**..."* (М. Капыловіч). *Але бачу, лепей страціць жонку, чым карову. Бо на месца нябожчыцы падсоўваеце мне капу дзяўчат, а вось **каб хоць адзін прапанаваў** жывёліну* (Л. Казлоў). *"**Каб хаця** яны тут не **сашчапіліся**" — выказаў трывогу Зарэцкі* (А. Варановіч). *Вось і сама я пашкадавала чалавека. **А няхай бы** на прыкладзе гэтага ўчастковага **навучыліся** іншыя* (А. Асіпенка). *(Шабуня) **Хай бы** матка не **прыязджала (А. Дудараў). ***Толькі б не хвалявацца**, **толькі б стрымаць** сябе, не заплакаць — патрабавала яе мацярынская рупнасць...*(В. Быкаў). ***"Толькі б** сур'ёзна **не закахацца** ў яе..." — разважаў з сабой Лявон* (П. Галавач). *Цяпер Люся стала Дарагусяй, — і — **абы толькі** яна **паправілася** — няхай малая носіць тонкае палатно. **Абы толькі** яна **жыла*** (К. Чорны). ***Абы** мой вазок з грашыма **не адваліўся*** (У. Караткевіч). *"**От бы пазнаёміцца** з ім бліжэй, **запрасіць** дадому, **звесці з Косцем*** (Л. Арабей).

Сярод шматлікіх часціц, якія бяруць удзел у стварэнні аптатываў, бадай, толькі часціца *бы* з'яўляецца нейтральнай, з выражэннем уласна жадання; усе астатнія так ці інакш мадыфікуюць значэнні аптатыўных выказванняў, надаючы ім свае дадатковыя адценні.

Так, часціца *толькі б* актуалізуе значэнне адзіна магчымага і найбольш значнага на гэты момант стану спраў; такую ж семантыку мае часціца *абы*. Часціца *каб толькі... не* надае выказванню адценне пэўнай асцярогі, боязі. Часціцы *хоць бы* і *каб хоць, абы толькі, от бы* побач з жаданнем маюць значэнне чагосьці неабходнага, мэтазгоднага, карыснага. Часціца *няхай бы (хай бы)* надае выказванню значэнне жадання з больш выразнай доляй пабуджэння, якое таксама не здзейснілася, але яно было б для моўцы зручным. Часціцы *толькі б* уласціва значэнне моцнага жадання. Маючы гэта на ўвазе, можна сцвярджаць, што дамінанту сінтаксічнага ядра складаюць аптатыўныя выказванні з часціцай *бы*, астатнія адзначаныя структуры мэтазгодна размясціць на ядзернай перыферыі.

У некаторых выпадках сустракаюцца выказванні, дзе формы дзеянняў ці станаў, выражаных інфінітывам, эмацыянальна характарызуюцца прыслоўямі, якія таксама, як і часціцы, прыўносяць у семантыку жадання свае ўласныя адценні значэнняў: *А вось **цікава б ведаць**, Антоне Глебавічу, які сэнс у нарысах, што на поўдні?* (У. Караткевіч). ***Хутчэй бы прайсці**, праскочыць гэта страшнае месца* (М. Лынькоў). У першым прыкладзе лексема *цікава* надае аптатыўнай канструкцыі адценне зацікаўленага жадання, у другім — форма *хутчэй* выражае нясцерпнае жаданне.

Інфінітыў у аптатыўных выказваннях можа быць эліптаваны, што не мяняе месца аптатываў у структуры поля: *Ён сказаў нам: "Ідзіце і кажыце людзям, хто вылечыў вас". Мой сябра пайшоў, і я... пайду... **Мне б толькі вады...** Я вады шукаю...* (І. Жарнасек).

Калі аптатыўныя выказванні з дзеясловамі ў спалучэнні з часціцамі выкарыстоўваюцца ў другой асобе адзіночнага ці множнага ліку і маюць пры сабе асабовыя займеннікі, яны трапляюць за межы ядзерных адзінак, паколькі эксплікуюць, побач з семай жадання, адрасаванасць, бенефактыўнасць, аблігаторнасць сітуацыі, што сведчыць пра наяўнасць у іх семантыцы імператыўнага значэння ў форме парады, просьбы, радзей катэгарычнага пабуджэння: — ***Не ездзілі б вы**, цяпер, пане паручнік* (У. Караткевіч). — ***Памаўчаў бы ты**, — сказаў князь* (У. Караткевіч).

Пераходную зону паміж двух цэнтраў у саставе ядра поля аптатыўнасці складаюць выказванні з прэдыкатамі, якія спалучаюць названыя лексіка-марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці: *Цябе, зямля, у адзенні новым **хацеў бы** к сэрцу **прыгарнуць*** (Я. Колас). *Крылаў **жадала б**... на гэты час, каб **пераляцець** раптам к сыну* (У. Дубоўка).

Па-за межамі ядзернай зоны знаходзяцца ўскосныя аптатыўныя адзінкі, якія праяўляюць сему жадання ў выніку транспазіцыі. Маючы асабістыя, першасныя (не аптатыўныя) значэнні і адначасова скрыта валодаючы гэтым кампанентам, яны ва ўмовах пэўных кантэкстаў і маўленчых сітуацый могуць транспанавацца ў сферу аптатыўнасці.

Да першай ускоснай зоны лексіка-марфалагічных аптатываў належаць выказванні з дзеясловамі ў функцыі прэдыката, якія толькі з дапамогай адпаведнага кантэксту вылучаюць кампанент жадання. Побач з адзначанай семай гэтыя структуры эксплікуюць разнастайныя значэнні, якія ўдакладняюць характар праяўлення жадання — эмацыянальны, ментальны, актуальны. Семантычны кампанент жадання для такога роду лексем з'яўляецца другасным, набытым у выніку іх транспазіцыі ў сферу поля жадання, вага ж гэтай семы, думаецца, залежыць ад агульнага значэння прэдыкатыўнай адзінкі, што абумоўлівае яе месца ва ўскоснай прасторы ФСП аптатыўнай мадальнасці: *збірацца, дамагацца, гарэць ахвотай, намагацца, імкнуцца, карцець, мецца, мець намер, мець падставы, наважыцца, намерыцца (намервацца), нецярпецца, нецярпліві-вацца, рупіць, падмываць, памкнуцца, прагнуць, старацца, любіць, марыць, прасіць, спадзявацца, спрабаваць, патрабаваць, радавацца* (у тым ліку і адпаведныя прэдыкатывы), *цягнуць* (у безасабовым значэнні) і іншыя ў спалучэнні з інфінітывам: *У яго голасе чулася вінаватасць за тое, што турбуе, ён **збіраўся выйсці** следам, але яна запрапанавала: —*

А вы нішто, не турбуйцеся. Пагрэйцеся тут (В. Быкаў). *Так, перадумаў усё. Але ні разу не бліснула думка, што вось так, у адной машыне, седзячы побач, буду ехаць з пракурорам, які так зацята* ***дамагаўся*** *смяротнай казні мне* (І. Шамякін). *Хомачцы страшэнна* ***карціць падысці*** *да столу і узяць ніжку ў самыя рукі* (М. Гарэцкі). *Я* ***меўся*** *сам* ***прасіць*** *цябе, каб ты паслухаў іх, але ўстрымаўся* (У. Дубоўка). *Па ўсім адчувалася, што малады пісьменнік* ***не мае намеру коўзацца*** *на паверхні з'яў. Хоць апісанні яму вельмі ўдаваліся, а* ***імкнецца заглянуць*** *у нутро жыцця* (У. Гніламёдаў). *Ты маю суседку Ганну Пятроўну, мабыць, ведаеш. Пенсіянерку, што пада мной жыве. Дык вось. Учора я* ***наважылася адведаць*** *старую. Хварэе ж яна* (М. Капыловіч). *Сабачка, пускаючы сліну і вытанцоўваючы на месцы,* ***намагаўся падысці****, але ж не асмельваўся* (Д. Нічыпаровіч). *Ён толькі* ***намерыўся перабегчы*** *завулак, каб зноў схавацца за плот, як насустрач яму з прыгрэбніка выбегла ўспалошаная жанчына* (А. Масарэнка). *Яго сэрцу* ***нецярплівілася*** *дамоў* (М. Лужанін). *Яму* ***рупіла запытаць****, па якой нагодзе сам госпад бог прыслаў на ягоны панадворак такіх паважаных гасцей* (Р. Сабаленка). *Але іншы раз (Ігнася) так і* ***падмывала сарвацца*** *з месца, з крыкам праімчацца ўздоўж платоў і збіць з ног якога-небудзь важнага сяміклассніка* (А. Чарнышэвіч). *І адразу пасля гэтага Насця пачала заўважаць, што Серж стаў яе ворагам. Ён* ***стараўся****, каб яна адчувала на сабе яго помсту* (К. Чорны). *Кожны* ***марыць вярнуцца*** *да родных мясцін, дзе вада маладосцю сваёю звініць, дзе вачамі тваімі глядзіць зара* (М. Танк). *Антон Адамавіч таксама* ***любіў пасядзець*** *на лаўцы ў скверыку, але пускаць сліну і расчульвацца ад успамінаў пра вясковыя ранкі ды зязюліны куванні не ўмеў* (Д. Нічыпарэнка). *— А ты таксама добры бадзяга, — накінулася на яго Аня. — Ты сам* ***рад быў*** *з дому* ***збегчы*** *хоць на край свету* (І. Шамякін). *Выйшла тое, чаго ніхто* ***не спадзяваўся!*** *Гэтыя дзве красуні пакахалі аднаго маладога паніча і кінуліся яму на шыю* (Я. Колас). *Трызор адбегся,* ***паспрабаваў злавіць*** *кончык свайго хваста, але не злавіў, і тады ўжо ні з таго, ні з сяго, як вокам згледзець, сігануў з дарогі, у кустоўе* (А. Масарэнка). *Думаць аб Левановічу, што ён ветраны чалавек, перакаці поле, сёння тут, а заўтра там, — Зязюля не* ***меў*** *ніякай* ***падставы*** (А. Рылько). *— Сёння вы пракурор... самі сказалі. І я прызнаў. За памылкі трэба плаціць — Вышэйшай меры я* ***не патрабую****. А на кампенсацыю маю права* (І. Шамякін). *Прэзідэнт магутнай, прыгожай краіны* ***папрасіў****, каб на апошнім развітанні з ім былі толькі родныя і найбліжэйшыя сябры* (Я. Брыль). *Хто меў сям'ю кіламетраў за трыццаць, таго* ***цягнула ісці*** *ў нядзелю дадому, але гэтага зрабіць было нельга, і дзень праходзіў сумна* (К. Чорны).

Да ўскосных сінтаксічных аптатываў належаць выказванні, якія фармальна супадаюць з імператывамі, але паводле зместу адпавядаюць адзінкам са значэннем жадання. Спалучаючыся са значэннем пабуджэння, яно нярэдка не адрасаванае рэальнаму выканаўцу і ў сувязі з гэтым выступае як адцягненае. Так атрымліваецца, калі маецца на ўвазе неадушаўлёны выканаўца дзеяння ці дзеяслоў выражае непадкантрольнае дзеянне: ***Не гаманіце, вербы**, не будзіце, / **Не грайце, ветры**, у зялёным вецці: / Яна ўсю ноч пракаратала з дзіцем / І задрамала толькі на дасвецці* (Н. Гілевіч). *Давай лепей класціся спаць, ды **няхай прысняцца** табе добрыя **сны*** (І. Шамякін) ***Няхай іржавеюць** сабе дапатопныя **сярпы**, і **няхай звініць** на нашых палетках гартаваная **сталь** камбайнаў* (А. Паслядовіч). *Спіць? Іш ты, Пархом халерны. Ну ладна, **расці*** (В. Быкаў).

Прыналежнасць фармальна імператыўных выказванняў да аптатыўных часта фіксуе паказчык наяўнасць/адсутнасць рэальнага выканаўцы дзеяння, які ўдакладняе прыкмету адрасаванасці/неадрасаванасці. Калі ў выказванні нічога не паведамляецца пра такога выканаўцу ці няма суразмоўцы, які б мог служыць пасрэднікам (транслятарам) у перадачы волевыяўлення, яно ўключаецца ў аптатыўныя структуры: *На ягонай пляцоўцы жыве лекар, да якога я, дзякуй богу, яшчэ ніколі не хадзіў, хадзіць не хачу і вам ніколі не раю, і **няхай ён** увогуле **застанецца без працы** і **гладыёлусы разводзіць**. Бо ён псіхіятр і, здаецца, працуе ў доме вар'ятаў* (У. Караткевіч).

Да другой зоны ўскосных сродкаў выражэння аптатыўнасці, агульнай для яе двух тыпаў, належаць пытальныя сказы, якія выражаюць імкненне моўцы даведацца пра пэўныя падзеі ці пераканацца ў іх. Увогуле, інварыянтнае значэнне пытальных сказаў вельмі набліжана да значэння аптатываў: пытальныя сказы інфармуюць пра тое, што хоча ведаць моўца. Таму ў адпаведнасці з пэўнымі кантэкстамі гэтыя структуры злёгку набываюць другаснае значэнне аптатыўнасці, тым самым транспануючыся ў яе ўскосную прастору. Такія пераўтварэнні зазнаюць галоўным чынам агульнапытальныя сказы ці так званыя рытарычныя, у якіх змяшчаецца перш за ўсё ўпэўненае, экспрэсіўна афарбаванае сцвярджэнне. Выказванне: *Не ведаеце часам, як "дворнік" па-латышску?* (У. Караткевіч) — роўнае паводле сэнсу выказванню *Я хачу ведаць, як "дворнік" па-латышску.* Выказванне: *Паедзем, як чыстая вада будзе?* (У. Караткевіч) — адпавядае сэнсу: "Я хачу, каб мы паехалі на рыбалку".

Ускосную зону ФСП аптатыўнасці складаюць шматлікія выказванні, якія сумяшчаюць у сабе значэнне жадання і значэнні іншых сумеж-

ных функцыянальна-семантычных палёў, — мэтавыя, умоўныя, уступальныя, параўнальныя. Так, выказванне: *Я з вялікай радасцю і прыемнасцю пачытаў бы свае новыя творы, але іх не маю пры сабе* (У. Дубоўка) — спалучае аптатыўную семантыку з проціпастаўляльна-ўступальнымі адносінамі. Выказванне з параўнальнымі адносінамі: *Чымся ў лес, лепей бы на раку схадзіў* (А. Масарэнка), — нясе значэнне накіраванага да адрасата жадання, каб ён не рабіў таго, аб чым гаворыцца ў першай частцы.

На перыферыі ўскоснай прасторы поля аптатыўнасці знаходзяцца шматлікія сродкі выражэння маўленчага этыкету са значэннем п а ж а д а н н я. З'яўляючыся вытворным ад значэння жадання, але больш складаным, пажаданне ёсць адрасаванае слухачу выказванне дабрабыту, здароўя, шчасця ці, наадварот, праклёну. Праблематыка маўленчага этыкету ў беларускай мове — гэта асобная, самастойная вобласць у беларусістыцы, якая плённа распрацоўваецца ў даследаваннях.

Крайнюю перыферыю ФСП аптатыўнасці складаюць выказванні з кансітуатыўнымі сродкамі выражэння мадальнасці жадання. Па тых ці іншых прычынах моўца свядома пазбягае намінацыі пажаданага дзеяння, але значэнне жадання вынікае з так званага "стану спраў": з маўленчай сітуацыі, моўнай ці камунікатыўнай кампетэнцыі ўдзельнікаў маўлення. Выражэнне значэння аптатыўнасці кансітуатыўнымі сродкамі дае адрасату магчымасць пэўным чынам адрэагаваць на літаральнае значэнне выказвання і ўхіліцца (калі ёсць неабходнасць) ад рэакцыі на імпліцытнае аптатыўнае значэнне.

Прааналізуем блок выказванняў.

У сярэднявеччы існаваў такі звычай: калі кагосьці вялі на шыбеніцу, а дзяўчына з натоўпу кідала на яго свой рантух..., то асуджанаму даравалі жыццё, вызвалялі і адразу жанілі са збавіцельніцай. ...Эскартуюць нейкага маладога ды прыгожага злачынца да месца пакарання. У злавеснай працэсіі ідзе і кат, вядомы ўсім Якуб. ...Раптам з натоўпу выскоквае баба не першай маладосці і кідаецца са сваім рантухом да таго асуджанага малайца. Ён жа, як угледзеў, што за фартуна чакае яго, закрычаў спалохана: "Пане Якубе, хутчэй да шыбеніцы" (Л. Казлоў).

Інтрыга прыведзенай мініяцюры пабудавана на кансітуатыўнай аптатыўнасці, нежаданні маладога злачынца ажаніцца са старой жанчынай, нягледзячы на тое, што гэта будзе каштаваць яму жыцця.

Кансітуатыўныя сродкі выражэння любога тыпу мадальнасці, у тым ліку і аптатыўнай, — гэта так званыя сітуатыўныя сінонімы, суадносныя з тымі ці іншымі мадальнымі адзінкамі, якія паўстаюць у адпа-

веднасці з патрабаваннямі надзённай камунікацыі, іншай прагматычнай інфармацыі. Выкарыстанне кансітуатыўных мадальных выказванняў сведчыць пра іх далейшае семантыка-прагматычнае ўзбагачэнне, дзякуючы чаму ўдзельнікі камунікацыі пазбягаюць прамалінейнасці, аднамернасці ў ацэнцы падзей.

Функцыянальна-семантычнае поле аптатыўнасці з'яўляецца слаба цэнтраваным тыпам поля з двума яўна выражанымі цэнтрамі — лексіка-марфалагічным і сінтаксічным, — якія аптымальна канцэнтруюць прататыпныя прыкметы, і шырокай сферай перыферыйных сродкаў — ускосных, суадносных з чужымі знакамі, але транспанаваных ў прастору аптатыўнасці, і кансітуатыўных, абумоўленых галоўным чынам прагматычнымі фактарамі.

Графічная выява ФСП аптатыўнасці можа мець наступны выгляд:



1 — ядзерныя сродкі: выказванні з дзеясловамі *хацець, жадаць*, у т. л. з іх эліптаванымі формамі;

1* — ядзерныя сродкі: выказванні з незалежным кан'юнктывам, у т. л. з эліптаванымі формамі;

✡ — пераходная зона: выказванні з дзеясловамі *хацець, жадаць* у незалежным кан'юнктыве;

2 — першая зона ўскосных лексіка-марфалагічных сродкаў: выказванні з індыкатыўнымі формамі дзеясловаў, транспанаванымі ў прастору аптатыўнасці;

2* — першая зона ўскосных сінтаксічных сродкаў: імператыўныя выказванні з неадушаўлёным выканаўцам;

3—3* — другая зона ўскосных сродкаў: пытальныя і рытарычныя выказванні, выказванні з мэтавымі, умоўнымі, уступальнымі, параўнальнымі адносінамі з семай пабуджальнасці, сродкі выражэння маўленчага этыкету;

4—4* — кансітуатыўныя сродкі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Аристотель.* Сочинения: В 4 т. М.: Мысль, 1976. Т. 1.
2. *Аристотель.* Сочинения: В 4 т. М.: Мысль, 1978 . Т. 2.
3. *Шатуновский И.Б.* Пропозициональные установки: воля и желание // Логический анализ языка. Проблемы интенсиональных и прагматических контекстов. М.: Наука, 1989. С. 155—185.
4. *Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы* / Пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. Мн.: БелЭн, 1996.
5. *Шатуновский И.Б.* Семантика предложения и нереферентные слова: значение, коммуникативная перспектива, прагматика. М.: Школа. Языки рус. культуры, 1996.
6. *Рассел Б.* Философский словарь разума, материи и морали / Пер. с англ. Киев: Port-Royal, 1996.
7. *Арутюнова Н.Д.* Язык и мир человека. Изд. 2-е. М.: Языки рус. культуры, 1999.
8. *Міхневіч А.Я.* Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы. Мн: Навука і тэхніка, 1976.
9. *Паўлоўская Н.Ю.* Функцыянальна-кагнітыўны аспект таксаноміі мадальнасці і тэорыя магчымых сусветаў // Национально-культурный компонент в тексте и языке: Материалы II Междунар. науч. конференции 7—9 апреля, г. Минск. Мн., 1999. С. 97—100.
10. *Есперсен О.* Философия грамматики. М.: Мысль, 1958.
11. *Ивин А.А.* Онования логики оценок. М.: Изд-во Моск. ун-та, 1970.
12. *Распопова Т.И.* Функционально-семантическое поле волеизъявления в русском и английском языках // Структура словаря и вопросы словообразования германских языков. Пятигорск, 1981. С. 140—150.
13. *Шведова Н.Ю.* Синтаксическое желательное наклонение // Современные проблемы литературоведения и языкознания. М.: Наука, 1974. С. 455—466.

А.А. Пацехіна

МАРФАНАЛОГІЯ: ПРАДМЕТ І АБ'ЕКТ ДАСЛЕДАВАННЯ Ў РАМКАХ НОВАЙ НАВУКОВАЙ ПАРАДЫГМЫ

У 60—70-я гады ў мовазнаўстве намецілася змена навуковай парадыгмы. Аказалася, што для апісання механізмаў маўлення недастаткова вывучэння моўных структур. Таму структурная парадыгма, скіраваная на вывучэнне "ўнутрылінгвістычных" фактаў, на працягу апошніх дзесяцігоддзяў XX ст. усе больш здае свае пазіцыі як у галіне граматыкі пад націскам новай, функцыянальнай парадыгмы, так і ў галіне лексікалогіі — на карысць кагнітывізму.

Трэба канстатаваць той факт, што даследаванні па марфаналогіі ў апошні час практычна не прыцягваюць увагі вучоных. Створаная і больш-менш дакладна распрацаваная ў рэчышчы структуралізму, марфаналогія больш не вабіць даследчыкаў, паколькі марфаналагічныя характарыстыкі асобных моў быццам бы апісаны, вызначаны тыпы марфаналагічных чаргаванняў. Асноўнай жа задачай тэарэтычнага мовазнаўства ў цяперашні час лічыцца стварэнне гіпотэз і даказальных тэо-

рый прыроды маўлення і яго разумення, у чым традыцыйная марфаналогія, заснаваная на падставовых паняццях фаналогіі, таксама як і сама традыцыйная фаналогія, што аперыруе моўнымі адзінкамі, якія не маюць сэнсу, не можа быць карыснай.

Тым не менш, месца марфаналогіі ў сістэме мовы да сённяшняга часу не вызначана.

Як вядома, перадумовы для ўзнікнення марфаналогіі былі закладзены І.А. Бадуэнам дэ Куртэнэ ў працы "Вопыт тэорыі фанетычных альтэрнацый". Характарызуючы спосаб адносін паміж рознымі морфамі адной марфемы, ён пісаў аб такіх альтэрнацыйных адносінах фанем, пры якіх з фанетычным адрозненнем можа звязвацца (асацыіравацца) якое-небудзь псіхічнае адрозненне форм і словаў, г. зн. якое-небудзь марфалагічнае і семасіялагічнае адрозненне (Бадуэн дэ Куртэнэ, 1963, *1*, *301*). Як навука, марфаналогія аформілася ўжо ў рамках структурнага падыходу да мовы. Аб генетычнай роднасці яе з фаналогіяй гаворыць не толькі сам тэрмін, які, дарэчы, аспрэчваецца на працягу ўсяго часу існавання дадзенай навукі. А. Марцінэ, напрыклад, пісаў аб тым, што сам тэрмін марфа(фа)наналогія трэба выключыць з ужывання, бо націск робіцца на другой частцы слова, і асацыяцыі з фаналогіяй падмяняюць сапраўдную сутнасць рэчаў, калі на самай справе прадметам дысцыпліны з'яўляецца даследаванне марфалагічных адрозненняў (Martinet, 1970, *102*). Падазрэнне ў лінгвістаў выклікалі як аб'ект, так і прадмет даследавання. Калі Э. Станкевіч меркаваў, што "морфафанеміка і фаналогія — гэта два розныя ўзроўні, якія знаходзяцца ў адносінах узаемадзеяння (Stankiewicz, 1966, *510*), то Е. Курыловіч сцвярджаў, што марфаналогія ў якасці самастойнай дысцыпліны не існуе (Kuryłowicz, 1967, *168*). А.А. Рэфармацкі, наадварот, пісаў аб тым, што марфаналогія з'яўляецца самастойнай (разрадка наша — А.П.) дысцыплінай, якая выступае ў іерархіі ўзроўней мовы ў якасці "мосціка" паміж фаналогіяй і граматыкай, такога раздзела лінгвістыкі, "дзе набываюць структурную сувязь два асноўныя ярусы мовы, а такім чынам і два раздзелы лінгвістыкі: фаналогія і марфалогія" (Реформатский, 1975, *99*).

Вызначыўшы ў якасці прадмета даследавання марфаналогіі фаналагічную структуру марфемы, М.С. Трубяцкой заставіў марфаналогію балансіраваць паміж фаналогіяй і марфалогіяй. На пачатку вучоны сцвярджаў, што марфаналогія з'яўляецца часткай граматыкі, якая даследуе выкарыстанне фаналагічных сродкаў для марфалагічных мэт (Трубяцкой, 1929), пазней ён уяўляў марфаналогію як частку фаналогіі (Projet). Нарэшце ён вызначыў задачы марфаналогіі наступным чынам: "Поўная марфаналагічная тэорыя складаецца з наступных трох раздзе-

лаў: 1) тэорыі фаналагічнай структуры марфем; 2) тэорыі камбінаторных гукавых змен, якім падлягаюць асобныя марфемы ў марфемных спалучэннях; 3) тэорыі гукавых чаргаванняў, якія выконваюць марфалагічную функцыю" (Трубецкой, 1931, *116—117*) Такім чынам, перад вучонымі была пастаўлена задача ў тры дзеянні, вынік рашэння — стварэнне структурнай тэорыі марфаналогіі. Але ў цэлым стан рашэння задачы, пастаўленай М.С. Трубяцкім, вучоных не задавальняе. Як сцвярджае польскі лінгвіст Р. Ляскоўскі (Laskowski, 1975, *6*), выдатная работа І.А. Бадуэна дэ Куртэнэ, як і кніга М.С. Трубяцкога "Морфонологическая система русского языка", не аказалі дастатковага ўплыву на распрацоўку ўказаных у іх праблем. Падобную думку находзім у А.С. Кубраковай і Ю.Г. Панкраца, якія пішуць, што "яшчэ ніхто не падкрэсліў як трэба надзвычайнага ўнутранага адзінства ў сфармуляванай Трубяцкім трыядзе марфаналагічных задач" (Кубрякова, Панкрац, 1983, *9*).

У чым жа сутнасць праблемы? Існуюць апісанні фаналагічных адрозненняў у будове марфем розных класаў (Чурганова, 1973; Славянская морфонология, 1987: Славянская морфонология і інш.), і, значыць, сцверджана, што аднолькавыя па сваіх функцыях класы марфем выказваюць пэўнае фаналагічнае падабенства. У даследаваннях па славянскай марфаналогіі назіраецца надзвычай вялікая колькасць фармулёвак даследчыцкіх задач, існуюць розныя праграмы збору і аналізу матэрыялу, арыентаваныя ў асноўным на стварэнне тэорыі марфаналагічных чаргаванняў, якія выконваюць марфалагічную функцыю (Булыгина, 1977; Кубрякова, Панкрац і інш.). На нашу думку, праблема марфаналогіі не ў тым, што даследчыкі адмовіліся працаваць паводле плана, прапанаванага М.С. Трубяцкім, а ў тым, што, рэалізаваўшы збольшага па меры магчымасці заключаныя ў ім задачы, не знайшлі шляхоў да развіцця тэорыі марфаналогіі ў рэчышчы сучасных напрамкаў мовазнаўства, адрозных ад класічнага структуралізму.

Для таго, каб зрабіць марфаналогію цікавай для даследчыкаў і перавесці даследаванні ў рэчышча сучасных мовазнаўчых тэорый, трэба, на нашу думку, вырашыць некалькі асноўных задач.

Для рашэння *першай* задачы патрабуецца дакладна вызначыць аб'ект даследавання і адмежаваць яго ад прадметаў іншых даследаванняў. У дадзеным выпадку аб'ектам даследавання з'яўляюцца фаналагічныя адрозненні, г. зн. чаргаванні. Прадмет жа даследавання на сённяшні дзень не мае дакладна вызначаных граніц. Пры любым падыходзе да марфаналогіі трэба мець ўяўленне аб тым, якія фрагменты фаналагічнага і марфалагічнага ўзроўняў мовы павінны лічыцца зыходнымі, а

гэтыя ўяўленні і дэманструюць адрозненні ў падыходах. Для апісання марфалагічных функцый гукавых чаргаванняў недастаткова апісаць фаналагічную структуру марфем, паколькі даследуемая марфалагічная функцыя чаргавання можа быць прадстаўлена толькі ў поўнай парадыгме словазмянення, а значыць, выходзіць за межы марфалогіі і становіцца прадметам сінтаксісу (па меры вызначэння граматычнай семантыкі склонавых форм), бо "марфаналогія цікавіцца якраз тым, як «паводзяць сябе» з пункту гледжання гучання значымыя адзінкі" (Касевич, 1986, *4*), а значымыя адзінкі, гэта далёка не ў першую чаргу марфемы (Botha, 1968; Laskowski, 1975).

Думка аб тым, што марфаналагічныя з'явы маюць фаналагічную прыроду як у генетычным сэнсе, так і з сінхроннага пункту гледжання, ляжыць у аснове структуралісцкага падыходу да марфаналогіі. Між тым, само азначэнне *фаналагічны* патрабуе ўдакладнення. Калі мець на ўвазе ўдзел у апазіцыях па сэнсаадрозненню, то прамой дыферэнцыяцыі значэнняў марфаналагічныя чаргаванні не прадстаўляюць, ва ўтварэнні дэрыватаў каранёў ці ў парадыгме граматычных форм удзельнічаюць і афіксы. Да таго ж, роля фаналагічных сродкаў сэнсаадрознення ў патоку маўлення не такая значная. У сваю чаргу генэзіс марфалагічных чаргаванняў звязаны не толькі з гістарычнымі працэсамі ў фанетычным ладзе слова, прычыны якіх адназначна не вызначаюцца, а з дзеяннем пэўных экстралінгвістычных фактараў, напрыклад, аналогіі, імкнення да эканоміі вымаўленчых намаганняў, ibid. эканоміі памяці — Бадуэнаў "псіхічны" фактар.

На думку В.Б. Касевіча, рускае мовазнаўства адрозніваецца ад замежнага, перш за ўсё амерыканскага, сваім падыходам да апісання сістэмы фанем мовы як аўтаномнай сістэмы (Касевич, 1986, *5*). (З такога разумення вынікае, у прыватнасці, размежаванне фанетычнага і фаналагічнага апісанняў.) У рускім мовазнаўстве, паводле прызнання В.Б. Касевіча, даследаванні па марфалогіі праводзіліся амаль выключна прыхільнікамі школы Р.І. Аванесава (Чурганова, 1974) і Маскоўскай фаналагічнай школы (Ильина, 1980). У генератыўнай фаналогіі паняцце сістэмы фанем не выкарыстоўваецца. Генератыўная фаналогія апісвае універсальныя дыферэнцыяльныя прыметы, вывучаючы будову марфем у слоўніку і правілы вывада іх тэкставых варыянтаў (Halle, 1959; Worth, 1967; Laskowski, 1975). Гаворка ідзе не аб ліквідацыі фаналогіі як такой, але аб устанаўленні функцыянальнай адпаведнасці паміж узроўнямі фаналогіі і марфалогіі (Phonologie, 1967).

Генератывісты не прызнаюць аўтаномнасці сістэмы фанем, і гэта можна зразумець, паколькі фанема знакам не з'яўляецца, а марфема

з'яўляецца такім, і правілы пераходу ад нязнакавага ўзроўня мовы да знакавага суадносяць фаналагічную структуру марфем і правілы яе заканамернага вар'іравання як паверхневую і глыбінную структуру мовы на адным і тым самым узроўні. Пры гэтым пад марфаналагічнай сінтагматыкай разумеецца фаналагічная структура марфем, а пад парадыгматыкай — кантэкстуальна абумоўленыя змены ў гэтай структуры, іх характар і тыпы фактараў, якія ўплываюць на ўзаемаадносіны варыянтаў марфем (Laskowski, 1975, *7*).

Генератывісты адмаўляюцца ад уяўлення ранніх структуралістаў аб мове як сістэме фіксіравана зададзеных узроўняў-паверхаў са сваімі адзінкамі і асобымі законамі, у якіх апісваюцца ўзаемаадносіны гэтых адзінак, на карысць уяўлення моўнай сістэмы як лесвіцы ці ліфта, які рухаецца паміж паверхаў, па ходу якога адбываецца параджэнне маўлення ў парадку паслядоўнасці ўзаемазвязаных ступеней-узроўняў. Генератыўная граматыка падрыхтавала глебу для ўзнікнення функцыяналізму.

Асноўная адзінка марфаналагічнай сістэмы, марфанема, не атрымала ў класічным структуралізме адназначнага і дакладнага разумення. Стваральнік тэрміну Х. Улашын разумеў марфанему як член марфаналагічнай альтэрнацыі (Ułaszyn, 1931), М.С. Трубяцкой — як "сукупнасць фанем, якія ўдзельнічаюць у дадзеным чаргаванні", што існуе ў моўнай свядомасці гаворачага, адрозніваючы карэлятыўныя марфанемы і дыз'юнктныя марфанемы (Трубецкой, 1987, *88* і наступныя), Т.С. Булыгіна і С.А. Крылоў — як "гранічны элемент азначальнага марфемы" (Булыгина, Крылов). Аднак гэты тэрмін ужываецца ў працах па марфаналогіі вельмі рэдка, а некаторыя лінгвісты, напрыклад, А.А. Рэфармацкі (Реформатский, 1970) ці С.Б. Бернштэйн (Бернштейн, 1968) лічылі яго збыткоўным і нават шкодным (Бернштейн, 1968). Як заўважае Р. Ляскоўскі, непрыгоднасць прыведзеных азначэнняў марфанемы праяўляецца ў тым выпадку, калі на падставе іх праводзіцца спроба вызначыць паняцце марфемы. Прадстаўленая як "найменшы комплекс альтэрнацыйных радоў (марфанем), які выконвае асобную і пастаянную функцыю ў моўнай камунікацыі", марфема перастае быць моўным знакам, які мае акрэсленыя змест і форму, захоўваючы ў якасці інварыянта асобную і пастаянную функцыю — і ў такім разуменні прымаецца амерыканскай школай трансфармацыйна-генератыўнай граматыкі (Laskowski, *8*). Марфанемы рэалізуюцца ў паверхнаснай структуры праз альтэрнацыйныя рады, пры гэтым існаванні кожнага з радоў імплікуе існаванне марфанемы, рэалізацыяй якой з'яўляецца дадзены рад (збор рэалізацый) [тамсама, *9*].

Прадстаўнікі школы трансфармацыйна-генератыўнай лінгвістыкі ўяўляюць параджэнне маўлення як працэс пераходу ад глыбінных структур да паверхневых, які адбываецца па пэўных правілах, якія можна апісаць і пералічыць (асноўны прынцып сістэмнага падыходу), марфаналагічная сістэма мовы прадстаўляецца імі як "набор правіл структуры формы марфем + набор марфаналагічных трансфармацый" (Laskowski, *10*). Марфаналагічныя правілы выглядаюць наступным чынам: $X \rightarrow Y / W — Z$.

Левая частка формулы апісвае аперацыю (чаргаванне), якое апісваецца пэўным правілам, напрыклад: < т > → < т' > (*бант/бантик*). У правай частцы формулы ўказваецца кантэкст, у якім павінен аказацца X для таго, каб дзейнічала правіла. W і/ці Z могуць быць роўнымі нулю. Правіла можна прачытаць наступным чынам: "X пераўтварыць ў Y, калі знаходзіцца паміж W і Z". Пры аперыраванні дыферэнцыяльнымі прыметамі правіла можа выглядаць трохі іначай (Laskowski, 1975, *22*). Тут прыведзены самы прымітыўны прыклад правіла.

Такім чынам, марфаналагічныя правілы генератывістаў апісваюць тыя ж самыя камбінаторныя (фонатактычныя) змены гукаў, што і сфармуляваныя іншым спосабам схемы М.С. Трубяцкога (гл. Трубецкой, 1987), бо ўрэшце пры стварэнні правіл бяруцца пад увагу толькі (ці амаль толькі) дыферэнцыяльныя прыметы фанем. Але асноўныя праблемы ўзнікаюць тады, калі трэба адрозніць правілы ад выключэнняў, бо правілы для адрозненняў становяцца надзвычай складанымі, і колькасць іх расце. Апрача гэтага, спрэчкі выклікае інтэрпрэтацыя чаргаванняў заднеязычных па ўмовах трох палаталізацый і іншыя гістарычныя змены гукаў. Бацькі трансфармацыйна-генератыўнай лінгвістыкі Хомскі і Хале дайшлі да прымянення ў сваіх правілах рэканструкцыі праславянскіх дыфтонгаў дзеля тлумачэння рэфлексаў палаталізацый і спалучэнняў зычных з *j* (Chomski, Halle, 1968, *424* і наступныя), але, як вядома, даследаванні ў гэтым напрамку больш не праводзяцца. Першая спроба спалучыць структурны метад з параўнальна-гістарычным скончылася няўдачай.

У выніку такіх разважанняў перад намі паўстае *другая задача,* якую павінна вырашыць марфаналогія на сучасным этапе, — гэта адносіны да пастулату аб паслядоўным адрозненні сінхранічнага і дыяхранічнага падыходаў да мовы. Рашыць гэту задачу немагчыма без высвятлення характару асаблівасцей, якія не маюць чыста фаналагічнага тлумачэння, таму што гэтыя асаблівасці могуць быць вынікам дзеяння некаторых гістарычных заканамернасцей, якія нельга растлумачыць у сінхронным плане, г. зн. фаналагічна, бо яшчэ Ф. дэ Сасюр пісаў аб

тым, што "фанетычная змена <...> не з'яўляецца ні адзінай, ні галоўнай прычынай чаргавання" (Соссюр, *191*), да таго ж "няма абсалютна ніякай мяжы ў ступені фаналагічных адрозненняў паміж аламорфамі" (Nida E.A. Morphology: цыт. па кнізе Laskowski, 1975, *8*).

Сасюраўскае сцверджанне аб прыналежнасці чаргавання сінхраніі — "на самай справе чаргаванне, як у яго зыходным пункце, так і ў яго канчатковым выглядзе, заўсёды належыць толькі граматыцы і сінхраніі" (Соссюр, *191*) — прама ці ўкосна вызначыла лёс марфаналогіі ў лінгвістыцы XX века: пераважная большасць структурных апісанняў марфаналагічных з'яў — гэта апісанні сінхронныя. Між іншым, гаворачы пра граматычныя наступствы фанетычнай эвалюцыі, Сасюр прыведзенымі вышэй словамі, як нам думаецца, хацеў падкрэсліць толькі тое, што элементы дыяхранічнага факта не разумеюцца гаворачым, для якіх "тут мае месца звычайнае сінхранічнае супрацьпастаўленне" (Тамсама, *193*).

Пад сінхронным апісаннем мы, згодна з У.К. Жураўлёвым, будзем разумець як апісанне сучаснага стану чаргаванняў у асобных мовах і пры іх супастаўленні, так і апісанне гісторыі мовы на тых ці іншых этапах — у адрозненне ад апісання дыяхранічнага, паводле Жураўлёва, дынамічнага, сутнасць якога ў паказе моўных з'яў у іх развіцці (Журавлев, 1976, *23*).

Амаль у кожнай рабоце па марфаналогіі так ці інакш узгадываецца роля параўнальна-гістарычнага мовазнаўства ў развіцці сучаснага ўяўлення аб структуры мовы (Кубрякова, Панкрац, 1983, *8*; Касевич, 1986, *5*), аднак у цэлым ва ўсіх работах апошняга часу паслядоўна рэалізуецца сінхронна-структурны падыход да марфаналагічных з'яў. Сучасныя тыпалагічныя апісанні, выкананыя рускімі вучонымі, — гэта, як правіла, сінхронныя фармальна-структурныя апісанні (Славянская морфонология). Тыпы марфаналагічных чаргаванняў у гэтых працах праілюстраваны вялікай колькасцю матэрыялу. Але ў іх няма глыбокіх тэарэтычных абагульненняў. Недастатковы ўлік ролі гістарычнага (дыяхранічнага) фактару звязан не толькі з вернасцю ідэям Ф. дэ Сасюра, але, між іншым, і з выбарам матэрыялу даследавання і яго зыходнага пункту.

Сучасныя славянскія мовы даюць многа матэрыялу для вывучэння марфаналагічных чаргаванняў з улікам іх гістарычнага характару. У гэтых мовах у сувязі з іх флектыўным характарам, пры развітым словазмяненні і наяўнасці бясконцых спосабаў словаўтварэння, шырока прадстаўлены фанемныя змены на межах марфем, якія самі па сабе не заўсёды могуць быць дакладна вызначаны. У той жа час пераважная

большасць работ рускіх (ды не толькі рускіх) лінгвістаў выканана на рускім матэрыяле. Сучасная руская літаратурная мова, а іменна яна дае даследчыку матэрыял для фармулявання канцэпцыі (так было ў М.С. Трубяцкога, такога зыходнага пункту прытрымліваецца калектыў аўтараў манаграфіі "Славянская марфаналогія"), у сілу сваёй найбольш паслядоўна праведзенай стандартызацыі з наяўнасцю мінімальнай колькасці нарматыўных варыянтаў словаформ і дэрыватаў не можа даць такога багатага матэрыялу, як, напрыклад, беларуская ці ўкраінская, у якіх захавалася значна больш архаічных рыс і якія ў сваіх літаратурных формах адчуваюць моцны ўплыў дыялектаў.

Тыпалагічныя даследаванні павінны мець адну абагульненую перспектыву, якая заставалася б нейтральнай у адносінах да кожнай са славянскіх моў, узятых паасобку. Але пастуліруемы сінхронны характар тыпалагічных, а значыць, сінхронных даследаванняў загадзя выносіць прычыну ўзнікнення тых ці іншых марфаналагічных з'яў па-за межы даследуемага прадмету. Асноўная ж праблема супастаўляльнай марфаналогіі славянскіх моў — гэта праблема вар'іравання морфаў і апісання асаблівасцей выбару марфаналагічных варыянтаў у вусным і пісьмовым маўленні. Распрацоўцы новых ідэй у марфаналогіі ў пэўнай ступені перашкаджае таксама традыцыйны падзел чаргаванняў пры словаўтварэнні і словазмяненні (Worth, 1967), а таксама зыходнае адрозненне чаргаванняў у іменных і дзеяслоўных асновах. Пры такой дыферэнцыяцыі прадметаў апісання цяжка знайсці агульны пункт адліку.

Ядро ўсёй сістэмы марфаналагічных чаргаванняў складаюць чаргаванні гістарычныя, г. зн. такія, што з'явіліся вынікам моўных змен паводле правіл, якія дзейнічалі ў мінулым, таму сучаснае тэарэтычнае марфаналагічнае апісанне павінна быць апісаннем *дыяхранічным*. Трэба заўважыць, што фанетычныя змены, звязаныя з выражэннем граматычных значэнняў, напрыклад, разглядаліся Ф. дэ Сасюрам у главе "Дыяхранічная лінгвістыка" (Соссюр, *173—224*). Між іншым, мы не можам рабіць ніякіх закідаў у непаслядоўнасці самому натхняльніку і творцу структуралізму, паколькі сам "Курс агульнага мовазнаўства" не належыць яго пяру. У лекцыях Сасюра "Дыхатамія сінхранія versus дыяхранія ўзгадываецца толькі аднойчы, там, дзе Сасюр, завяршыўшы выкладанне фаналогіі, пераходзіць да дыяхранічнай лінгвістыкі". Паведаміўшы падчас лекцыі слухачам аб існаванні магчымасці статычнага аналізу мовы, ён адразу ўказаў "на большую важнасць гістарычнага пункту гледжання, паколькі гаворачаму яна не даецца непасрэдна" (Холодович, 1977, *13*).

Граматычныя чаргаванні даволі позна звярнулі на сябе ўвагу гісто-

рыкаў мовы. Справа, відаць, у тым, што задачай параўнальна гістарычнага мовазнаўства перш за ўсё была рэканструкцыя праславянскай мовы, і ўсе даследаванні, якія праводзіліся ў гэтым кірунку лінгвістыкі, так ці інакш датычыліся рашэння гэтай праблемы.

Фанетычную сістэму праславянскай мовы па прычыне яе абмежаванага характару і наяўнасці відавочных гукавых паралелей было лёгка рэканструяваць, таму ў параўнальна-гістарычным мовазнаўстве чаргаванні далучаліся да фанетчных з'яў, і гэты падыход да гукавых змен у значымых частках слова (напачатку — у каранях) быў пакладзены ў аснову іх сінхроннага фаналагічнага апісання.

Сведчаннем гэтага могуць быць працы класікаў параўнальна-гістарычнага мовазнаўства А. Мее (Мейе, 1951), А.М. Сялішчаў (Селищев, 1951—1952), О. Семярэньі (Семереньи, 1980) і інш. Так, у "Гісторыі стараславянскай мовы" (Ван-Вейк, 1957) разглядаецца толькі чаргаванне галосных у каранях, і гэта складае змест раздзела "Дадатак да фанетыкі", дзе адзначаецца, што чаргаванне мае агульна вядомае значэнне для граматыкі, калі тыя ці іншыя галосныя характарызуюць фармальныя катэгорыі. Такая ж карціна назіраецца ў шэрагу акадэмічных граматык рускай мовы (1954, 1970) і беларускіх акадэмічных граматык (1962—1966 і 1986), у якіх чаргаванні даюцца ў раздзеле "Фаналогія".

Гістарычныя чаргаванні пазбаўлены фанетыка-фаналагічнай рэгулярнасці, а таму выносяцца за межы традыцыйнай фаналогіі. Сувязь такіх чаргаванняў з пэўнымі граматычнымі значэннямі з пункту гледжання сінхраніі незразумелая, а таму яны знаходзяцца быццам бы на перыферыі граматыкі. Пры дакладным размежаванні дыяхранічнага і сінхранічнага падыходаў могуць застацца па-за ўвагай даследчыка такія важныя факты, як, напрыклад, адзіная аснова такіх чаргаванняў, як чаргаванне перад флексіяй меснага склону адзіночнага ліку *-е* цвёрдых/мяккіх і заднеязычных/пярэднепаднябенных гукаў (русск. *рука — в руке*, бел. *рука — у руцэ* і інш.). Чаргаванне цвёрдых/мяккіх разглядаецца як пазіцыйнае, паколькі ў сучаснай рускай мове існуе рад супрацьпастаўленняў зычных па цвёрдасці/мяккасці, тады як чаргаванне заднеязычных з пярэднепаднябеннымі належыць да чаргаванняў гістарычных, бо рада супрацьпастаўленняў заднеязычных пярэднепаднябенным няма. Для марфаналогіі (марфалогіі) гэта адна і тая ж склонавая форма, і, адпаведна, ацэнена яна павінна быць з пункту гледжання марфалогіі.

Са сказанага вышэй вынікае *трэцяя задача* сучаснай марфалогіі. Узгадка аб тэндэнцыі да ліквідацыі марфаналагічных чаргаванняў у сла-

вянскіх мовах паявілася ў манаграфіі С.Б. Бернштэйна (1974). Кніга, напісаная ў рэчышчы параўнальна-гістарычнага мовазнаўства, змяшчае аналіз агульнатэарэтычных праблем марфаналогіі, гісторыі чаргаванняў у славянскіх літаратурных мовах і дыялектах. Аўтар апісвае старажытны стан славянскіх іменных асноў, уяўляе іх гісторыю ў праславянскай мове і ў раннія перыяды гісторыі асобных славянскіх моў, пры гэтым фармулюючы шэраг гіпотэз, у тым ліку меркаванне аб тым, што "ва ўсіх славянскіх мовах у рознай ступені прадстаўлена тэндэнцыя да ўстаранення чаргаванняў" (Бернштейн, 1974, *18*).

Змена лінгвістычнай парадыгмы ў апошнія дзесяцігоддзі прывяла ў пэўным сэнсе да крызісу дыяхраніі, які здаецца вельмі праўдападобным, калі звярнуць увагу на колькасць апублікаваных работ і дакладаў на канферэнцыях рознага ўзроўню, у тым ліку і на такіх прадстаўнічых, якім з'яўляецца Міжнародны з'езд славістаў. Кідаецца ў вочы кантраст паміж колькасцю і якасцю работ эмпірычных у параўнанні з тэарэтычнымі, хаця, безумоўна, для кожнай галіны навукі, у прыватнасці для мовазнаўства, стварэнне мадэлей мае першаснае значэнне. Паводле сцвярджання нямецкага вучонага К. Штайнке (Steinke, 1998) ідэя рэканструкцыі праславянскай мовы аказвае занадта моцны ўплыў на фармуляванне далейшых славістычных гіпотэз.

Адной з непераадоленых праблем дыяхранічнага (ibid. параўнальна-гістарычнага) мовазнаўства з'яўляецца, напрыклад, стварэнне мадэлі пераўтварэння сістэмы скланення славянскіх назоўнікаў. У цэлым парадыгмы гэтага скланення дастаткова даставерна рэканструяваны паводле даных стараславянскай мовы, санскрыта, лацінскай і старажытнагрэчаскай моў (гл., напрыклад, Вступ, 1966). Тым не менш дасюль няма ніводнай пераканаўчай гіпотэзы, у якой прадстаўляўся б (мадэляваўся) працэс пераходу ад старой сістэмы форм, заснаванай на фанетычнай прымеце — якасці фіналі (аўслаўта) назоўніка — да сучаснай, у аснове якой ляжыць прынцып класіфікацыі паводле роду назоўніка (Кузнецов, 1954). Большасць даследаванняў па гісторыі мовы пабудавана па метаду вывучэння "сінхронных зрэзаў": для высвятлення месца ў сістэме кожнага элемента эвалюцыі змены выяўляюцца шляхам супастаўлення розначасовых зрэзаў і такім чынам ілюструюцца заканамернасці эвалюцыі дадзенага элемента. У сувязі з гэтым варта ўзгадаць вялікі артыкул У.К. Жураўлёва (Журавлев, 1976 і б), у якім выказваюцца агульныя прынцыпы дыяхранічных даследаванняў у будучым. Аўтар піша: "Апісанне гісторыі моўнай сістэмы ад сінхранічнага зрэзу да сінхранічнага зрэзу не з'яўляецца дыяхранічнай канцэпцыяй. Застаючыся ў рамках сасюраўскай антыноміі дыяхраніі і сінхраніі, такое

апісанне з'яўляецца хутчэй сінхраніей, чым дыяхраніяй" (1976, *23*). Аўтар мяркуе тым самым, што пры такім падыходзе, які характарызуе гістарычнае (як сінонім часта выкарыстоўваецца тэрмін *дыяхранічнае*) мовазнаўства, факт змены толькі канстатуецца і апісваецца, тады як прычыны і механізмы моўных змен застаюцца невядомымі. Жураўлёў лічыць, што адказ на пытанне аб прычынах, шляхах і спосабах моўных змен можа даць толькі структурная дыяхранія, заснаваная на ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці з'яў і элементаў мовы, іх дыяхранічным быцці і развіцці. Дарэчы, варта ўзгадаць прыведзенае вышэй паведамленне А.А. Халадовіча аб тым, што Ф. дэ Сасюр таксама прызнаваў статычны характар сінхраніі, а таксама працу Э. Касерыу "Сінхранія, дыяхранія і гісторыя".

Сапраўды, дынамічны характар марфаналагічных чаргаванняў недастаткова выяўляецца пры сінхронным аналізе моўнага матэрыялу. Сутнасць чаргаванняў у дынаміцы, паколькі марфаналагічнае чаргаванне — гэта змена фаналагічнага складу марфемы ў выніку дастасавання словаформы да існуючых умоў, сінтаксічная характарыстыка словаформы. Аднак супастаўленне матэрыялу дзвюх ці некалькіх моў непазбежна прыводзіць да выяўлення адрозненняў ва ўмовах, якімі вызначаецца наяўнасць ці адсутнасць таго ці іншага чаргавання; напрыклад, руск. *домик* — польск. *domek* (наяўнасць ці адсутнасць чаргавання велярны/палатальны пры ўтварэнні дэмінутываў). Вызначэнне такіх умоў дае нам статычную характарыстыку, скажам, патэнцыяльную магчымасць сказаць "так" ці "не" пры выбары той ці іншай словаформы. Такога роду магчымасці апісаны ў манаграфіі "Славянская марфаналогія" для кожнай з моў паасобку. Але толькі адказ на пытанне "чаму" можа прывесці да стварэння дынамічнай мадэлі альтэрнацый. Для гэтага неабходна разам з данымі, атрыманымі метадамі структурнай лінгвістыкі, выкарыстаць даныя, атрыманыя шляхам рэканструкцыі граматычнай сістэмы праславянскай мовы.

Сучаснае мовазнаўства павінна пабудаваць такое апісанне, якое ўлічвала б здабыткі параўнальна-гістарычнага метаду даследавання і метаду структурнай тыпалогіі роднасных моў. Славянскія мовы прадстаўляюць унікальную магчымасць правядзення рознага роду супастаўленняў, таму славістыка — адна з найбольш магутных галін лінгвістыкі. Першае пытанне, якое можна паставіць перад даследчыкам, што займаецца пабудовай дынамічнага (дыяхранічнага) апісання марфаналагічных з'яў — гэта пытанне "з якой мэтай?", другое — "якімі сродкамі?"

Ідэя С.Б. Бернштэйна аб тэндэнцыі да ліквідацыі чаргаванняў у сла-

вянскіх мовах можа, у прынцыпе, паслужыць адпраўным пунктам для пабудовы арыгінальнай дынамічнай канцэпцыі марфаналогіі.

Скажам, прымяняльна да славянскай сістэмы скланення назоўнікаў, пры гэтым спадзеючыся на даставернасць рэканструкцыі яе прастану, можна меркаваць, што марфалагічна (і марфаналагічна) значымай для нас у тыпалагічных (як і параўнальна-гістарычных) адносінах трэба было б прызнаць *не наяўнасць* у парадыгме чаргавання ў кожнай з асобных славянскіх моў, а *адсутнасць* яго.

Можна дапусціць, што адным з фактараў развіцця сістэмы форм у субстантыўных парадыгмах магла быць тэндэнцыя да ліквідацыі марфаналагічных чаргаванняў, якую заўважыў С.Б. Бернштэйн (Бернштейн, 1974) і ў якой праяўляецца імкненне да эканоміі моўных сродкаў (Мартине, 1960).

Апісанне працэсу ліквідацыі чаргаванняў, у прыватнасці, заднеязычных з пярэднепаднябеннымі, звонкіх з глухімі ў абсалютным выходзе слоў, ётавыя з утварэннем гемінат як аднаго з фактараў пераўтварэння славянскага скланення назоўнікаў разглядаецца ў работах А.А. Пацехінай (Пацехіна, 1991, 1999, 2000), у тым ліку і на матэрыяле беларускай мовы.

Як вядома, разнастайнасць флексій у шасці тыпах праславянскага (ibid. стараславянскага і старажытнарускага) скланення назоўнікаў абумоўлівала наяўнасць у асобных склонах аманімічных форм, што не магло не прывесці да спрашчэння ўсёй сістэмы дзеля эканоміі моўных сродкаў. Акрамя агульнага, кожны з тыпаў меў, адпаведна, і свае асаблівасці, унаследаваныя з індаеўрапейскай сістэмы дэклінацыі. Характар канцавога зычнага асновы прамым чынам залежыў ад якасці галоснага флексіі. Апрача спецыяльнай парадыгмы, кожны з тыпаў скланення характарызаваўся яшчэ і наборам чаргаванняў (пар. Славянская морфонология — для сінхраніі): для скланення на **o* — у месным склонее адзіночнага ліку, у назоўным і месным склонах множнага ліку, у назоўным/вінавальным склоне парнага ліку, для скланення на **a* — у давальным і месным склоне адзіночнага ліку і г.д. па тыпу чаргавання цвёрдых/мяккіх зычных перад галоснымі пярэднягя рада (для цвёрдых асноў) і чаргавання заднеязычных са свісцячымі (для асноў на *г, к, х*).

Наступны факт a priori — той, што працэс уніфікацыі сістэмы скланення назоўнікаў ішоў у напрамку збліжэння падобных тыпаў скланення (напрыклад, назоўнікі мужчынскага роду імкнуцца мець аднолькавыя парадыгмы, пар. адрозненне парадыгмы мужчынскіх і жаночых назоўнікаў з флексіяй *-а* ў сучаснай беларускай мове). Для праславянскага скланення такімі тыпамі былі перш за ўсё тыпы скланення

назоўнікаў з асновамі на **о* и **и*, паколькі абодва ўключалі назоўнікі мужчынскага роду. Аднак калі першы тып меў флексіі з кантынуантам **е — ь (яць)*, то другі іх не меў, адпаведна не было ў гэтым тыпе ўказаных чаргаванняў.

Цікавая рэч: наазоўнікаў, якія змяняліся па парадыгме скланення на **и*, паводле даных даследчыкаў вельмі мала. Поўная парадыгма зафіксавана даставерна для назоўнікаў *сынъ, домъ, медъ, врьхъ, полъ* (Соболевский, 1907, *170*). У гэты спіс Ван-Вейк уключыў назоўнік *волъ* (Ван-Вейк, 1957, *241*). А.А. Шахматаў жа лічыў, што па гэтым тыпе змяняліся таксама словы *низъ, долъ, вънъ, кратъ, чинъ, миръ, олъ* і *санъ* (Шахматов, 1957, *83*) .

Такім чынам, мы маем два тыпы скланення назоўнікаў мужчынскага роду, з якіх у выніку ўзаемадзеяння ўтварыўся адзін, прычым першы з іх быў прадстаўлены ў старажытнасці вялікай колькасцю слоў, другі — крайне абмежаванай. (Маюцца на ўвазе перш за ўсё даныя стараславянскай мовы як мовы найстарэйшага славянскага пісьмовага перыяду).

У старажытнарускіх тэкстах побач з рэгулярнымі канчаткамі з парадыгмы на **о* сустракаюцца і канчаткі **и*-парадыгмы: *противится плоть духови* (замест *духоу* — дав., адз.) (Срезневский, 1959), *смьхове неоудрьжими и грохотьливи* (замест *смьхы, смьхи, *смьси* — наз., мн.) (Тамсама), *избыти грьховъ своих* (замест *грьхъ* — родн., мн.) (Лаврентьевская, *244*); *от послоуховъ слышавши вьровати* (Павлов, 1886, *88*) замест *послоухъ*; *послоухове* (замест *послоуси* — наз., мн.) (Павлов, 1886, *86*, *87*, *88*, *89* і інш.); *о послухь* (Русская правда, *112*) замест *о послусь (*месн., адз.*); не каетца ѡ грьхь своемъ* (Орлов, 1908, *38*) і г. д. У Дзвінскіх граматах на 45 ужыванняў у судовай формуле аб сведках дагавора назоўніка ў множным ліку з зыходным *х* (*а на то послухи* (*послухы*)) прыходзіцца толькі 6 з альтэрнантам *с'* (*а на то послуси*).

Ліквідацыя чаргаванняў заднеязычных з пярэднепаднябеннымі ў формах мужчынскага скланення ў выніку выраўноўвання асноў па аналогіі пры рэгулярным захаванні іх у формах жаночага з'яўляецца адным з фактараў фарміравання парадыгмы скланення назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду. У выніку праведзенага аналізу матэрыялу (Пацехіна, 1999) можна зрабіць вывад аб тым, што тыя працэсы, што адбываюцца ў сучаснай беларускай мове і вельмі цесна звязаны з яе фармальна-граматычным ладам, адпавядаюць аналагічным працэсам у іншых славянскіх мовах. Гэтыя працэсы накіраваны на далейшае развіццё склонавых форм назоўніка з мэтай усё больш сціслага размеркавання іх па склонавых класах паводле прыметы роду (Кузнецов, 1958).

Адным са спосабаў ліквідацыі чаргаванняў у парадыгме скланення з'яўляецца лексікалізацыя марфаналагічных чаргаванняў. Пры гэтым на аснове прынцыпу эканоміі моўных сродкаў адбываецца выраўноўванне парадыгмы па аналогіі, а былыя словазмяняльныя характарыстыкі лексемы ўваходзяць у склад яе семантыкі.

У супастаўляльным мовазнаўстве на сённяшні дзень тыпалогія відаў і спосабаў лексікалізацыі граматычных (словазмяняльных і дэрывацыйных) чаргаванняў не распрацоўвалася.

Параўнанне парадыгм скланення назоўнікаў у беларускай і рускай мовах дае цікавы матэрыял для вызначэння асаблівасцей фарміравання сістэмы граматычных форм і лексіка-граматычных характарыстык гэтай часціны мовы. Возьмем для параўнання формы назоўнага склону адзіночнага і множнага ліку назоўнікаў 1-га (мужчынскага) скланення.

Формы множнага і адзіночнага ліку ў некаторых назоўнікаў маюць розныя асновы: *перо — перья, звено — звенья, колос — колосья, брат — братья, дно — донья, помело — помелья* (гл.: Русская грамматика, 1980, *501*) і г.д. З пункту гледжання марфаналогіі ў формах множнага ліку мае месца чаргаванне з пашырэннем асновы (Славянская морфонология, 25). Некаторыя з назоўнікаў маюць і варыянтныя формы без чаргавання: *клок — клоки* (пар. *клочья*), *крюк — крюки* (пар. *крючья*), *кол — колы* (пар. *колья*), *муж — мужи* (пар. *мужья*). Варыянты форм могуць быць дублетнымі, адрозніваца стылістычна ці семантычна (*колы* — ад *кол* "адзінка, школьная адзнака"). Рэгулярнасць і заканамернасць утварэння марфаналагічна адрозных варыянтаў у парадыгмах назоўнікаў патрабуюць асобнага даследавання не толькі ў плане сінхраніі, але, галоўным чынам, даследавання дыяхранічнага.

У скланенні беларускіх назоўнікаў ніякага роду пашырэнне асновы ліквідавана: *пяро — пёры, звяно — звёны, колас — каласы, волас — валасы, брат — браты*. Суфікс [*j*] з'яўляецца прыметай лексіка-граматычнага разраду зборных назоўнікаў: *пер'е, калоссе, валоссе, прыладдзе, палоззе* і г. д. Форма *звенні* (Слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. М.В. Бірылы. Мн., 1987) запазычана з рускай мовы разам з рэаліяй — назвай калектыву. Чаргаванне, такім чынам, мае дэрывацыйны, а не словазмяняльны характар.

З'ява ліквідацыі марфаналагічных чаргаванняў у славянскіх мовах можа быць прадметам тыпалагічнага даследавання. Пры апісанні дадзенай з'явы можна карыстацца як тэрміналогіяй структурнай лінгвістыкі: марфаналагічна маркіраваная словаформа і марфаналагічна маркіраваная парадыгма, — так і тэрміналогіяй параўнальна-гістарычнага мовазнаўства: рэканструіруемая словаформа (протаформа), рэканструіруемая

парадыгма (протапарадыгма), а таксама ўжываць паняцце ліквідацыя марфаналагічнага чаргавання ў якасці спецыяльнага тэрміна дыяхранічнай марфаналогіі.

Можна прадставіць некаторыя перспектывы развіцця новага кірунку даследаванняў. Агульны недахоп структурнага падыходу — у недаацэнцы вуснага маўлення. Развіццё сродкаў гуказапісу дазволіла паглядзець на мову з адваротнага боку, забяспечыўшы магчымасць фіксацыі спантаннага маўлення. У святле кагнітыўнай лінгвістыкі можа, напрыклад, ставіцца пытанне аб ступені ўплыву канвенцыянальнсці на развіццё літаратурных моў. Вельмі важна тое, якім чынам адбывалася кадзіраванне вуснага маўлення ў форме літаратурнай мовы. Гаворка ідзе, уласна кажучы, аб тым, што спецыфіка кадзіравання і прынцыпы нармалізацыі і кадыфікацыі літаратурнай мовы могуць вызначаць тое, наколькі стыхійна адбываўся і адбываецца працэс выбару словаформ з чаргаваннем ці без яго ў якасці нарматыўных. Гістарычныя слоўнікі, напрыклад, "Словарь древнерусского языка" І.І. Сразнеўскага, даюць нам права разважаць аб тым, які з дэрыватаў таго ці іншага назоўніка ці дзеяслова ўжываўся часцей за ўсе астатнія ў час напісання помніка. У слоўніках сучаснай літаратурнай мовы фіксуецца, як правіла, толькі адзін. Магчыма, працэс ліквідацыі марфаналагічных чаргаванняў праходзіў (праходзіць) пад уплывам як свядомых, так і несвядомых фактараў. У шэрагу несвядомых трэба ўзгадаць імкненне да эканоміі вымаўленчых (і мнеманічных!) намаганняў, якое, бясспрэчна, кіруе вусным маўленнем. Таму такая велікая вартасць дадзеных гісторыі і дыялекталогіі для даследчыка марфаналогіі. Апрача гэтага, дасюль не створана колькі-небудзь дакладная тэорыя запазычанняў, а, між іншым, іменна адсутнасць даследаванняў канвергентнага развіцця моў, у тым ліку славянскіх, было зместам выступлення прафесара Штайнке на Кангрэсе славістаў у Кракаве (Steinke, 1998). Вывучэнне асаблівасцей ліквідацыі марфаналагічных чаргаванняў, уласцівых мове-крыніцы пры запазычанні лексемы ў мову-акцэптар, можна пакласці ў аснову стварэння комплекснай тэорыі запазычанняў (як працэсу і выніку) (Пацехіна, 2001).

Адмаўляючыся ад структуралісцкіх поглядаў на марфаналогію, варта звярнуць увагу на ролю марфаналагічных з'яў, якая павінна праяўляцца не толькі "ў тым, каб здзяйсняць, падтрымліваць або ўзмацняць дыферэнцыяцыю форм на марфалагічным узроўні" (Кубрякова, 1990, *315*), але і захоўваць адзінства слова і яго частак. Функцыя марфаналогіі ў дыяхраніі можа быць зразумета як захаванне тоеснасці слова і яго складу з мэтай эканоміі моўных сродкаў ва ўмовах змяняльнасці асярод-

дзя. Сродкам рэалізацыі гэтай функцыі можа з'яўляцца ліквідацыя чаргаванняў у сістэме словазмянення і словаўтварэння. Такім чынам, захоўваецца закон развіцця ў адзінстве статычнага і дынамічнага, у адзінстве пастаянных прымет і іх зменлівасці. У сваю чаргу, захаванне ў нязменнасці асноўных сховішчаў сэнсу палягчае працэс разумення, таму што "мы гаворым дзеля таго, каб быць пачутымі <...>, паколькі мы хочам быць пачутымі дзеля таго, каб быць зразуметымі" (Якобсон, 1985, *43*).

ЛІТАРАТУРА

Botha R.P. The Function of the Lexicon in Transformational Generative Grammar. The Hague; Paris; Mouton, 1968.

Halle M. The Sound Pattern of Russian. A Linguistic and Acoustical Investigation. Mouton, s'Gravenhage, 1959.

Laskowski R. Studia nad morfonologią współczesnego języka polskiego. Wrocław, 1975.

Martinet A. Podstawy lingwistyki funkcjonalnej. Dokonał wyboru, przełożył i tom opatrzył tytułem L. Zawadowski. Warszawa, 1970.

Phonologie und Morphonologie // Phonologie der Gegenwart. Vorträge und Diskussionen... Graz; Wien; Köln. C. 158—172.

Phonologie1967: Phonologie der Gegenwart. Vorträge und Diskussionen. Graz; Wien; Köln, 1967.

Projet de terminologie phonologique standariseé // Traveaux du Circle Linguistique de Prague. 4. C. 309—326

Stankiewicz E. Slavic Morphophonemics in Typological and Diachronic Aspects, Current Trend in Linguistics. Vol. 3. Theoretical Foundations. The Hague; Paris: Mouton, 1966.

Steinke K. Prasłowiańszczyzna: fikcja i/lub realność // XII Międzynarodowy Kongres Slawistów. Streszczenia referatów i komunikatów. Kraków, 1998. C. 150—151.

Ulaszyn H. Laut, Phonema, Morphonema // Traveaux du Circle Linguistique de Prague. 4. 1931. C. 53—61.

Worth D.S. On Ciclical Rules in Descriptive Morphonemics // Phonologie der Gegenwart. Vorträge und Diskussionen. Graz; Wien; Köln, 1967. C. 173—186

Worth D.S. The Notion of "Stem" in Russian Flection and Derivation // To Honor Roman Jacobson. The Hague: Mouton, 1967. C. 2269—2288.

Chomski N., Halle M. The Sound Pattern of English. Harper and Row, New York — Evanston — London.

Trubetzkoy N.S. Sur la "morphonologie" // Traveaux du Circle Linguistique de Prague. 1.

Бернштейн С.Б. Введение в славянскую морфонологию // ВЯ. 1968. № 4. С. 43—59

Бернштейн С.Б. Очерк сравнительной грамматики славянских языков. Чередования. Именные основы. М.: Наука, 1974.

Бодуэн де Куртенэ И.А. Опыт теории фонетических альтернаций // Избр. труды по общему языкознанию: В 2 т. М.: Изд-во АН СССР, 1963. Т. 1. С. 265—348.

Булыгина Т.В. Проблемы теории морфонологических моделей. М.: Наука, 1977.

Булыгина Т.В., Крылов С.А. Морфонема // Лингвистический энциклопедический словарь. М.: Советская энциклопедия, 1990.

Ван-Вейк Н. История старославянского языка. М.: Изд-во иностр. лит-ры, 1957.

Вступ до порівняльно-історичного вивчення слов'янських мов. Київ, 1966.

Журавлев В.К. Введение в диахроническую морфологию // Балканско езикознание / Linguistique balkanique. 1976. 19. № 2. С. 49—71.

Журавлев В.К. Введение в диахроническую морфологию // Балканско езикознание / Linguistique balkanique. 1976. 19. № 3. С. 23—47.

Ильина Н.Е. Морфонология русского глагола. М.: Наука, 1980.

Касевич В.Б. Морфонология. Л.: Наука, 1986.

Кубрякова Е.С. Морфонология // Лингвистический энциклопедический словарь. М.: Сов. энцикл., 1990.

Кубрякова Е.С., Панкрац Ю.Г. Морфонология в описании языков. М.:, 1983.

Кузнецов П.С. Развитие индоевропейского склонения. М., 1958.

Кузнецов П.С. Чередования в праславянском "языке-основе" // Вопросы славянского языкознания. 1954. № 5. С. 24—67.

Лаврентьевская и Суздальская летописи по Академическому списку / Полное собрание русских летописей. М., 1962.

Мартине А. Принцип экономии в фонетический изменениях. М., 1960.

Мейе А. Общеславянский язык. М.: Изд-во иностр. лит., 1951.

Орлов А.С. Домострой по Коншинскому списку и подобным. Кн. 1 // Чтения в Обществе истории и древностей российских при Московском университете. М., 1908.

Павлов А.С. Книги законные, содержащие в себе в древнерусском переводе византийские законы, земледельческие, уголовные, брачные и судебные // ОРЯС. Т. XXXVIII. Спб, 1886.

Пацехіна А.А. Аб адным выпадку лексікалізацыі марфаналагічнага чаргавання ў беларускай мове // Национально-культурный компонент в тексте и языке. Мат-лы II Международной науч. конф. 7—9 апреля 1999. Мн., 1999. С. 100—101.

Пацехіна А.А. Аб ліквідацыі чаргаванняў у беларускім субстантыўным скланенні // Слово в диахронии и синхронии. Сб. научн. ст. к 80-летию профессора М.Г. Булахова. Мн., 1999. С. 117—129.

Пацехіна А.А. Да пытання аб ліквідацыі марфаналагічных чаргаванняў у беларускай мове // Мат-лы Міжнароднай навук. канфер. "Мова. Літаратура. Культура"да 50-годдзя адкрыцця кафедры беларускай мовы БДУ. Мн., 2000.

Пацехіна А.А. Спосабы граматычнага засваення запазычанняў у беларускай мове // Паланістыка 2000. У гонар К.М. Гюлумянц. Мн.: РІВШб 2001. С. 190—194.

Потехина А.А. Морфонологический статус фонемы [х] и ее альтернантов в древнерусском и современном русском языке. Автореф. дис. Мн., 1991.

Реформатский А.А. О соотношении фонетики и грамматики (морфологии) // Из истории отечественной фонологии. М., 1970.

Реформатский А.А. Фонологические этюды. М.: Наука, 1975.

Русская грамматика. Т.1. М.: Наука, 1980.

Русская правда по списку 1282 г. // Русские достопамятности. Ч. 1. М., 1918.

Селищев А.М. Старославянский язык: В 2 т. М.: Учпедгиз, 1951—1952.

Семереньи О. Введение в сравнительное языкознание. М.: Прогресс, 1980.

Славянская морфонология. Субстантивное словоизменение. М.: Наука, 1987.

Соболевский А.И. Лекции по истории русского языка. М., 1907.

Соссюр Ф. де Труды по языкознанию. М.: "Прогресс", 1977.

Срезневский И.И. Материалы для словаря древнерусского языка: В 3 т. М., 1959.

Трубецкой Н.С. Морфонологическая система русского языка // Избранные труды по филологии. М.: Прогресс, 1987.

Трубецкой Н.С. Некоторые соображения относительно морфонологии // Пражский лингвистический кружок. М.: Изд-во иностр. лит-ры, 1967. С. 115—119.

Холодович А.А. О "Курсе общей лингвистики" Ф. де Соссюра // Соссюр Ф. де "Труды по языкознанию". М.: Прогресс, 1977. С. 9—22 (прадмова).
Чурганова В.Г. Очерк русской морфонологии.М.: Наука, 1973.
Шахматов А.А. Историческая морфология русского языка. М.: Учпедгиз, 1957.
Якобсон Р.О. Избранные работы. М.: Прогресс, 1985.

А.А. Радзевіч

НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ ДА ПРАБЛЕМЫ "НЕЗАЛЕЖНАСЦІ" АКАЛІЧНАСНЫХ КАМПАНЕНТАЎ У ГІСТОРЫІ СІНТАКСІСУ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ МОЎ

У сучасную лінгвістычную парадыгму беларускага мовазнаўства паняцці *дэтэрмінацыі, дэтэрмінантаў, сітуатыўнага пашырэння, сітуантаў* неадзерныя кампаненты сказа, якія суадносяць увесь змест сказа з пэўным месцам і часам (П. Адамец, В. Грабе), як і сама канцэпцыя пашырэння сказа ў цэлым, уключаны рэфлексіўна, без належнага асэнсавання іх сутнасці. Увага беларускіх даследчыкаў у асноўным засяроджана на аспектах анталагічнага характару: марфолага-сінтаксічная тыпалогія і лексіка-семантычны аб'ём акалічнасных кампанентаў пры мадэліраванні прасторава-часавай сітуацыі. Характэрна, што ў рускай сінтаксічнай навуцы, адкуль бярэ свой пачатак канцэпцыя факультатыўных кампанентаў сказа, і да гэтага часу механізм дэтэрмінацыі канчаткова не вызначаны, а сама з'ява выклікае пярэчанні ці ўспрымаецца неадназначна.

Знаёмства са станаўленнем і вырашэннем праблемы арганізацыі сказа ў гісторыі сінтаксісу ўсходнеславянскіх моў дазваляе ўдакладніць сутнасць канцэпцыі "свабоднага далучэння", а дэтэрмінацыю ці сітуатыўнае пашырэнне асновы сказа акалічнаснымі кампанентамі даследаваць як аб'ектыўную з'яву, якая адлюстроўвае сучасны ўзровень развіцця сінтаксічнай навукі.

Запозненасць вучэння аб сказе ва ўсходнеславянскай навуцы аб мове прадвызначыла характар рапрацоўкі сінтаксічных праблем. Антычны свет, пераемнікамі і захавальнікамі культурнай спадчыны якога разам з іншымі народамі Еўропы былі і ўсходнія славяне, стварыў умовы для паглыбленага вывучэння моўных фактаў. Не дыскутуючы аб месцы Візантыі ў гэтым працэсе, усё ж такі трэба пагадзіцца, што "каля тысячы гадоў грэкамоўная культура існавала ў межах Візантыйскай імперыі..." [15, *109*] і "перадала славянству асноўныя панятці тэорыі мовы і славеснасці..." [15, *122*]. Старажытныя славянскія землі злучала з Візантыяй і хрысціянства — светабачанне, якое вызначала задачы "навуковага" спасціжэння ісціны.

І візантыйскую, і славянскую культуры заўсёды вылучалі самастойнасць і неардынарнасць у выпрацоўцы светапогляду на чалавека і сусвет. Аднак "жрэчаскі" пачатак у вывучэнні мовы шмат у чым прадвызначыў характар яе аналізу на славянскай глебе. Напачатку аб'ектыўнай была цікаўнасць да слова, яго гучання (фанетыка-арфаграфічны аспект). Высвятляецца праблема *слова-сутнасці*, што валодае "магічнай сілай уплываць на чалавека і нават на бажаство" [23, *8*].

Паступова граматыка становіцца сродкам асэнсавання слова як кампанента рэчыўнага свету, слова, якое не толькі называе, але і "арганізуе" гэты свет. Напрыклад, "Граматично исказание об русском езыку..." Ю. Крыжаніча — гэта пэўная сістэма поглядаў на мову, якая "имает своя властита правила" [12, *115*] і вылучаецца дэталёвай распрацоўкай катэгорый месца, часу, спосабу дзеяння. Яшчэ не сфармулявана разуменне цэлага, што аб'ядноўвае асобныя элементы, але ўжо значным падаецца грунтоўнасць вымярэння дзеяння як складанай семантычнай з'явы: "1) Отколи? Откада? Откогда? От ких пор, от ких мест? 2) Когда? Давич; Днес; Вчера; 3) Доколи? До сих пор..." [12, *115*; *116*]. А падрабязны пералік словаформаў, што выконваюць функцыі часу, месца, спосабу дзеяння ("Об изречению орудия") сёння можна ахарактарызаваць як грунтоўны і цікавы [12, *176—179*].

Неадназначна ўспрымаецца і "Грамматики Словенския правильное синтагма" М. Сматрыцкага. Пры відавочнай лагічнай скіраванасці ("Ёсць жа слова маўленняў складанне..." [24, *17*] у ёй можна ўгледзець падыход да праблемы члянення сказа на аснове семантычных адрозненняў у пэўных разрадах слоў, структурных зрухаў паміж імі [24, *185*], што парушае ўзорнасць пабудовы граматыкі, звычайна заснаванай на аглядзе "сінтагматыкі ўсіх марфалагічных класаў" [15, *105*].

У граматычнай канцэпцыі М.В. Ламаносава грунтоўна распрацаванага вучэння аб сказе няма. Яно абмежавана "правіламі" спалучальнасці слоў на аснове сувязей дапасавання і кіравання ("О сочинении часцей слова") [14, *185—210*]. Аднак слова ў граматыцы М.В. Ламаносава — гэта сродак адлюстравання і асэнсавання рэчаіснасці ў яе развіцці. І дадзена яно для паведамлення ўласных думак [14, *394*]. У М.В. Ламаносава сувязь мовы і мыслення шырэй за мадэль аб'яднання лагічных суб'екта і прэдыката: "Рэчаў і дзеянняў уласцівасці і акалічнасці памнажаюць нашыя паняцці і найменнямі іх <...> пашыраюць" [14, *418*]. Сам жа працэс структурна-граматычнага пашырэння бачыцца вучонаму разгалінаваным і складаным: пашырэнне знешняе ("памнажальнае") і ўнутранае ("павелічальнае"). У сістэме сін-

тагматычных сувязей улічваецца склад кампанентаў, іх матэрыяльнасць, месца часткі ў складзе цэлага і т. д. Нягледзячы на тое, што "дзеянне і залежнасць ёсць шчодрая крыніца ўсіх пашырэнняў", шмат увагі надаецца менавіта акалічнасці, паколькі, на думку аўтара "Краткого руководства к красноречию", падрабязнае "прывядзенне выбраных і лепшых акалічнасцей ёсць спосаб да пашырэння слова і яснага рэчы ці дзеяння адлюстравання" [13, *148*].

Аналізуючы граматычныя вучэнні XVIII—XIX ст., нельга не заўважыць, нягледзячы на іх супярэчлівасць у выбары прынцыпаў (метадалогіі) апісання, і вытокаў новага. Погляды А.Х. Вастокава займаюць асаблівае месца і характарызуюцца якасна новым падыходам да ўжо вядомага.

Як і пазалінгвістычная рэчаіснасць, структура сказа ўспрымаецца ім як пэўная сістэма. Гэта дазваляе прааналізаваць сінтаксічныя сувязі ў іх аб'ектыўнай дадзенасці. Улічваецца кожная акалічнасць (граматычная, сэнсавая, структурная), якая можа ўплываць на ступень звязнасці кампанентаў у сказе. "Прыназоўнікі, што кіруюць склонамі, маюць па некалькі значэнняў, з якіх адно ёсць спрадвечнае, іншыя значэнні пераносныя" [6, *141*]. За аснову бярэцца семантыка не толькі гэтай адзінкі, але і ўнутраныя змены сувязей пры ўключэнні прыназоўнікаў у граматычныя адзінствы. Да таго ж уласная семантыка прыназоўніка (напрыклад, месца) удакладняецца А.Х. Вастокавым дадатковай семантычнай градацыяй. Вось тут і вылучаюцца прыназоўнікавыя канструкцыі з сувяззю "адноснай свабоды".

Тэндэнцыі развіцця граматычнага мыслення таго часу вельмі добра адлюстраваны ў "Сравнительном синтаксисе" А.В. Папова, які спрабуе асэнсаваць і вытлумачыць магчымыя зрухі ў сістэме сувязей сказа. Нетрадыцыйны падыход ("...граматычныя паняцці залежнасці <...> з навуковага пункту гледжання — фікцыя" [20, *165*]) і падрабязны аналіз катэгорыі склонаў дае сінтаксісту падставы вылучыць асобны іх разрад "вінавальны незалежны".

Характэрна, што "незалежнасць" мае дакладную суаднесенасць з акалічнаснымі словаформамі: "сярод акалічнасных слоў у акалічнасцях часу і месца асабліва моцна праяўляецца схільнасць да самастойнасці; гэта відаць з таго, што яны часам утвараюць з сябе самастойныя сказы" [19, *57*]. На ступень самастойнасці ("незалежнасці") уплывае і значэнне (семантыка) словаформы. Напрыклад, "акалічнасці часу і месца для вызначэння <...> працягласці з'яўляюцца больш самастойнымі, чым акалічнасці на пытанне «калі?», «дзе?»" [19, *62*]. Даволі дакладна адзначаецца змяненне ступені самастойнасці ў залежнасці ад сувязей дзея-

слова з акалічнаснай словаформай, як і полісемія саміх катэгорый часу і месца. Перавага аддаецца "незалежным" акалічнасцям часу, паколькі, як лічыць А.В. Папоў, яны захаваліся ў найбольш натуральным выглядзе, а ў працэсе развіцця і станаўлення структуры сказа змяніліся нязначна: "У такіх сказах, як «Год без малого я не выходила из пустыни» <...> акалічнасныя словы з'яўляюцца *амаль што самастойнымі сказамі*" (Падкрэслена намі. — Р. А.) [19, *68*]. "Незалежныя" ж месца набылі дадатковае значэнне: першапачатковае значэнне месца (дзе?) ускладняецца значэннем перамяшчэння ў пэўным напрамку (куды?).

У працах, праблематыка якіх звязана з даследаваннем факультатыўных сувязей на ўзроўні структуры сказа, часта робіцца спасылка на "Историческую грамматику" Ф.І. Буслаева. Сапраўды, граматыстам узгадваюцца акалічнасныя словаформы, якія "1) злучаюцца праз кіраванне з тымі, да якіх далучаюцца, або 2) не знаходзяцца з імі ў відавочнай сінтаксічнай сувязі" [1, *275*]. Аднак адразу ўказваем на магчымасць рознага вытлумачэння "незалежнасці", "самастойнасці" прыслоўных канструкцый у Ф.І. Буслаева.

Па-першае, гэта можа быць асобным відам сувязі разам з дапасаваннем і кіраваннем, без чаго немагчымы акт пашырэння структурнай асновы сказа: "Асобныя словы толькі тады могуць скласці сказ, калі будуць злучаны адно з адным: 1) па спосабу дапасавання ці 2) па спосабу кіравання" [1, *270*]. Па-другое, гэта можна інтэрпрэтаваць як асобны від сувязі — сувязі "свабоднага далучальнага характару".

У гэтым выпадку трэба звярнуцца да філасофскіх поглядаў аўтара на мову і рэчаіснасць, да так званага ўмоўна-рамантычнага гістарызму (В.Ул. Вінаградаў) ва ўспрыняцці і вывучэнні моўных з'яў, што сапраўды адбілася на агульнай граматычнай канцэпцыі Ф.І. Буслаева. Яе сутнасць вызначаецца тэорыяй "першапачатковай мовы" (В. Гумбальт): "На месца палёту фантазіі, што з глыбокім сэнсам аб'ядноўвае граматычныя паказчыкі з паўнагучным патокам складоў, прыходзіць зручнасць разумення, што падзяляе формы на дапаможныя дзеясловы і прыназоўнікі" [7, *219*]. Гэтым, як мы мяркуем, і тлумачыцца вылучэнне Ф.І. Буслаевым акалічнасных словаформаў, якія не знаходзяцца ў пэўнай сувязі з астатнімі членамі сказа: "спрашчэнне" (і як вынік — зацямненне першапачатковай этымалогіі слова) магло адбіцца і на ўнутрыструктурных сувязях у сказе. У адпаведнасці з гэтым акалічнасныя кампаненты падзяляюцца ім на дзве групы: а) з сэнсавай сувяззю (тое, што зараз вызначаецца як прымыканне); б) акалічнасці, што "першапачаткова былі ў залежнасці ад такіх дзеясловаў, якія зараз кіравання пазбаўлены" [1, *276*].

Вылучэнне "незалежных" кампанентаў было толькі часткай таго, што патрабавала неадкладнага вырашэння. Дыскусію на старонках "Филологических записок" (Г. Мілавідаў, А. Хаванскі, Я. Грот, А. Барсаў і інш.) можна лічыць якасным зрухам у гісторыі станаўлення тэорыі сказа і структурнай схемы ў прыватнасці. Паколькі "адвольныя сухія правілы" (А. Катлярэўскі) разыходзіліся з тэарэтычнымі высновамі, падалі свой голас практыкі.

Напрыклад, прапановы настаўніка Карачанскай Аляксандраўскай прагімназіі А.А. Дзмітрэўскага цікавыя не толькі зменамі ў граматычнай іерархіі галоўных членаў сказа: "Дзейнік наогул не складае самастойнай катэгорыі і павінен разглядацца як адзін з відаў дапаўнення" [9, *61*]. Сярод іншых членаў, уключаных у структуру сказа пры дапамозе ўжо вядомых сувязей кіравання і дапасавання, ім разглядаюцца акалічнасці са "знешнім падпарадкаваннем" (з дакладна выражанай залежнасцю ад дзеяслова-выказніка) і "ўнутраным падпарадкаваннем" ("невідавочным") [8, *25*]. Былая ўпэўненасць у нязменнай зададзенасці сувязей на ўзроўні сказа страчвае свае пазіцыі. Прыводзячы традыцыйную класіфікацыю даданых членаў сказа, заснаваную на характары сувязей з галоўнымі членамі, адзначаецца складанасць гэтых адносін, дзе ўлічваецца не толькі форма марфалагічнага выражэння кампанентаў. Асаблівая ўвага звяртаецца на семантыку словаформы, характар яе акружэння і магчымыя выпадкі полісеміі.

Так, у залежнасці ад ступені сувязі са словам, што дапаўняецца, аўтар "Синтаксиса простого предложения" М.М. Веліканаў вылучае "ўласныя дапаўненні", якія ўтвараюць разам з гэтым словам "адно паняцце", і акалічнасныя члены сказа, якія толькі "прыстасоўваюцца" да слоў, што дапаўняюцца, але "не знаходзяцца з імі ў такой цеснай сувязі, як першыя, таму не маюць адносін да дзейніка" [2, *61*]. Робіцца меркаванне аб нейкай генетычнай схільнасці акалічнасных кампанентаў да "незалежнасці" сувязей на ўзроўні арганізацыі сказа. Падкрэсліваецца, што акалічнасная словаформа можа спалучаць у сабе некалькі сінкрэтызаваных значэнняў, а семантыка дзеяслова вызначае ступень яе залежнасці/незалежнасці [2, *72*].

У лінгвістычнай спадчыне А.А. Патабні таксама знайшлі адлюстраванне катэгорыі "дух", "арганізм", "энергія" (В. Гумбальт). Гэта вельмі важна, паколькі дапамагае вызначыць сутнасць яго граматычнай канцэпцыі.

Праблема статусу сказа, размежаванне лагічнага і граматычнага вырашаецца ў А.А. Патабні праз аналіз псіхічных працэсаў у свядомасці чалавека. Менавіта сказ з'яўляецца складанай псіхалагічнай фор-

май адлюстравання гэтых працэсаў, паколькі мова ёсць дзейнасць ("энергія"), а не прадукт дзейнасці ("эргон"): "...у гісторыі мовы, у псіхалагічных назіраннях сучасных нам працэсаў ключ да таго, як адбываліся гэтыя працэсы на пачатку жыцця чалавецтва" [22, *39*].

Зыходзячы з гэтага вызначаецца канцэпт "дух": "мова ёсць пераход ад несвядомасці да свядомасці", таму "можна параўнаць адносіны гэтай сістэмы слоў і граматычных форм да духу народнага з адносінамі да яго вядомай філасофскай сістэмы" [22, *38*]. Працэс пераходу ад "несвядомасці да свядомасці" А.А. Патабня звязвае з катэгорыямі "душэўнай дзейнасці", "душэўных з'яў". Члены сказа — "энергетычнае выяўленне сілы", нешта дадзенае, генетычнае, што толькі на ўзроўні сказа сябе і праяўляе. Напрыклад, "імя адносіцца да дзеяслова, як успаміны раней атрыманага ўражання да самога гэтага больш жывога ўражання" [22, *43*].

Нягледзячы на складанасць філасофскай і псіхалагічнай асновы граматычнай канцэпцыі ў А.А. Патабні, можна заўважыць, што структура сказа і ўзаемаадносіны кампанентаў ("форм"), якія складаюць гэтую структуру, падаюцца як аб'ектыўны гістарычны працэс прывядзення "матэрыі мовы" ў адпаведнасць са свядомасцю чалавека. Таму магчымыя змены на гэтым узроўні павінны ўспрымацца не механічна, а ў адзінстве супярэчнасцей. А.А. Патабня неаднаразова звяртае ўвагу на неадпаведнасць статуса сказа падзелу "форм" на "галоўныя" і "даданыя" [21, *81*]; на неадпаведнасць аб'яднання дапасавання і кіравання ў межах адной сістэмы ("прыпадабненне" і "залежнасць") [21, *90*].

Таму асаблівай увагі, на думку А.А. Патабні, патрабуюць формы, якія нельга падвесці ні пад дапасаванне, ні пад кіраванне. Сутнасць іх у тэрміналагічным вызначэнні — "бачная" і "нябачная" сувязь: "Акалічнасныя словы або зусім не знаходзяцца ў сувязі з іншымі членамі і ў такім разе стаяць па-за сказам, што немагчыма, або знаходзяцца з імі ў нябачнай сувязі..." [21, *92*]. На першы погляд, А.А. Патабня не прымае падобных "форм": "Чым больш дасканалымі робяцца сродкі назірання, тым больш мы пераконваемся, што сувязь паміж пэўнымі з'явамі мовы больш цяснейшая, чым падаецца" [21, *48*]). Відаць, праблема ў іншым: як вызначыць "нябачную сувязь" і даведацца пра яе існаванне?

Асэнсаваць механізм "паслаблення" сувязей у структуры сказа, наблізіцца да новага разумення сутнасці яго сінтаксічнай арганізацыі паспрабаваў Д.М. Аўсяніка-Кулікоўскі, аналізуючы гістарычна абумоўленыя змены ў сістэме граматычных катэгорый. Калі раней "нябачная" сувязь успрымалася як нешта загадкавае, анамальнае, то зараз падаецца Д.М. Аўсяніка-Кулікоўскім як звычайная сінтаксічная пазіцыя, як вынік гістарычна абумоўленых структурна-граматычных змен у сказе.

Сутнасць "нябачнай" сувязі, як мяркуе Д.М. Аўсяніка-Кулікоўскі, адлюстравана ў адносінах суб'екта да працэсаў думкі. Прапануецца класіфікацыя, заснаваная на паняццях "фіктыўнасці і ўяўнасці". Стварэнне "фікцыі" складаецца з трох этапаў: фіктыўнасць—уяўнасць—устараненне, — "з практыкі ці ўжытку думкі-паняцця, якое стала ўяўнай велічынёй" [17, *XXXII*].У адпаведнасці з гэтым некаторыя формы з'яўляюцца "фікцыямі", "уяўнымі" велічынямі [17, *XXXI*], што і робіць іх "незалежнымі". Сярод іх прыдзеяслоўныя "фіктыўныя" дапаўненні, прыналежнасць якіх да таго або іншага разраду вызначаецца месцам у валентным радзе дзеяслова. "Фіктыўныя" дапаўненні "не залежаць ці, па крайней меры, не знаходзяцца ў прамой залежнасці ад лексічнага значэння дзеяслова, а абумоўлены або станам, або характарам цэлага звароту... (*Мне хочется*, *Мне не спится*)" [17, *240*]. Вылучаюцца і пераходныя формы — "адносна-незалежныя", якія "ўтвараюць пераход ад дапаўнення да акалічнасці" [17, *240*], ці так званыя "фіктыўныя" дапаўненні-акалічнасці. На гэтым жа прынцыпе заснавана класіфікацыя і акалічнасцей, якія надзяляюцца большай "свабодай", чым дапаўненні. "Акалічнасць з'яўляецца часткай сказа больш незалежнай, чым іншыя яго часткі. Знаходзячыся пры выказнікў, яна ўзмацняе яго значэнне, надае яму большы аўтарытэт у сказе" [17, *258*].

Трэба падкрэсліць, што галоўным дасягненнем у пошуках і асэнсаванні сінтаксічнай канцэпцыі, якая б адпавядала моўным рэаліям, была думка аб рухомасці, зменнасці сінтаксічных форм і сувязей. Аднак і гэтае "новае" не было пазбаўлена пэўных хібаў. На некаторыя з іх указваў яшчэ Я.Ф. Карскі, а іменна на супярэчнасць граматычнай канцэпцыі, заснаванай на псіхалагічным падыходзе да моўных з'яў. Патрабуе вырашэння праблема ўзаемадзеяння "псіхалагічных уяўленняў" і форм сувязі паміж імі. Для таго, каб "суджэнне стала граматычным сказам, патрабуецца... выражэнне тым ці іншым спосабам фармальнай сувязі паміж указанымі словамі, што абазначаюць вядомае ўяўленне ці паняцце" [11, *310*]. Калі ж, на думку Я.Ф. Карскага, асноўная ўвага звяртаецца на змястоўнасць псіхалагічнага ўяўлення, а не на сувязі і адносіны паміж яго кампанентамі, то "новае разуменне сказа лёгка набліжаецца да старога суджання і нават супадае з ім" [11, *310*]. Таму даследаванне сінтаксічных сувязей павінна стаць прыярытэтным сярод іншых сінтаксічных праблем, паколькі "сутнасць розных рэчаў, у тым ліку і кампанентаў сказа, пазнаецца на аснове існуючых паміж імі адносін" [17, *66*].

Сувязі гэтыя, як і сама структура сказа, не аднародныя па сваім характары. Я.Ф. Карскі, аналізуючы некаторыя склонавыя прыназоўніка-

ва-назоўнікавыя формы, звяртае ўвагу, што іх ужыванне характарызуецца пэўнай "незалежнасцю". Такой уласцівасцю, як лічыць даследчык, валодаюць формы роднага склону кампанентаў структуры сказа ў адносінах да дзеяслова. "Пры дзеясловах ставіцца і родны часу, але сувязь яго з дзеясловам вельмі нязначная, так што яго можна лічыць родным незалежным (*Той же осени на филлиповы запуски приде войско литовское; того же року весне и лете по люди были хоробы великие; одного разу пошла яна шукаць сабе мужа*)" [11, *403*]. У формах жа давальнага склону адзначаецца суаднесенасць з усёй структурай сказа ў цэлым.

Я.Ф. Карскі спрабуе асэнсаваць сам механізм арганізацыі сувязей, што характарызуе ўзаемадзеянне розных узроўняў мовы. У прыватнасці, вытокі "незалежнасці" для давальнага склону тлумачацца ім як паслабленне першапачатковага прасторавага значэння. Гэта ж адлюстравана на сінтагматычным узроўні — ва ўзаемаадносінах прыслоўяў з імёнамі, займеннікамі: "<...> ад дзеяслова прыслоўе ўжо не залежыць, не кіруецца як дапаўненне ў вядомым склоне, а толькі стаіць пры дзеяслове, узмацняючы яго значэнне" [11, *444*]. А функцыянальнае прызначэнне "рэгулюе" ступень "незалежнасці".

Неадназначна ўспрымаецца і сінтаксічная канцэпцыя А.М. Пяшкоўскага. У ёй ёсць і непаслядоўнасць у падыходзе да словазлучэння, сказа, некаторая заблытанасць пры вызначэнні дзеяслоўнасці і недастаткова глыбокае пранікненне ва ўзаемаадносіны даданых і галоўных членаў сказа. Аднак ужо тое, што лінгвіст "засяродзіў увагу на вывучэнні сінтаксічных сувязей" ставіць яго канцэпцыю "вышэй за некаторыя іншыя больш пазнейшыя канцэпцыі сінтаксічных структур" [16, *72*]. А прапанаваныя знакавыя схемы для аналізу сувязей і сённяя можна выкарыстаць як мадэлі сінтаксічных адносін [18, *60*].

Характарызуючы "словазлучэнні" (сказы), А.М. Пяшкоўскі вылучае сярод іх "самастойныя часткі" і "рад іншых самастойных словазлучэнняў" [18, *283*]. У "самастойным словазлучэнні" А.М. Пяшкоўскага некаторыя бачаць не супрацьпастаўленне галоўных і даданых членаў сказа, як на гэтым настойваў В.У. Вінаградаў [4, *69*], а характэрнае і для сучасных сінтаксічных канцэпцый асэнсаванне дзейніка і выказніка ("самастойнае словазлучэнне") — ядра сказа, у якім кампаненты звязаны прэдыкатыўнай сувяззю [16, *77*].

Неадназначны падыход да сінтаксічных праблем і ў вылучэнні А.М. Пяшкоўскім моцнай і слабай ступеняў кіравання. Сярод некаторых асаблівасцей слабакіруемых форм (а выклікана гэта паслабленнем унутраных сувязей паміж кампанентамі) называюцца залежнасць сту-

пені кіравання ад парадку слоў, семантыкі словаформы, гэта значыць тое, што і сёння з'яўляецца вызначальным пры характарыстыцы акалічнаснай дэтэрмінацыі, ці сітуатыўнага пашырэння. А палажэнне аб адносінах слабакіруемых форм не да асобнага слова, а да цэлага словазлучэння (сказа) [18, *287*] займае цэнтральнае месца ў канцэпцыі акалічнаснай дэтэрмінацыі ці сітуатыўнага пашырэння структурнай асновы сказа.

На жаль, "слабакіруемыя формы" ў А.М. Пяшкоўскага — асобны эпізод, своеасаблівае выключэнне ў сістэме адносін кампанентаў структуры сказа.

Некаторыя з даследчыкаў праблемы свабоднага далучэння ўключаюць "спадарожныя" акалічнасці, вылучаныя А.А. Шахматавым, у агульную сістэму перадумоў станаўлення канцэпцыі акалічнаснай дэтэрмінацыі (Малашчанка В.П., Рудэнка Л.М.). Аднак не адзначаюцца супярэчнасці пры аналізе гэтых кампанентаў.

А.А. Шахматаў падкрэслівае, што ў некаторых выпадках акалічнасць, выражаная прыслоўем, можа набываць "незалежную" пазіцыю, але займае "тым не менш другараднае месца, якое залежыць ад усяго сказа ў яго сукупнасці" [25, *417*]. У сучаснай канцэпцыі свабодных далучальных сувязей (Шведава Н.Ю.) кіраванню, дапасаванню, прымыканню супрацьпастаўляецца дэтэрмінацыя — сувязь асобных кампанентаў з усёй структурнай асновай сказа ў цэлым. Але "спадарожныя" акалічнасці ў А.А. Шахматава не зусім адпавядаюць, як нам падаецца, сутнасці свабоднага далучэння. Зыходзячы з паняцця "псіхалагічнай камунікацыі", прапанаванага А.А. Шахматавым, можна кожны з элементаў гэтага працэсу аднесці да сказавага ўзроўню.

Па-другое, ў самой характарыстыцы "спадарожных" акалічнасцей закладзена супярэчнасць. Ужо форма акалічнасці, як падкрэсліваецца ім, указвае на залежнасць: "Назва залежных адносін у сказе адпавядае таму члену сказа, які называецца акалічнасцю" [25, *24*]. Таму "спадарожны" характар акалічнасці яшчэ не з'яўляецца паказчыкам яе факультатыўнасці ці "незалежнасці": "<...> прыслоўе можа абазначаць супастаўленую з пануючай адзнакай адзнаку, якая спадарожнічае яму, а таму яна стала у залежнае ад яго становішча" [25, *400*].

Сучаснае разуменне і інтэрпрэтацыя канцэпцыі дэтэрмінантных членаў сказа шмат у чым вызначаюцца даследаваннямі В.У. Вінаградава ў галіне сінтаксісу словазлучэння і сказа. Паколькі гэта патрабуе асобнага грунтоўнага аналізу, выкажам толькі некалькі заўваг.

В.У. Вінаградаў неаднаразова падкрэсліваў, што змены ў сістэме сувязей і арганізацыі сінтаксічных канструкцый павінны ўспрымацца як

аб'ектыўная з'ява, як вынік "узбагачэння і ўдасканалення <...> структуры" [5, 7]. Менавіта гэта і вызначае высокую ступень разнастайнасці, пераходнасці, сінкрэтызму членаў сказа і характар арганізацыі сказа ўвогуле. Таму "няўстойлівыя" словаформы сярод даданых членаў сказа ўпершыню адносяцца не да "загадкавых" выключэнняў, а складаюць неабходныя катэгорыі агульнай канцэпцыі сказа [3, 95]. Адзначанае В.У. Вінаградавым "свабоднае далучэнне" асобных прыназоўнікавых канструкцый сёння можна тлумачыць толькі якаснымі зменамі ў сістэме адносін класічнага падпарадкавання. Засталося толькі раскрыць сам механізм "паслаблення" сувязей і адсутнасць "прамой сінтаксічнай залежнасці" некаторых прыназоўнікава-назоўнікавых канструкцый у структуры сказа.

Знаёмства з некаторымі аспектамі станаўлення і распрацоўкі праблемы арганізацыі сказа ў гісторыі сінтаксісу ўсходнеславянскіх моў дае аб'ектыўныя падставы меркаваць аб гістарычна абумоўленай пераемнасці ў даследаванні сінтаксічных працэсаў: ад пазнання словасутнасці ў сістэме духоўна-філасофскай інтэрпрэтацыі свету да асэнсавання моўных катэгорый, дзе слова з'яўляецца асобным элементам у структурна арганізаваным адзінстве — сказе.

Прызнанне за моўнымі з'явамі магчымасцей да ўнутранага "ўдасканалення", відазмянення (Патабня А.А., Аўсяніка-Кулікоўскі Д.М., Карскі Я.Ф., Вінаградаў В.У.) дазволіла ўключыць выпадкі паслаблення сувязей на ўзроўні арганізацыі сказа і выказвання ў самастойную сінтаксічную канцэпцыю.

Былі вызначаны асноўныя напрамкі аналізу "свабодных далучальных канструкцый", марфалагічная, функцыянальная і семантычная абумоўленасць "паслаблення" сувязей, абумоўленасць ступені "незалежнасці" месцам ў структуры сказа, семантыкай дзеяслоўнай формы і характарам сродкаў сувязі.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што праблема акалічнаснай дэтэрмінацыі ці сітуатыўнага пашырэння мае аб'ектыўную аснову і можа быць кваліфікавана як неардынарная моўная з'ява ў сістэме сінтаксічных сувязей.

ЛІТАРАТУРА

1. *Буслаев Ф.И.* Синтаксис // Историческая грамматика русского языка. М., 1959.

2. *Великанов М.М.* Синтаксис. Простое предложение: Повторительный курс синтаксиса. Тверь, 1890. Вып. 1.

3. *Виноградов В.В.* Введение // Грамматика русского языка. М., 1960. Т. 2. Ч. 1.

4. *Виноградов В.В.* Из истории изучения русского синтаксиса. М., 1958.

5. *Виноградов В.В.* Некоторые задачи изучения синтаксиса простого предложения // Вопросы языкознания. М., 1954. № 1.

6. *Востоков А.Х.* Русская грамматика. Спб., 1874.

7. *Гумбольдт В.* Избранные труды по языкознанию. М., 1984.

8. *Дмитревский А.А.* Опыт учебника русского языка // Филологические записки. Воронеж, 1880. Вып. 1—2.

9. *Дмитревский А.А.* Практические заметки о русском языке // Филологические записки. Воронеж, 1877. Вып. 3—4.

10. *Дмитревский А.А.* Практические заметки о русском языке // Филологические записки. Воронеж, 1878. Вып. 1—2.

11. *Карский Е.Ф.* Белорусы. Язык белорусского народа. М., 1956. Вып. 2—3.

12. *Крижанич Ю.* Граматично исказание об руском езыку... М., 1859.

13. *Ломоносов М.В.* Краткое руководство к красноречию // Полное собрание сочинений. М.—Л., 1952 . Т.7.

14. *Ломоносов М.В.* Россійская грамматика (Факсимильное издание). М., 1982.

15. *Мечковская Н.Б.* Ранние восточнославянские грамматики. Мн., 1984.

16. *Мухин А.М.* Структура предложений и их модели. Л., 1968.

17. *Овсянико-Куликовский Д.Н.* Синтаксис русского языка. Спб., 1912.

18. *Пешковский А.М.* Русский синтаксис в научном освещении. М., 1956.

19. *Попов А.В.* Сравнительный синтаксис // Филологические записки. Воронеж, 1879. Вып. 4—6.

20. *Попов А.В.* Сравнительный синтаксис // Филологические записки. Воронеж, 1880. Вып. 1—5.

21. *Потебня А.А.* Из записок по русской грамматике // Филологические записки. Воронеж, 1873. Вып. 4—6.

22. *Потебня А.А.* Мысль и язык. Одесса, 1922.

23. *Прокофьев Н.И.* О литературно-художественных взглядах и требованиях в Древней Руси XI—XVI веков // Литература Древней Руси. М., 1986.

24. *Смотрицкий М.* Hramatiki Slovenskija pravilnoe syntagma (Факсимильное издание). Frankfurt am Main, 1974.

25. *Шахматов А.А.* Синтаксис русского языка. Л., 1925.

Т.Р. Рамза

СЕМАНТЫЧНАЯ СТРУКТУРА ЛЕКСЕМЫ *ЛЁД* *

Дэнататыўнае значэнне слова *лёд* ва ўсходнеславянскіх і польскай мовах цалкам супадае і намінуе сабой ці ваду, якая замерзла і перайшла ў цвёрды стан, ці вялікую колькасць ільдзін [ТСБЛМ, *317*; СУМ, *508*; SJP, *204*]. Разам з тым па-за межамі слоўнікавага артыкула застаецца шэраг устойлівых асацыяцый, сімвалічных уяўленняў, маўленчых канатацый, звязаных з лексемай *лёд*, якія абумоўлены традыцыйным народным светаўспрыманнем, наіўнай і канцэптуальнай карцінай свету славянаў. Мэта прапанаванага артыкула — адзначыць тыя семантычныя матывы, што ляжаць у аснове ўстойлівых выразаў з гэтай лексемай у су-

*Большая частка матэрыялу была агучана на міжнароднай канферэнцыі ў Беластоку (10—11 красавіка 2000 г.).

пастаўляемых мовах, а таксама выявіць сярод іх нацыянальна маркіраваныя адзінкі.

Паводле дадзеных У.М.Тапарова, балта-славянскі корань *led- (слав. *ledъ — ст.-сл. ледъ, бел. *лёд*, рус. *лед*, укр. *лід*, польск. *lód*, кашуб. *lód*; літ. *lõdas*, лтш. *lędus*) займае ізаляванае месца сярод іншых індаеўрапейскіх моў: "Утвараючы досыць разгалінаванае словаўтваральнае гняздо, гэта лексема і ў балтаў і ў славянаў сама па сабе выглядае нематываванай і найперш не мае першавобразнага дзеяслова, які б яе патлумачваў" [Топоров, *412*]. Але семантычныя матывы, на якіх грунтуюцца ўстойлівыя адзінкі з лексемай *лёд*, маюць пэўныя паралелі і ў рамана-германскіх мовах, прынамсі, нямецкай, і разам з тым могуць быць адрознымі ў роднасных мовах.

Паводле народнага светаразумення беларусаў, *лёд* узнік ад дзеяння Бога: "*ω^{m} д^{у}χненья божего дается лод и шириня вод на крузе*" [Цыт. па ГСБМ, *338*] (параўн. бел. загадку: *Палажыў бог пячаць, без жалеза не пачаць* [Загадкі, *52*]), а ў наіўнай карціне свету беларусаў і само неба ўтворана Богам з лёду: "*нижнее н^{е}бо створилъ б^{о}гъ дня второго: а оучинилъ е з ледуяко з кристалу*" [Цыт. па ГСБМ, *328; 329*].

У ст.-сл. мове лексема *лёд* мела тры значэнні 'лёд', 'мароз', 'лёдавы холад' (параўн. у ням. мове: *das Eis* 'лёд', перан. 'холад'), у рускіх дыялектах і іншых славянскіх мовах яна намінуе сабой і град [СРНГ, *318*]. У беларусаў існуе прымета: "Град робіцца з таго, што на небе замярзае вада <...>, той лёд адрываецца ат неба да й падае на хмары. От як захоча Бог каго пакараць, то й вяліць зграбаць той лёд на зямлю" [Сержпутоўскі, *38*]. Паміж "нябесным" і "зямным" лёдам ёсць яшчэ лёд горных вяршыняў, які фактычна атаясамліваецца з нябесным. І такі лёд — звышхолад, цалкам варожая чалавеку і жывой прыродзе стыхія. Найбольш яскрава такое яго ўспрыманне адлюстроўваецца ў паэзіі, напрыклад у Ф.І. Цютчава:

Сквозь лазурный сумрак ночи
Альпы снежные глядят;
Помертвевшие их очи
***Льдистым ужасом** разят* <...>
("Альпы", 1830)

Пра тое, што лексема *лёд* фактычна выкарыстоўваецца як сінонім слову *холад*, сведчыць шэраг парэмій: бел. *Прыйшоў Ілля і ўкінуў у ваду алядня, Ілля ў воду ўкідае лёду* [Сысоў, *181*] (пашыранае павер'е, што пасля 2 жніўня (Святы Ілля) забараняецца купацца: вада рэзка халаднее); *На вуснах мёд, а на (у) сэрцы лёд* [Лепешаў, 2, *37*], рус. *На словах медок, а на сердце ледок* [Stypuła, *401*], польск. *Na języku (w gębie) miód, a w serzu lód* [Stypuła, *136*], бел. З *лёду іскры не высячэш* [Ган-

чарова, *49*], рус. *В старомъ теле, что во льду* [Даль, *244*], польск. *dziewczyna jak lód* [NKP, 1, *539*], а таксама шэраг устойлівых параўнальных выразаў: бел. *што ляды* 'вельмі халодныя' [Носовіч, *267*], *лёд лёдам* 'вельмі халодны' [ТС, *28*], *як ледакі* 'адубелыя ад холаду' [СБГПЗБ, 2, *271*], рус. *как (словно, точно) лёд* [Огольцев, *208*], *как ледышка* 'халодны' [там жа, *209*]; прычым нярэдка выкарыстанне для большага ўзмацнення адначасова дзвюх лексем — *халодны* і *лёд:* бел. *халодны як лёд;* польск. *zimny jak lód* [Skorupka, *395*], *zimny jak lodu dwie bryły* 'халодны як дзве крыгі лёду' [NKP, 3, *877*], тое ж і ў нямецкай мове: *kalt wie Eis sein* 'неадчувальны, бяздушны, чэрствы' [Wahrig, *401*] (літаральна 'быць халодным як лёд').

Успрыманне лёду як ненатуральнага холаду надае яму сімвалічнае значэнне пагарды, грэбавання ўсім ніжэйшым [Керлот, *288*] (параўн. у гэтым дачыненні пераасэнсаваны ў польскай мове біблейскі выраз: *Kto posiał śnieg, zbiera lód* [NKP, 3, *173*] (літаральна 'хто пасеяў снег, збярэ лёд'). Правамерным падаецца тут правесці паралель з казкай датчаніна Г.Х. Андэрсена "Снежная каралева" і некаторымі народнымі выказваннямі. Так, апартаменты Снежнай каралевы — ледзяны палац, пасярод якога — замёрзлае возера, дзе і знаходзілася яна сама, сцвярджаючы, што сядзіць на люстры розуму (im Spiegel des Verstandes). Кай, займеўшы кавалак лёду замест сэрца, пагарджаў усімі і ўсім і забаўляўся толькі складваннем фігураў з ільдзін, што называлася ледзяной гульнёй розуму (das Verstandeseisspiel) (прычым мучыўся над словам Ewigkeit "вечнасць") [Andersen, *371*]. Параўн. бел. прыказку *Тое мудрона, што на лёдзе зварона* [Бел. пр., *155*], а таксама ўстойлівы рускі выраз *Покупай съ ледкомъ, а продавай съ огонькомъ* [Даль, *244*]. (Апасродкавана гл. таксама ў нямецкай і польскай мовах: *aufs Eis tanzen gehen* 'станавіцца высакамерным, зазнавацца' [Wahrig, *401*], і больш шырокі кантэкст гэтай фраземы: *Wenn's dem Esel zu wohl wird, geht er aufs Eis [tanzen]* — 'Калі хто-небудзь з-за сваёй фанабэрлівасці і высакамернасці рашаецца на што-небудзь цяжкае, то можа лёгка нашкодзіць' [Duden, 186] (літаральна 'калі аслу добра, ён ідзе на лёд (танцаваць)', тое ж у польск. *Jak się oslu dobrze powodzi, to chce tańcować po gołoledzi* [NKP, 2, *745*] (літаральна 'калі аслу спрыяе ўдача, то ён хоча танцаваць на галалёдзе'), і адсюль выснова: *Kto tańczy na lodzie, nogi ma w szkodzie* [там жа, *317*] (літаральна 'хто танцуе на лёдзе, мае пакалечаныя ногі')).

Паводле дадзеных слоўнікаў, *лёд* уваходзіць у самую частотную тысячу слоў паэтычнай беларускай мовы [Мажэйка, *5*], і ў ёй адным з самых "эксплуатуемых" ёсць матыў "лёду-смерці", прычым ён не толькі абумоўліваецца кантэкстам, але і першапачаткова ўтрымліваецца ў

структуры самой лексемы [гл. дэталёва: Топоров, *412—413*]. Параўн. верш рускага паэта М. Забалоцкага "Начало зимы": ***Заковывая*** *холодом природу, // Зима идет и руки тянет в воду. // Река дрожит и, чуя,* ***смертный час****, // Уже окрыть не может томных глаз, // И все ее беспомощное тело // Вдруг страшно* ***вытянулось*** *и* ***оцепенело****. // И,* ***еле двигая*** *свинцовою волной, // Теперь лежит и бьется головой. // Я наблюдал, как речка* ***умирала*** *<...> //* ***Смертельно*** *почерневшая вода //* ***Чешуйками подергивалась льда****. // И речка, вероятно,* ***еле билась****, //* ***Затвердевая*** *в каменном гробу* — і пункцір беларускага паэта А. Разанава: *Чалавек // упадае ў жыццё — // вадою // выпадае — // лёдам.* Лёд — "мёртвая вада" ў міфапаэтычным успрыманні гэтай рэаліі. Так, у беларускай казцы царэўна адтаяла ад ільду пад палкім паглядам хлопца, але не ажыла датуль, пакуль ён не пакрапіў яе жывою вадою [Чарадз., *326*]. "Мёртвая вада загойвае нанесеныя раны, зрошчвае рассечаныя часткі мёртвага цела, але яшчэ не ўваскрашае яго, яна робіць яго цэлым, але пакідае бездыханным, мёртвым <...>" [Афанасьев, *185*]. Таму лёд (як і вада) займае маргінальнае становішча паміж жывым і нежывым, бо ён валодае здольнасцю захоўваць аб'ект, які скоўвае у адным і тым жа стане, што і знайшло сваё адлюстраванне ў фальклорных і паэтычных тэкстах.

З другога боку, *лёд* (нароўні са снегам) — устойлівы атрыбут усходнеславянскай зімы, які выконвае ахоўную функцыю. Зіма — "гэта час пасля смерці [восень] і да адраджэння [вясна] — той час, якога няма ў чалавечым жыцці, але які з безумоўнай відавочнасцю выяўляецца ў жыцці прыроды. Прырода ўжо памерла і яшчэ не ўваскрэсла" [Эпштейн, *172*], яна знаходзіцца як бы ў летаргічным сне, анабіёзе. Таму *лёд* выклікае і станоўчае яго ўспрыманне, бо ён спрыяе захаванню жывога: *Лёд апякае, як ёд, але ў ім — мёд літасці, якою ахоўваецца ўсё жывое ад лёзаў марозу і люта*сці *холаду* (А. Разанаў "Лёд"), а таксама параўн. у вершы Н. Арсенневай "Хворая восень":

На асенні дурны забабон,
як на грыпа, зямля захварэла.
Хрыпла плача з-за мокрых вуглоў
і трасецца асінавай трасцай <...>

Будзе гэтак туляцца, стагнаць,
пакуль лёд не сатне яе сіні*,*
пакуль снежань не прыйдзе ёй даць
снежнабелы драбок аспірыны.

Сімвалічнае ўспрыманне лёду абумоўлена якраз тым, што ён паралізуе магчымасці вады. Устойлівыя метафарычныя выразы са значэннем "замярзаць" характэрныя як для ўсходнеславянскіх, так і польскай моў: бел. *лёдам стаяць* (пра вадаём) [СБГПЗБ, 2, *649*], укр. *кригою братися (взятися)* [СУМ, 4, *247*], польск. *stanąć lodem* [SJP, 4, *205*], а таксама ў ням. *in Eis verwandeln* 'замярзаць' [Wahrig, *401*] (літаральна

'пераўтварацца ў лёд'). Семантычны матыў застывання, згушчэння знайшоў сваё ўвасабленне ў фраземах, што метафарычна абазначаюць псіхафізіялагічную рэакцыю чалавека на нейкі жахлівы для яго факт рэчаіснасці — здранцвенне, застыласць: бел. *кроў (сэрца) ледзянее* 'адчуваць моцны страх' [Лепешаў, 2, *420*], укр. *кров крижаніе (крижаніла) в жилах* [СУМ, *342*], рус. *кровь леденеет* [ФСРЯ, *214*], польск. *ścinać krew lodem w żyłach* [SJP, *208*], *strach krew w lód obraza, Stoi, jakby go zimnym odział lodem* 'застылы, здранцвелы' [Linde, 2, *652*] (літаральна 'страх пераўтварае кроў у лёд', 'стаіць быццам яго апранулі ў халодны лёд') — і ў блізкім па семантыцы кантэксце: *Nie lejcież już na mnie wody z lodem* 'жахнуўся, напалохаўся, устрывожыўся' [NKP, 3, *732*] (літаральна 'не ліце ж на мяне ваду з лёдам'). (Параўн. у ням. мове: *das Blut wurde zu Eis* 'кроў застыла ў жылах' (літаральна 'кроў стала лёдам'), *Eisbeine bekommen (kriegen)* 'пахаладзець ад страху, напалохацца' [БНРС, 1, *407*] (літаральна 'займець ледзяныя (халодныя) ногі') і фамільярнае *j-m Eisbeine knicken* 'адчыхвосціць каго-н.' [Wahrig, *401*] (літаральна 'падламіць каму-н. ледзяныя ногі'), а таксама метафарычнае абыгрыванне адтэрміноўкі чаго-н.: *etw. aufs Eis legen (stellen)* 'замарозіць, адкласці на доўгі тэрмін' [БНРС, 1, *407*] (літаральна 'пакласці (паставіць) на лёд'), параўн. у рус.: *положить под сукно, отложить в долгий ящик.*

Станоўчыя характарыстыкі лёду абумоўлены найперш тым, што ён пераўвасобленая вада, і тым, што ён цвёрды, моцны, цэласны. У паэтычных і міфапаэтычных тэкстах якраз увасабляюцца гэтыя яго якасці: *Вада ўтрымлівае ў сабе лёд як сваю іпастась, як сваю патаемную патэнцыю, як свой летаргічны сон і ўсялякі раз, калі "прыціскаюць" абставіны, пералітоўваецца ў яго* (А. Разанаў, "Лёд"). На тым, што лёд — адзін са станаў вады, пабудаваны шэраг парэмій і загадак: польск. *Wody lodem nie wysuszy* [NKP, 3, *739*] (літаральна 'ваду лёдам не высушыш'); бел. *На вадзе радзіцца, а вады баіцца* [Загадкі, *52*], рус. *Меня рождает мать, которую я рождаю; Я вода да по воде же и плаваю* [Круглый, *405*]. Калі ж у прыродзе адбываецца парушэнне заканамернага, натуральнага, то людзі праецыруюць такія "адхіленні" на наступствы ў сваім жыцці: рус. *Ледъ весенній тонетъ на тяжелый, безхлебный годъ* [Даль, *244*]; *Когда вешний лёд по затонам и озерам не тронется, а тонет, год будет тяжелый* [Грушко, *245*]; польск. *Kiedy grzmi na lód, to będzie głód* 'Калі гром грыміць на лёд, то будзе голад' [NKP, 1, *765*].

Згодна з народным светаўяўленнем, *лёд* як пераўвасобленая вада захоўвае ў сабе яе плодную сілу: *"морозомъ, снегом, **солію і лiодомъ** можешъ крестити дітя, ежели бы вода з нихъ потекла на главу крещае-*

мого" [Цыт. па ГСБМ, *329*]; а таксама ў дачыненні да прыроды і чалавека: польск. *Gdy zima mocno rzeki lodem ścina, wiele ciężarnych mają w ten rok syna* [NKP, 3, *873*] (літаральна 'калі зіма моцна сцінае лёдам рэкі, то шмат цяжарных народзяць сына'; бел. *Калі зімою часта бывае галалёд, та будзе вялікі зраджай на ўсялякую пашню* [Сержпутоўскі, *40*]; рус. *Если лед на реке становится грудами, то и хлеба будут груды, а если гладко, то и хлеба будет гладко* [Грушко, *246*]. Дарэчы да гэтых народных прымет прывесці і фразеалагічныя адзінкі, дзе *лёд* апасродкавана ўтрымлівае сему 'багацце', што карэлюе з семай 'шмат': польск. *jak lodu* 'мноства, дужа многа' (найчасцей пра грошы) [Skorupka, *395*], бел. *як лёду* 'вельмі многа' [СБГПЗБ, *649*] (але мае рэгіянальнае пашырэнне, найчасцей гавораць *як гразі, як расы* [Санько, *103*]), а таксама кашуб. *тес реńą і jak lodu* 'быць багатым' [Sychta, *371*]. Параўнайце досыць зласлівае выказванне ў дачыненні да людзей канкрэтнай прафесіі, дзе лёд выступае крыніцай прыбытку ў той час, калі для іншых гэта досыць цяжкая часіна: бел. *Як на дварэ лёд, то кавалю мёд* [Бел. пр., *116*], рус. *Кода на дваре ледъ кузнецам медъ* [Добровольский, *372*], польск. *Jak na drodze lód, to kawalom miód* [NKP, 2, *171*], бо *Z końcem bosym na lód — niebezpieczna* [там жа, *127*] (літаральна 'небяспечна з босым (=непадкаваным) канём на лёд'); а таксама ў парэміях пра сквапнага чалавека, дзе *лёд* адназначна выяўляе сему 'шмат': бел. *У его і зімою лёду не дастанешъ* [Носовіч, *267*], *Узімку лёду не дасць* [Санько, *190*], рус. *У скупаго въ Крещенье льду не выпросишь, У него середъ зимы льду взаймы не выпросишь* [Даль, *244*], укр. *криги серед зими не выпросиш* [СУМ, 4, *342*]. І абсалютна аўтаномнай на прыведзеным фоне выступае беларуская фразема *як лёду* 'роўна столькі, колькі названа, ні больш ні менш, ні многа ні мала' [Лепешаў, 1, *573*], што грунтуецца на адной з самых адметных якасцяў лёду — яго цэльнасці-злітасці.

Моц ільду, яго трываласць у пэўны зімовы перыяд стала падставай для зычэння такіх жа якасцяў і чалавеку: бел. *Будзь здаровенькі на ўвесь год, як калядны лёд* [Янкоўскі, *206*] (параўн. у гэтым дачыненні беларускую прымету: *Калі першы раз загрыміць на лёд, та будзе здаровы год, бо людзі не будуць хварэць* [Сержпутоўскі, *32*]). Пра мацунак лёду ў пэўны час сведчыць і такая беларуская прыказка: *Піліпаўскі лёд кажа: "Хоць трашчу, але не пушчу"* [Сысоў, *233*]. Бясспрэчна, што зацвярдзенне раўназначна стойкасці, а таму з'яўляецца пазітыўным фактарам [Керлот, *288*]. Параўн. прыведзеную вышэй польскую фразему *dziewczyna jak lód* (якая можа быць выказана не толькі ў асуджэнне яе холаднасці, але і як пахвала яе цвёрдасці), бел. дыялект. *Кажуць, дзеўка на ляду грэіцца!* [СБГПЗБ, *48*], а таксама рус. тэкст-пытанне, што зада-

валі маладому пасля першай шлюбнай ночы: *"Лёд ломал али в прорубь попал?"* [Живая, *59*] і кашуб. выразы *ostac na lo e* 'застацца старой дзевай' і *ostavic panną na gorącim lo e* 'кінуць дзяўчыну' [Sychta, *371*]. У той час, мяркуючы па фразеалагізмах, якраз парушэнне злітнасці лёду ўспрымаецца як станоўчы фактар, бо дэфармацыя цэласнасці формы змяняе саму субстанцыю, лёд пераходзіць у іншы стан; прычым калі ён быў адзіным цэлым, то ўспрымаўся негатыўна, увасабляў сабой нейкую перашкоду, адчужанасць, недавер, парушэнне яго злітнасці дае надзею на пераход да лепшага. Такое разуменне знайшло сваё метафарычнае ўвасабленне ва ўстойлівых выразах ва ўсіх супастаўляемых мовах: бел. *разбіць (растапіць) лёд* 'ліквідаваць нацягнутасць у адносінах' [Лепешаў, 2, *368*], з тым жа значэннем: рус. *разбить (сломать) лед* [ФСРЯ, *200*], укр. *ламати (зламати, проламувати, проламати, розбивати, розбити) лід* [СУМ, *509*], польск. *przełamać (łamać, skruszyć, przebić (pierwsze) lody* [Skorupka, *395*], ням. *das Eis brechen* [Duden, *174*]; бел *лёд крануўся* 'пачатак чаму-н. зроблены', укр. *лід рушив* [СУМ, *509*], рус. *лед тронулся* [ФСРЯ, *200*], польск. *lody ruszają, spływają* [Skorupka, *395*]; бел. *лёд паламаны (растае)* 'знікае пачуццё адчужанасці' [Лепешаў, 1, *572*], *розтопити лід* 'пазбавіцца недаверу', *крига скресла* 'наступіла вясна; пачалося штосьці доўгачаканае' [СУМ, *509*], рус. *лед тает (растаял)* [ФСРЯ, *200*], польск. *lody puściły, stajały, roztajały, stopniały, stopiły się* [Skorupka, *395*]. (Параўн. таксама кашуб. *stopic są jak lód* — пра чалавека: 'змякчыцца' [Sychta, *371*] і тое ж у польск. *zmiękł jak lód marcowy* [NKP, 2, *468*] або: *taje jak lód* [там жа, 3, *497*].)

Перыядычнае з'яўленне лёду на рэках і азёрах абумовіла ўтварэнне такіх устойлівых адзінак, дзе *лёд* набывае значэнне пэўнага часавага прамежку: бел. *ад лёду і да лёду* 'круглы год' [Янкова, *179*], *од лёду до лёду* 'ад ледаставу да ледаставу' [ТС, *28*]; рус. *ото льду до льду* 'ад крыгалому да ледаставу'; *по первому льду* 'па першым зімовым шляху, калі на рацэ ўтвараецца лёд'; *съ первым ледом, за первымъ льдомъ тотчасъ* 'адразу пасля крыгаходу'; рус. *по синему леду* 'па апошнім зімовым шляху, перад крыгаходам' [СРЯ, *194*].

Той факт, што *лёд* — толькі часава абмежаваны стан вады, а таму нетрывалы, увасобіўся ва ўстойлівых адзінках: бел *як лёд на (каля) Пятра* 'зусім нетрывалае, ненадзейнае што-н.' [Даніловіч, *231*], *Злосць, што лёд: да цяпла жыве* [Бел. пр., *195*], рус. *Надежда на него, как на вешний лед* [СРНГ, *318*]; польск. *Niepewny jak lód w marcu* [NKP, 2, *318*] (літаральна 'няпэўны як лёд у сакавіку'), *Przyjaźń błagana jak marcowy lód z rana: rano po nim chodzisz, a w południe brodzisz* [там жа, *940*] (літаральна 'выпрашанае сяброўства як сакавіцкі лёд зранку: ранкам хо-

дзіш па ім, а ў поўдзень — па вадзе'). Часовасць існавання лёду, рэзкае пераўвасабленне яго ў першапачатковы стан (ваду) спарадзілі шэраг адметных моўных выразаў, якія грунтуюцца на семе 'няўстойлівасць': рус. *Где одна вода ледъ положит, тамъ другая вода его снесетъ*; *Молодой дружекъ, что вешній ледокъ* [Даль, *244*], параўн. таксама народнае тлумачэнне сну ў беларусаў *лёдам ісці* 'хтось хоча здрадзіць' [Сержпутоўскі, *69*]; польск. *na lodzie* 'небяспечна, нетрывала' [Linde, *652*], *zamki na lodzie* 'мары, якія не маюць ніякіх шансаў на здзяйсненне', *budować (stawiać) zamki na lodzie* [SJP, 2, *205*] і ў больш экспліцытным кантэксце *Kto więcej, niż może, obiecuje, zamki na lodzie buduje* [NKP, 2, *666*] (літаральна 'хто больш, чым можа, абяцае, замкі на лёдзе будуе'), кашуб. *budowac na lo e* 'дарма працаваць' [Sychta, 2, *371*], тое ж і ў беларускай мове: *На лёдзе хату будаваць* [Санько, *99*], *На лёдзе дурань хату ставіць* [Бел. пр., *224*], рус. *На льду не строятся* [Даль, *244*], а таксама пра хісткасць, няўпэўненасць: польск. *stoi (siedzi) na lodzie (gołoledzi)* 'няпэўна; быць у небяспецы' і больш шырокі кантэкст: *Stoi jak słóń na lodzie, Trzyma się jako kot na gołoledzi* [NKP, 3, *182*], *Opiera się jak koza na lodzie* [там жа, 2, *734*], *Chodzi jak niedźwiydź po lodzie* [там жа, 1, *281*], бел. *Ідзе (ходзіць) як карова па лёдзе* [Ліцвінка, *71*], кашуб. *Obracac są jak vol na lo e* [Sychta, 2, *371*]. (Натуральна, што ўсе гэтыя жывёлы трымаюцца на лёдзе вельмі няўстойліва і нязграбна; параўн. у гэтым кантэксце неадабральную бел. дыялект. фразему *выдурвацца як карова на лёдзе* са значэннем 'вельмі, празмерна' [Даніловіч, *229*]).

Амбівалентнасць сігніфікатыўнага значэння слова *лёд* рэпрэзентуецца ў проціпастаўленні такіх характарыстак, як 'цвёрдасць', 'надзейнасць' і 'няўстойлівасць', 'хісткасць'. Сумяшчэнне ў адной лексеме вышэйназваных узаемавыключальных матываў стала падставай для стварэння такіх устойлівых параўнальных адзінак, у якіх ужыванне гэтага слова надае ім значэнне 'непрадказальнасць': рус. *Как на льду обломиться* [СРНГ, *318*], бел. *Пагуляў, як рыба па лёдзе* [Бел. пр., *195*], *Пляснуў, як дзячыха па лёдзе* [Бел. пр., *151*], *А пад кім лёд трашчыць, а пад намі ломіцца* [Даніловіч, *288*], а таксама польск. выразы-папярэджанні: *Pod lodem belek nie ma* [NKP, 2, *318*] (літаральна 'пад ільдом няма бэлек'), *Ładem bezpieczniej niż lodem* [NKP, 2, *32*] (літаральна 'па сушы бяспечней, чым па лёдзе').

Тое, што *лёд* — небяспека, абумовіла выкарыстанне гэтай лексемы непасрэдна для наймення паняццяў 'бяда', 'няшчасце', 'няўдача' [Гл. дэталёва: Топоров, *413*; ЭСБМ, *109*], а таксама апасродкавана ва ўстойлівых адзінках: бел. *як рыба аб лёд (біцца)* 'жыць у бядзе, дарэмна дабіваючыся лепшага' [ТСБЛМ, *317*], рус. *биться как рыба об лед*

[Шанский, *17*], польск. *jak ryba na lodzie* і *bije się jak ryba o lód (pod lodem)* [NKP, 3, *104*]; укр. *сісти на лід* ‘яўдала завяршыць якую-н. справу; апынуцца ў цяжкім становішчы; збяднець’ і *посадити на лід* ‘звесці на нішто чыю-н. справу’ [СУМ, 4, *509*] (параўн. рус: *сесть в лужу* і *посадить в лужу*), польск. *zostać (osiąść) na lodzie* ‘застацца пазбаўленым чаго-н., застацца з нічым’ і *zostawić kogo a. co (osadzić kogo) na lodzie* ‘пазбавіць кагосьці чаго-н. і пакінуць сам-насам у цяжкай сітуацыі; кінуць што-н. на вырашэнне лёсу; перастаць чым-н. цікавіцца’ [SJP, *205*] і больш шырокі кантэкст: *Kto bez Boga chce wskórać, sadzi się na ledzi* [NKP, 1, *172*] (літаральна ‘Хто без Бога хоча чаго-н. дабіцца, стараецца на лёдзе’); бел. неадабр. *сперці як босага на лёд* ‘ставіць каго-н. у бязвыхаднае становішча, прымушаючы зрабіць што-н.’ [Лепешаў (а), *66*]; ням. *aufs Eis gehen* ‘трапіць у цяжкае становішча’; *j-n aufs Eis führen (wollen)[locken]* ‘паставіць каго-н. у цяжкае становішча; перахітрыць, спадмануць каго-н.’; *j-m aufs Eis gehen* ‘даць каму-н. абмануць сябе’ [БНРС, *406*]. Параўн. разам з тым у нямецкай мове *die Kuh vom Eis bringen / kriegen* ‘вырашыць цяжкую праблему’ [Duden, *422*] (а літаральна ‘прынесці карову з лёду’) і рус. дыялект. *Отработать, как леду* ‘выканаць вельмі цяжкую і няўдзячную працу’ [СРНГ, *318*].

У процілегласць матыву няўдачы, непрадказальнасці гэта лексема ўтрымлівае і антанімічную сему ‘лёгка’, параўн.: польск. *jak po lodzie* ‘без перашкод, без цяжкасцяў’ [SJP, *205*], што, безумоўна, матывавана яго рэчыўнай характарыстыкай — гладкасцю (параўн. больш разгорнуты выраз: *gładko jak po lodzie* [NKP, 1, *630*] і рус. *как по маслу*). Паводле сведчання Асацыятыўнага слоўніка беларускай мовы на слова-стымул *гладкі* большасць рэспандэнтаў прывяла слова-асацыят *лёд* (у тым ліку і ўстойлівае параўнанне *як лёд*) [Цітова]. Відавочна нацыянальна маркіраванай у адзначаным кантэксце выступае рус. фразема *Как ладожский лёд идет* ‘усё ідзе як належыць, як па маслу’ [СРНГ, *318*], што ўключае ў свой склад уласную назву — Ладажскае возера (параўн. у гэтым плане таксама маркіраваны польскі выраз з такім жа кампанентам *Styczeń dla gości lodem* ***Wiślę*** *mości* [NKP, 3, *344*] (літаральна ‘студзень для гасцей Віслу мосціць лёдам’)).

Аднак гладкасць ільду мае адваротны, негатыўны бок, бо спрыяе коўзкасці, слізгоце, што, вядома, з’яўляецца небяспечным, а таму прымушае быць на ім вельмі асцярожным. Гэтая акалічнасць выразна засведчана ў польскай фраземе: *idzie (jedzie) jak po lodzie,* і ў больш выразным кантэксце: *iść w rzeczach ostrożnie jak po lodzie* [NKP, 1, *802*], *jedzie, ale to jedzie jak po śliskim lodzie* [там жа, *838*], а таксама ў выразах

павучальнага кшталту: *lód jest śliska rzecz, nie trzeba na niego obces wpadać* [там жа, 2, *317*] (літаральна ‘лёд — слізкая рэч, не трэба на яго дзёрзка ўскокваць’), *I gąska nieraz na lodzie pośliźnie się* [там жа, 1, *624*] (літаральна ‘І гуска не раз паслізнецца на лёдзе’).

Такім чынам, лексема *лёд* у фальклорных тэкстах, якімі з’яўляюцца найперш фраземы і парэміі, а таксама ў паэтычных тэкстах выяўляе дадатковыя да свайго дэнататыўнага значэння семантычныя матывы, якія грунтуюцца на яе першаснай функцыі, — найменні адметнай прыроднай з’явы. Устойлівыя выразы з кампанентам *лёд* у супастаўляемых мовах маюць больш тыпалагічнага, чым генетычнага, і таму пра нацыянальную маркіраванасць можна гаварыць толькі ў дачыненні да асобных адзінак. Найбольш яркія другасныя матывы гэтай лексемы могуць быць адлюстраваны схематычна:

Сэнсавая структура лексемы *лёд*

‘холад’
бел. *халодны як лёд*
польск. *zimny jak lód*
ням. *kalt wie Eis sein*

‘замярзанне’
бел. *лёдам стаяць*
укр. *кригою братися (взятися)*
польск. *stanąć lodem*
ням. *in Eis verwandeln*

‘застыванне’
бел. *кроў (сэрца) ледзянее*
укр. *кров крижаніе в жилах*
рус. *кровь леденеет*
польск. *ścinać krew lodem w żyłach*
ням. *das Blut wurde zu Eis*

‘перашкода’
бел. *разбіць (растапіць) лёд*
рус. *разбить (сломать) лед*
укр. *розбити лід*
польск. *skruszyć lody*
ням. *das Eis brechen*

ЛЁД

бел. *біцца як рыба аб лёд*
рус. *биться как рыба об лед*

‘няўдача’
укр. *сісти на лід* і *посадити на лід*
польск. *osiąść na lodzie* і *zostawić kogo a. co na lodzie*
ням. *j-n aufs Eis führen (wollen)[locken]*

‘няўстойлівасць’	бел. *На лёдзе хату будаваць* рус. *На льду не строятся* польск. *stawiać zamki na lodzie* ням. *aufs Eis gehen*
‘непрадказальнасць’	бел. *Пагуляў, як рыба па лёдзе* рус. *Как на льду обломиться* польск.*Pod lodem belek nie ma* ням. *j-m aufs Eis gehen* бел. *як лёду*
‘шмат’	рус.? польск. *jak lodu*
‘якраз’	бел. *як лёду* рус.? польск.?

ЛІТАРАТУРА

Andersen H. Sämtliche Märchen und Geschichten. Leipzig,1969. B.1. 659 s.

Афанасьев А.Н. Поэтические воззрения славян на природу: В 3 т. М.,1995. Т.1. 416 с.

Бел. пр. — Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / Склаў Я.Рапановіч. Мн., 1974.

БНРС — Большой немецко-русский словарь: В 2-х т. М., 1980. Т.1. 760 с.

Wahrig G. Deutsches Wörterbuch. München, 2000. 1451 s.

Гончарова Н.И., Щербакова И.М. Из античной мудрости. Мн., 1995. 373 с.

Грушко Е.А., Медведев Ю.М. Словарь русских суеверий, заклинаний, примет и поверий. Ниж. Новгород, 1995. 560 с.

ГСБМ — Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Мн., 1997. Вып.16. 359 с.

Даль В. Толковый словарь живого великорусского языка: В 4 т. М., 1979. Т.2. 779 с.

Даніловіч М.А. Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны. Гродна, 2000. 267 с.

Der Duden. Redewendungen und sprichwörtliche Redensarten / Worterbuch der deutschen Idiomatik. Mannheim-Leipzid-Wien-Zürich: Dudenverlag, 1992. B.11. 864 s.

Добровольскмй В.Н. Смоленский областной словарь. Смоленск, 1914. 1022 с.

Живая старина. 1995. №2.

Загадкі. Мн., 1972. 448 с.

Керлот Х. Словарь символов. М., 1994. 608 с.

Круглый год. Русский земледельческий календарь. М.,1991. 496 с.

Лепешаў І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2 т. Мн., 1993. Т.1. Т.2.

Лепешаў (а) — *Лепешаў І.Я.* З народнай фразеалогіі: Дыферэнц. слоўнік. Мн., 1991.

Linde B. Słownik języka polskiego: T.1—4. Lwów, 1855. T.2. 691 s.

Ліцвінка В.Д., Царанкоў Л.А. Слова міма не ляціць: Беларус. нар. прыказкі і прымаўкі. Мн.,1985. 149 с.

Мажэйка Н.С., Супрун А.Я. Частотны слоўнік беларускай мовы: Паэзія. Мн.,1992.

Мокиенко В.М. Русская картина мира и сопоставительный анализ фразеологии и пареомиологии // Рус.язык, литература и культура на рубеже веков. IX Междунар. конгресс МАПРЯЛ. Тез. докл. и сообщ. (16—21 августа 1999): В 2 ч. Братислава, 1999. Ч.1. С.120—121.

NKP — Nowa księga przysłów i wyrażeń przysłowiowych polskich: W 4 t. Warszawa, 1969—1978. T.1. 881 s.; T. 2. 1165 s.; T.3. 996 s.; T.4. 627 s.

Носовіч І.І. Слоўнік беларускай мовы. Мн.,1983. 792 с.

Огольцев В.М. Краткий словарь устойчивых сравнений русского языка. Ижевск, 1994.

Санько З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. Мн., 1991.

СБГПЗБ — Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: У 5-і т. Мн.,1980. Т.2: Д—Л. 728 с.

Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1999. 301 с.

SJP — Słownik języka polskiego. Warszawa, 1962. T.4. 1331 s.

Skorupka S. Słownik frazeologiczny języka polskiego: W 2 t. Warszawa. 1967. T.1. 788 s.

СРНГ — Словарь русских народных говоров. Л.,1974. Вып.16. 388 с.

СРЯ — Словарь русского языка XI—XYII веков. М.,1981. Вып.8. 351 с.

Stypuła R. Słownik przysłów rosyjsko-polski i polsko-rosyjski. Warszawa,1974. 559 s.

СУМ — Словник українськоі мови: В XI т. Київ. 1973. T.YI. 840 с.

Sychta B. Słownik gwar kaszubskich na tle kultury ludowej: W 7 t. Wrocław; Warszawa; Kraków,1968. T.2. 412 s.

Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. М.,1997. 41 с.

Топоров В.Н. Прусский язык: Словарь Л—L. М.,1984. 43 с.

ТС — Тураўскі слоўнік: У 5 т. Мн., 1984. Т.3. 31 с.

ТСБЛМ — Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1996. 784 с.

ФСРЯ — Фразеологический словарь русского языка. М., 1967. 543 с.

Цітова А.І. Асацыятыўны слоўнік беларускай мовы. Мн., 1981. 144 с.

Чарадз. — Чарадзейныя казкі. Мн., 1973. Ч. 1. 648 с.

Шанский Н.М., Зимин В.И., Филиппов А.В. Опыт этимологического словаря русской фразеологии. М., 1987. 240 с.

Эпштейн М.Н. "Природа, мир, тайник вселенной...": Система пейзажных образов в русской поэзии. М.,1990. 303 с.

ЭСБМ — Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Мн., 1990. Т. 6: Л—М. 289 с.

Янкова Т.С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. Мн., 1982. 432 с.

Янкоўскі Ф. Дыялектны слоўнік. Мн., 1959. Вып. 1. 230 с.

С.Я. Рапацэвіч

ЗВАРОТАК У ПАЭТЫЧНАЙ МОВЕ (ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ МНАГАЗНАЧНАСЦЬ)

Умоўнасць звароткаў у паэтычным тэксце, паслабленне ці адсутнасць іх уласна апелятыўнай функцыі, статус кампазіцыйнай формы — усе гэтыя асаблівасці надзвычай важна ўлічваць пры даследаванні структурнага і функцыянальнага аспектаў сінтаксісу [Тарасов, 1976, *14*] паэтычнай мовы.

Вядома, што аслабленне адных функцый цягне за сабой з'яўленне новых. Пазіцыя зваротка ў паэтычным тэксце застаецца адкрытай для выражэння адносін намінацыі [Бурак, 1987, *191— 92*] і прэдыкацыі [Пешковский, 1956, *57—59*]. На магчымасць спалучэння ў назоўным склоне апелятыўнага і прэдыкатыўнага значэння ўказваў А. Пяшкоўскі: "Асноўны сэнс гэтага назоўнага — пабуджальны: прымусіць слухача

слухаць, звярнуць яго ўвагу на маўленне гаворачага. Але ўжо ў размове гэта функцыя шчыльна пераплятаецца з функцыяй кваліфікацыі самога слухача, у выніку атрымліваецца нешта сярэдняе між звароткам і назоўным прэдыкатыўным з апушчаным ***ты***. У літаратураній мове група звароткаў часта робіцца эстэтычным альбо рытарычным цэнтрам, убірае ў сябе максімум думак і пачуццяў аўтара" [Пешковский, 1956, *407*].

У паэтычнай мове абазначэнне прыметы, характарызацыя, азначэнне імкнецца заняць усе прыўдатныя для гэтага сінтаксічныя пазіцыі. У святле гэтага важна адзначыць, што звароткі часта насычаны абазначэннем прымет і, такім чынам, акрамя значэння адрасаванасці, заключаюць у сабе характарыстыку адрасата. Паводле гэтага мэтазгодна вылучыць тры разрады звароткаў: 1) звароткі, якія сумяшчаюць у сабе функцыі адрасацыі і характарызацыі (*звароткі-характарыстыкі*); 2) звароткі, якія сумяшчаюць у сабе функцыі адрасацыі і намінацыі (*звароткі-намінацыі*); 3) звароткі, якія спалучаюць усе тры функцыі — адрасацыі, намінацыі і характарызацыі (*фразавыя намінацыі*).

У межах звароткаў-характарыстык азначэнне адрасата можа рэалізоўвацца ў дзвюх структурных групах: а) утрымліваца ў самім зваротку; б) выражацца пры дапамозе канструкцый з прэдыкатыўным значэннем (звароткі, ускладненыя адасобленымі зваротамі).

Першая структурная група звароткаў-характарыстык выражаецца, як правіла, пры дапамозе субстантываваных прыметнікаў: ***Дарагая****! Я чую, я чую! І ты вер — мне спакою не знаць: Прысягаю на помсту святую, Што прыйду я цябе ратаваць* (М. Машара)*; Ляціце,* ***родныя****! Я б хацеў мець вашы крыллі, Аб чым у цяжкі час не раз душою згараў* (П. Пестрак)*; Імень, паветра... Яно такое!.. Не знайсці параўнання — якое... Як і ты, з той жа пражы сатканая,* ***Дарагая мая, каханая!*** (С. Дзяргай).

Звароткі-прыметнікі ў паэтычнай мове неаднародныя. Знешне яны вельмі блізкія да звароткаў у размоўным стылі. Але ў вусным маўленні, калі выключыць аказіянальныя ўтварэнні, у якіх прысутнічае момант індывідуальнай творчасці, звароткі-прыметнікі семантычна абмежаваныя, паколькі звычайна выражаюць або пяшчоту, або грубасць, — г. зн. звароткі з ярка выражанай станоўчай ці адмоўнай адзнакай.

У паэтычных жа тэкстах звароткі-прыметнікі, у тым ліку і ва ўмовах міжвершавай атрыбуцыі [Артеменко, 1977, *83*], заключаюць у сабе не столькі экспрэсіўна-ацэначны сэнс, сколькі — семантыку характарызацыі, выяўлення прымет. Перавага характарызуючага значэння матывуе змяншэнне ўдзельнай вагі апелятыўнай функцыі, якая да таго ж у паэтычным маўленні носіць умоўны характар. Індывідуальнасць,

своеасаблівасць выражанай у звароткy прыметы перамяшчаюць яго па шкале адрасацыя — характарызацыя (прэдыкацыя) у бок характарызацыі: *Дзе ты,* ***чарнавокая, Блізкая, далёкая****, Светлая, падобная вясне? Можа, у гэты вечар Ты чакаеш стрэчы І таксама марыш пра мяне?* (А. Ушакоў)*; Не плач,* ***забытая****, прыеду на пасёлак, Пазней ці ў травені, як зацвітуць сады* (П. Трус).

Да звароткаў-прыметнікаў па сваіх сэнсавых уласцівасцях набліжаюцца: а) звароткі з неадасобленымі прыдаткамі: *Маці родная,* ***Маці-Краіна!*** *Не усцішыцца гэтакі боль... Ты прабач. Ты прымі свайго сына, За цябе яму ўмерці дазволь!..* (М. Багдановіч)*; Эх, скажы ты нам цёплае слова, Прытулі нас,* ***радзіма-зямля!*** (П. Пестрак)*;* ***Беларусь-радзіма****, вольная старонка, Вольным тваім далям краю не відаць* (А. Русак); б) звароткі-словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі. Трэба адзначыць, што тут, з аднаго боку, узмацняецца інфармацыйная функцыя, а з другога — прыметнікі ў саставе звароткаў здольны даваць яркую, індывідуальную характарыстыку адрасату мовы, абазначаць такія яго прыметы, якія своеасабліва і ўпершыню раскрываюцца ў даным кантэксце. Чым больш новая і індывідуальная прымета, тым у большай ступені такія звароткі выражаюць прэдыкатыўныя адносіны: *О,* ***чорны дзень****! Ты ненажэрны, Людзей сціскаеш у рады. І дзеліш золата (не зерне!), Нібы збавенне ад бяды* (Ю. Свірка)*; Пакланюся я табе, царыца,* ***Чыстая, сцюдзёная вадзіца*** (М. Багдановіч)*;* ***Цёмнавокая пані****, сябе Я на гэтым агні не спалю: Шмат на свеце ёсць розных агнёў, Ўсе яны вабяць душу маю* (М. Багдановіч).

Другую групу звароткаў-характарыстык складаюць структуры з адасобленымі зваротамі, якія раскрываюць прыметы адрасата, здзяйсняючы тым самым прэдыкатыўную функцыю. Семантыка адасобленага зварота аказваецца звязанай з семантыкай звароткa звароткавай залежнасцю: чым больш ярка выражана адрасаванасць у звароткy, тым менш гэтая адрасаванасць адчуваецца ў адасобленым звароце. Адасоблены зварот у гэтым выпадку становіцца бліжэй да полюса чыстай характарызацыі. Залежнасць ад кантэксту — рытмічнага, сінтаксічнага і лексіка-семантычнага — мае следствам зменлівы статус адасобленых іменных груп. Гэта знішчае магчымасць іх дакладнай кваліфікацыі ў граматычных апісаннях. Тым не менш выяўленне фактараў, якія ўплываюць на функцыю адасобленага звароту ў паэтычным тэксце, дазваляе кожны раз устанаўліваць залатую сярэдзіну гэтых фактараў і вызначаць, хаця і з прыблізнасцю, месца адасобленага звароту на шкале адрасацыя — характарызацыя: *Бывай,* ***абуджаная сэрцам, дарагая****. Чаму так горка не магу я зразумець. Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае. На ўсхо-*

дзе дня майго, якому ружавець (А. Куляшоў)*; Ой, вы,* ***вербы й сасонкі, Зораў спелых сям'я****!.. З вамі сёння на золку Развітаюся я* (А. Коршак)*;* ***Матуля, родная мая****. Ўжо дагарыць лучына ў хаце, Як да цябе вярнуся я* (П. Трус)*; Працуй на шчасце роднае дзяржавы,* ***наш добры друг, абраннік і паэт, увенчаны усенароднай славай*** (К. Буйло).

У звароткі да асоб і іншых адушаўлёных істот, блізкіх да лірычнага суб'екта, значэнне адрасацыі звычайна бывае яўна выражаным безадносна да ўмоў кантэксту. Такая адрасаванасць звароткаў-намінацый, якая сведчыць аб блізкасці, аб глыбінным унутраным кантакце, часцей за ўсё назіраецца ў звароткі да Радзімы, народа, прыродных сіл: ***Радзіма мая дарагая****! Ты ў шчасці жаданым жыві: Я сэрцам табе прысягаю У шчырай сыноўняй любві* (А. Бачыла)*; О,* ***Беларусь!..*** *— няхай усклікну І я за волатамі ўслед. Як пілігрым нясе малітву — так я нясу іх запавет* (Н. Гілевіч)*;* ***Вецер, вецер, буйны вецер!*** *Спеў ад сэрца льецца. Маіх песень голле-вецце У вянок заўецца!* (П. Трус). У іншых тэматычных групах звароткаў значэнне адрасацыі можа быць аслабленым.

Пры змяншэнні пазіцыі адрасацыі зварот актыўна запаўняецца значэннямі намінацыі і прэдыкацыі. Найменне прадмета мовы і абазначэнне яго прымет — функцыі, якія існуюць толькі ва ўзаемадзеянні аднаго з адным, таму аслабленне адной функцыі вядзе да ўзрастання другой.

Функцыю найменя прадмета маўлення набываюць звычайна такія тыпы звароткаў, дзе адрасаванасць валодае найбольшай ступенню ўмоўнасці. Адзначанае пераразмеркаванне функцый можна назіраць пры зваротах да прадметаў і аб'ектаў акаляючай рэчаіснасці, якія знаходзяцца ў полі зрокавага ўспрымання. Разам з тым функцыю намінацыі бяруць на сябе і звароты да абстрактных панняцяў і абагуленых катэгорый. У названых тэматычных тыпах звароткаў значэнне адрасацыі адступае на задні план, асноўнай аказваецца функцыя наймення прадмета мовы — пры ўмове раскрыцця яго прымет ў найбліжэйшым кантэксце. Такім чынам, найменне прадмета мовы звязана і абумоўлена яго наступнай характарызацыяй: *Ой,* ***восень, восень****, Каханняў восем. А стрэць жаданай, наканаванай не давялося. Ой,* ***восень, восень*** (М. Янчанка)*;* ***О чэргі, чэргі****... як світальна Жыццё высвечваецца ў іх* (Ю. Свірка)*; Покуль,* ***зорка****, ўранці твой Бледны блеск яшчэ зіяе* (М. Багдановіч).

Калі ж кантэкст, у які ўключаны зварот, у далейшым утрымлівае не характарызацыю, а просьбу, пабуджэнне, загад або пытанне — адметныя прыкметы дыялагічнага маўлення, то ў зварот пачынае пераважаць семантычнае адценне адрасацыі: *Не сумуйце,* ***асеннія ліпы****, Калі*

радасць мая не відна... (У. Клішэвіч); *Прысядзем,* ***ночка****, на траве, Прытулімся бліжэй к каліне* (У. Хадыка); *Ты,* ***радзімае поле****, скажы, Каласістым павевам вясны, Хай не хіліцца аж да мяжы Жытні колас ля стромкай сасны* (А. Іверс).

Фразавая намінацыя [Мигрина, 1986, *38, 45*] сумяшчае ў сабе ў аднолькавай ступені тры функцыі: намінацыі, характарызацыі і адрасацыі. Намінацыя тут вызначаецца тыпам канструкцыі, характарызацыя — яе лексіка-семантычным напаўненнем і адрасацыя — яе сінтаксічнай пазіцыяй:

Край легенд,
Крыжоў, магіл-курганаў
Край тугі —
Бальзам жывых крыніц...
Край смугі, бялявых кос-туманаў,
Край палёў,
Краса шумлівых ніў...
Край балот,
Нізін, азёраў наскіх,
Край лясоў,
Маўклівых сосен-струн...
Край паэм,
Адвечных песень-казак —
Дарагая сэрцу
Беларусь...
(П. Трус)

О вясна! Таполі! Свеце мілы!
Сонца німб! Аблокі! Сад! Рака!
Залатая падаплёка крылаў
Маладога звонкага шпака!
(У. Караткевіч)

Мае шырокія палі,
Мой ціхі далягляд,
Загоны ворнае зямлі
І сонца вадаспад.
(М. Хведаровіч)

Відавочна, што зваротак у паэтычнай мове яскрава дэманструе адну з характэрных паэтычнай мове форм асіметрыі, якая заключаецца ў магчымых зрухах паміж сінтаксічнай пазіцыяй і функцыяй.

У зваротках часта бывае аслабленай функцыя адрасацыі, і пазіцыя зваротка адкрываецца для выражэння адносін намінацыі і прэдыкацыі (характарызацыі). Аслабленне супрацьпастаўлення функцый адрасата і прэдыката садзейнічае ўключэнню ў сінтаксічную пазіцыю зваротка прымет, характарызуючых адрасат. Аслабленню ж супрацьпастаўлення функцый адрасата і прадмета мовы садзейнічае найбліжэйшы кантэкст, які утрымлівае характарызацыю. Гэты кантэкст актуалізуе ў зваротку значэнне наймення прадмета мовы. І наадварот, кантэкст, у якім актыўна ўведзена пазіцыя гаворачага (пабуджэнне, загад, пытанне), матывуе перавагу ў зваротку значэння адрасацыі.

З'яўленне ў пазіцыі зваротка фразавай намінацыі вядзе, як правіла,

да зняцця супрацьпастаўлення, трох функцый — адрасацыі, намінацыі і прэдыкацыі (характарызацыі).

ЛІТАРАТУРА

Артеменко Е.Б. Синтаксический строй русской народной лирической песни в аспекте ее художественной организации. Воронеж, 1977.

Бурак Л.І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987.

Мигрина Н.И. Типы номинаций для обозначения статусов лица в современном русском языке. Кишинев, 1986.

Пешковский А.М. Русский синтаксис в научном освещении. М., 1956.

Проничев В.П. Синтаксис обращения. Л., 1971.

Тарасов Л.Ф. Поэтическая речь. Харьков, 1976.

І.І. Савіцкая

МЕСЦА ЛЕКСІКАГРАФІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ М. ГАРЭЦКАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКАГРАФІІ

1920-я гг. — перыяд актыўнай работы ў галіне лексікалогіі і лексікаграфіі, якая абапіралася на здабыткі беларускай лексікаграфіі дарэвалюцыйнага часу. Па меры таго, як беларуская мова набывала ўсё шырэйшыя грамадскія функцыі, усё болей пранікала ў друк, школьнае навучанне і г. д., узнікала пільная патрэба ў складанні нарматыўных слоўнікаў беларускай мовы, якія не толькі зафіксавалі б назапашаную ёю лексіку, але і папоўнілі б яе новымі словамі для абазначэння паняццяў з розных сфер вытворчасці, грамадска-палітычнага жыцця, прывялі б у парадак нормы словаўжывання.

Нармалізатарская роля нацыянальнай лексікаграфіі. Значэнне слоўнікаў у тым, што яны дэманструюць змены ў семантычнай структуры слова на працягу пэўнага часу, выдзяленне або адасабленне некаторых яго адценняў, перастаноўку яго цэнтральных і перыферыйных значэнняў, вылучэнне лексем абмежаванага ўжытку як спосабу папаўнення слоўнікавага складу мовы. У задачы лексікаграфіі ўваходзіць не толькі "даследаванне семантычнага зместу слоў у сувязі з распрацоўкай слоўнікавых артыкулаў, але таксама і ўдзел у моўным мысленні як грамадскім працэсе, які складаецца з пошукаў максімальнай яснасці і прастаты як у раздзяленні значэнняў слоў на рубрыкі, так і ў спосабах інтэрпрэтацыі гэтых значэнняў у вызначэннях" [Дорошевский, 1973, *113*].

Напрыклад, у перыяд бурнага развіцця і нармалізацыі беларускай мовы слоўнік адлюстроўваў працэс пранікнення ў тагачасны лексічны састаў абласных слоў, *дыялектызмаў* (ці, як іх называлі ў 20-я гады, правінцыялізмаў). За кошт дыялектызмаў адбываецца абагачэнне тых

моў, якія не маюць працяглай пісьмовай традыцыі і нормы якіх яшчэ не канчаткова стабілізаваліся. Аналіз дыялектнай лексікі ў слоўніках 20-х гадоў дае магчымасць меркаваць аб пранікальнасці стыляў літаратурнай мовы, аб шляхах пранікнення лакальнай лексікі ў помнікі, аб узбагачэнні слоўнікавага складу літаратурнай мовы за кошт народных гаворак. Урэшце ўвесь гэты матэрыял павінен паказаць спецыфіку адносін літаратурнай мовы эпохі з абласнымі варыянтамі размоўнага маўлення.

Увядзенне ў слоўнікі *аказіянальных* слоў таксама адлюстроўвае магчымасці нацыянальнага словаўтварэння і словаўжывання ў плане нармалізацыі літаратурнай мовы. Пры гэтым колькасць аказіянальнай лексікі непасрэдна вызначаецца ўзроўнем развіцця моўнай нормы: "Чым вышэйшы ўзровень развіцця нормы, тым больш выразна і пэўна абмяжоўваецца кола аказіянальнай лексікі, і наадварот, чым норма менш стабільная, тым кола слоў, што адносяцца да аказіянальнай лексікі, шырэйшае" [Князькова, 1977, *72*]. Па ўзроўню адлюстравання аказіяналізмаў можна меркаваць аб іх лёсе, які залежыць ад сукупнасці чыста моўных і экстралінгвістычных фактараў: "Словы сацыяльна значныя, якія не адмаўляюцца сістэмай мовы, як правіла, уваходзяць у яго лексічны склад. Словы, у якіх моўцы, а адпаведна і мова, не адчуваюць пастаяннай патрэбы, створаныя для разавага ўжывання, застаюцца па-за яго межамі, папаўняючы разрад так званай неузуальнай лексікі" [Мальцева, 1977, *40*].

Слоўнікі адлюстроўваюць таксама і яшчэ адну складаную лексікаграфічную праблему — суадносіны спрадвечных і *запазычаных* слоў, адлюстраванне іх у слоўніках без аднабакова-пурыстычнага асвятлення гэтага пытання. Як адзначыў Р. Будагаў, "пры несумненным значэнні роднай глебы для кожнай мовы разам з тым нельга змяншаць значэнні кантактаў паміж мовамі, у сваю чаргу абумоўленых кантактамі паміж народамі і іх культурамі. Ад лексікографа і тут патрабуюцца вялікія веды і вялікі такт у асвятленні і тлумачэнні самой праблемы запазычаных слоў і словазлучэнняў" [Будагов, 1989, *86*].

Нарэшце, слоўнікі адыгрываюць значную ролю ва *уніфікацыі* пісьмовай формы мовы, таму што "наяўнасць у развітай, маючай працяглую традыцыю літаратурнай мове вялікай колькасці тэарэтычных апісанняў, практычных граматык, слоўнікаў прывучае пішучых звяртацца да гэтых дапаможнікаў, адлюстроўваючы ў сваім пісьме змешчаныя ў іх рэкамендацыі..." [Ицкович, 1982, *13*].

Утрымліваючы ў сабе вышэйназваныя моўныя праблемы, слоўнікі прама звязаны з выпрацоўкай літаратурнай нормы мовы ў кожную эпоху — нормы, маючай агульнанацыянальнае значэнне, — і таму маюць

вялікае значэнне ў працэсе стварэння навукі і літаратуры на роднай, а пазней на нацыянальнай мове. Такім чынам, значэнне слоўнікаў у адлюстраванні ведаў, якімі валодае пэўнае грамадства ў пэўную эпоху, і ў спрыянні ўдасканаленню і уніфікацыі мовы як сродка зносін шляхам фіксацыі значэнняў і ўжыванняў слоў.

Месца і роля двухмоўных слоўнікаў у лексікаграфічным працэсе 20-х гадоў. Асобна трэба спыніцца на ўласцівасцях двухмоўных (перакладных) слоўнікаў. Вызначальная іх асаблівасць заключаецца ў тым, што двухмоўны слоўнік — "перш за ўсё даведачны дапаможнік, але пры гэтым і асноўная крыніца звестак аб замежнай мове для чытача" (Берков, 1973, *11*). Гэтая *інфармацыйная* каштоўнасць перакладных слоўнікаў тычыцца і беларуска-рускіх і руска-беларускіх даведнікаў, бо, нягледзячы на, здавалася б, прастату супастаўлення ў перакладных слоўніках слоў дзвюх роднасных моў, сэнсавае падабенства лексем у іх адлюстроўвае "адрозненні ў сэнсавым аб'ёме слова, якія вызначаюцца адрозненнем сукупнасці маўленчых кантэкстаў, з якімі звязана кожнае з гэтых слоў" [Сорокин, 1977, *18*].

Варта адзначыць і высокую *нармалізацыйную* каштоўнасць двухмоўных слоўнікаў 20-х гадоў: перакладныя слоўнікі, выдадзеныя ў гэты час ("Руска-беларускі слоўнік" Г. і М. Гарэцкіх (1918), "Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік" М. Гарэцкага (1919), "Практычны расійска-беларускі слоўнік" М. Байкова і М. Гарэцкага (1924), "Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік" З. Верас (1924), "Беларуска-расійскі слоўнік" (1925) і "Расійска-беларускі слоўнік" (1928) М. Байкова і С. Некрашэвіча) "арыентавалі лексікаграфічную распрацоўку беларускай мовы на ўзровень, якога ўжо дасягнулі іншыя, больш развітыя на той час літаратурныя мовы, у прыватнасці суседнія — руская, польская" [Шакун, 1995, *182*], а г. зн. спрыялі інтэнсіфікацыі нармалізацыйных працэсаў у беларускай мове. Адлюстраванне працэсу "станаўлення нацыянальнай мовы шляхам перакладу багацціяў чужой мовы" [Щерба, 1974, *297*] у двухмоўным слоўніку з'яўляецца, такім чынам, заканамернай з'явай у перыяд моўнай нармалізацыі.

Невялікі аб'ём перакладных слоўнікаў 20-х гг. і іх недасканаласць у лексікаграфічных адносінах (у параўнанні з сучасным узроўнем лексікаграфіі) не зніжаюць іх вартасці, паколькі з іх дапамогай у моўную практыку ўводзіліся новыя лексічныя і словаўтваральныя сродкі, праз іх пасрэдніцтва вырашаліся дыскусійныя праблемы аб мэтазгоднасці ўжывання тых ці іншых тэрмінаў і запазычаных слоў. Маштабы лексікаграфічнай працы на Беларусі ў 20-я гг. далі М. Байкову падставы адзначыць, што "...сабранага да гэтага часу лексыка-графічнага мата-

р'ялу — матар'ялу ў... слоўніках Насовіча, Ціхінскага, Дабравольскага, М. і Г. Гарэцкіх, рукапісах, а таксама ў зборніках Федароўскага, Шэйна і Раманава, у трудох Навукова-Тэрміналёгічнай Камісіі, будзе досыць для апрацоўкі расійска-беларускага слоўніка, каб здаволіць практычныя патрэбы" [Байкоў, 1922, *254*].

Лексікаграфічная спадчына М. Гарэцкага ў рэчышчы нармалізацыі беларускай мовы. М. Гарэцкі з'явіўся складальнікам "Руска-беларускага слоўніка" (Смаленск, 1918; 2-е выд. "Маскоўска-беларускі слоўнік", Вільня, 1921, разам з Г. Гарэцкім), "Невялічкага беларуска-маскоўскага слоўніка" (Вільня, 1919), "Практычнага расійска-беларускага слоўніка" (Мінск, 1924; 2-е выд. Мінск, 1926, разам з М. Байковым). У кожным новым слоўніку, акрамя павелічэння рэестравай часткі ("Руска-беларускі слоўнік" — 3000 рускіх слоў, "Маскоўска-беларускі слоўнік" — 4000 слоў; "Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік" — 7000 слоў; "Практычны расійска-беларускі слоўнік" — больш за 20000 слоў), назіраўся якасны рост патрабаванняў да падбору рэестравай часткі, што тлумачылася, відавочна, больш прадуманай арганізацыяй лексікаграфічнай работы з боку М. Гарэцкага і яго сааўтараў, паступовае назапашванне вопыту ў стварэнні слоўнікаў. Кожны новы слоўнік — не толькі пэўны этап навуковага шляху пісьменніка, але і канкрэтны мовазнаўчы даведнік, пабудова і прынцып падбору матэрыялу якога маюць свае асаблівасці.

Для вызначэння месца даведнікаў М. Гарэцкага ў беларускай лінгвістыцы варта суаднесці слоўнікавую працу 20-х гадоў з асноўнымі функцыямі лексікаграфічных прац.

Не паглыбляючыся ў галоўныя палажэнні лексікаграфічнай навукі, адзначым, што яе асноўнымі грамадскімі функцыямі лічацца: 1) **інфармацыйная** функцыя, рэалізоўваючы якую лінгвістычныя і энцыклапедычныя слоўнікі праз тлумачэнні слоў і навуковыя дэфініцыі паняццяў дапамагаюць сваім чытачам далучыцца да назапашаных чалавецтвам і беларускай нацыяй разнастайных ведаў; 2) **камунікацыйная** функцыя, ажыццяўляючы якую, перакладныя слоўнікі шляхам устанаўлення эквівалентнасці слоў беларускай і іншых моў садзейнічаюць пашырэнню моўных кантактаў паміж нашым і іншымі народамі свету; 3) **нарматыўная** функцыя, выконваючы якую сучасныя лексікаграфічныя працы кадыфікацыйнага характару пры дапамозе стылістычных памет стабілізуюць лексічныя і іншыя нормы і гэтым самым спрыяюць удасканаленню літаратурнай мовы [Гак, 1977, *14*; Шчэрбін, 1996, *26*]; 4) навуковае вывучэнне лексікі мовы (этымалагічныя, гістарычныя слоўнікі [Гак, 1977, *14*; ЛЭС, *258*].

Адзначаныя функцыі выконваюць розныя тыпы слоўнікаў: функцыю навучання мове і апісання яе "бяруць на сябе" тлумачальныя слоўнікі; функцыю міжмоўных зносін — перакладныя двухмоўныя; функцыю навуковага вывучэння лексічнага складу мовы — этымалагічныя, гістарычныя і іншыя слоўнікі. Наяўнасць разгалінаванай і рознаўзроўневай лексікаграфіі — уласцівасць развітай нацыянальнай літаратурнай мовы, сістэмнасць якой добра ўсведамляецца яе носьбітамі.

Разуменне беларускімі лексікографамі 20-х пастаўленых перад імі нармалізатарскіх задач з'явілася прычынай шматаспектнасці, **поліфункцыянальнасці** тагачасных слоўнікаў. Гэта ў поўнай меры тычыцца і лексікаграфічных дапаможнікаў М. Гарэцкага.

Так, у "Невялічкім беларуска-маскоўскім слоўніку" ў якасці рэестравых слоў падаюцца **ўласныя назвы** ў беларускай фанетычнай афарбоўцы: ***Амсціслаў*** *— город Мстиславль;* ***Ангельшчына*** *— Англия;* ***Дзвіна*** *— Двина (река);* ***Кацапаўшчына*** *— Великороссия, Московия;* ***Нёман*** *— Неман;* ***Непра*** *— Днепр;* ***Нямеччына*** *— Германия;* ***Няпро*** *— Днепр;* ***Польшча*** *— Польша;* ***Турэччына*** *— Турция;* **імёны асоб і міфалагічных істот**: ***Гануля*** *— Аннушка;* ***Жукоўшчык, -шчанка*** *— сын, дочь Жуковского;* ***Карпа*** *— Карп;* ***Карпека*** *— Карп;* ***Паўлюк*** *— уменьшит. от Павел; Павел;* ***Юзюк*** *— Иосиф,* ***Восіп****;* ***Юрка*** *— Георгий, Юрий; нац. бел танец;* ***Юстын*** *— Устин;* ***Якуб*** *— Яков;* ***Янка*** *— Иван;* ***Копша*** *— гробокопатель, миф. существо;* ***Купала*** *— миф. существо, бог любви;* ***Лізун*** *— миф. существо, летом прячется в бобах, в конопле, в горохе; прегрешивших детей (например, скушавших незрелый плод), а также одиноко бродящих умыкает и лижет, зализывает до смерти;* ***Люцыпар*** *— Люцифер, диавол;* ***Лясун*** *— миф. существо, житель и бог лесов;* ***Смок,*** *или* ***Цмок*** *— сказочный змий, страшное миф. существо;* ***Стаўры-Гаўры*** *— название миф. существ, собаки миф. князя Боя;* **назвы хрысціянскіх святаў і абрадаў**: ***Васільле*** *— 1 января по ст. стилю, новый год и день св. Василия;* ***Вялікадзень*** *— первый день Пасхи;* ***Грамніцы*** *— праздник Сретения;* ***Здзьвіжанне*** *— Воздвижение Креста Господня;* ***Каляды*** *— Рождественские праздники;* ***Купалле*** *— ночь на 24 июня ст. стыля, Иванов день, белорусский праздник в честь весны;* ***Ма каўе*** *— день 1 августа (ст. стиля), праздник братьев Маккавеев, в который совершается освящение овощей;* ***Праводніца*** *— Фомино воскресенье;* ***Раданіца*** *— поминовение усопших и празднество во вторник на Фоминой неделе;* ***Ражство*** *— Рождество І.Х., 25 декабря ст. стиля;* ***Сакрамэнт*** *— св. Тайны, причастие;* ***Стрэчанне*** *— Сретение Господ-*

не, 2 февраля ст.стиля; ***Юр'е*** *— праздник в честь св. Георгия (23 апреля ст. стиля.), имеющий у белорусов нац. черты;* **назвы нацыянальных гістарычных з'яў**: ***сойм*** *— сейм, собрание народных представителей;* ***сойм устаноўчы*** *— учредительное собрание;* ***староста павятовы*** *— начальник уезда;* ***суд земскі*** *— гражданский суд;* нацыянальных гістарычных асоб: ***гэтман польны*** *— главнокомандующий;* ***падкаморы земскі*** *— управляющий межевой частью (министр Белор.-Литов. княжества);* ***падскарбі земскі*** *— министр финансов (в Бел.-Лит. княжестве).*

Прыведзеныя назвы культурных і гістарычных паняццяў у поўнай меры падаюць **інфармацыю** аб нацыянальных рэаліях і **навучаюць** лексіцы, што абазначае гэтыя рэаліі. Лексікаграфічныя даведнікі М. Гарэцкага, агітуючы "браць у сваю мову словы, якіх няма ў сялянскай мове" (ПРБС-2, *3*), арыентуючыся на больш развітую рускую мову, выконвалі **камунікатыўную** функцыю.

Пры перакладзе даволі значнай колькасці слоў М. Гарэцкі лічыў неабходным даваць тлумачэнне іх **семантыкі або этымалогіі**: ***авай, авой*** *— ох (говорится от удивления или негодования);* ***агу*** *— междометие, выражающее укоризну или отсутствие всякой надежды;* ***адсохнуць, или адцохнуць*** *— говорится о части организма, что значит: лишиться жизненности, отмереть;* ***ат!*** *— ну, тьфу, э! Междометие, выражающее опровержение, противоречие, негодование, недовольство;* ***аці*** *— слово детское или шутливое, значит здравствуй, спасибо;* ***брацці*** *— от слова браць, взятие, но без указания, совершилось действие или нет;* ***варых*** *— междометие, выражающее быстрое раскачивание;* ***высалупіць*** *— высунуть (язык); отсюда —* высалупіцца, *что значит вылезть на глаза, показать себя;* ***вытрусіцца*** *— говорится о мелкой вещи: случайно выпасть, вытряхнуться с чем-нибудь из кармана;* ***губляць*** *— иногда говорится вместо* губіць; *отсюда производное* ***гублянне****, т. е. теряние, порча;* ***гуз*** *— узел, связь; шишка (на лбу); желвак; нарост; зад (*отсюда ***чарнагуз, вертагуз, агуззе****);* ***гэргатаць*** *— быстро говорить (как евреи);* ***дзын*** *— звукоподражание;* ***зальжэць*** *— полегчать (от слова "льзя", т. е. можно);* ***каня,*** *или* ***канюх*** *— звукоподражательное название птицы из породы коршунов; ее появление и крик предсказывают дождь;* ***навалак*** *— этаж (слово редкое и старое);* ***садухі*** *— капут, конец, смерть, гибель (от* ***со духи праведных****);* ***скубель!*** *— слово для обозначения быстрого, моментального дергания;* ***шату-бату*** *— междометие, означающее поспешность (приблизительно то же, что "бухты-барахты").*

Такім чынам, у слоўніку змяшчаліся элементы **навуковага**

а н а л і з у прапануемых лексем. Функцыя **н а р м а л і з а ц ы і** роднай мовы знайшла адлюстраванне ў падачы **стылістычнай маркіроўкі** прапанаваных лексем: ***быдля*** *— скотина (ругательн. слово);* ***гаршкалёп*** *— гончар, горшечник (иронически);* ***гарыда*** *— скаред; дрянь (ругат. слово);* ***грыбы*** *— губы (несерьезно);* ***наўда*** *— говорится с насмешкой в смысле: "велика важность", "не важная особа".*

Так, вынікам праведзенага аналізу з'яўляюцца наступныя вывады: 1) лексікаграфічная дзейнасць М. Гарэцкага адпавядала агульным прынцыпам практычнай лексікаграфіі і адлюстравала асноўныя напрамкі тагачаснага беларускага мовазнаўства; 2) слоўнікі М. Гарэцкага змяшчалі як сацыяльна актуалізаваны рэестравы матэрыял, так і элементы яго лінгвістычнага аналізу, а значыць выконвалі функцыі, абумоўленыя пастаўленымі перад імі задачамі.

ЛІТАРАТУРА

Байкоў М. Слоўнікавая праца ў беларускай мове // Літаратурна-навуковы весьнік інстытуту беларускае культуры. Сшытак 1. Мн., 1922. С. 254.

Берков В.П. Вопросы двуязычной лексикографии. Л., 1973. 192 с.

Будагов Р.А. Толковые словари в национальной культуре народов. М., 1989.151 с.

Гак В.Г. О некоторых закономерностях развития лексикографии (учебная и общая лексикография в историческом аспекте) // Актуальные проблемы учебной лексикографии. Сост. В.А. Редькин. М., 1977. 320 с.

Дорошевский В. Элементы лексикологии и семиотики. М., 1973. 288 с.

Ицкович В.А. Очерки синтаксической нормы. М., 1982. 199 с.

Князькова Г.П. Просторечие в словаре языка XVIII в. (отбор слов) // Проблемы исторической лексикографии. Л., 1977. 176 с.

ЛЭС — Лингвистический энциклопедический словарь / Гл. ред. В.Н. Ярцева. М., 1990. 685 с.

Мальцева И.М. Лексическая окказиональность в языке XVII в. // Проблемы исторической лексикографии. Л., 1977. 176 с.

ПРБС-2 — Байкоў М., Гарэцкі М. Практычны расійска-беларускі слоўнік. Мн., 1926.

Сорокин Ю.С. Что такое исторический словарь? // Проблемы исторической лексикографии. Л., 1977. 176 с.

Шакун Л.М. Гісторыя беларускага мовазнаўства: Вучэб. дапам. Мн., 1995. 271 с.

Шчэрбін В.К. Тэарэтычныя праблемы беларускай лексікаграфіі. Мн., 1996. 141 с.

Щерба Л.В. Опыт общей теории лексикографии // Языковая система и речевая деятельность. Л., 1974. С. 265—304.

А.Л. Садоўская

ЧАЛАВЕК У ЛЮСТЭРКУ ФРАЗЕАЛОГІІ З КАМПАНЕНТАМ-АРНІТОНІМАМ

Адной з важнейшых асаблівасцей успрымання свету моўнай асобай з'яўляецца яго метафарычная і сімвалічная інтэрпрэтацыя, і яскравым прыкладам таму — вербальная яе прэзентацыя ва ўстойлівых адзін-

ках, значную частку якіх складае фразеалогія з кампанентам-арнітонімам. Факт праецыравання свету людзей на свет жывёл, птушак і наадварот з'яўляецца традыцыйным і універсальным, мае старажытныя і трывалыя карані. Арнітаморфная сімволіка беларускай фразеалогіі цесна ўзаемазвязана і карэлюе з іншымі сферамі традыцыйнай духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў. Пацверджаннем гэтаму з'яўляецца паўтаральнасць і частотнасць птушыных вобразаў-сімвалаў у абрадавай і міфапаэтычнай традыцыях, гульнёва-карагодных комплексах, у шматлікіх скульптурна-рэчыўных формах, адзенні, арнаменце і г. д. Усё гэта сведчыць пра надзвычай развітую арнітаморфную сімволіку, яе поліфункцыянальнасць і пра актуальнасць даследаванняў у гэтай галіне.

Дадзеныя Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы дазваляюць сцвярджаць, што "антрапацэнтрычнае" ўспрыманне свету птушак пашырае семантычны патэнцыял ужо саміх лексем-арнітонімаў. Акрамя свайго дэнататыўнага значэння, многія з іх маюць таксама і значэнні пераносныя: **певень** — 'задзірысты чалавек, забіяка'; **варона** — 'нерастаропны, нехлямяжы чалавек' і дэрыват "вароніць" як 'быць нерастаропным, зяваць'; **сава** — 'чалавек, які позна кладзецца спаць'; **салавей** — 'чалавек, які славіцца чыстым, прыгожым, пераважна высокім голасам, вакальным майстэрствам' і інш.

У беларускай мове існуе значная колькасць устойлівых моўных выразаў, у якіх праз характэрныя і універсальныя рысы птушак наглядна і вобразна перадаецца знешняе аблічча і фізічныя ўласцівасці чалавека. Пераважна гэта кампаратыўныя канструкцыі: *чорны як грак (грач, галка, крук); белабокі як сарока; сівы як голуб; шэрая як зязюлька* (адсюль дэрываты *"зязюлець"* — рабіцца шэрым, *"зязюлісты"* — светла-шэры, падобны па апярэнню да зязюлі (дыял.); *сіні як пуп гусіны, рабенькі як дзяцел (дзятлік, цяцера); цыбаты як бусел (журавель); нос як у качкі (як у дзятла, у бусла дзюба); даўганосы, бы той бусел; галава як сарочча гняздо; шыя як у лебедзя (доўгая як у бусла); вочы як у савы; глядзіць як сыч; мець вочы як у сокала, сакаліныя вочы* — г. зн. праніклівы, хуткі позірк, дасканалы зрок; *бачыць як сокал (як арол, як птушка); чырвоныя (рукі) як гусіныя лапы; ногі як у буцяна; ходзіць як пава (як індык, як бусел ля вады (па балоце, кавалерам як гусь); худая як чапля; худы як вясновы грак; глухі як цецярук (цяцера); жвавы як верабейка; спрытны як качка на вадзе; лёгкі як птушка; глядзець як варона (як гусь на бліскавіцу, як індык на чырвонае); хадзіць (ляцець) арлом; сілы як у вераб'я (як у сіндзіка); сядзіць як грак (як кураня, як куроватка, як квактуха, як гусыня, як той верабей у клетцы (стрэсі), як сарока на калу, як курыца на яйках)* і інш.

Акрамя таго, у размоўнай практыцы беларусаў для апісання знешніх і фізічных праяў чалавека шырока бытуюць і іншыя фраземы і парэміі, напрыклад: *мокрая курыца* — ‘чалавек, які мае ўбогі, прыгнечаны выгляд; вялы ў рабоце, непаваротлівы ў рухах чалавек, на якога няма як разлічваць’; *мокрая варона* — ‘збянтэжаны, разгублены чалавек’; *сляпая курыца* — ‘блізарукі чалавек; чалавек, які бязглузда мітусіцца, адшукваючы рэч, што ляжыць у яго пад самым носам’; *белая варона* — ‘чалавек, рэзка не падобны на іншых сваім знешнім выглядам ці паводзінамі, не такі як усе’; *салаўі ў жываце спяваюць* — ‘хочацца есці’; *Ці скора ты нажарэшся, жаўна?* і інш.

Супрацьпастаўленне знешняга хараства чалавека і яго ўнутранай нікчэмнасці перадаецца праз **вобраз павы**: *Апрануты (адзеўся) як пава, але брыдкая слава*, а вось пра чалавека знешне простага, але вялікага сваімі жыццёвымі дасягненнямі і справамі характарызуюць пры дапамозе **вобраза салаўя**: *Хоць салавей маленькі, але яго песні ўдаленькі.*

У “тэрмінах птушынага свету” спасцігаюцца ў беларускай фразеалогіі і асаблівасці характару чалавека, яго маральныя і разумовыя якасці.

Так, напрыклад, **певень** у беларускай моўнай свядомасці рэпрэзентуе такія праявы характару, як ваяўнічасць і задзірыстасць *(задзірлівы (задзірысты) як певень; б’юцца як пеўні)*, наравістасць, мужчынскую фанабэрлівасць і ганарыстасць *(як певень наравісты; І певень умее свой гонар паказаць, не толькі зяцёк)*, пільнасць *(Сплю, як той певень на курасадні: адно вока заплюшчана, а другім гляджу)*, бессаромнасць *(сораму як у пеўня мяса на шпорах)*. Пра спешчанае дзіця кажуць: *Меў чорт урадзіцца, да пятух запеў* (па даўніх павер’ях, апоўначы, калі праспявае певень, знікае нячыстая сіла).

Эталонам прастакаватасці, нездагадлівасці, “недалёкага” розуму і легкадумнасці сталі **вобразы вароны** (да таго ж рэпрэзентуе няўважлівасць і нерастаропнасць: *вароняка зловіты* — г. зн. не ўбачыць па няўважлівасці; *лічыць варон; страляць варон; варонаю не будзь* — г. зн. будзь пільным, разважлівым; *Варонаю не будзь, то і сарока не падвядзе* — г. зн. пільнасць, разважлівасць, здольнасць прадбачыць падзеі (надзейны сродак засцерагчыся ад ашуканства); **курыцы і цецерука (цяцеры)**: *дурная варона* (лаянк.), *варона загуменная* (лаянк., асудж.); *дурны (глуп) як варона; глядзіць як варона; Мужык дурны, як варона, а хітры, як чорт; Глядзіць, як варона, а хітры, як чорт; курыная (вароніна) галава* (неадабр.) — нездагадлівы, прастакаваты чалавек; *курыны розум* — г. зн. легкадумны; *Ведаць курыную сісю і тую не ўсю* (груб.) — г. зн. зусім нічога не ведаць; *дурны як цецярук (цяцера).*

Можна таксама ахарактарызаваць неразумнага і легкадумнага чалавека, скарыстаўшы фразему *У яго (у цябе, у іх) вераб'і ў шапцы*.

Для актуалізацыі такіх негатыўных характарыстык чалавека, як прагнасць, сквапнасць, хцівасць і двудушнасць у парэміях выкарыстоўваюцца, як правіла, вобразы драпежных, "нячыстых" птушак: *збірае, як груган косці; Вароны крукаюць, падла чуюць; Цалаваў каршун курачку да апошняга пёрушка*. Пра таго, хто ў сваёй дзейнасці глядзіць далёка наперад, шукаючы для сябе карысці, метафарычна гаворыць прыказка *Бацян глядзіць на ваду, а ўглядаецца пад ваду*, якая вынікае з характару і спосабу харчавання бусла. Акрамя таго, пра чалавека, які дбае толькі пра сябе і мала спагадае іншым, можна сказаць *Што дразду па чужому гняздзе* (дрозд — птушка, якая вельмі грунтоўна і дасканала будуе сваё гняздо). А вось калі хто-небудзь задавальняецца малымі патрэбамі і паступова назапашвае штосьці, кажуць: *Курачка па зярнятку клюе* або *Курыца па зярнятку збірае і сытая бывае*. Чалавека бяскрыўднага характарызуе фразема *(і) курыцы не пакрыўдзіць*.

Для метафарычнага найменння чалавека вопытнага, спрактыкаванага, якога цяжка падмануць або абхітрыць служаць фраземы *стрэляная птушка, стрэляны верабей, стары верабей*, а чалавека маладога, нявопытнага і наіўнага — *жаўтаротае птушаня*. Пра таго, хто сустрэўся з сапраўднымі жыццёвымі цяжкасцямі, зведаў нягоды ў жыцці, можна сказаць *саву смаленую пабачыў* або *смажаны певень клюнуў (дзюбнуў) (у зад, у азадак)*. А залішне асцярожны чалавек, які праз перажытыя выпрабаванні баіцца нават таго, што не пагражае яму небяспекай, іранічна назавецца *пужанай варонай* (параўн.: *Мужык як варона, ды ўсё ж жонцы абарона*).

З антанімічным значэннем ужываюцца ў беларускай мове фразеалагізмы *важная птушка* або *птушка высокага палёту* (чалавек з высокім становішчам, званнем, пасадай) і *птушка невысокага палёту* (нязначны, неўплывовы, малаважны чалавек). З неадабральнай канатацыяй апошняя фразема называе чалавека нікчэмнага. Для таго каб вызначыць, да якой жа з названых груп аднесці тую ці іншую асобу, дапаможа прымаўка *Відаць птушку па палёце* або *Па пер'і птушку пазнаюць*. Аднак заўсёды знойдуцца сярод людзей і такія, што марна імкнуцца паказаць сябе лепшымі, больш значнымі, чым ёсць на самой справе. Для характарыстыкі такіх людзей часта ўжываецца фразема *варона ў паўлінавых пёрах*. Агульную сему 'жыць, не маючы трывалага забеспячэння, грамадскага ці службовага становішча' маюць фраземы *(жыць) на птушыных правах* і *(жыць) як верабей у веніку*.

Цэлы комплекс беларускіх фразем і парэмій з кампанентам-артоні-

мам прысвечаны асэнсаванню маўленчай дзейнасці чалавека. Эталонам развітай маўленчай здольнасці, умення красамоўна гаварыць у беларусаў, як вядома, з'яўляецца **салавей**: *пець (заліваца) салаўём* (г. зн. гаварыць красамоўна, горача, з захапленнем); *засвістаў як салавей; свішчы не свішчы, а салаўём не будзеш.* Відавочным вынікам табуіравання з'яўляецца парэмія *Галасок як у таго салаўя, што за гарою (на зарэ) кабылу душыць (коней круціць)* — г. зн. голас, як воўчы вой. Іранічна салаўём называюць гаваруна, балабона, які прыгожа гаворыць, шмат абяцае, а мала робіць: *Салавей пяе, ды хлеба не дае.*

Заганы чалавека, звязаныя з яго маўленчай дзейнасцю, прадстаўлены ва ўстойлівых моўных адзінках праз вобразы **сарокі, курыцы, жаўны, цецерука і вароны**: *стракоча як сарока; шчабеча як сарока (на плоце); жанкі як сарокі; як курыца сакоча; квохча як курыца* (пра тых, хто заўсёды жаліцца ды бурчыць); *Скажаш курыцы, а яна ўсёй вуліцы; Курыца не птушка, гультай не чалавек, балбатун не гаспадар; язык доўгі як у жаўны* (балбатун, пустаслоў); *жаўна языкатая* (абзыв., ганьбаванне; пра колкую жанчыну з "куслівым" языком); *затакаваўся (затакаўся) як цецярук* (пра таго, хто многа гаворыць, не зважаючы на іншых); *балбоча як цецярук; крычыць як варона на калку; гракае як варона; гарланіць як варона; як варона на дождж* (г. зн. крычыць ва ўсё горла); *раздзявіў горла як варона.* Пра нясладнасці ў мове чалавека гаворыць прыказка *Сарока ляцела, а сабака (сучка) на хвасце сядзела.*

Дастаткова паслядоўна праводзіцца і падзел птушак на мужчынскія і жаночыя персанажы. Ярка выражаная, міфалагічна значымая жаночая сімволіка збліжае зязюлю, саву, курыцу, ластаўку і галубку. Аднак кожная з названых птушак валодае ў фразеалагічнай традыцыі сваім колам функцый. Так, лексема **зязюля** выкарыстоўваецца ў размоўнай практыцы беларусаў для метафарычнага наймення бестурботнай маці, якая пакідае, не гадуе сваіх дзяцей, а ў фразеалогіі **зязюля і сава** — сімвалы адзіноты, нешчаслівай жаночай долі: *(адна) як зязюлька; жыве як зязюлька; накукуешся як удава; ніхто не чуе, як удава кукуе; жывецца як той саве; Жыццё ўдавінае — савінае; Саве ды ўдаве адна доля; удавінае дзела як савінае.* Як антытэза спрадвечным уяўленням пра "адзінокую" зязюлю гучыць фразема — назва жонкі, дарагой палавіны — *начная зязюля* і, адпаведна, прымаўка *Начная зязюлька дзённую перакукуе*, якая, верагодна, датычыцца інтымных адносін паміж мужам і жонкай. Як сімвал жаночай адзіноты спарадычна ўжываюцца ў беларускай мове і вобразы **сарокі, вераб'я**: *жыве як сарока на калу* (г. зн. адзінока); *адна як верабей.*

Традыцыйным сімвалам вернай і пяшчотнай спадарожніцы жыцця з'яўляецца **галубка**, а **галубы** — сімвалам шчаслівай сямейнай пары. Адсюль, канечне, паходзіць дэрыват **прыгалубіць** і кампаратывы *брукуюць (буркуюць) як галубкі; кахаюцца як галубкі; малодка і малады сядзяць як галубы*. Разам з лексемай **ластаўка** слова **галубка** выкарыстоўваецца ў беларускай мове ў якасці ласкавай назвы жанчыны, дзяўчыны, дзяўчынкі: *Ластавачка мая маленькая! Ласцінька, ласцінічка маё любае! Бабулька мая, галубка мая! Кума-галуба!* і інш.

У парэміях, якія абыгрываюць сітуацыю шлюбнага выбару (юнаком дзяўчыны) назіраецца сінанімізм пэўных "жаночых" птушыных вобразаў, якія маюць зніжаную характарыстыку: *Хоць сава, абы з другога сяла; Хоць за курыцу, ды на сваю вуліцу; Хоць за варонку, ды на сваю старонку; Не ўздыхай глыбока, не аддамо далёка — хоць за курапатку, ды ў сваю хатку*.

Цікавасць уяўляюць і іншыя фраземы: *вольная птаха* — 'свабодная, ні ад кога незалежная жанчына' (у адносінах да мужчыны ўжываецца варыянт *вольны птах*); *ні качка, ні швачка* — 'жанчына, не здатная ні да якой справы' і г. д.

Традыцыйным увасабленнем мужчынскага пачатку ў беларускай міфапаэтычнай і, адпаведна, моўнай традыцыях з'яўляюцца вобразы сокала, арла, пеўня, вераб'я, голуба, радзей — салаўя, гусака і інш. Так, сінанімічнае пераноснае значэнне маюць лексемы **сокал, арол**: яны з'яўляюцца арнітаметафарамі для намінацыі смелага, адважнага, мужнага і прыгожага юнака, мужчыны. **Саколікам**, акрамя таго, называюць закаханага і каханка. Лексемы **сокал, голуб**, падчас — **певень, салавей** (звычайна ў памяншальна-ласкальных формах) служаць ласкавымі назвамі мужчыны, юнака, хлопчыка: *Сакалок, сакалочак мой! А мае ж вы саколікі! Ах, маё сакалятка! Мой ты саколка! Пецька, петушочак мой! Мой ты галубок! Адзін ты ў мяне галубчык (мой галубок), каб цябе й таго не было!* (праклён); *У вочы то — "саколю", а за вочы — сллю* і інш.

З "мужчынскай" семантыкай названыя арнітонімы ўжываюцца і ў парэміях, якія ўяўляюць сабой яскравую алюзію на ўзаемаадносіны мужчыны—жанчыны, напрыклад: *За сокалам і варона хараша; За сокалам і варона сакаліца; Лепш палюбіць старога арла, чым маладую саву; Бяда ў тым доме, дзе куры пяюць, а пеўням волі не даюць; Арол (качар) курыцы не пара; Певень за тое і пяе, што жонак многа, а цешчы няма; Без гусака і гусь прапашчая; Нават гуска гусака мілуе; Баба не курыца, а дзед не пятух* і г. д.

Прадстаўлены ў беларускай нацыянальнай фразеалогіі з кампанен-

там-арнітонімам і такі універсальны пласт карціны свету, як "узаемаадносіны бацькоў—дзяцей", напрыклад: *Сава не (ў)родзіць сакала (а толькі савянятка); Свіння не родзіць бабра, а сава не выведзе арла; Дрэнная курыца — дрэннае яйка; Чубатыя куры па родзе* (г. зн. дзеці, падобныя на сваіх бацькоў); *Кураня (яйцо) курыцу не вучыць; Яйка мудрэйшае (разумнейшае) за курыцу* і г. д.

Заслугоўваюць увагі і парэміі, пабудаваныя на прынцыпе паралелізму. У такіх парэміях асаблівасці паводзін і ўзаемаадносін птушак у прыродзе суадносяцца з пэўнымі выпадкамі ці з'явамі чалавечага жыцця непасрэдна ў тэксце: *Птушка радая вясне, а дзіця маціры; Птушку пазнаюць у палёце, а чалавека — у рабоце; Дзетак узгадаваць, не курак насклікаць; Цяжка саду без зязюлі, цяжка доньцы без матулі; Кукушка — не птушка, нявестка — не дачушка; Чалавек без Радзімы, як салавей без песні (як птушка без крылаў)* і г. д.

Такім чынам, беларуская фразеалогія з кампанентам-арнітонімам валодае багатым "чалавеказнаўчым" матэрыялам. Такое багацце фразеалагічнага матэрыялу з арнітонімам, у якім усебакова разглядаюцца розныя моманты чалавечага жыцця, а таксама наяўнасць у лексем — назваў птушак пераносных "антрапацэнтрычных" значэнняў яшчэ раз сведчаць, з аднаго боку, аб прызнанні моўнай асобай значнасці птушак у агульнай інтэрпрэтацыйнай карціне свету і, з другога боку, аб суб'ектыўным успрыманні свету птушак чалавекам праз прызму ўласнага светаўяўлення, у выніку чаго бачанне птушак і становіцца метафарычным і сімвалічным.

І.М. Сафронава

АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ ВЫВУЧЭННЯ МАЎЛЕНЧЫХ ПАВОДЗІН У ГЕНДЭРНЫМ АСПЕКЦЕ

Дадзены артыкул прысвечаны размежаванню базавых паняццяў і вызначэнню перспектыў развіцця гендэрнага аспекта айчыннай лінгвістыкі, які распрацоўвае пытанні сацыякультурнай рэпрэзентацыі пола ў мове.

Пільная ўвага да тэмы "мова і пол" ва ўмовах постіндустрыяльнага грамадства было абумоўлена актыўным развіццём гендэрных даследаванняў — міждысцыплінарнай даследчай практыкі, прызначэнне якой — раскрыць адносіны паміж навукай, уладай і гендэрам як складаным сацыякультурным канструктам. Катэгорыя *гендэр* увайшла ў навуковы паняційны апарат ў канцы 60-х гадоў XX ст. і першпачаткова выкарыстоўвалася ў сацыялогіі, псіхалогіі, этнаграфіі, антрапалогіі, гісто-

рыі. Гендэр атрымаў трактоўку аднаго з асноўных вымярэнняў сацыяльнай структуры, які разам з іншымі сацыяльна-дэмаграфічнымі і культурнымі характарыстыкамі арганізуе сістэму сацыяльных адносін. Прыцягненне катэгорыі *гендэр* у сферу інтарэсаў лінгвістыкі прывяло да з'яўлення цэлага рада новых акцэнтаў у антрапацэнтрычных і прагматычных даследаваннях, якія звязалі праблему вывучэння маўленчага Я з экстралінгвістычнымі фактарамі чалавечых зносін.

Аднак гендэрная праблематыка не з'яўляецца прынцыпова новай у мовазнаўстве. У гісторыі вывучэння ўзаемасувязі мовы і пола яго носьбітаў А.В. Кірыліна выдзяляе тры перыяды: 1) біялагічны дэтэрмінізм — нерэгулярныя даследаванні, заснаваныя на назіраннях разрозненых фактаў і не звязаныя са сумежнымі навукамі; 2) пераходны перыяд з пачатку да сярэдзіны XX ст.; 3) шырокамаштабныя гендэрныя даследаванні з 60-х гадоў XX ст. [1, *32*; 2, *51*].

Агульнай характарыстыкай першага перыяда, які бярэ пачатак у антычнасці, з'яўляецца выключна біялагічнае тлумачэнне фактаў, у прыватнасці, катэгорыі граматычнага роду. "Рэчы з'яўляюцца такімі, якія яны ёсць, дзякуючы таму факту, што мужчыны — гэта мужчыны, а жанчыны — гэта жанчыны: такі падзел разглядаецца як натуральны і ўкаранёны ў біялогіі" [3, *97*].

Пераходны перыяд ахарактарызаваўся з'яўленнем новых фактаў, якія сведчаць аб уплыве сацыяльных фактараў на адрозненне паміж мужчынскім і жаночым маўленнем (даследаванні Ф. Маўтнера, Э. Сэпіра, О. Есперсэна). Аднак на працягу другога перыяду вывучэнне ўзаемасувязі мовы і пола па-ранейшаму мела спарадычны характар і заставалася на перыферыі лінгвістычных ведаў.

З другой паловы XX стагоддзя пад уплывам соцыялінгвістыкі, філасофіі постмадэрнізма і пад'ёму фемінісцкага руху ў ЗША і краінах Заходняй Еўропы пачынаецца сістэматычнае вывучэнне гендэрнага фактара ў мове. Узнікае фемінісцкая лінгвістыка, якая ў якасці асноўнай мэты ставіць выкрыццё мужчынскага панавання ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і як вынік — змяненне моўных норм, арыентаваных на мужчынскі пункт погляду. Пры гэтым, канцэнтруючы ўвагу на выкрыцці патрыярхальных стэрыятыпаў панавання—падпарадкавання, зафіксаваных у мове, фемінісцкая лінгвістыка пераважна звяртае ўвагу на структуру мовы, а не на яе рэальнае выкарыстанне. Акрамя таго, аўтары фемінісцкага кірунку нярэдка абмяжоўваюцца палемічнымі выступленнямі і залішне эмацыянальнымі суджэннямі, што не спрыяе аб'ектыўнасці даследавання і прыводзіць да тэндэнцыйнага адбору вывучаемых фактаў. Аднак, нягледзячы на аднабаковы характар, фемінісцкая лінгві-

стыка распрацавала ўласную лінгвістычную метадалогію і пашырыла лінгвістычнае апісанне, уключаючы яго ў сферу агульна-гуманітарных ведаў пра чалавека і грамадства.

80-я гады XX ст. характарызуюцца аднаўленнем фемінісцкай тэорыі, што знайшло выражэнне ў пераходзе ад аналізу форм прыгнечання жанчын і спецыфічна жаночага вопыту да аналізу гендэрнай сістэмы ў цэлым. Фарміруецца міждысцыплінарны навуковы кірунак — гендэрныя даследаванні, якія змяняюць радыкальны крытычны запал фемінізма на аб'ектыўны аналіз сацыяльных працэсаў і культуры ў гендэрным вымярэнні. Пры гэтым сфера ўласна жаночых даследаванняў расшырылася за кошт уключэння новага праблемнага поля, звязанага з вывучэннем маскуліннасці [падрабязна гл.: 1, *31—85*; 2].

Даследаванні гендэрнага фактара ў мове актыўна праводзяцца ў ЗША і краінах Заходняй Еўропы. Пры вялікай колькасці работ на матэрыяле англійскай і іншых еўрапейскіх моў у айчыннай лінгвістыцы гэта тэма толькі пачынае сваё перамяшчэнне з перыферыі навуковых ведаў да цэнтра. Пры гэтым спробы экстрапаліраваць вынікі замежных даследаванняў на глебу рускай мовы нельга прызнаць прадуктыўнымі, паколькі ўяўленні пра мужчынскае і жаночае фарміруюцца ў рамках пэўных культурных традыцый, што не можа не адлюстравацца на вербальных паводзінах мужчын і жанчын. Існуючыя спосабы абмеркавання гендэрных праблем, цесна звязаныя з заходняй фемінісцкай традыцыяй, павінны быць перагледжаны ў адпаведнасці з культурнымі рэаліямі і інтэлектуальным кантэкстам постсавецкага грамадства. Таму актуальнай задачай з'яўляецца выяўленне гендэрнага вымярэння рускай і беларускай моў і транслюемай імі нацыянальнай культурнай традыцыі.

На сучасным этапе даследаванні, праведзеныя на матэрыяле рускай мовы, носяць вельмі разрознены, спарадычны характар (беларуская мова з пункту гледжання гендэрнага аспекта сур'ёзна не аналізавалася). Вывучэнне асаблівасцей мужчынскага і жаночага маўлення носіць паўзроўневы характар (фанетыка, лексіка, словаўтварэнне, граматыка). Вялікая колькасць прац прысвечана даследаванню граматычнай катэгорыі роду і спосабам намінацыі асоб жаночага і мужчынскага полу. З'яўляюцца працы, прысвечаныя псіха- і сацыялінгвістычным аспектам мужчынскага і жаночага маўлення. Спробай сістэмнага апісання катэгорыі гендэра ў рускай мове з'яўляецца манаграфія А.В. Кірылінай "Гендэр: лінгвістычныя аспекты", у якой даецца тэарэтычнае асэнсаванне канцэпта *гендэр*, абагульняюцца вынікі гендэрных даследаванняў у замежным і айчынным мовазнаўстве, раскрываецца змест культурных канцэптаў мужчынскасці і жаноцкасці і асаблівасці іх адлюстравання ў рус-

кай і нямецкай мове на матэрыяле фразеалогіі [1]. На тэрыторыі СНД лінгвістычныя даследаванні ў гендэрным аспекце актыўна праводзяцца ў Маскве, Санкт-Пецярбурзе, Харкаве. Пры Крыварожскім дзяржаўным педагагічным універсітэце створаны "Сектар па вывучэнню праблем мужчынскага і жаночага маўлення", які прапанаваў праграму комплекснага міждысцыплінарнага даследавання мужчынскага і жаночага маўлення [4]. Даследчыкі вядуць размову пра стварэнне рускай гендэрнай лінгвістычнай школы, якая мае свае асаблівасці, у прыватнасці адсутнасць ярка выражанай фемінісцкай афарбоўкі і ў сувязі з гэтым недастатковы інтарэс да пытанняў фемінісцкага рэфармавання мовы і спробам паўплываць на моўную палітыку дзяржавы [5, *305*].

Асаблівую цікавасць уяўляе вывучэнне мужчынскіх і жаночых маўленчых паводзін, якія сфарміраваліся на аснове гендэрных стэрэатыпаў, што гістарычна склаліся, і ў значна большай ступені, чым структура мовы, рэагуюць на любыя сацыяльныя змены, так ці інакш звязаныя з размеркаваннем мужчынскіх і жаночых ролей у грамадстве. Пры гэтым неабходна размежаваць рад базавых тэарэтычных паняццяў, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца пры вывучэнні жаночых маўленчых паводзін і стратэгій. Да такіх базавых паняццяў адносяцца *фемінісцкі дыскурс, гендэрны дыскурс, жаночае маўленне і жаночы дыскурс.*

Фемінісцкі дыскурс — сацыяльна арыентаваная маўленчая практыка крытычнага характару, накіраваная на выкрыццё ўсіх форм жаночай залежнасці і дасягненне рэальнага раўнапраўя жанчын.

Гендэрны дыскурс — адзін з асноўных механізмаў фарміравання інстытута полу, які канструюе пэўныя гендэрныя стэрэатыпы (стандартызаваныя ўяўленні пра мужчынскае і жаночае) праз палітыку рэпрэзентацыі ў мове і іншых ідэалагічна значных сферах, у тым ліку мастацтве, адукацыі, рэлігіі, модзе.

Жаночае маўленне — маўленчая практыка жанчын у розных сферах зносін, спецыфіка якой дэтэрмінуецца біялагічным полам. На ўзроўні даследавання жаночага маўлення можна выявіць набор тыповых з'яў, якія праяўляюцца ў розных мовах і маюць універсальны характар, паколькі іх існаванне абумоўліваецца дэтэрмінантамі жаночага полу. Аднак неабходна прызнаць, што паняцце жаночага маўлення з'яўляецца пераважна тэарэтычным канструктам, паколькі рэальная маўленчая інтэракцыя ажыццяўляецца ў шырокім камунікатыўным кантэксце, які ўключае розныя прагматычныя, псіхалагічныя, сацыякультурныя і іншыя фактары. У сувязі з гэтым вывучэнне жаночага маўлення непазбежна ўскладняецца ўплывам сістэмы сацыяльна і культурна значымых фактараў, г.зн. гендэрным аспектам.

Жаночы дыскурс — маўленчая практыка жанчын у розных сферах зносін, дэтэрмінаваная сістэмай сацыякультурных фактараў (ад этнічных да эканамічных).

У цэлым шырокае выкарыстанне гендэрнай метадалогіі ў галіне сацыяльных навук паказала новыя аналітычныя магчымасці для даследавання грамадства і культуры. У сувязі з гэтым вывучэнне гендэрнай дыферэнцыяцыі маўленчых паводзін будзе спрыяць запаўненню гнасеалагічных лакун у парадыгме агульнагуманітарных ведаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Кирилина А.В.* Гендер: лингвистические аспекты. М., 1999.

2. *Кирилина А.В.* Развитие гендерных исследований в лингвистике // Филологические науки. 1998. № 2. С. 51—58.

3. *Уэст К., Зиммерман Д.* Создание гендера (doing gender) // Гендерные тетради. Вып. 1. СПб., 1997. С.94—124.

4. Програма дослідження чоловічого та жіночого мовлення // Мовознавство. 1995. № 2—3. С. 54—56.

5. *Горошко Е.* Гендерный фактор в языке и коммуникации. Рецензия // Гендерные исследования. 2000. № 4. С. 305—308.

Г.М. Траццякова

МЕТАФАРА Ў ЭФЕКТЫЎНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

Эфектыўная камунікацыя разглядаецца як асобы тып камунікатыўнага ўзаемадзеяння індывідаў, у выніку якога намеры камунікантаў паспяхова рэалізуюцца. Крытэрыі паспяховасці камунікацыі вар'іруюцца ў залежнасці ад *сферы* яе працякання, *сацыякультурных* асаблівасцей яе ўдзельнікаў і дыяпазону тых мэтаў, якія традыцыйна ставяцца і дасягаюцца ў данай сферы прадстаўнікамі пэўнай культуры.

У мастацкай літаратуры, на матэрыяле якой праводзілася даследаванне, крытэрыямі паспяховасці камунікацыі выступаюць такія параметры, як тыраж надрукаванай кнігі, колькасць моў, на якія яна перакладзена, месца твора ў дзесятку сусветных бестсэлераў, цікавасць да яго спецыялістаў (уключэнне твора ў праграмы універсітэтаў, з'яўленне крытычных артыкулаў, уключэнне інфармацыі аб творы ў даведнікі і манаграфіі і г. д.)

Мяркуецца, калі тэкст інтэнсіўна запатрабуецца носьбітамі якой-небудзь культуры (прычым не толькі на ўзроўні масавага чытача, але і ў асяроддзі спецыялістаў шэрага навук), актыўна перакладаецца і раскупліваецца вялікімі тыражамі ў многіх краінах ("задзел" носьбітаў іншых культур), то ў яго ўнутранай (кагнітыўнай) будове ёсць *нешта*, што даз-

валяе яму лёгка ўсведамляцца і гучаць ва унісон з рытмам камунікатыўна-пазнавальнай дзейнасці рэцыпіентаў розных культур.

Гэта дае падставы паспрабаваць даследаваць кагнітыўную будову такіх тэкстаў на матэрыяле мовы зыходнай культуры, у межах якой яны былі створаны, і прааналізаваць ролю асобных складаючых у рэалізацыі стратэгій эфектыўнай камунікацыі.

Матэрыялам даследавання паслужылі творы сучаснага нямецкага пісьменніка П. Зюскінда, *аб'ектам* аналізу стала метафара, а *стратэгіяй* камунікацыі, у межах якой разглядалася метафара, — стратэгія *блакіравання нявыгадных карыстальніку напрамкаў інтэрпрэтацыі фрагментаў тэксту.*

Метафара як моўная фіксацыя сувязі па падабенству паміж двума аб'ектамі заснавана, на думку Н.Д. Арыцюнавай, "на адмове і выбары"[1] і "працуе на катэгарыяльнай памылцы"[2]. Уздзеянне метафары на рэцыпіента (выклікае прыемнае адчуванне) адзначалі яшчэ Арыстоцель (4 ст. да н. э., праца "Рыторыка") і Цыцэрон (1 ст. да н. э., праца "Прамоўца"). Яны лічылі, што выкарыстанне метафар у мове сведчыць аб дасціпнасці (пераскочыў тое, што ляжыць пад нагамі, а схапіў другое, якое ляжала далёка) [8, *35*].

Сучасныя лінгвісты падкрэсліваюць, што эфект метафары, як і любога іншага тропа, "утвараецца не наяўнасцю агульнай «семы» (...па меры павелічэння колькасці агульных «сем» эфектыўнасць тропа знікаецца...), а украпваннем іх у несумяшчальныя семантычныя прасторы і ступенню семантычнай аддаленасці несупадаючых «сем»" [4, *54*].

Здольнасць метафары закранаць пачуцці камунікантаў мы бачым у тым, што яна значна ўзмацняе дынаміку працэсу актывізацыі сістэмы ведаў рэцыпіентаў і забяспечвае прарыў у тыя зоны кагнітыўнай прасторы, якія нельга закрануць без парушэння норм і правіл моўных зносін (напрыклад, пастулатаў П. Грайса) [3, *223*].

Закранаючы праз метафару пачуцці рэцыпіентаў, карыстальнік атрымлівае доступ у дзве сферы кагнітыўнай прасторы рэцыпіента:

• працэдуральную сферу — неўсведамляемыя схемы дзеянняў, якія злучаюцца на этапе, калі праходзяць з ацэнкай прыемна/непрыемна, небяспечна/бяспечна і г. д.;

• сферу асабістага вопыту (індывідуальны кампанент у канфігурацыях ментальных схем).

---

[1] "Адмова ад матывіровак, тлумачэнняў, пашыральнікаў, разгортвання «фону»... можа быць кампенсавана толькі адзінасцю і дакладнасцю выбару" [1, *355*].

[2] "Метафара індывідуалізуе прадмет, адносячы яго да класа, да якога ён не належыць" [1, *348*].

Такім чынам, дзякуючы метафары, зона актывізацыі аказваецца высвечанай адразу з трох бакоў — *моўнага* (праз моўную адзінку), *працэдуральнага* (праз эмацыянальны кампанент, які першапачаткова замацаваны за фазамі ўзаемадзеяння чалавека з рэальным светам) і *культурна-індывідуальнага* (праз культурна абумоўлены кампанент канцэптуальнай сферы).

Такое трохкратнае выдзяленне пункта ментальнай прасторы выводзіць яго на ўзровень фігуры, а пераводзячы на ўзровень фону ўсе іншыя, роўна магчымыя лініі актывізацыі ментальнай прасторы, а значыць і лініі пераважнага разгортвання тэксту. За кошт гэтага гасяцца непажаданыя для карыстальніка напрамкі актывізацыі ментальных схем і блакіруюцца нявыгадныя для яго варыянты інтэрпрэтацыі рэцыпіентам фрагмента тэксту.

На прыкладзе, які ўзяты з рамана П. Зюскінда "Парфумер", разгледзім, як метафара ўключаецца ў рэалізацыю *стратэгіі* блакіравання непажаданых для карыстальніка варыянтаў інтэрпрэтацыі тэксту.

Mit dem ersten Blick, den er auf Monsieur Grimal geworfen — nein, mit dem ersten witternden Atemzug, den er von Grimals Geruchsaura eingesogen hatte, wußte Grenouille, daß dieser Mann imstande war, ihn bei der ***geringsten*** *Unbotmäßigkeit* ***zu Tode zu prügeln***. ***Sein Leben galt*** *gerade noch* ***so viel wie die Arbeit****, die er verrichten konnte...*

Tagsüber *arbeitete er, solange es hell war, im Winter acht, im Sommer vierzehn, fünfzehn,* ***sechszehn Stunden****...*

Monatelang *schleppte er Wasser vom Fluß herauf, immer zwei Eimer,* ***Hunderte von Eimern am Tag****...* ***Monatelang*** *hatte er* ***keine trockene Faser mehr am Leibe*** *vor lauter Wassertragen...*

Nach einem Jahr dieser mehr ***tierischen*** *als menschlichen Existenz bekam er den Milzbrand, eine* ***gefürchtete Gerberkrankheit****, die üblicherweise* ***tödlich*** *verläuft... Entgegen aller Erwartungen jedoch überstand Grenouille die Krankheit...*

Plötzlich mußte er nicht mehr auf der nackten Erde schlafen... Zum Schlafen sperrte man ihn nicht mehr ein. Das Essen war auskömmlicher...

Er hatte gesiegt, denn er lebte, und er besaß ein Quantum von Freiheit... ***Der Zeck*** *Grenouille regte sich wieder* [7, *40—43*].

Спачуванне і жаль да дзевяцігадовага дзіцяці, якія не могуць быць не выкліканы нечалавечымі ўмовамі яго існавання (гатоўнасць гаспадара забіць яго насмерць за самую малую правіннасць, 14—16-гадзінная праца па вырабу скур, якія страшэнна смярдзяць, знясільваючае цяганне вады па сто вёдраў за суткі, амаль заўсёды мокрая вопратка, смяротная хвароба гарбароў — сібірская язва), *палёгка і ра-*

дасць ад таго, што дзіця змагло вырвацца з учэпістых абдымкаў смерці, — гэта пачуцці, якія з максімальнай верагоднасцю (у адпаведнасці з этычнымі нормамі нямецкамоўнага соцыума, якія вызначаюцца ўзаемадзеяннем шэрага фактараў, уключаючы Біблію) суправаджаюць апрацоўку рэцыпіентамі фактуальнай і прагматычнай інфармацыі дадзенага фрагмента рамана.

Аднак наўмысна выкліканыя пачуцці рэцыпіентаў (усплёск у напрамку *станоўчае* (+) на шкале ацэнкі) гасяцца з'яўленнем метафары *Грэнуй — клешч*. Напамін аб кляшчы — упершыню метафара разгорнута ўведзена некалькімі старонкамі раней — блакіруе магчымае зрушэнне ментальнай схемы *Грэнуй* (у кагнітыўнай сістэме рэцыпіентаў) у зону макрасхемы *Свой свет*.

Слова *клешч* асацыіруецца з небяспечнасцю [6, *181*; 5, *104*], таму рух схемы *Грэнуй* у напрамку *свой* (вось *свой — чужы*[1]), які намеціўся (за кошт эмацыянальнага кампанента), прыпыняецца за кошт праекцыі на даную схему інфармацыі (усвядомленай, а таксама той, што знаходзіцца ў сферы неўсвядомленага), якая звязана з небяспекай. Таму напрамак актывізацыі *чужы → свой* адсякаецца, як непатрэбны, толькі паспеўшы намеціцца.

Тое, што гэты напрамак (на ўзроўні перамяшчэння кампанентаў у макрасхеме *Свой свет*) разглядаецца аўтарам рамана як непажаданае, пацвярджаецца наступным фрагментам рамана, у якім Грэнуй паўстае як не-чалавек, які дзеля цудоўнага паху забіў маладую дзяўчыну: *Daß am Anfang dieser Herrlichkeit ein Mord gestanden hatte, war ihm, wenn überhaupt bewußt, vollkommen gleichgültig* [7, *58*].

Метафары, якія выкарыстоўваюцца ў стратэгіі блакіравання непажаданых для карыстальніка варыянтаў інтэрпрэтацыі тэксту, як правіла, не з'яўляюцца ў тэксце нечакана і раптам, іх увядзенню ў канву тэксту звычайна папярэднічае пэўная *падрыхтоўка*.

У якасці прыкладу разгледзім, як у рамане П. Зюскінда "Парфумер" ажыццяўлялася падрыхтоўка для з'яўлення метафары *Грэнуй — клешч*.

Der kleine häßliche Zeck, der seinen bleigrauen Körper zur Kugel formt, um der Außenwelt die geringstmögliche Fläche zu bieten... Der Zeck, der sich extra klein und unansehnlich macht, damit niemand ihn sehe und zertrete. Der einsame Zeck, der in sich versammelt auf seinem Baume hockt, blind, taub und stumm, und nur wittert... das Blut vorüberwandernder Tiere...

[1] На думку Н.Д. Арыонавай, ацэнка сітуацыі па параметру *свой — чужы* вызначае (пры ўзаемадзеянні з ацэнкай па іншых параметрах) выбар альтэрнатывы ў працэсе прыняцця рашэння [1, *263*].

Aber der Zeck, bockig, stur und eklig, bleibt hocken und lebt und wartet. Wartet, bis ihm der höchst unwahrscheinliche Zufall das Blut in Gestalt eines Tieres direkt unter den Baum treibt. Und dann erst gibt er seine Zurückhaltung auf, läßt sich fallen und krallt und bohrt und beißt sich in das fremde Fleisch... So ein Zeck war das Kind Grenouille [7, *29*].

Падрыхтоўка метафары *Грэнуй — клешч* заключаецца ў апісанні мадэлі паводзін істоты (кляшча), у якой параўноўваецца аб'ект (чалавек), прычым гэтае апісанне прасякнута абгрунтаванымі, адзіна магчымымі ў данай сітуацыі адносінамі да яго (у даным выпадку — негатыўнымі).

Гэтыя негатыўныя адносіны (адзіна дапушчальныя ў мадэліруемай сітуацыі) пераносяцца праз метафару на чалавека (*Грэнуя*), імя якога з'яўляецца адразу ж пасля выразнага апісання мадэлі паводзін гэтага небяспечнага насякомага — кляшча. Прычым уводзіцца імя Грэнуя (дзякуючы сінтаксічнай канструкцыі *So ein Zeck war das Kind Grenouille*) як знак нейкай *чорнай дзіркі*, якая ўвабрала ў сябе ўсю перададзеную ў папярэднім фрагменце інфармацыю (у даным выпадку — усе негатыўныя якасці кляшча).

Выкарыстанне спецыяльнай тактыкі *падрыхтоўкі* пры ўвядзенні метафар дае карыстальніку шэраг пераваг у ажыццяўленні эфектыўнага моўнага ўздзеяння. Дзякуючы гэтай тактыцы аўтару рамана, напрыклад, не спатрэбіліся аб'ектыўныя аргументы для абгрунтавання таго, што Грэнуй — небяспечны чалавек.

З аб'ектыўнымі аргументамі рэцыпіент можа і не згадзіцца. З пачуццямі (адчуванне небяспекі), якія базіруюцца на многавяковай традыцыі нямецкамоўнага соцыума, спрачацца значна цяжэй, паколькі "тое, што асвечана паданнем і звычаем, валодае безыменным аўтарытэтам, і ўсё наша гістарычнае канчатковае быццё вызначаецца пастаянным панаваннем атрыманага ў спадчыну — а не толькі зразумелага на разумных падставах — над нашымі ўчынкамі і справамі" [2, *333*].

Аналіз метафары ў тэкстах, якія характэрызуюцца высокім патэнцыялам уздзеяння на рэцыпіентаў, паказаў, што яна выкарыстоўваецца не толькі для ўзмацнення вобразнасці вербальнага адлюстравання фрагмента свету ці для ўзбуджэння станоўчых эмоцый рэцыпіентаў. Яе роля ў эфектыўнай камунікацыі можа заключацца ў *блакіраванні* наўмысна выклікаемых карыстальнікам *спадзяванняў* рэцыпіента і ў *рэгуляванні рэгістра* (станоўчы/адмоўны) магчымых інтэрпрэтацый тэксту, пакідаючы рэцыпіенту магчымасць напаўняць навязаны рэгістр любой асабіста значнай інфармацыяй.

ЛІТАРАТУРА

1. *Арутюнова Н.Д.* Язык и мир человека. М.: Языки русской культуры, 1999.
2. *Гадамер Х.-Г.* Истина и метод: Основы философской герменевтики. М., 1988.
3. *Грайс Г.* Логика и речевое общение // Новое в зарубежной лингвистике. Вып. 16. Лингвистическая прагматика. М., 1985. С. 217—237.
4. *Лотман Ю.М.* Внутри мыслящих миров. Человек. Текст. Семиосфера. История. М., 1996.
5. *Gerlach W.* Das neue Lexikon des Aberglaubens. Frankfurt am Main: Eichborn, 1998.
6. *Harnisch G.* Das große Traumlexikon. Über 1500 Traumsymbole von A bis Z psychologisch gedeutet. Freiburg ; Basel; Wien: Herder, 1996.
7. *Süskind P.* Das Parfum. Zürich: Diogenes, 1994.
8. *Ueding G., Steinbrink B.* Grundriss der Rhetorik: Geschichte, Technik, Methode. Stuttgart; Weimer: Metzler, 1994.

І.А. Хазеева

КАНЦЭПТ *ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ* У БЕЛАРУСКАЙ МОЎНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ: МЕТАФАРА *ДАРОГА*

У межах кагнітыўнага падыходу да мовы цэнтральнай з'яўляецца катэгорыя ведаў, а мова разглядаецца як форма ведаў (аб свеце і аб моўнай сістэме) і змест думак, які перадаецца ў працэсе камунікацыі. Такі зварот да катэгорыі ведаў у адносінах мовы дазваляе "зняць супрацьпастаўленне паміж лінгвістычным і экстралінгвістычным значэннем, што было перашкодай у традыцыйнай лінгвістыцы" [Фурашова, 1999, *7*].

Пры кагнітыўным разглядзе феномена метафары важным уяўляецца аналіз і выяўленне ролі экстралінгвістычных ведаў, якія акумулірующца ў метафарычным значэнні. Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца спроба вызначыць культурныя фонавыя веды, якія ляжаць у аснове матывацыі метафары.

Канцэптуалізуючая роля метафары стварае моўную карціну свету. Для таго, каб зразумець, як складваецца ідыяграфія мовы (у нашым выпадку — у галіне значэнняў *"жыць"* і *"памірацъ"*, неабходна супаставіць тры тыпы значэнняў (згодна І. Сандамірскай) [Сандомирская, 1998, *201—202*].

1. Факталагічнае (на аснове пазітыўных ведаў аб жыцці і смерці, не кранутае вобразнасцю і не маючае сувязі з культурным канцэптам): усе людзі нараджаюцца, нейкі час жывуць, а пасля паміраюць.

2. Моўныя веды аб жыцці і смерці, якія змяшчаюцца ў лексічным значэнні слоў *жыццё* і *смерць*, іх сінонімаў, антонімаў, дэрыватаў і г. д., г. зн. семантычных структур дэнатата. У гэтых ведах з'яўляюцца наступныя параметры: часавы (пачатак — сярэдзіна — канец жыцця), працягласці (хуткая — доўгая смерць), суб'ектнасці/аб'ектнасці (знайсці

смерць, чакаць смерць), этычнай ацэнкі (благое жыццё). Такім чынам, за кошт семантычнай структуры дэнатата ў карціну свету дадаецца інфармацыя аб тым, што жыццё і смерць суадносяцца з лінейным часам, чалавек выступае ў ролі як аб'екта, так і суб'екта, магчымы суджэнні як якаснай, так і колькаснай ацэнкі.

3. Веды аб жыцці і смерці як культурна-моўных канструктах. Змяшчаецца ў вобразных моўных адзінках, найчасцей — у фразеалогіі. Метафара дапаўняе і ўдакладняе фрэйм значэння слова ў яго прамым значэнні. З'яўляюцца новыя семантычныя параметры: лакалізацыі (дарога жыцця, парог смерці), "інструментальны" (у руках/кіпцюрах смерці), маніфестацыі нябачных уласцівасцей (пячатка смерці).

Такім чынам, метафара ператварае дэнатат у сігніфікат, надаючы моўнаму значэнню характар культурна-спецыфічнага. Выбар семантычнага поля даследавання тлумачыцца тым, што ідэя руху, дарогі закладзена ў самой карціне свету — як сукупнасці ўяўленняў чалавека аб свеце і самім сабе, а метафара "дарога" з'яўляецца адной з самых распаўсюджаных сярод устойлівых спалучэнняў са значэннем *жыць/ памерці*.

Метафара *жыццё = дарога* змяшчае ў асноўным значэнні, звязаныя з дзейнаснымі і падзейнымі аспектамі чалавечага існавання. *Як ішоў адной сцягою, так з жыцця па ёй сышоў / Не служакам, не слугою, / Непрыкметным мурашом* [К. Камейша, Маладосць, 1999, № 2, *59*]; *Прытомлены жыццёваю дарогай, / сам у сябе заглядвай з асцярогай* [Р. Барадулін, Анталогія, 2000, *97*]; *І лічыш, і лічыш паволі / Удачы свае і няўдачы — / Чаго меў на свеце найболей, / Чым сцежку жыцця абазначыў* [Я. Купала, 3, *179*].

Дарога жыцця — прасторава-часавы сэнс і спосаб існавання, сцэнарый жыцця і смерці. Ва ўстойлівых спалучэннях з кампанентам *'дарога жыцця'* найважнейшай з'яўляецца сема "цэласнасць": *І знікаюць у бездань дарогі, / Што чамусьці завуцца жыццём* [С. Грахоўскі, 1996, *79*]; *Жыццё маё — бясконцая дарога, / Што ніадкуль ідзе ў нікуды.* [А. Кудласевіч, Анталогія, 2000, *83*].

У самім паняцці *'дарога'* закладзена амбівалентнасць: дарога мае пачатак і канец: *Так і канчаецца наша дарога / Без хвалявання і прывідных сноў.* [С. Грахоўскі, 1996, *84*]; *Хутка закончу дарогу сваю* [М. Танк, 4, *556*]; *І люты кат не закасуе душы, / Што ў Курапаты пачыналі шлях* [С. Грахоўскі, 1996, *141*]. Такім чынам актуалізуецца часавы параметр метафарычнай дарогі, у адрозненні з рэальнай, дзе важным з'яўляецца перамяшчэнне ў прасторы.

Але пачатак і канец могуць "зліваццa", у гэтым выпадку шлях становіцца бясконцым, утвараецца кола: *Не ведаем, чыя заслуга ці віна, /*

Што ўсё мінае і сысці павінна / Апошняя хвіліна. Вось яна. / А для гасьці — першая хвіліна. [С. Грахоўскі, 1996, *116*] *За кругам круг бягуць кругі, / Усё жыццё ідзе кругамі* [С. Грахоўскі, 1996, *171*].

З кантынуальнасці (бесперарыўнасці) канца і пачатку, жыцця і смерці ўзнікае ідэя "вечнага вяртання" (М. Эліядэ), якая пераўтварае шлях у цыклічны. "Сакралізацыя жыццёвага шляху, які замыкаецца ў круг і яднае нараджэнне і смерць, з'яўляецца адной з важнейшых складнікаў міфалагічнай свядомасці" [Толстой, 1995, *223*]. *Вечна ўсё: зямлі вярчэнне, / Лісця шум і тлум дарог. / Вечнае дарог кружэнне / На асі людскіх трывог. Кружым полем, кружым лугам, /Кружым вечна на зямлі.* (В. Гардзей, Анталогія, 2000, *76*].

Архетыпічны вобраз дарогі ўзыходзіць да старажытных уяўленняў, згодна з якімі жыццё чалавека — гэта невялікі адрэзак у ланцугу часу, у ланцугу пераўвасабленняў, нараджэння і смерці. На падставе ўяўленняў пра смерць, якая можа адраджацца, склаўся увесь сямейна-бытавы рытуал (жыццёвае кола), а ў фізічным свеце — гадавое кола (каляндар). У паэзіі цыклічнасць часу і чалавечага існавання адлюстравана наступным чынам: *Пачварны дождж...Распачынае потым / Начное сонца свой кругазварот* [В. Куртаніч, Зорка палын, 1993, *96*]; *Дарэмна на долю гляджу чалавечую, / Не бачу шчаслівых у жыццёвым кругу.* [Я. Купала, 1, *124*].

У гэтым выпадку *смерць* — умоўнае заканчэнне кола, ці апошні віток спіралі: *Так завяршу свае кругі я , / Час непрыкметна набяжыць.* [С. Грахоўскі, 1996, *156*]; *Той мкнецца да яго праз сотні жыццяў, / Упэўнены, што круг іх завяршыцца* [Т. Бондар, Маладосць, 1998, № 7, *22*]; *Заканчваю апошнія віткі* [С. Грахоўскі, 1996, *81*].

Асобае значэнне набывае такая адзінка руху/дарогі як мяжа: *Даўно няма маіх сяброў, / Стаю апошні на мяжы я* [С. Грахоўскі, 1996, *144*]; *Ніхто не знае, колькі Бог / Гадоў і дзён яму адмераў / І дзе апошні той парог, / Дзе ў рай, а можа ў пекла дзверы* [С. Грахоўскі, 1996, *107*]; *Зямля — яго прытулак і не болей, / На скрыжаванні лёсу і жыцця* [Т. Бондар, Маладосць, 1998, № 7, *21*]; *А лёс шляхі мае крыжуе / На стыку смерці і жыцця* [С. Грахоўскі, 1996, *172*]. Мяжа — гэта "не пачатак і не канец, гэта паўза, якая амаль абавязкова прадугледжвае працяг руху па дарозе, але з пераходам у іншую прастору/час, па той бок, акрэсленай ёй мяжы" [Невская и др., 1998, *442—443*]. *Як дабрысці нам да парога, / Дзе між адзіны — нам замнога, / А вечнасць — сціслая дарога?* [А. Гуцаў, Анталогія, 2000, *96*]; *Адчыню дзвярэй засовы / Я без радасці, без мук. / Ў невядомую пуціну / Немаведамы парог перайду* [Ул. Жылка, 1998, *102*].

Так, у Лаўрэнцьеўскім летапісе згадваецца, што прах нябожчыка змяшчалі каля дарогі на слупе. У гэтым старажытным звычаі аб'ядноўваюцца вераванні ў зыход па апошняй дарозе і стварэнне знака мяжы "сваёй тэрыторыі", якую ахоўваюць продкі ("дзяды") [Сардаров, 2000, *43*].

У паэзіі замацавалася ўяўленне аб загадкавасці і таямнічасці новага свету, бо ніхто з жывых не ведае дакладна, што іх чакае пасля смерці. Таму паэты часам пазбягаюць канкрэтных назваў лакалізацыі "новага" жыцця: *Смерць — і шлях у далечу…* [А. Рыбік, Першацвет, 1998, № 5, *22*]; *Калі свет у вачах пахіснецца, / Апраўданне разлуцы знайду: / Шлях туды небяспечны, здаецца, / Лепш адзін я ў разведку пайду* [П. Саковіч, Полымя, 1998, № 8, *97*]; *Пайшоў туды, адкуль не прыйдзе болей* [А. Смалянец, Анталогія, 2000, *110*]; *І выйсці ў іншае шукаць* [Л. Сільнова, Анталогія, 2000, *79*].

У галашэннях, якія суправаджаюць пахавальны абрад, таямнічасць новага свету — месца знаходжання нябожчыкаў і іх душ — "падказвалі плакальшчыцам адпаведныя матывы, якія часцей сфармуляваны ў выглядзе рытырычнага пытання — куды ты йдзеш ад мяне?" [Сысоў, 1995, *19*].

Найбольш частотным у паэзіі з'яўляецца зварот да старажытнага погляду аб тым, што смерць — гэта пераход чалавека з белага, зямнога свету на той (трансцэдэнтны) свет. У фразеасістэме беларускай мовы захавалася шматлікая колькасць устойлівых спалучэнняў, заснаваных на гэтым поглядзе: *пусціць на той свет, звесці са свету, адыходзіць на той свет, адпраўляць на той свет, загнаць на той свет, зжыць са свету, адыходзіць у іншы свет.*

Паэты шырока карыстаюцца фразеалагічнай скарбніцай мовы: *Устае рой новых пакаленняў, / Старыя сходзяць на той свет.* [Я. Купала, 2, *200*]; *Я Госпаду не памаліўся, Сыходзячы у лепшы свет* [С. Грахоўскі, 1996, *156*]; *Не бачу ў снезе ці лістоце вецце, / Ці на Зямлі я, ці ў дарозе на той свет* [С. Грахоўскі, 1996, *133*]; *Калі, каб хацеў нават / Нешта паправіць, / Дык трэба было б / З таго свету вярнуцца* [М. Танк, 4, *28*]; *Мы ў гэты свет на нейкі міг прыйшлі* [К. Цвірка, Анталогія, 2000, *96*].

Уяўленні аб існаванні замагільнага свету выклікалі пачуццё страху перад ім як нечым звыш натуральным, таямнічым. Пазбавіцца ад такой дысгармоніі дапамагала думка аб тым, што там чакаюць свае. Такім чынам памёршы ператвараўся ў духа-продка. Існаванне на Зямлі стала толькі адным са звенняў у ланцугу ўсіх адышоўшых пакаленняў; з "дапамогай" смерці адбываецца сувязь з усімі тымі, хто памёр раней: *ісці*

да сваіх, да сваіх далучыцца; мая пара настане / Да большасці, як кажуць, далучыцца [М. Танк, Полымя, 1994, № 9, *12*].

Так, свет жывых, які пазбавіўся сваёй часткі, атрымлівае кампенсацыю ў выглядзе дабрадзейнага, ахоўнага заступніцтва памёршых продкаў. Таму ў народным пахавальным абрадзе праводзілі члена свайго роду на той свет з хлебам-соллю, ці абсяваючы жытам, бо верылі і спадзяваліся на яго (памёршага) спрыянне і дапамогу ў гаспадарцы: *Вось толькі на шлях мой апошні, пражыты / Сыпнуць не забудзьце хоць прыгаршчы жыта.* [М. Танк, 4, *107*].

Згодна з народнымі вераваннямі, духі продкаў, адлятаючы на той свет (у вырай, як птушкі), пакідаюць на небе след — Млечны шлях: *Нешта Продкаў шлях аж слепіць вока* [Л. Рублеўская, Зорка палын, 1993, *135*]; *Уваскрасаюць і Сусвет раскрыўся, / І вырай прасвятліў Птушыны шлях* (А. Хатэнка). Такім чынам смерць набывае метафарычную намінацыю з кампанентам Млечны шлях: *І ты пад зоркамі не вечны / З вачэй знікаем / Шляхам / Млечным* [М. Гукава, Анталогія, 2000, *78*]; *На абшарах зямных, пад сонцам / Мы сышліся на гулкім вечы. / Два шляхі ў свеце бясконцым — / Млечны шлях І шлях Чалавечы* [М. Мятліцкі, Анталогія, 2000, *70—71*]; *На чужыне і дома — усе мы ў адной чарадзе / Што не ведае межаў, ляціць і радзее паволт / Млечным шляхам, дарогай,якая няўмольна вядзе / Ад няволі зямной да нязнанай нябеснае волі* [У. Някляеў, Полымя, 2000, № 2, *4*].

У пахавальным абрадзе ідэя апошняй дарогі непасрэдна экспліцыравана ў галашэннях: *Да паследняя ж у цябе дарога / Да паследній пуць./ Закрываюцца сцежкі-дарожкі, / Сабраўся ты ў вялікую дарогу / А мы больш не пабачым цябе...* [Сысоў, 1995, *23*].

У прыведзеным урыўку з галашэння выразна зафіксаваны характэрныя асаблівасці ўяўленняў аб дарозе ў замагільны свет. З аднаго боку, гэта была апошняя дарога памёршага ад хаты да месца пахавання, пасля якой назаўсёды закрываліся "сцежкі-дарожкі" на зямлі, а з другога боку, нябожчыка ўперадзе чакала "вялікая дарога", якая ўзнікала з уяўленняў чалавека аб падарожжы ў свет продкаў.

У беларускай паэзіі даволі часта ўжываецца эпітэт "апошні" для метафарычнай намінацыі смерці: *Анёлы, абмяркуюць вядомае ўслых / І ў шлях апошні праводзяць* [В. Куртаніч, Анталогія, 2000, *77*]; *Так сталася: жыву не дома, а ў гасцях. / А буду памірaць — ад роднага парога / Вярнуся, каб адсюль сысці ў апошні шлях* [А. Жыгуноў, Анталогія, 2000, *85*]; *Апошняй дарогай ужо без звароту / Паспешна даставіць маўклівы фурман* [С. Грахоўскі, 1996, *158*]; *Іду дарогай без звароту* [С. Грахоўскі, 1996, *28*].

Такім чынам, вобраз "апошняй дарогі" і звязаныя з ім уяўленні, утвараюць асноўны вобраз як пахавальнага фальклору, так і сучаснай беларускай паэзіі, бо менавіта "з дапамогай гэтага канцэпту вырашаецца асноўная калізія — важнае для жывых раз'яднанне сфер жыцця і смерці і шырэй — свайго і чужога, зняцце хаоса, які ўзнік у выніку самога факта смерці, узнаўленне бяспечнага для соцыуму парадку" [Невская и др., 1998, *449*].

Шырока экспліцыруецца як у пахавальным абрадзе, так і ў паэзіі ідэя госця, якая змяшчае семантыку пераходнасці. Госць — гэта персанаж, які ажыццяўляе сувязь дзвюх сфер: сваёй і чужой прасторы, гэтага і таго свету. Пры чым госць — гэта і сам нябожчык, і смерць, якая прыйшла па яго: *Ляжаць зарытыя тут косці / Ваяк гаротных за жыццё, / Сышлі ў зямлю на векчны госці, / Сышлі пад дзёрнаў пакрыццё* [Я. Купала, 2, *172*]; *Стала госця ля парогу, / Белым вабіць рукавом: / — Выйдзі, любы, у дарогу, / Новы дам начлег і дом* [Ул. Жылка, 1998, *102*].

Метафара жыццё = дарога ўзыходзіць і да Свяшчэннага пісання, біблейскай сімволікі духоўнага шляху, які вядзе да Бога: *Мяне анёлы за руку ўзялі / І, як дзіця, вядуць да Пана Бога. / Таму па мне не плачце, мама, многа, / Бо да Хрыста — нібы дамоў дарога* [А. Сыс, Анталогія, 2000, 68]; *Ды тых кранаецца тая асалода, / Каго не зломіць першая вярста.../ І як працяг Бясконцага Зыходу — апошні крок — у вечнасць, да Хрыста* [А. Дуброўскі, Маладосць, 1999, № 3, *21*].

Хрыстос, які хадзіў па Галілеі разам са сваімі вучнямі, сказаў аб сабе: "Я — шлях". Ў хрысціянскім вучэнні падкрэсліваеццаі найперш рэлігійна-філасофскі бок пазнання свету, дзе прасторавае і часавае пазнанне спалучаецца з духоўнай дарогай у глыб чалавека.

Ва ўжыванні разглядаемай метафары, у выпадках, калі неабходна адмежаваць духоўную дарогу ад паўсядзённай рэаліі, выкарыстоўваецца лексема *шлях*: *Яно (святло) распусціцца, працяўшы цвердзь / Напластаванняў часу і прасторы, / І россыпы блакітна-срэбных зорак / Адкрэсліць шлях. які адпрэчыць смерць* [Т. Бондар, Маладосць, 1998, № 7, *24*]; *...ён вылушчыў душу мне з цела / І затрымаў на хвілю ў высях, / Каб раз, адзін раз толькі паглядзела / Адтуль, з-пад сонца, на зямны свой шлях* [Я. Купала, 3, *195*]. Дэнатат метафары пашыраецца семантычным кампанентам 'духоўны, сакральны'.

Шлях духу не мае канкрэтнай ні прасторавай, ні часавай лакалізацыі, бо памёршы накіроўваецца ў вечнасці: *Ён скажа, што ў вечнасць яго не ўзялі* [К. Камейша, Маладосць, 1999, № 2, *57*]; *Паэце, здзейснілася мара — Твой дух памчаўся да вечных зор* [А. Давыдаў, Першацвет, 1993, № 3, *20*]; *Я думаю пра вечнае / Мая пара прыйшла* [Г. Бураўкін,

Полымя, 1999, № 10, *4*]; *Ідуць заўсёды побач — / сцяжынка ў вечнасць / І шаша ў нябыт* [Р. Гародка, Першацвет, 1997, № 1, *56*]; *Ты — прахожы на вечнай дарозе* [Л. Філімонава, Анталогія, 2000, *123*].

Метафарычна вобраз дарогі суадносіцца з рознымі аспектамі паняційнага поля. Шлях універсальна трактуецца і як катэгорыя маралі. Фразеасістэма беларускай мовы адлюстройвае набыццё адмоўных маральных якасцей чалавекам: *стаць на слізкую дарожку, ісці па крывой дарожцы*. Агульнахрысціянская ідэя дарогі як спосабу набыцця духоўных каштоўнасцей адлюстравана і ў беларускай паэзіі. Так, беларусу нялёгка было знайсці сапраўдную дарогу, найчасцей ён "блудзіць" у пошуках выйсця: *Блудныя сцежкі цёмнага жыцця / Навукі сонцам мусім рассвятліць* [Я. Купала, 1, *94*]; *А як да могілак прыйдзем: / Крыж, Крыж, каля крыжа бадылі, / І тут мы толькі увідзім / Як жа здарма век блудзілі* [Я. Купала, 2, *50*].

Як ужо вышэй адзначалася, дарога жыцця — гэта спосаб, сцэнарый жыцця, адрэзак часу, насычаны пэўнымі падзеямі. Хрысціянства вучыць, што сапраўднае духоўнае жыццё чалавек набывае, прайшоўшы праз пакуты: *цярністая жыццёвая пуцявіна, колкая пуцяцявіна жыцця, жыцця сцежкі трудныя* (Купала), *шлях ніўдатны і нявольны* [А. Гарун, Анталогія, 2000, *52*].

Як вядома, духоўны шлях патрабуе ўвагі і адказнасці за кожны крок (за кожнае дзеянне чалавека), таму след, пакінуты на дарозе (ці памяць аб чалавеку), набывае ў гэтай сувязі актуальнае гучанне: *Што ж. І мая канчаецца дарога, / Не ведаю, які пакіну след* [С. Грахоўскі, 1996, *140*]; *Я адыду і аднойчы ўзыду / З вечнай раллі / У тваім успаміне* [Р. Барадулін, Маладосць, 1998, № 9, *172*].

Такім чынам, да прасторава-часавых характарыстык сігніфіката метафары далучаюцца і маральна-этычныя, якія маюць важнае значэнне ў канструяванні канцэпта *'жыццё і смерць'*.

Намі выяўлены наступныя асаблівасці метафары *жыццё/смерць= дарога* ў беларускай моўнай карціне свету:

1) вобраз дарогі энантыясемічны, бо адначасова змяшчае ў сабе ідэю і пачатку і канца, сэнс жыцця чалавека ў яго цэласнасці (і зямнога, і вечнага, пасмяротнага);

2) у семантычную прастору дэнатата ўваходзяць не толькі прасторава-часавыя характарыстыкі дарогі: накірунак (у вечнасць, да труны, у зямлю і г. д.); час (пачатак, канец, ад старасці, бясчасна і г. д.), але і важнае значэнне набывае і маральна-этычны кампанент;

3) даследуемая метафара з'яўляецца адным з найбольш распаўсюджаных вобразаў паняційнага поля *жыццё/смерць* у беларускай моў-

най карціне свету і ўзыходзіць да старажытных славянскіх уяўленняў аб чалавечым жыцці як адрэзку ў ланцугу пераўвасабленняў, пакаленняў і хрысціянскай ідэі духоўнага шляху да Бога.

ЛІТАРАТУРА

Анталогія беларускай эпітафіі. Мн., 2000.

Грахоўскі С. Недапісаная кніга. Мн., 1996.

Жылка. У. Выбраныя творы. Мн.,1998.

Звонак А. Санеты. Мн., 1982.

Зорка Палын: Творы беларускіх паэтаў пра чарнобыльскую трагедыю. Мн., 1993.

Купала Я. Поўны збор твораў: У 7 т. Мн., 1997—2001.

Невская Л.Г., Николаева Т.М., Седакова И.А., Цивьян Т.В. Концепт пути в фольклорной модели мира // Славянское языкознание. XII Международный съезд славистов: Доклады российской делегации. М., 1998. С.442—458.

Сандомирская И. Метафоры жизни и смерти в устойчивых сочетаниях русского языка: внутренняя форма как нарративный потенциал // Scando-Slavica. Tomus 44. Munksgaard-Copenhagen, 1998. С. 199—212.

Сардаров А.С. Книга о дорогах. Дороги в человеческой цивилизации и культуре. Мн., 2000.

Сысоў У.М. Беларуская пахавальная абраднасць. Мн., 1995.

Танк М. Збор твораў: У 6 т. Мн., 1978—1981.

Толстой Н.И. Язык и народная культура. Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике. М., 1995.

Фурашова Н.В. Об усовершенствовании семантического анализа в когнитивной лингвистике. Мн., 1999.

Г.К. Чахоўскі

КАГНІТЫЎНЫ АНАЛІЗ ПАЛІТЫЧНАГА ДЫСКУРСА Ў БЕЛАРУСІ 1920—1930-х гг.

У сучаснай лінгвістычнай навуцы аднымі з найбольш складаных і актуальных з'яўляюцца пытанні вывучэння ідэалагічна актуалізаванага тэксту. "Адкрытасць" моўнай сістэмы, якая рэалізуецца ў фактах дынамічнага ўзаемадзеяння знакавага і рэальнага свету, змяніла даследчыцкія прыярытэты. У прыватнасці, лінгвісты зацікавіліся асаблівасцямі функцыянавання мовы ў перыяды сацыяльных змен, якія характарызуюцца змяненнем камунікатыўных умоў — нараджэннем як новых інфармацыйных тэхналогій, так і новых тыпаў тэкстаў, вылучыліся новыя напрамкі лінгвістычных даследаванняў.

Сацыяльная ўлада рэалізуе свае функцыі праз дзяржаўны апарат і заканадаўчыя акты. Яна робіцца легітымнай толькі тады, калі абапіраецца на няхай і прадэкларованыя ёю, але законы, устаноўкі, ідэі, г. зн. тэксты. Пэўная грамадская падзея робіцца стымулам для стварэння шэрагу тэкстаў, прычым гэты працэс стварэння (генеравання) можа ад-

бываць настолькі рознымі спосабамі, што разводзіць гэтыя тэксты "па розныя бакі барыкад". Абавязковай умовай любой улады з'яўляецца яе выражэнне ў мове, а палітыка — гэта кадыфікаваныя знакі, якія пры дапамозе акта выказвання разгортваюцца ў сацыяльна-семіятычны працэс — дыскурсію. Кожная ўлада стварае сваю маўленчую практыку, якая, паводле Ж. Ліятара, імкнецца сцвердзіць сябе ў якасці універсальнай, сапраўднай і справядлівай і тым самым падпарадкоўвае сабе іншыя маўленчыя практыкі [Современная западная философия, 1991, *158*]. Выкарыстоўваючы тэрміны гэтага накірунку, можна сказаць, што кожная ўлада гуляе ў сваю "моўную гульню"[1].

У гэтым артыкуле робіцца спроба кагнітыўнага аналізу дыскурса ў Беларусі 1920—1930-х гг., які ахоплівае: 1) вылучэнне прыёмаў уздзеяння, якія выкарыстоўваюць прадстаўнікі палітычных эліт; 2) аналіз прычын уздзеяння на адрасата — чалавека, які жыве ў Беларусі ў сацыяльным кантэксце 1920—1930-х гг., як асобных лінгвістычных адзінак, выкарыстаных у тэксце, так і цэлых фрагментаў тэксту; 3) вызначэнне прычын з'яўлення ў тэксце тых або іншых сродкаў уздзеяння (іх абумоўленасць асаблівасцямі свядомасці камуніканта, які стварае тэкст).

У якасці рабочай гіпотэзы мы прапануем наступныя дэфініцыі:

Пад ***тэкстам*** мы разумеем складаны моўны знак у адзінстве яго формы і зместу, значэння (прадметнага зместу) і значнасці (суб'ектнага зместу), працэсу і выніку. Разгляд паняцця "тэкст" у сферы "функцыя — рэпрэзентацыя — дзейнасць" дае напрамак каардынаты для развіцця паняцця "палітычны дыскурс" і яго вывучэння ў сінтэзаваным прачытанні. Такім чынам, мы разглядаем гэтае паняцце ў максімальна шырокім дыяпазоне.

Палітычны тэкст — гэта вербалізаваная палітычная дзейнасць ва ўсіх яе праявах: як знакавых, сімвалічных (намінатыўная і акумулятыўная дзейнасць), так і несімвалічных (тэксты-перфарматывы). Гэтае паняцце ахоплівае тэматычны аб'ём і стылявыя асаблівасці палітычнай актыўнасці грамадства, якая рэалізуецца ў мове.

Дыскурс — гэта (таксама як і тэкст) дзейнасць, феномен і функцыя адначасова. Але ў дыскурсе дзейнасць звужаецца да яе сацыяльна-арыентаваных маўленчых праяў. У сваю чаргу, пры разглядзе дыскурса ў якасці феномену, які "пакідае" дзейнасць, акцэнт робіцца на тым, што гэта феномен сацыяльна-арыентаванай маўленчай дзейнасці (сацыялагічны дакумент), які мы "чытаем" толькі з гэтых пазіцый. Нарэшце,

[1] Тэрмін належыць Л. Вітгенштэйну [Витгенштейн, 1985, *85*] і мае дачыненне да абазначэння цэласных і закончаных сістэм камунікацыі, якія падпарадкоўваюцца сваім унутраным правілам, парушэнне якіх выводзіць за межы канкрэтнай "гульні".

дыскурс калі і разглядаецца з пазіцый яго функцыянальнай нагрузкі, то толькі ў функцыі сацыяльнай арыентацыі і арганізацыі.

Палітычны дыскурс — гэта сукупнасць палітычных ***дыскурсій*** (сацыяльна-дыферэнцыраваных маўленчых практык) соцыума: дыскурса ўлады (*энкратычнага*), контрдыскурса (*акратычнага*), публічнай рыторыкі, якія або замацоўваюць стабільнасць пэўнай сістэмы грамадскіх узаемадачыненняў або дэстабілізуюць яе.

Прааналізаваныя намі дакументы і матэрыялы, якія раскрываюць працэсы ідэолага-палітычнай барацьбы і ўсталявання на Беларусі ідэалагічнага дыктату, ахопліваюць 1929—1931 гг. Гэты час вызначаўся савецкай афіцыйнай гістарыяграфіяй як "перыяд пачатку разгорнутага наступлення сацыялізму па ўсім фронце на аснове рэканструкцыі галін народнай гаспадаркі". Складнікамі гэтага працэсу былі барацьба з "нацыянал-дэмакратызмам" і ліквідацыя "апошняга эксплуататарскага класа" — заможнага сялянства. Сёння гэты перыяд кваліфікуецца як час спецыфічнага "пераварота" ў межах палітычнай сістэмы, своеасаблівая "рэвалюцыя зверху", якой спрыяла эканамічная сітуацыя ў краіне. "Вялікім пераломам" Савецкі Саюз вяртаўся да ваенна-камуністычных метадаў кіравання, згортвання дэмакратыі, што было апрабавана яшчэ ў часы грамадзянскай вайны.

Мы прапануем мадэль генеравання тэксту, у якой у адпаведных формах падаюцца веды індывідаў. Асноўную стратэгію аналізу тэкстаў пры рэканструкцыі працы свядомасці можна акрэсліць наступным чынам: "Форма і значэнне выказвання аналізуюцца ў тэрмінах ментальных станаў моўцы і слухача" [Виноград, 1983, *157*]. Аналізуючы дыскурс, мы павінны адказаць на два асноўныя пытанні: 1) чаму моўца гаворыць гэта? 2) чаму ён гаворыць гэта менавіта такім чынам? Адказ на другое пытанне звязаны з рыторыкай, што сведчыць аб тым, што два напрамкі даследавання — кагнітыўная навука і рыторыка — робяцца ўзаемазвязанымі, паколькі рытарычныя прыёмы вызначаюцца апрацоўкай адпаведных ведаў у свядомасці моўцы — ведаў пра слухача, пра камунікатыўную сітуацыю, пра агульнапрынятыя формы зносін (апошнія звесткі атрымліваюцца з папярэдняга маўленчага вопыту). Такім чынам, рыторыка як навука "аб атрыманні спосабаў прыцягнення да свайго пункту гледжання" (паводле Арыстоцеля) разглядаецца намі ў святле кагнітыўных працэсаў, што адбываюцца ў свядомасці адрасанта. Таму кагнітыўны аналіз як сродак мадэлявання працэсаў мыслення пры стварэнні тэксту мэтазгодна дапоўніць рытарычным.

Мэта нашага даследавання — прааналізаваць кагнітыўную прыроду беларускага палітычнага дыскурса 1920—1930-х гг. і этапы яго ўтва-

рэння на прадмет вызначэння прыёмаў маўленчага ўздзеяння ў дыскурсе партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, навукова-творчых работнікаў праз вытлумачэнне прычын уздзеяння і матывацыі выкарыстання гэтых прыёмаў.

На падставе гэтай мэты ставіліся і вырашаліся наступныя задачы:

1) прааналізаваць працэс генеравання палітычнага дыскурса ад зыходных структур да рытарычнага забеспячэння тэксту;

2) рэканструяваць ўнутраны свет свядомасці моўнай асобы, якая знаходзіцца як за энкратычным, так і за акратычным дыскурсам, вызначыўшы такія адзінкі апісання структур свядомасці, якія мелі б адпаведныя тэкставыя карэляты;

3) вызначыць сэнсавыя інварыянты парадыгм тэкстаў і, адпаведна, апісаць "грамадскую свядомасць" гэтага перыяду;

4) акрэсліць сувязі дыскурса 1920—1930-х гг. у рэчышчы ідэй і рытарычных сродкаў з дыскурсам наступных эпох.

Матэрыялам нашай работы сталіся дакументы ЦК, акругкомаў, шэрагу райкомаў і ячэек ЦК КП(б)Б: рашэнні з'ездаў, пленумаў, бюро, сакратарыятаў, дырэктыўныя ўказанні аддзелаў ЦК КП(б)Б, выступленні партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, навукова-творчых работнікаў, інфармацыйныя і іншыя паведамленні ДПУ БССР, станоўчыя і выкрывальныя артыкулы прэсы, матэрыялы разгляду "партыйных спраў", лісты ў партыйныя органы, заявы, змешчаныя ў зборніку [На крутым павароце, 1999]. Абраны для аналізу дыскурс бачыцца нам цікавым таму, што "кожнаму змяненню грамадскай свядомасці, кожнай ідэалагічнай варыяцыі адпавядае новая сістэма тэкстаў. У кожнай Рэвалюцыі свае прамоўцы" [Blancel, 1869, *9*]. На гэтых дакументах раскрываецца працэс нарастання агрэсіўнасці ў адносінах да нацыянал-дэмакратызму і яго праяў у партыі як да ідэйна-палітычнай плыні; паварот, з якога нацыянал-дэмакратызм сталі разглядаць як падпольную контррэвалюцыйную арганізацыю, а таксама барацьба з нацыянальнымі ўхіламі ў партыі.

Мы лічым, што гэты матэрыял дазваляе супаставіць дзве маўленчыя практыкі — дыскурсію ўлады (энкратычную) і контрдыскурсію (акратычную) — і вызначыць правілы, што абумовілі "моўную гульню" ўлады, а таксама тыя парушэнні правіл, якія робяць маўленчую практыку беларускага іншадумства савецкай эпохі ўжо іншай моўнай гульнёй, нягледзячы на тое, што 1920—1930-я гг. нельга назваць часам панавання ліберальных ідэй і ліберальнай ідэалогіі.

У адрозненне ад папярэдніх даследаванняў па лінгвістыцы, рыторыцы, неарыторыцы, тэорыі аргументацыі аналізуецца не столькі сам

аб'ект — палітычны тэкст, — колькі працэс яго генеравання ад інтэнцыі, што сталася стымулам да стварэння тэксту, да яе вербалізаванага ўвасаблення. Мы лічым патрэбным адзначаць не столькі працу інтэлекту, колькі працу свядомасці чалавека, таму што ў пералік кагнітыўных установак, якія ніколі не маюць дачынення ні да ведаў, ні да з'яў рацыянальнага кшталту, уключаюцца такія, як інтэнцыйнасць, мэтавызначэнне, якія тым не менш з'яўляюцца вартасцямі псіхікі і прымаюць удзел у стварэнні тэксту. На нашу думку, і іх можна апісаць як веды. Такім чынам, ствараецца магчымасць апісаць працу псіхікі, працэс тэкстаўтварэння і інварыянтныя сэнсавыя структуры, пакладзеныя ў аснову парадыгм тэкстаў (грамадскай свядомасці) у адных і тых жа тэрмінах.

Як ужо адзначалася, побач з тэрмінам "дыскурсія" для абазначэння сукупных маўленчых практык мы будзем карыстацца агульнапрынятым тэрмінам "дыскурс", разумеючы пад ім не толькі звязны тэкст, але і "складаную камунікатыўную з'яву, якая ўключае ў сябе і сацыяльны кантэкст, які стварае ўяўленне як пра ўдзельнікаў камунікацыі (падае іх характарыстыкі), так і пра працэсы стварэння і ўспрымання тэксту" [Ван Дейк, 1989, *13*]. Гэтае вызначэнне змяшчае адначасова ўказанне як на напрамак аналізу, так і ў пэўнай ступені на яго методыку, паколькі, у адрозненне ад папярэдніх прац, прысвечаных аналізу моўных аб'ектаў розных узроўняў (ад фанемы да тэксту), нашае даследаванне прысвячаецца таксама аналізу кагнітыўных працэсаў — г. зн. структуры працэсаў, якія адбываюцца ў свядомасці носьбіта мовы, які належыць да пэўнага напрамку грамадскай думкі, пры стварэнні ім тэксту, а таксама працэсам, якія абумоўліваюць разуменне тэксту і залежнасць яго ўспрымання ад абраных форм маўленчага ўздзеяння.

Навізна нашай гіпотэзы ў тым, што яна ўпершыню, грунтуючыся на канкрэтным дыскурсе, робіць спробу рэканструкцыі мысленчых працэсаў не ўвогуле, а ў дачыненні да канкрэтнай маўленчай сітуацыі. Вызначальнай рысай нашай мадэлі з'яўляецца тое, што мы прапануем мадэль генеравання не асобнага выказвання, а звязнага тэксту. Зыходны матэрыял для стварэння гіпотэзы аб тэкстаўтварэнні — сам тэкст. Наша задача ў гэтым выпадку — рэканструяваць мысленчыя працэсы, якія спрыяюць утварэнню тэкстаў, падобных адзін да другога аднолькавым ацэначным стаўленнем да адной і той жа падзеі і ў той жа час супрацьпастаўленых другой групе тэкстаў па іншых ацэначных стаўленнях да прадмета ацэнкі. Асабліва падкрэслім, што мы маем справу са з'явамі пісьмовага маўлення, пры падрыхтоўцы якога моўца мае магчымасць зрабіць падвойную рэфлексію — падумаць: 1) што ён скажа, чаму ён па-

вінен гэта сказаць; 2) чаму ён скажа гэта менавіта такім чынам. Ступень рэфлексіі можа быць рознай: у адных выпадках моўца сапраўды ўсведамляе, чаму ён робіць гэта менавіта такім чынам, у другіх — карыстаецца падрыхтаванымі клішэ, якія склаліся раней у падобных дыскурсах, аднак адрасант тым не менш усведамляе, што "так гавораць".

У нашай мадэлі сінтэзуюцца ідэі папярэдніх мадэлей ГМ [Леонтьев, Рябова, 1970; Кацнельсон, 1972; Хомский, 1972; Лурия, 1975; Прибрам, 1975; Арбиб, 1976; Выготский, 1982; Аполлонская, Глейбман, Маноли, 1987; Серебренников, 1988; МакКормак, 1990; Человеческий фактор в языке, 1991], і ў той жа час прапануецца прынцыпова іншая мадэль тэкстаўтварэння, у якой падрабязна распрацоўваецца стадыя фарміравання зместу, але адсутнічае падзел на перадмаўленчыя і маўленчыя этапы, таму што мысленчы змест на любой стадыі мае свой моўны карэлят.

Нашая мадэль грунтуецца на наступных тэзісах:

1) мысленчыя працэсы — гэта працэсы кіравання ведамі, пад час якіх нараджаецца новае мысленчае ўтварэнне, што дазваляе або самому суб'екту скласці ўласную карціну свету, або паўплываць на карціну свету адрасата. Пад карцінай свету мы разумеем уяўленне аб сувязі сутнасцей у навакольным свеце, аб іх іерархіі і вартаснай значнасці для суб'екта, які ўспрымае свет;

2) мысленчыя працэсы — не чыста інтэлектуальныя з'явы. У працэсе набыцця ведаў адбываецца ацэнка свету, якая выклікаецца адпаведнасцю/неадпаведнасцю навакольнага свету запытам, устаноўкам суб'екта і папярэднічае эмоцыям. З гэтага вынікае, што неабходным складнікам мысленчых працэсаў з'яўляецца эмацыянальна-ацэначны кампанент, або прагматычны аператар у тэрмінах папярэдніх схем ГМ;

3) асноўнымі адзінкамі, у межах якіх структуруюцца веды, з'яўляюцца фрэйм і сцэнар.

Пры аналізе тэкстаўтварэння мы шырока выкарыстоўваем паняцце "фрэйм", зыходзячы з таго, што мысленне — гэта карыстанне ведамі. Структура ведаў, пазначаная тэрмінам "фрэйм", дазваляе суаднесці з ім самыя розныя прадукты чалавечага мыслення, якія можна называць парознаму ("ідэі", "паняцці", "канцэпты"). Яны — пэўныя веды чалавека аб рэчаіснасці, яе склад ніках і перспектывах.

Прапанаваная намі мадэль ГМ палітычнага дыскурса можа выкарыстоўвацца як мадэль аналізу тэксту ў накірунку, адваротным працэсу тэкстаўтварэння, — ад рытарычна аформленага тэксту да падставовых ідэй, пакладзеных у яго генераванне.

Наша задача — вызначыць апазіцыі, пакладзеныя ў аснову тэксту,

лінгвістычныя паняцці, звязаныя з пэўнымі кагнітыўнымі з'явамі, супастаўляць зыходныя апазіцыі, пакладзеныя ў аснову дыскурса розных грамадскіх накірункаў. Што дазваляе вызначыць асаблівасці і мыслення аўтара тэксту, і вербалізацыі пэўных ідэй у пэўны перыяд.

Энкратычны дыскурс звычайна грунтуецца на апалогіі пэўных ідэй, паняццяў, пакладзеных у падмурак уладнай стратэгіі і супрацьпастаўленых іншым ідэям. Адпаведная грамадская з'ява, ролю якой з пункту гледжання сацыяльнага заказу трэба кваліфікаваць, вызначыўшы яе грамадскую значнасць, робіцца стымулам, які актывізуе ў свядомасці моўнай асобы пэўнага тыпу некаторую вартасную сетку, што складаецца прынамсі з адной апазіцыі, прынятай у сацыяльным асяроддзі. З пункту гледжання актывізаваных кагнітыўных структур, апазіцыі ўяўляюць фрэймы — веды пра абагульненыя (не дэталізаваныя) сітуацыі і стэрэатыпныя іх уяўленні. Так, фрэйм, звязаны з апазіцыяй *роўнасць — няроўнасць* можа ўключаць: 1) працэдуральныя веды аб тым, як паводзяць сябе людзі ў грамадстве, заснаваным на прынцыпах роўнасці; 2) дэкларатыўныя — аб тым, што можа існаваць сітуацыя, супраць пастаўленая сітуацыі роўнасці; 3) эмацыянальна-ацэначныя характарыстыкі сітуацыі, згодна з якімі роўнасць ацэньваецца станоўча, а няроўнасць адмоўна.

Актывізаваны фрэйм складаецца з двух субфрэймаў: структур ведаў аб тых з'явах, якія выключаюць адна другую. Мы лічым слушным казаць пра антытэзу субфрэймаў у межах адзінага складанага апазітыўнага фрэйма. Кожнае з імёнаў-членаў апазіцыі называе адпаведную структуру ведаў, якая можа пазначацца і тэрмінам "фрэйм". Але гэтая структура ведаў аб з'явах існуе настолькі, наколькі існуе іншая структура ведаў — аб антыз'яве. Так, *роўнасць* мае на мэце існаванне *няроўнасці*, *гуманізм — антыгуманнасці* і г. д. Адна структура адлюстроўвае наяўнасць другой, яны непарыўна спалучаюцца. Таму мы лічым патрэбным адзначаць ролю такіх структур, як субфрэймы ў межах апазітыўнага фрэйма.

Апазітыўны фрэйм існуе ў свядомасці ў выглядзе цэласнага ўяўлення — гештальта, моўным карэлятам ён мае парадыгматычна звязаныя словы — антанімічны рад, які можа з'яўляцца і намінатыўнай адзінкай — словазлучэнні тыпу *роўнасць і няроўнасць* (злучнік *і* мае супастаўляльнае значэнне). Гэта сведчыць аб тым, што на першым этапе ГМ спрацоўвае намінатыўны кампанент. На першым жа этапе падключаецца і прагматычны аператар (ацэначны кампанент), таму што фрэйм уключае, як мы ўжо адзначалі, веды суб'екта аб тым, добрай ці дрэннай лічыць пэўную з'яву, з прычыны чаго намінацыя кожнага з членаў пары

ўключае ў свой семны склад канататыўную ацэначную сему +/–. Нашае даследаванне грунтуецца на тым, што палітычны тэкст з'яўляецца рэалізацыяй адной або некалькіх бінарных вартасных апазіцый, прыкладзеных да пэўнай з'явы. Адмысловасць нашай мадэлі тэкстаўтварэння заключаецца ў тым, што першую стадыю (цыкл) працэсу ГМ можна лічыць адначасова і пэўным узроўнем існавання самога тэксту.

Прапанаваныя намі ў выглядзе базы першага ўзроўню тэкстаўтварэння апазіцыі свядомасці (напрыклад, *індывідуалізм — калектывізм, камунізм — капіталізм* і г. д.) якраз і прыдаюцца да вызначэння першасных тэкстаў-прымітываў як вербалізацыя пэўнай цэласнасці, якая падлягае дэталізацыі ў тэксце, як неразгорнутае "кадаванне" цэласнага ў сэнсавых адносінах фрагменту тэксту. Такім чынам, на першым этапе ГМ адбываецца актывізацыя апазітыўнага фрэйма як структурнай арганізацыі пэўнага фрагменту ведаў, якая моўным карэлятам можа абраць антанімічны рад слоў або злучальнае словазлучэнне з супастаўляльным значэннем. Гэтая моўная адзінка, якая прымае ўдзел у ГМ, набывае і камунікатыўную значнасць: яна робіцца найбольш агульным абазначэннем семантыкі тэксту (першым узроўнем), затым падлягае перыфразаванню. Такім чынам, тэкст-прымітыў пачынае набываць сваё месца як у працэсе ГМ, так і ў структуры палітычнага (у нашым выпадку) тэксту.

Працэдура, на падставе якой вылучаецца ў тэксце пэўная апазіцыя, у самым агульным выглядзе грунтуецца на тым, што "ступень істотнасці пэўнай сутнасці карэлюе з колькасцю яе згадванняў у... маўленні. На гэтым прынцыпе ў сацыялогіі заснавана тэхніка кантэнт-аналізу, з дапамогай якога вызначаецца частата тэматычных элементаў тэксту. Пры гэтым павінен дасягацца максімальна магчымы ўзровень абстракцыі, на якім павярхоўныя тэмы зводзяцца з адной глыбіннай, варыянтамі якой яны з'яўляюцца, дзеля чаго неабходны не толькі кампанентны аналіз лексічных значэнняў, але і сістэма лагічнай высновы з прыцягненнем экстралінгвістычных ведаў" [Кобозева, 1990, *87*]. Пра наяўнасць у тэксце апазіцыі мы гаворым тады, калі ў ім даволі часта сустракаюцца намінацыі супрацьлеглых паняццяў (пра іх супрацьлегласць мы мяркуем не толькі па кампанентнай структуры значэнняў, — напрыклад, у пары *патрыятызм — антыпатрыятызм* супрацьлегласць выражаецца самім элементам значэння, які да таго ж мае і спецыфікаваную марфему *анты-*. Апазіцыя можа мець і канвенцыянальны характар: супрацьлегласць значэнняў мы вызначаем з ведання таго, што ў пэўным соцыуме не варта супрацьпастаўляць, напрыклад: *капіталізм — камунізм*).

Існаванне другаснага тэксту-прымітыва аргументуецца ў нашай мадэлі спецыфікай наступнага ўзроўню тэкстаўтварэння. Мы лічым, што другім этапам (узроўнем), на якім адбываецца тэкстаўтварэнне, з'яўляецца рэпрэзентацыя паняццевых апазіцый праз так званыя канцэптуальныя, або падставовыя, метафары. Ідэя канцэптуальных метафар, якія вызначаюць успрыняцце рэчаіснасці, мысленне і паводзіны, належыць Дж. Лакофу і М. Джонсану. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што наша рэчаіснасць дыктуецца нашай паняццевай сістэмай, якая з'яўляецца метафарычнай — пра гэта сведчыць наша мова. "Наша будзённая паняццевая сістэма, на мове якой мы думаем і дзейнічаем, наскрозь метафарычная... Метафары могуць ствараць для нас рэаліі, асабліва сацыяльныя рэаліі... Метафара можа стаць арыенцірам для наступнага дзеяння" [Лакофф, Джонсон, 1987, *145*]. Ідэя канцэптуальных метафар заключаецца ў тым, што значная частка сацыяльнай рэальнасці асэнсоўваецца ў метафарычных тэрмінах, агульных для ўсіх членаў соцыума. З гэтых метафар вылучаюцца высновы, якія акрэсліваюць пэўныя бакі нашага вопыту, вызначаюць як маўленчыя, так і немаўленчыя паводзіны. Так, з базавай метафары *спрэчка — гэта вайна*, якую характарызуе Дж. Лакоф, вынікае погляд на апанента як на ворага, у той час як у магчымай культуры, дзе спрэчка трактуецца ў тэрмінах танца, людзі, на думку Лакофа, па-іншаму разглядалі б спрэчкі — як эстэтычна прывабную гульню [Лакофф, Джонсон, 1987, *128*]. "Вельмі важна мець на ўвазе, што мы не проста вядзем гаворку аб спрэчках у тэрмінах вайны. Мы можам рэальна перамагаць або прайграваць у спрэчцы. Асоба, з якой мы спрачаемся, успрымаецца намі як вораг. Мы атакуем яго пазіцыі і абараняем уласныя... Мы плануем нашыя дзеянні і выкарыстоўваем пэўную стратэгію... Шмат з таго, што мы рэальна робім у спрэчках, часткова асэнсоўваецца ў паняццевых тэрмінах вайны. У спрэчцы няма фізічнага спаборніцтва, але адбываецца бойка слоў, а гэта адбіваецца на структуры спрэчкі: атака, абарона, контратака і г. д. Менавіта ў гэтым сэнсе метафара *спрэчка — гэта вайна* належыць да тых метафар, якімі мы «жывём» у нашай культуры: яны могуць упарадкаваць тыя дзеянні, якія мы прадпрымаем у спрэчцы" [Лакофф, Джонсон, 1990, *388*].

У кагнітыўных структурах чалавека як грамадскай істоты, якая склалася шмат у чым пад уплывам успрынятых ім раней дыскурсаў, існуе пэўная канцэптуалізацыя свету — напрыклад, *Радзіма — гэта маці*, — якая рэгулюе яго ўчынкі. Чалавек можа не ўсведамляць установак, якія "жывуць" у ім, менавіта ў вербальнай форме — яны існуюць у доўгачасовай памяці ў выглядзе пэўнага вобраза, адчування, гештальта. Але ў момант актывізацыі стымулам, які трапляе звонку, гэтыя ўстаноў-

кі рэалізуюцца як у дыскурсе суб'екта, так і ў яго немаўленчых паводзінах. Паколькі мы прызналі зыходным пунктам нашага даследавання тэзіс аб антытэтычнасці, бінарнасці свядомасці, наступным момантам нашых разважанняў будзе прызнанне таго, што гэтыя апазіцыі ідэй робяцца апасродкаванымі ў свядомасці кагнітыўнымі ўстаноўкамі, якія рэгулююць дзейнасць суб'екта згодна са зместам пазітыўнага элемента апазіцыі або, наадварот, вызначаюць дзейнасць па ліквідацыі негатыўнай вартасці, пазначанай другім членам апазіцыі. Гэтыя кагнітыўныя ўстаноўкі, якія маюць (згодна з ідэямі Лакофа і Джонсана) метафарычную форму, складаюць другі ўзровень палітычнага тэксту — мінідыскурс, або другасны тэкст-прымітыў.

Чаму бінарныя апазіцыі, перш чым разгарнуцца ў тэкст, павінны, на наш погляд, прайсці праз этап апасродкавання падставовымі, або канцэптуальнымі, метафарамі? У палітычных тэкстах бінарную апазіцыю складаюць ідэі — даволі абстрактныя паняцці, якія павінны "матэрыялізавацца", перакласціся на мову больш вядомых паняццяў, што і робіць метафара. Яшчэ І. Кант лічыў, што немагчыма надаць нагляднасць ідэям розуму, але можна надаць ім сімвалічную нагляднасць [Кант, 1965, *374*]. Як піша К.К. Жоль, "паводле Канта, кожны чалавек заўсёды імкнецца інтэрпрэтаваць абстрактнае ў тэрмінах пачуццёвага вопыту, дапасуючы трансцэндэнтнае да свайго жыццёвага вопыту..." [Жоль, 1984, *127*].

Наколькі канцэптуальныя метафары вызначаюць спосаб бачання і ўспрыняцця свету, настолькі можна ўявіць, што дыскурс пэўнага грамадскага напрамку будзе разгортвацца праз канцэптуальныя метафары, якія адрозніваюцца ад канцэптуальных метафар контрдыскурсіі.

Такім чынам, у адзначаных выпадках метафарычную форму набывае такая кагнітыўная адзінка, як сцэнар. Значыць, працэс тэкстаўтварэння ідэе наступным чынам:

• у рэчышчы карыстання ведамі як структурай — ад фрэйма да яго дэталізацыі праз сцэнар;

• у рэчышчы канкрэтнага зместавага напаўнення гэтых структур — ад апазіцыі да метафары;

• у рэчышчы моўных карэлятаў — ад намінатыўнай адзінкі да прапазітыўнай;

• у рэчышчы арганізацыі тэксту — ад першаснага тэксту-прымітыва да другаснага больш разгорнутага тэксту-прымітыва.

Першым чыннікам, які прадвызначае выбар моўных сродкаў, з'яўляецца дзеянне такой кагнітыўнай структуры, як сцэнар. Ён мае ў дыскурсе моўны карэлят — метафару. Адзначаючы асаблівасці метафары,

хацелася б падкрэсліць, што яна разумеецца намі шырока. Мы прытрымліваемся не традыцыйнай тэорыі метафары, якая разглядае апошнюю толькі як моўны сродак, як вынік замены слоў або кантэкставых зрухаў, "у той час як у падмурак метафары пакладзена ўзаемадзеянне ідэй. Метафарычнай з'яўляецца сама думка, яна набывае развіццё праз параўнанне, і адсюль у мове ўзнікаюць метафары" [Ричардс, 1990, *47*].

Другім чыннікам, які вызначае "і выбар жанра, і выбар кампазіцыйных сродкаў, і нарэшце выбар моўных сродкаў" [Бахтин, 1986, *29*] з'яўляецца чыннік адрасата, або Іншага, або слухача. Сучасная гуманітарыстыка адчувае значны ўплыў ідэй М. Бахціна, які выразіў думку аб ролі Іншага ў стварэнні тэксту такім чынам: "Падзея жыцця тэксту, яго сапраўдная сутнасць, заўсёды адбываецца на мяжы дзвюх свядомасцей, двух суб'ектаў" [Бахтин, 1986, *301*].

У палітычным дыскурсе магчымыя камбінацыі ўстановак і інтэнцый моўцы. Яны залежаць ад ступені падабенства поглядаў адрасанта і аўдыторыі. Моўца можа быць згодным з аўдыторыяй (або меркаваць, што гэта так) і, абапіраючыся на агульныя з ёй вартасныя ўстаноўкі, супрацьстаяць Іншаму. У гэтым выпадку ў тэксце можна адзначыць наяўнасць больш за аднаго Іншага. Гэтае падзяленне адрасата асабліва выразна адчуваецца тады, калі моўца жадае даказаць штосьці апаненту і разам з тым жадае атрымаць падтрымку і ўхваленне аўдыторыі ў дачыненні да таго, як выражаюцца іх агульныя вартасныя ўстаноўкі. Моўца можа разыходзіцца са сваім непасрэдным адрасатам — аўдыторыяй — у ацэнцы пэўнага рэферэнта. У такім выпадку пафас моўцы — гэта пафас чыстай палемікі.

Такім чынам, тэкстаўтварэнне вызначаецца дамінуючай інтэнцыяй адрасанта — да якога адрасата ён апелюе: таго, які знаходзіцца з ім у стане канфлікту або згоды ў дачыненні да вартасных установак. І выражэнне канфлікту, і выражэнне згоды маюць пэўныя формы, залежныя ад маўленчага вопыту соцыума. Яны рэалізуюцца праз пэўныя рытарычныя прыёмы, характэрныя для рытарычнай практыкі пэўнага напрамку грамадскай думкі.

З гэтага вынікае, што тэкстаўтварэнне ў значанай ступені дыктуецца ўсім сацыяльным кантэкстам зносін, узаемадачыненнямі паміж моўцам і Іншым. Увесь працэс пераходу ад узроўню свядомасці, на якім актывізуецца сцэнар, які мае моўны карэлят — метафару, да ўзроўню непасрэднага дыскурсіўнага забеспячэння гэтага сцэнара, ёсць працэс рытарычны, у якім моўца выбірае сродкі, здольныя зрабіць уплыў на адрасата з пункту гледжання рэалізацыі інтэнцыі. Інтэнцыі ў палітычным дыскурсе можна звесці да трох тыпаў:

1) выражэнне згоды з уладай;
2) выражэнне нязгоды з уладай;
3) апрацоўка свядомасці рэцыпіента ў адпаведным накірунку.

Пры ўмове наяўнасці агульных вартасных установак з рэцыпіентам інтэнцыя заключаецца ва ўмацаванні пачуцця "дакладнасці" гэтых установак, пры адчуванні адрознення — у ліквідацыі канфлікту паміж установамі шляхам іх абмеркавання. Стымулам, што выклікае пэўныя інтэнцыі, з'яўляецца феномен, які набывае грамадскую значнасць.

Нашай зыходнай гіпотэзай з'яўляецца тое, што згода або нязгода з пэўнай грамадскай падзеяй дыктуецца вартаснымі апазіцыямі ідэй і канцэптуальнымі метафарамі, якія могуць супадаць або не супадаць у свядомасці членаў соцыума (моўцы і іншага). Мы зыходзім з таго, што паколькі палітычны дыскурс — гэта рэалізацыя сацыяльна і ідэалагічна арыентаванай інтэнцыі (выклад ідэй і пэўнае ўзаемадзеянне з соцыумам), то практычна ўсе элементы такога тэксту рэалізуюць функцыю сацыяльнага ўзаемадзеяння і ідэалагічнай апрацоўкі рэцыпіента. Таму ў такім тэксце ўсе элементы маюць і рытарычную значнасць. Адсюль элакуцыя (як трэці этап рытарычнага дзеяння) у нашай схеме разумеецца не як "упрыгожванне" тэксту з пункту гледжання надання яму выразнасці, а як выкарыстанне сродкаў, спрыяльных для рэалізацыі інтэнцыі, у выніку чаго ствараецца цэласны дыскурс. Інвенцыя пры гэтым звязваецца з першымі двума этапамі тэкстаўтварэння і суадносіцца перш за ўсё з падставовай метафарай, таму што ўвесь тэкст з'яўляецца, з аднаго боку, яе перыфразай, а з другога, зводзіцца таксама да яе (другасны тэкст-прымітыў). Дыспазіцыя вызначаецца грамадскай традыцыяй размеркавання сацыяльна і ідэалагічна значных элементаў тэксту. Такім чынам, можна лічыць, што нашая мадэль тэксту (першасны тэкст-прымітыў, другасны тэкст-прымітыў, тэкст), якая адначасова з'яўляецца схемай тэкстаўтварэння (бінарныя апазіцыі (фрэйм) — канцэптуальная метафара (сцэнар) — дыскурсіўнае забеспячэнне перыфразы метафары) і суадносіцца з традыцыйнай рытарычнай схемай, адначасова адлюстроўвае большую ўзаемасувязь розных узроўняў і дазваляе сапраўды паказаць, як адбываецца тэкстаўтварэнне — "трансфармацыя ідэі ў слова". У выпадку аналізу дзвюх супрацьлеглых па вартасных установах дыскурсіўных практык адрозненне гэтых практык паўстае больш структураваным (паколькі аналізуецца на кожным узроўні).

Рытарычны аналіз тэксту пры такім падыходзе суадносіцца з кагнітыўным: рытарычны аналіз даследуе прычыны і характар уздзеяння элементаў тэксту на рэцыпіента — аналізуецца працэс успрынящця; кагнітыўны — абумоўленасць пэўных прыёмаў уздзеяння асаблівасцямі

свядомасці моўцы — тут даследуецца працэс тэкстаўтварэння. Рытарычная сістэма разумеецца намі як сукупнасць прыёмаў ідэалагічнага ўздзеяння, абумоўленых асаблівасцямі свядомасці камунікантаў. Рыторыка ў гэтым сэнсе спалучаецца з кагнітыўнай лінгвістыкай і сацыяльнай псіхалогіяй. З другога боку, кагнітыўна-рытарычны аналіз не толькі дазваляе вызначыць карэляцыю паміж інтэнцыямі мноства салідарных у чымсьці моўцаў, але і асэнсаваць эпоху, суадносіць індывідуальнае і агульнае, матывы асобы і грамадскія ўстаноўкі. Тут рыторыка пэўным чынам судакранаецца з філасофіяй.

Як мы ўжо адзначалі, прапанаваная мадэль тэкстаўтварэння як пэўнага алгарытма дзейнасці дазволіла спалучыць праблемы кагнітыўнай псіхалогіі, тэорыі тэкстаўтварэння, моўнай асобы, сэнсавай інварыянтнасці тэкстаў, грамадскай свядомасці. Таму і структуры свядомасці, і ўзроўні працэсу генеравання маўлення, і сэнсавая структура тэксту могуць характарызавацца ў межах адной сістэмы тэрмінаў, якія знаходзяцца ў пэўных стасунках:

Структуры ведаў	Фрэймы	Сцэнары	Ролі
стварэнне палітычнага тэксту	вартасныя апазіцыі ідэй	метафары	вынікі
узроўні генеравання маўлення	намінатыўны	прапазіцыйны	рытарычны
семантычныя ўзроўні тэксту	першасны тэкст-прымітыў	другасны тэкст-прымітыў	тэкст
узроўні моўнай асобы	прагматыкон, тэзаўрус	тэзаўрус	граматыкон
сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі асобы	веды, уласная мадэль, мадэль суразмоўцы	мэты	

Акрэслім вынікі, атрыманыя намі пры аналізе палітычных дыскурсаў, праз структуру падставовай (абагуленай) для кожнага з дыскурсаў моўнай асобы з улікам прыведзеных суадносін.

Мы абралі структуру моўнай асобы ў якасці рэпрэзентатыўнай адзінкі, таму што менавіта ў ёй спалучаюцца лінгвістычны і псіхалагічны аспекты тэкстаўтварэння.

Прагматыкон моўнай асобы энкратычнага дыскурса падаецца праз 2 вартасныя апазіцыі ідэй: **нацыяналізм (–) — інтэрнацыяналізм (+)**, **калектывізм (+) — індывідуалізм (–)**. У тэрмінах гэтых вартасных апазіцый моўная асоба дыскурса ўлады ўяўляе сябе як інтэрнацыяналіста і калектывіста, а Іншага — як нацыяналіста і індывідуаліста. Тэ-

заўрус гэтай моўнай асобы, які адлюстроўвае яе светабачанне, прадстаўлены наступнымі падставовымі метафарамі: **свет (БССР) — фронт барацьбы паміж нацыяналізмам і інтэрнацыяналізмам, калектывізм — норма жыцця**.

У карціне свету (яе спрошчанай мадэлі), якая складаецца са сцэнараў і вынікаў, свет паўстае арэнай барацьбы дзвюх сіл, дзе перадавыя сілы прадстаўлены прыхільнікамі савецкай улады, а перамога сацыялізму з'яўляецца непазбежнай, таму прагрэсіўныя сілы поўняцца аптымізмам. З рэалізацыяй першай апазіцыі звязана адна асаблівасць: часы найвышэйшых каштоўнасцей — мінулае, падзеі Кастрычніцкай (1917 г.) рэвалюцыі, стварэнне БССР (1919 г.) і ўмацаванне савецкай улады ў Беларусі, калі праяўляліся найлепшыя якасці чалавека, і будучыня — перамога сацыялізму. Арыентацыя каштоўнасцей на мінулае і будучыню ў дыскурсе ўлады практычна супадае з дыскурсам сучаснай эпохі, які скіроўвае Рэспубліку Беларусь або ў мінулае (перыяд з 1917 па 1991 г.), або ва ўтапічна створаную перспектыву. Можна сказаць, што, нягледзячы на адчуванне прынцыповага адрознення паміж тагачаснай і сучаснай Беларуссю, уяўленне пра час ажыццяўлення ідэалаў застаецца нязменным: тое, што будзе заўтра, ужо было ўчора. У гэтай карціне свету любы пабочны назіральнік, які не ўдзельнічае ў барацьбе двух лагераў, варты асуджэння, як і той, хто з'яўляецца носьбітам настрояў тугі і песімізму, паколькі гэта не супадае з адчуваннем гістарычнай перспектывы, а значыць можа быць звязана з недаверам да яе. Індывід з'яўляецца моцным і вартым увагі толькі тады, калі ён дзейнічае супольна з калектывам людзей; агульная справа патрабуе бязлітаснасці ў дачыненні да яе ворагаў. Ворагамі ж з'яўляюцца тыя, хто спрабуе ўсумніцца ў перамозе і неаспрэчнасці "агульнай ідэі".

Мэты, вылучаныя намі з тэкставага разгортвання адпаведных сцэнараў, можна апісаць наступным чынам: трэба весці непрымірымую барацьбу з усім, што перашкаджае супольнай справе (як з асобамі, так, напрыклад, і з мастацкімі творамі), трэба ўслаўляць Радзіму і словамі, і справамі, знішчаць яе ворагаў, згуртавацца ў імя дасягнення блізкай мэты. Фрэймы-апазіцыі і сцэнары-метафары атрымліваюць адпаведнае тэкставае забеспячэнне, вынікам чаго робіцца функцыянаванне дыскурса.

У працэсе тэкстаўтварэння адбываецца ўзаемаперасячэнне апазіцый, калі адзін фрагмент тэксту можа тлумачыцца дзеяннем другой апазіцыі: **нацыяналізм — інтэрнацыяналізм** паглынае **калектывізм — індывідуалізм** і наадварот. Да асаблівасцей граматыкона моўнай асобы энкратычнага дыскурса, звязаным з першымі двума ўзроўнямі, нале-

жаць: наяўнасць мілітарызаваных метафар і імёнаў, звязаных з ваеннай тэмай (напрыклад, *"вораг"*, *"шпіён"*, *"фашыст"*, *"здраднік"*), выкарыстанне займенніка *"наш"* у якасным значэнні; выкарыстанне зборных назоўнікаў і назоўнікаў множнага ліку, якія рэферуюць да ўсяго класа, пабудова тэксту, пры якой *"я"* моўцы замяняецца на *"мы"*, якое абазначае "ўсіх людзей".

У рэчышчы рытарычных прыёмаў мы вылучылі *рытарычныя элементы* — сінтаксічна аформленыя структуры, якія сустракаюцца ў большасці тэкстаў грамадскага накірунку і пэўным чынам рэалізуюць інтэнцыю моўцы. У дачыненні да дыскурса ўлады мы адзначалі наяўнасць дыскурса-стымула, які пачынае кампанію, прадвызначае тон і зыходзіць непасрэдна ад людзей, упаўнаважаных уладай, і дыскурса-рэакцыі. У энкратычным дыскурсе мы вылучылі рытарычныя элементы-перакананні, якія пабуджаюць рэцыпіента катэгарызаваць рэчаіснасць у пэўным ракурсе. У дыскурсе-рэакцыі, які належыць непасрэдным спажыўцам дыскурса ўлады, мы вылучылі рытарычныя элементы-пацвярджэнні, якія адлюстроўваюць фрагменты энкратычнага дыскурса і такім чынам сігналізуюць аб ухваленні яе пазіцый. Зробленыя намі высновы адносна зместу ўзроўняў моўнай асобы ўлады карэлююць з характарыстыкай грамадскай свядомасці, дадзенай Мерабам Мамардашвілі: "Вось два ўстойлівыя кампаненты нашай свядомасці. Па-першае, ніколі *асобна* (г. зн. на ўласную рызыку — і адказнасць), але заўсёды толькі *разам*. І другое: ніколі не сёння, а заўсёды толькі заўтра" [Мамардашвили, 1992, *137*]. З гэтага вынікае, што думкі філосафаў і лінгвістаў могуць супадаць, а філасофскі аналіз, пацверджаны лінгвістычным, набывае, на нашу думку, магчымасць верыфікацыі сваіх высноў.

Адсутнасць у прагматыконе моўнай асобы акратычнага дыскурса названых апазіцый ідэй (нацыяналізм — інтэрнацыяналізм, калектывізм — індывідуалізм) можа сведчыць аб тым, што моўная асоба дыскурса іншадумства або пагаджаецца з існаваннем гэтых супрацьпастаўленняў (*"Адным з асноўных звенняў, якім змыкаўся нацыянал-апартуніст з нацыянал-дэмакратам, было буржуазна-кулацкае, контррэвалюцыйнае «адраджэнства», сканцэнтраванае ў свае часы каля «Нашай Нівы»"* (з публічнай заявы У.М. Ігнатоўскага 12 снежня 1930 г.)), або не лічыць патрэбным канфрантаваць па іх з прычыны надзвычайнай укарэненасці адпаведнай пазіцыі. Мы прытрымліваемся першага пункту гледжання, паколькі на яго карысць і той факт, што і ў пазнейшыя часы пэўная частка беларускага дысідэнцтва не ўхваляла "празмерны нацыяналізм".

Моўная асоба акратычнага дыскурса на падставе прааналізаваных

тэкстаў уяўляе сябе як і моўная асоба дыскурса ўлады — як антышавініста і калектывіста, але, у адрозненне ад папярэдняй, устрымліваецца ад абвінавачанняў на адрас Іншага — як шавініста і індывідуаліста.

Тэзаўрус моўнай асобы контрдыскурса пазбаўлены падставовых метафар. Спрошчаная мадэль свету, якая рэканструюецца ў дыскурсіі, выглядае наступным чынам: краіна ўпэўнена будуе сацыялізм, на яе шляху могуць узнікаць перашкоды ў гэтым будаўніцтве, але іх сапраўдная прычына — "памылкі" некаторых грамадзян, якія можна лёгка выправіць, паколькі яны не з'яўляюцца фатальнымі. Мэты моўнай асобы іншадумства заключаюцца ў тым, каб дапамагчы дзяржаве пазбавіцца гэтых памылак, а таксама *"отмежеваться от провокационной тактики, навязанной нам представителями ОГПУ в нашей среде"* (з дадатка 2 да ліста ў ЦКК ВКП(б) і рэдакцыю газеты "Правда" рабочых Гальперына, Гольмана і Шульмана, 5 чэрвеня 1929 г.).

Моўнае забеспячэнне тэксту характарызуецца: 1) адсутнасцю усіх тых з'яў, якія маюцца ў дыскурсе ўлады; 2) неспалучэннем "я" з абагуленым суб'ектам.

Паміж моўнымі асобамі дыскурса ўлады і контрдыскурса назіраецца прынцыповая розніца ў характары мысленчых працэсаў: для асобы энкратычнага дыскурса ўласціва метанімічная замена часткай пэўнага цэлага, якая адлюстроўваецца ў самых розных сферах як маўленчых, так і немаўленчых паводзін: погляд на крытыку асобных недахопаў як на крытыку цэлага, магчымая падмена "Я" дзяржаўных інстытутаў, ад імя якіх гэтае "Я" спрабуе гаварыць; моўная асоба контрдыскурса настойвае на размежаванні гэтых з'яў — часткі і цэлага.

Кагнітыўны канфлікт, які зрабіўся прычынай грамадскіх канфліктаў, меў семіятычны характар — суправаджаўся розным тлумачэннем азначальных у адных і тых жа слоўных азначаючых ("інтэрнацыяналізм", "калектывізм").

У цэлым, калі гаварыць пра тое, наколькі новым (для свайго часу) з'яўляецца тэкст іншадумства, то варта, верагодна, прызнаць адсутнасць яго сапраўднай навізны з пункту гледжання пакладзеных у яго аснову ідэй. Іншадумства дэманструе сваю прыхільнасць законам БССР, не пагаджаючыся толькі з парушэннем гэтых законаў і грамадскіх установак і нормаў. Дыскурс іншадумства грунтуецца на пераразмеркаванні значнасці пэўных ідэй.

Нам даволі цяжка назваць больш-менш вядомы і аўтарытэтны ў любых грамадскіх колах тэкст, у якім бы меліся інавацыі самі па сабе, а таксама іх сацыяльныя, псіхалагічныя, культурныя або экзістэнцыйныя наступствы. І ў энкратычным, і ў акратычным дыскурсе катэгарызацыя

рэчаіснасці, кваліфікацыя з'яў і ўчынкаў адбываюцца ў рэчышчы традыцыі — дзейнічае механізм аналогіі: "Звычайна большасць сітуацый, з якімі сутыкаюцца людзі ў пэўным грамадстве, дэфінуюцца або структуруюцца імі адным і тым жа чынам. З улікам папярэдняй інтэракцыі яны развіваюць або набываюць агульнае разуменне або азначэнне таго, як трэба дзейнічаць ў той або іншай сітуацыі" [Блумер, 1984, *177*], — гэтае выказванне цалкам падыходзіць да маўленчых і немаўленчых паводзін моўных асоб абодвух дыскурсаў. Розніца паміж імі — у перайманні розных дыскурсіўных традыцый. Беларускае іншадумства ў большай ступені грунтуецца на традыцыях "нашаніўства", улада — на створаных ёю ж самой рэвалюцыйнай традыцыі і практыцы.

Мы прааналізавалі два тыпы моўных асоб, якія стваралі дзве розныя парадыгмы тэкстаў. На падставе гэтага аналізу можна меркаваць пра дваістую карціну свету, якая характарызуе стан свядомасці беларускага грамадства перыяду 1920—1930-х гг.

ЛІТАРАТУРА

Апполонская Т.А., Глейбман Е.В., Маноли И.З. Порождающие и распознающие механизмы функциональной грамматики. Кишинев, 1987.

Арбиб М. Метафорический мозг. М., 1976.

Бахтин М.М. Литературно-критические статьи. М., 1986.

Блумер Г. Общество как символическая интеракция // Современная зарубежная социальная психология. М., 1984.

Виноград Т. К процессуальному пониманию семантики // Новое в зарубежной лингвистике. М., 1983. Вып. 12.

Выготский Л.С. Мышление и речь // Собр. соч.: В 2 т. М., 1982. Т.2.

Дейк ван Т.А. Язык. Познание. Коммуникация. М., 1989.

Кацнельсон С.Д. Типология языка и речевое мышление. Л., 1972.

Лакофф Д., Джонсон М. Метафоры, которыми мы живем // Язык и моделирование социального взаимодействия. М., 1987.

Леонтьев А.А, Рябова Т.В. Фазовая структура речевого аспекта и природа пла нов // Планы и модели будущего в речи. Тбилиси, 1970.

Лурия А.Р. Основные проблемы нейролингвистики. М., 1975.

МакКормак Э. Когнитивная теория метафоры // Теория метафоры. М., 1990.

На крутым павароце: Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929—1931 гг. Мн., 1999.

Прибрам К. Языки мозга. М., 1975.

Ричардс А. Философия риторики // Теория метафоры. М., 1990.

Серебренников Б.А. Роль человеческого фактора в языке. М., 1988.

Современная западная философия. Словарь. М., 1991.

Хомский Н. Язык и мышление. М., 1972.

Человеческий фактор в языке. Язык и порождение речи. М., 1991.

Blancel F. D. Les revolutions de la parole. P., 1869.

І.Р. Шкраба

РОЛЯ МІЖМОЎНЫХ СУВЯЗЕЙ У ЛІНГВАДЫДАКТЫЦЫ

Улік фактару міжмоўных сувязей патрабуе дакладна прадуманай лінгвістычнай накіраванасці задачы навучання, якая дыктуецца агульнасцю лексічных, граматычных і стылістычных з'яў роднай мовы і мовы навучання. У варунках сучаснай сітуацыі беларуска-рускага двухмоўя нароўні з апрабаванымі прынцыпамі методыкі навучання рускай мове беларусаў выкладчыку адкрываецца шырокае поле эўрыстычнай дзейнасці для выпрацоўкі і прымянення прыватных метадычных прыёмаў, абаснаваных псіхалагічна, дыдактычна і стылістычна. Лінгвадыдактычная база мэтанакіраванага паглыблення зместу навучання істотна залежыць ад ступені роднаснай блізкасці беларускай і рускай мовы.

Для беларускамоўных навучэнцаў блізкасць асноўнага слоўнікавага фонду і граматычнай асновы роднай і рускай мовы выступае спрыяльным фактарам такой ступені авалодання вывучаемай мовай, якая нараджае каардынатыўнае двухмоўе. Лінгвістычная сітуацыя на Беларусі сведчыць аб сталым этапе развіцця білінгвізму, а адхіленні на любым узроўні рускага маўлення маюць нерэгулярны характар і часта не з'яўляюцца камунікатыўна значнымі.

Аднак у блізкароднасным моўным асяроддзі непазбежна пачынаюць адчувацца вынікі неўсвядомленага або свядомага накладання адной моўнай сістэмы на другую. Паводле меркавання Ю.А. Шмялёва, "парадокс моўнага ўзаемадзеяння заключаецца якраз у тым, што чым часцей у кантактных мовах інтэрферэнцыя выклікае станоўчыя вынікі (супадзенне элементаў дзвюх кантактных моў), тым трывалей замацоўваюцца адмоўныя вынікі інтэрферэнцыі (праяўленне ў адной з моў не сумяшчальных з яе нормамі элементаў іншай мовы)" [Шмелёв, 1986, *78*].

На фанетычным і лексіка-граматычным узроўнях прыкметы інтэрферэнцыі апісаны дастаткова поўна. Аднак камунікатыўная, канструктыўная і экспрэсіўная функцыі мовы набываюць вагу і адпаведнасць толькі ў тым выпадку, калі выпрацавана ўменне папярэджваць і стылістычную інтэрферэнцыю. Улічваючы мадэрнізацыю зместу і структуры лінгвістычных курсаў у адпаведнасці з адчувальнай тэндэнцыяй да гуманістычнага абнаўлення, пераходу ад граматыкі сказа да функцыянальна-камунікатыўнай граматыкі тэксту, павышэння ўвагі да нацыянальна-культурнай спецыфікі, эстэтычнага боку мовы, каштоўнасці слова як элемента мастацкага цэлага, трэба фарсіраваць параўнальна-

супастаўляльнае апісанне з'яў беларускай і рускай моў у функцыянальна-стылістычным аспекце.

Гэта задача можа быць паспяхова вырашана пры паралельным фарміраванні здольнасці рэалізаваць моўную норму і камунікатыўныя магчымасці моўных адзінак у канкрэтнай маўленчай сітуацыі, а значыць пры ўмове прыцягнення стылістычнай праблематыкі. Для феномена блізкароднаснага білінгвізму ўскладняльным момантам выступае тая акалічнасць, што анталогія экспрэсіўна-эмацыянальных сродкаў, а таксама спосабы іх перадачы ў розных мовах могуць не супадаць. Да таго ж, фактары, што вызначаюць тыпалагічнае падабенства або адрозненне нарматыўна-стылістычных сістэм, цесна звязаны са своеасаблівасцю культуры і гістарычных шляхоў саміх народаў. На жаль, супастаўляльнае апісанне стылістычных рэсурсаў беларускай і рускай моў, якое б мела сістэмны характар, яшчэ чакае даследчыкаў і гаварыць пра навуковую методыку, заснаваную на стылістычных разыходжаннях узаемадзейных моў, не даводзіцца. На сённяшнім этапе можна толькі вызначыць кола тых відавочных адрозных з'яў, улік якіх у практыцы выкладання рускай мовы ў беларускай аўдыторыі ўяўляецца абавязковым ці прынамсі плённым, і ахарактарызаваць тыпалагічнае моўнае падабенства і адрозненне, якія могуць спрыяць навучанню або замарудзіць яго.

Храналагічныя межы самога паняцця "сучасная літаратурная мова" розныя ў дачыненні да нацыянальнай мовы беларусаў і рускіх. Адлучэнне ад дзяржаўна-грамадскага ўжывання, існаванне на працягу амаль двух стагоддзяў у форме вусных бытавых зносін, адраджэнне ў якасці літаратурна-пісьмовай мовы цалкам на базе народных гаворак абумовілі адрозны ад рускай мовы склад функцый і сфер дачынення беларускай мовы, характар узаемаадносін паміж літаратурнай і нелітаратурнымі формамі, а таксама глыбіню функцыянальна-стылістычнай дыферэнцыяцыі варыянтных і сінанімічных сродкаў.

Гэта праяўляецца, у прыватнасці, у коле з'яў, абумоўленых рухомасцю межаў паміж катэгорыямі, што характарызуюць розныя функцыянальныя разнавіднасці беларускага і рускага маўлення. Так, даследчыкамі заўважана, што працэсы дэтэрміналагізацыі спецыяльных абазначэнняў і ўключэння іх у аб'ём агульнаўжывальнай лексікі значна шырэй адлюстраваны ў рускай мове, чым у беларускай. Па-другое, адсутнасць або абмежаванае ўжыванне некаторых прафесіяналізмаў выключае ў беларускай мове з прычыны экстралінгвістычнага характару ўласцівую рускай мове міжвідавую аманімію ў выніку карэліравання прафесіяналізмаў з літаратурнымі адпаведнікамі.

Характар ўзаемадачыненняў літаратурнай і дыялектнай разнавід-

насцей беларускай мовы вызначаецца ўсё яшчэ істотным уплывам жывой размоўнай стыхіі на лексіка-нарматыўную сістэму. Кожнае новае лексікаграфічнае выданне кадыфікаванага характару шляхам змянення стылістычных памет сведчыць пра актуальнасць перамяшчэння часткі дыялектнай лексікі ў сферу літаратурнага ўжывання. У працах рускіх даследчыкаў канстатуецца паступовае аслабленне фактару дыялектнага ўздзеяння на лексічны фонд. У сувязі з гэтай акалічнасцю варта адзначыць, што жыватворная база дыялектнага маўлення на працягу перыяду не толькі станаўлення, але і актыўнага развіцця беларускай мовы абумовіла большую прастору для дзеяння пераважна дыспазітыўных, рэкамендацыйных нормаў. Так напрыклад, стан сучаснага узуса прымушае прызнаць нарматыўнымі беларускія варыянты тыпу *капот — капота, зажор — зажора, бярлог — бярлога, мазут — мазута*. У рускай жа мове варыянты *капота, берлог, мазута* замацавалі статус нелітаратурных. Пры распрацоўцы дыдактычных заданняў трэба мець на ўвазе, а пры магчымасці і прадэманстраваць навучэнцам, што варыянтнасць лексем структурнага характару ў колькасных адносінах больш выражана ў беларускай мове, чым у рускай з яе працяглай традыцыяй нарматыўнага ўдасканалення.

Што да глыбіні функцыянальна-стылістычнай дыферэнцыяцыі сінанімічных радоў, то адрозненне стылістычнай афарбаванасці суадносных слоў беларускай і рускай мовы пераважна звязана з праблемай прастамоўя ў беларусістыцы. Гэта стылістычная катэгорыя недастаткова выразна акрэслена і ў тлумачальным слоўніку беларускай мовы як абавязковая атрыбуцыя адсутнічае. Такім чынам, у рубрыку "разм." у беларускай мове ўключаецца значна больш шырокі пласт лексікі, адпаведна дыферэнцыраваны як "разг." і "просторечн." у рускай мове.

Калі прааналізаваць адхіленне ад агульналітаратурнай нормы, найбольш характэрнае для беларускага носьбіта рускага маўлення ў стылістычных адносінах, можна заўважыць, што найбольш часта праяўляюцца недагляды, абумоўленыя міжмоўнай інтэрферэнцыяй, калі стылістычныя навыкі роднай мовы экстрапалююцца ў сферу рускага маўлення.

Фармальнае супадзенне беларуска-рускіх лексічных адпаведнасцей здольна правакаваць моўцу на неўсвядомленае атаясамліванне іх стылістычнай маркіраванасці. Уяўляючы ступень яе недапушчальнасці, а ў некаторых выпадках і дапушчальнасці з нарматыўнага пункту погляду, выкладчык мае магчымасць прэзентаваць лінгвістычы матэрыял, найбольш дзейсны ў дыдактычных мэтах. Звярнуўшыся да такіх карэляцый, як *прыватны — приватный, смачны — смачный, хлопчык —*

хлопчик, здаецца — сдаётся, сцежка — стёжка, хворы — хворый, араты — оратай, можна выявіць іх прыналежнасць да нейтральнай лексікі ў беларускай мове і стылістычна зніжанай або ўзвышанай — у рускай. Падобныя выпадкі патрабуюць узмоцненай увагі, ігнараванне ж адрозненняў стылістычнага плана стварае падставы для праяўлення лексіка-стылістычнай інтэрферэнцыі і непазбежна прыводзіць да зм ешвання сфер ужывання і парушэння стылістычнай раўнавагі ў маўленчым адрэзку.

Разыходжаннем у лексіка-стылістычных парадыгмах тлумачацца і памылкі ўжывання дэрыватаў агульнага для супастаўляльных моў словаўтваральнага тыпу пры адсутнасці іх стылістычнага паралелізму. Так, суфікс *-к-* у спалучэнні з асновай імені ўласнага ў беларускай мове становіцца носьбітам адценння памяншальнасці (Верка, Федзька, Іванка), у той час як у рускіх антрапонімах ён асацыіруецца з адценнямі пагарджальнасці і фамільярнасці. Менавіта разыходжаннем у межах стылістычных "рэгістраў" тлумачыцца недакладнае сітуацыйнае ўжыванне такіх назоўнікаў у рускім маўленні білінгваў. Яўна чужародным у нейтральнай фразе "Их дом совсем обветшал" успрымаецца займеннік *ихний*, які ў беларускай мове пазбаўлены стылістычнай афарбоўкі і ў падобным кантэксце дарэчны.

Назіранні над маўленчай практыкай навучэнцаў дае падставы гаварыць і пра марфолага-стылістычную інтэрферэнцыю. Элятыўныя формы рускіх прыметнікаў з суфіксамі *-ейш-, -айш-* тыпу *актуальнейшая проблема, важнейшее событие, мудрейший философ*, акрамя значэння гранічнай ступені праяўлення якасці, надзелены і кніжнай стылістычнай афарбаванасцю, якая ў адпаведных беларускіх формах са значэннем параўнання якасці пазбаўлена якой-небудзь канатацыі.

Стылістычная канатацыя можа ўскладняцца характэрнай для пэўнай мовы этнаканатацыяй і этнаэматыўнасцю: *папараць (кветка) — папоротник, шыпшына — шиповник, васілёк — василёк, жаба (царэўна-жаба) — жаба* і інш. Асэнсаванне гэтага прагматычнага кампанента лексічнай семантыкі мае самастойнае значэнне, таму што адкрывае магчымасць засваення маўленчага досведу іншакультуры ў цэлым. У лінгвадыдактычным плане важна выпрацаваць моўнае адчуванне кантэкстуальных абмежаванняў або забаронаў такіх змястоўна падтэкставых лексем, асабліва з адмоўнымі канатацыямі.

Уяўляе цікавасць і супастаўленне сінанімікі залежных прыназоўнікавых форм назоўнікаў, якія побач з семантычнымі і граматычнымі фактарамі вызначаюцца і стылістычнымі. Неаднароднасць стылістычнай афарбоўкі семантычна эквівалентных дзеяслоўных спалучэнняў тыпу

паведаміць пад сакрэтам — сообщить под секретом, пайсці па ягады — пойти по ягоды, забыцца пра хваробу — забыть про болезнь, падабраць пад свой рост — подобрать под свой рост не можа адчуваць навучэнцамі, што застаюцца на інтуітыўна-пераймальным узроўні валодання моваў. У гэтым выпадку камунікатыўная задача можа быць вырашана паспяхова пры ўсвядомленым падыходзе да аналізу суадносных фактаў дзвюх моў.

Моўны узус часта выяўляе адрозненне ў намінацыі паняццяў блізкароднасных моў, якія могуць быць нацыянальна пазначаны і невытлумачальныя з пункту погляду моўнай камунікацыі. Пры наяўнасці ўсіх кампанентаў, неабходных для мадэлявання паняццяў у беларускай і рускай мовах, лексічны склад іх розны, як напрыклад, у выразах *быть в ладоши — пляскаць у далоні, растить детей — гадаваць дзяцей, чёрная баня — курная лазня, принимать участие — браць удзел, начинает морозить — бярэцца на мароз, домашние животные — свойскія жывёлы* і інш. Фактары ідыяматычнасці вывучаемай мовы, а таксама матэрыяльнае яе ўвасабленне павінны ўлічвацца ў працэсе фарміравання культурна-маўленчай кампетэнцыі.

Такім чынам, паняцце функцыянальнай, стылістычнай нормы можа выпрацоўвацца не толькі на фактах рускага маўлення, але і ў практыцы развіцця навыкаў супастаўляльнага стылістычнага аналізу суадносных і розных з'яў у блізкароднасных мовах. Стылістычная інтуіцыя "выражаецца ва ўменні прадуктыўна, мінаючы лагічныя аперацыі, рашаць (у вусным або пісьмовым маўленні), што адпавядае або выступае як чужое да маўленчых нормаў" [Чижова, 1987, *36*], і дазваляе не толькі разумець, але і пісьменна рэпрадуцыраваць рускае маўленне ў любой з яе стылістычных разнавіднасцей.

Сістэматызацыя з'яў міжмоўнай інтэрферэнцыі дазволіць узбагаціць методыку эфектыўнымі арталагічнымі рэкамендацыямі і ўзброіць спецыялістаў у галіне лінгвадыдактыкі практычным матэрыялам, які паспрыяе ўдасканаленню выкладання.

Асновы навучання мове ва ўмовах білінгвізму павінны распрацоўвацца з улікам сацыялінгвістычнай спецыфікі яе функцыянавання і характару ўзаемадзеяння мовы навучання і роднай мовы ў святле нарматыўных патрабаванняў сістэмы і узуса.

ЛІТАРАТУРА

Чижова Т.И. Основы методики обучения стилистике в средней школе. М., 1987.

Шмелев Ю.А. Некоторые особенности русской речи учащихся Белоруссии с точки зрения лексического состава // Русский язык в школе, 1986. № 3.

С.М. Якуба

НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АЦЭНКІ НАВУЧАЛЬНЫХ ПІСЬМОВЫХ РАБОТ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Згодна з патрабаваннямі праграм і стандартаў, распрацаваных пад кіраўніцтвам доктара педагагічных навук прафесара В.У. Протчанкі, навучанне беларускай мове ў школе накіравана на забеспячэнне пазнавальнай культуры вучняў, развіццё іх моўных і інтэлектуальных здольнасцей; выпрацоўку агульнаадукацыйных уменняў і навыкаў, практычнае валоданне беларускай мовай і звесткамі пра яе; засваенне культуры паводзін і суразмоўніцтва ў бытавой, вучэбнай, афіцыйна-дзелавой і сацыякультурнай сферах; усведамленне ведаў пра культуру, гісторыю, традыцыі беларускага народа і падпарадкавана канчатковай мэце — фарміраванню духоўнай, высокаморальнай, нацыянальна свядомай моўнай асобы [Агульная сярэдняя адукацыя, 1999, *3—24*]. Паспяховаму вырашэнню пастаўленых задач у практыцы навучання мове на аснове асобаснага, матывацыйна-мэтавага падыходу, пры якім у цэнтры ўвагі — вучань як асоба, як суб'ект навучання, як актыўны ўдзельнік вучэбна-выхаваўчага працэсу, які валодае мовай ва ўсіх сферах маўленчай дзейнасці, садзейнічае сістэматычны кантроль за ўзроўнем ведаў, уменняў і навыкаў школьнікаў. Метадычна правільна арганізаваны кантроль дазваляе актывізаваць пазнавальныя і інтэлектуальныя магчымасці вучняў, засяродзіцца на сістэматычнай працы па фарміраванні ведаў, уменняў і навыкаў, дапамагае настаўніку адкарэкціраваць вучэбна-выхаваўчы працэс, зарыентаваны на выхаванне і развіццё асобы, і звярнуць увагу на дыферэнцаваны падыход пры навучанні беларускай мове.

Школьная практыка паказвае, што неабходнасць удасканалення сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў вызначаецца роляй аб'ектыўнай ацэнкі як стымулюючага фактару пры навучанні мове. Адзнака — гэта не толькі паказчык паспяховасці школьніка, гэта яшчэ і ацэнка ўсёй яго вучэбнай працы, таму пяцібальная шкала ацэнкі ўзроўню падрыхтаванасці вучня па беларускай мове перадавым педагогам уяўляецца вельмі цеснай і вымушае іх карэкціраваць, удакладняць існуючыя нормы. Думаецца, што для стымулявання вучэбна-выхаваўчага працэсу і аб'ектыўнага адлюстравання паспяховасці вучняў мэтазгодна выкарыстаць дзесяцібальную сістэму ацэнкі іх ведаў, уменняў і навыкаў. У артыкуле прапануюцца нормы 10-бальнай ацэнкі навучальных пісьмовых работ па беларускай мове. Прапанаваная сістэма ацэнкі праходзіць апрабацыю ў эксперыментальных школах Беларусі.

Ацэнка навучальных пісьмовых работ

Сфарміраваць трывалыя моўныя, маўленчыя і правапісныя ўменні і навыкі вучняў па беларускай мове дапамагаюць разнастайныя віды практыкаванняў. З улікам 1) узроўню самастойнасці вучня пры выкананні задання; 2) этапа навучання (этап знаёмства з моўнай з'явай; першыя ўрокі замацавання матэрыялу; абагульняльна-паўтаральныя ўрокі; пашырэнне і паглыбленне ведаў пры вывучэнні іншых раздзелаў курса; урокі абагульнення і сістэматызацыі ў канцы навучальнага года); 3) аб'ёму работы; 4) акуратнасці афармлення пісьмовай работы; 5) ступені складанасці задання; 6) індывідуальных магчымасцей вучняў да такіх работ прад'яўляюцца больш высокія патрабаванні, чым да кантрольных прац.

Ацэнка практыкаванняў, якія фарміруюць моўныя ўменні вучняў. Моўныя ўменні вучняў у першую чаргу фарміруюцца пры выкананні школьнікамі разумовых дзеянняў з вывучаемым моўным матэрыялам. Дзеянні па яго распазнаванні спрыяюць фарміраванню распазнавальных моўных уменняў, дзеянні па групоўцы — класіфікацыйных моўных уменняў, па выяўленні ўсіх прымет моўнай з'явы — аналітычных уменняў. Кожнае з названых уменняў фарміруюць адпаведныя практыкаванні: апазнавальныя, класіфікацыйныя, аналітычныя. Ацэнка выканання гэтых практычных работ можа быць наступнай:

"2" (0 балаў) — ставіцца, калі заданне не выканана ці пры выкананні практыкавання вучань можа назваць толькі асобныя моўныя факты і адрознівае моўную з'яву, пададзеную настаўнікам у гатовым выглядзе, не разумее практычнага прызначэння тэарэтычных ведаў, слаба ўсведамляе неабходнасць гэтых ведаў пры выкананні практычных заданняў, з дапамогай настаўніка выконвае менш за 1/4 моўнага разбору, дапускаючы пры гэтым шэраг памылак, якія не можа выправіць у выніку дадатковых пытанняў.

"3–" (1—2 балы) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практычных задач не валодае большай часткай тэарэтычнага матэрыялу, абмяжоўваецца недакладным узнаўленнем азначэння паняцця, не можа падмацаваць свае меркаванні прыкладамі, з дапамогай настаўніка выконвае больш за 1/4 моўнага разбору, з цяжкасцю спраўляецца з нескладаным практыкаваннем рэпрадуктыўнага характару, але не прыкладае намаганняў у дасягненні пастаўленай мэты.

"3" (3 балы) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практычнай работы дэманструе неглыбокія веды і неразуменне некаторых лінгвістычных тэрмінаў, з дапамогай настаўніка выяўляе моўную з'яву ў тэксце, але не размяжоўвае моўныя адзінкі па асноўных прыметах, не

ўмее растлумачыць нескладаныя моўныя з'явы і праілюстраваць іх прыкладамі, з дапамогай настаўніка правільна выконвае менш за палову моўнага разбору, здольны выканаць практыкаванні толькі рэпрадуктыўнага плана.

"3+" (4 балы) — ставіцца, калі вучань у працэсе выканання практыкавання паказвае разуменне галоўнага ў правяраемым матэрыяле, самастойна выяўляе моўную з'яву ў тэксце, але слаба арыентуецца ў агульных асновах групоўкі моўных адзінак, пры размежаванні моўных з'яў дапускае памылковыя рашэнні, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў настаўніка, не здольны праілюстраваць моўныя факты дарэчнымі прыкладамі, з дапамогай настаўніка выконвае палову моўнага разбору, не ўмее творча прымяняць веды на практыцы.

"4–" (5 балаў) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практычнай работы паказвае веданне і разуменне асноўных палажэнняў тэмы, самастойна і асэнсавана выяўляе моўную адзінку ў тэксце, але няпоўна адлюстроўвае прыметы пры яе характарыстыцы, з цяжкасцю вызначае аснову групоўкі моўных з'яў, не ўмее дастаткова доказна абгрунтаваць свае разважанні, праілюстраваць іх адпаведнымі прыкладамі па ўзоры, правільна выконвае менш за 3/4 моўнага разбору, не ўмее творча прымяніць веды.

"4" (6 балаў) — ставіцца, калі вучань у працэсе выканання практыкавання паказвае дастаткова поўнае разуменне вывучанага матэрыялу, але дапускае памылкі пры характарыстыцы моўнай з'явы, якія выпраўляе пасля заўвагі настаўніка, пры падборы прыкладаў па ўзоры прыводзіць адзінкавыя няправільныя рашэнні, самастойна і правільна выконвае 3/4 моўнага разбору, з нязначнай дапамогай настаўніка прымяняе веды ў нестандартнай практычнай сітуацыі.

"4+" (7 балаў) — ставіцца, калі вучань дастаткова поўна валодае тэарэтычным матэрыялам і дарэчна карыстаецца лінгвістычнымі тэрмінамі пры характарыстыцы моўнай з'явы, самастойна выяўляе яе ў тэксце, абгрунтоўвае прыналежнасць да пэўнага разраду, падбірае аднатыпныя ўласныя прыклады, пры размеркаванні моўных адзінак па групах дапускае недакладнасці, самастойна і правільна выконвае больш за 3/4 моўнага разбору, праяўляе імкненне да творчага прымянення ведаў на практыцы.

"5–" (8 балаў) — ставіцца, калі вучань у высокай ступені валодае тэарэтычным матэрыялам, дарэчна аперыруе моўнымі паняццямі ў знаёмай і незнаёмай сітуацыі, самастойна выяўляе ў тэксце вывучаемую моўную з'яву, доказна абгрунтоўвае яе прыналежнасць да пэўнага разраду, размяркоўвае моўныя адзінкі па групах, падмацоўваючы выканан-

не тэарэтычнымі выкладкамі, поўнасцю самастойна выконвае аналітычныя практыкаванні, падбірае разнастайныя доказныя прыклады, дапускае 1—2 нягрубыя памылкі, якія выпраўляе самастойна, праяўляе здольнасці да творчага прымянення ведаў.

"5" (9 балаў) — ставіцца, калі вучань свабодна аперыруе тэарэтычным матэрыялам і моўнымі паняццямі ў незнаёмай сітуацыі, самастойна выяўляе ў тэксце вывучаемую моўную з'яву, доказна абгрунтоўвае яе прыналежнасць да пэўнага разраду, устанаўліваючы міжузроўневыя сувязі, вызначае асновы групоўкі моўных з'яў, размяркоўвае моўныя адзінкі па групах, падбірае выразныя, дарэчныя ўласныя прыклады, поўнасцю, без памылак выконвае розныя віды моўных разбораў, творча прымяняе веды ў нестандартнай практычнай сітуацыі.

"5+" (10 балаў) — ставіцца, калі вучань свабодна аперыруе праграмным вучэбным матэрыялам рознай ступені складанасці, умее звязна і аператыўна трансфармаваць атрыманыя веды для рашэння праблем у нестандартных сітуацыях; праяўляе мэтанакіраванасць, адказнасць, пазнавальную актыўнасць, творча ставіцца да навучання.

Ацэнка практыкаванняў, якія фарміруюць правапісныя (арфаграфічныя і пунктуацыйныя) ўменні і навыкі вучняў (ТС "пунктуацыйныя ўменні і навыкі вучняў"). Практыкаванні такога тыпу змяшчаюць заданні на вызначэнне ў словах і сказах арфаграм і пунктаграм, абгрунтаванне іх напісання, выяўленне ў словах і сказах арфаграфічных і пунктуацыйных памылак і іх выпраўленне. Гэта могуць быць заданні на ўскладненае спісванне тэксту, а таксама разнастайныя дыктоўкі.

"2" (0 балаў) — ставіцца, калі вучань не выканаў задання ці ў працэсе яго выканання адрознівае арфаграму і пунктуацыйна-сэнсавы фрагмент толькі пры прад'яўленні іх настаўнікам у гатовым выглядзе, слаба ўсведамляе неабходнасць тэарэтычных ведаў у час выканання практычных работ, механічна піша арфаграмы і ставіць знакі прыпынку, з дапамогай настаўніка можа правільна выканаць менш за 1/4 рэпрадуктыўнага практыкавання, характарызуецца несфарміраванасцю арфаграфічнай і пунктуацыйнай пільнасці.

"3–" (1–2 балы) — ставіцца, калі вучань пры вырашэнні практычных задач абмяжоўваецца недакладным азначэннем арфаграмы і пунктаграмы, не можа з дапамогай настаўніка выявіць іх у словах і сказах, здольны правільна выканаць 1/4 рэпрадуктыўнага практыкавання, характарызуецца невысокай матывацыяй навучання.

"3" (3 балы) — ставіцца, калі вучань паказвае неглыбокія веды пры вызначэнні арфаграм і пунктуацыйна-сэнсавых фрагментаў, з дапамогай настаўніка выконвае менш за палову задання, дапускае памылкі,

якія не можа выправіць самастойна, не захоўвае правілы каліграфіі і акуратнага пісьма, тлумачыць напісанне слоў ці пастаноўку знакаў прыпынку з дапамогай настаўніка, не здольны карыстацца алгарытмам напісання слоў і пастаноўкі знакаў прыпынку, не ўмее прымяніць веды ў нестандартнай моўнай сітуацыі.

"3+" (4 балы) — ставіцца, калі вучань валодае тэарэтычнымі звесткамі пра арфаграму і пунктаграму, самастойна вызначае арфаграму ў слове і пунктуацыйна-сэнсавы фрагмент у сказе, з дапамогай настаўніка правільна выконвае палову задання, дапускаючы памылкі, апіскі і выпраўленні пры пісьмовым афармленні, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; карыстаецца алгарытмам напісання арфаграм і пунктаграм, спрабуе абгрунтаваць напісанне, але не ўмее творча прымяніць веды на практыцы; праяўляе цікавасць да вучобы, самастойнасць у дасягненні мэты.

"4–" (5 балаў) — ставіцца, калі вучань разумее асноўны тэарэтычны матэрыял, аднак не заўсёды паслядоўна выдзяляе арфаграмы і пунктаграмы, самастойна і правільна выконвае 3/4 задання, дапускаючы 2—3 памылкі ў пісьмовым афармленні працы, з дапамогай настаўніка выконвае практыкаванні на прымяненне алгарытму, не ўмее дастаткова доказна абгрунтаваць свае практычныя дзеянні, растлумачыць некаторыя арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі, прымяніць веды ў нестандартнай моўнай сітуацыі.

"4" (6 балаў) — ставіцца, калі вучань дастаткова свядома аперыруе тэарэтычным матэрыялам пры вызначэнні арфаграм і пунктаграм па аналогіі, але дапускае некаторыя недакладнасці, якія выпраўляе без дапамогі настаўніка, самастойна і правільна выконвае 3/4 задання, акуратна афармляе пісьмовае маўленне, дапускае 1—2 памылкі ў працэсе прымянення алгарытму напісання арфаграм і пунктаграм, якую выпраўляе з дапамогай настаўніка, дастаткова лагічна абгрунтоўвае свае дзеянні ў час выканання задання.

"4+" (7 балаў) — ставіцца, калі вучань свядома аперыруе тэарэтычным матэрыялам у знаёмай сітуацыі пры вызначэнні арфаграм ў словах і пунктуацыйна-сэнсавых фрагментаў у сказах і тэкстах, самастойна і правільна выконвае больш за 3/4 задання, у адпаведнасці з правіламі каліграфіі афармляе пісьмовае маўленне, дапускае недакладнасць у час прымянення алгарытму да напісання арфаграм і пунктаграм, якую самастойна выпраўляе, у асноўным лагічна і поўна абгрунтоўвае свае дзеянні ў працэсе выканання задання, пры прымяненні ведаў у незнаёмай сітуацыі дапускае нязначныя памылкі, праяўляе імкненне да творчага пераносу ведаў.

“5–” (8 балаў) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практычнага задання свядома аперыруе тэарэтычным матэрыялам у знаёмай і незнаёмай сітуацыі, самастойна і правільна выконвае прапанаваны аб’ём задання, захоўваючы арфаграфічныя і пунктуацыйныя нормы, акуратнасць і каліграфічную правільнасць пісьма, у час прымянення ведаў на практыцы вучань дапускае 1—2 нягрубыя памылкі, якія выпраўляе самастойна, лагічна абгрунтоўвае правільнасць выбару арфаграмы і пастаноўкі знакаў прыпынку, умее рэдагаваць тэксты, творча прымяняць веды ў нестандартнай сітуацыі, праяўляе добрасумленнасць, здольны адэкватна ацаніць свае веды.

“5” (9 балаў) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практычнага задання свабодна аперыруе вучэбным матэрыялам у незнаёмай сітуацыі, правільна вызначае ў словах арфаграмы і пунктуацыйна-сэнсавыя фрагменты ў сказах і тэксце, самастойна і без памылак выконвае прапанаваны аб’ём задання, захоўваючы арфаграфічныя і пунктуацыйныя нормы маўлення, прытрымліваючыся акуратнага афармлення і каліграфічнай правільнасці пісьма, выяўляе арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі і выпраўляе іх, лагічна і поўна абгрунтоўвае правільнасць напісання, здольны да прымянення ведаў у нестандартнай практычнай сітуацыі.

“5+” (10 балаў) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практычных заданняў рознай ступені складанасці свабодна і асэнсавана аперыруе вучэбным матэрыялам, захоўваючы арфаграфічныя і пунктуацыйныя нормы маўлення, лагічна і поўна абгрунтоўваючы правільнасць напісання, умее аператыўна прымяніць веды ў нестандартнай моўнай сітуацыі, творча ставіцца да навучання, характарызуецца мэтанакіраванасцю, адказнасцю, пазнавальнай актыўнасцю.

Ацэнка практыкаванняў, якія фарміруюць маўленчыя ўменні і навыкі вучняў. Маўленчым практыкаванням, якія фарміруюць уменні школьнікаў, звязаныя з работай над перадачай аўтарскага тэксту ці стварэннем уласнага, папярэднічаюць падрыхтоўчыя маўленчыя практыкаванні (некамунікатыўныя), пры выкананні якіх развіваюцца лексічныя, слова- і формаўтваральныя, сінтаксічныя, стылістычныя і іншыя ўменні вучняў. Ацэнка маўленчых практыкаванняў, якія фарміруюць у школьнікаў уменні працаваць з тэкстам, можа быць наступнай:

“2” (0 балаў) — ставіцца, калі вучань не выканаў ці з дапамогай настаўніка выканаў менш за 1/4 задання, слаба ўсведамляе неабходнасць тэарэтычных ведаў пры выкананні практыкавання, дэманструе нізкую сфарміраванасць маўленчых уменняў, пры афармленні выказвання дапускае шматлікія грубыя памылкі, якія не можа выправіць пасля дадатковых пытанняў настаўніка.

"3–" (1–2 балы) — ставіцца, калі вучань пры вырашэнні практычных задач абмяжоўваецца недакладным узнаўленнем правіла, з дапамогай настаўніка выконвае 1/4 задання, дэманструе недастатковую сфарміраванасць уменняў у форма- і словаўтварэнні, канструяванні словазлучэнняў і сказаў розных тыпаў, адборы моўных сродкаў, можа абгрунтаваць толькі некаторыя ўласныя практычныя дзеянні, пры афармленні выказвання дапускае грубыя памылкі, не здольны да творчага прымянення ведаў, характарызуецца невысокай матывацыяй навучання.

"3" (3 балы) — ставіцца, калі вучань пры выкананні практыкавання паказвае неглыбокія веды, з дапамогай настаўніка выконвае менш за палову задання, можа абгрунтаваць толькі некаторыя свае дзеянні пры ўтварэнні формы слова, пабудове і пашырэнні словазлучэнняў і сказаў, выбары слова ў адпаведнасці з яго лексіка-стылістычным значэннем, маўленне школьніка характарызуецца аднатыпнасцю сінтаксічных канструкцый, парушэннем нормаў словаўжывання, наяўнасцю істотных памылак, якія вучань не можа выправіць з дапамогай настаўніка.

"3+" (4 балы) — ставіцца, калі вучань з дапамогай настаўніка выконвае палову задання, дапускае памылкі (пры формаўтварэнні, канструяванні слоў, словазлучэнняў і сказаў, выбары лексічных сродкаў і інш.), якія можа выправіць пасля дадатковых пытанняў настаўніка, маўленне характарызуецца аднатыпнасцю канструкцый, наяўнасцю памылак, якія вучань выпраўляе пасля дадатковых пытанняў, прыкладае намаганні ў дасягненні вучэбнай мэты.

"4–" (5 балаў) — ставіцца, калі з дапамогай настаўніка вучань выконвае 3/4 задання, яго практычная дзейнасць характарызуецца невысокай ступенню сфарміраванасці лексіка-стылістычных і граматычных уменняў, ён не ўмее дастаткова доказна абгрунтаваць свае дзеянні ў працэсе выканання задання, пры афармленні пісьмовага маўлення дапускае нягрубыя памылкі, не здольны да творчага прымянення ведаў.

"4" (6 балаў) — ставіцца, калі вучань самастойна і правільна выконвае больш за 3/4 задання па аналогіі, у дастатковай ступені валодае граматычнымі і лексіка-стылістычнымі нормамі пісьмовага маўлення, лагічна абгрунтоўвае свае дзеянні ў працэсе выканання задання з нязначнай дапамогай педагога, пры пісьмовым афармленні маўлення дапускае нягрубыя памылкі, не ўмее творча прымяніць веды.

"4+" (7 балаў) — ставіцца, калі вучань самастойна і правільна выконвае заданні рознай ступені складанасці, пры гэтым у асноўным валодае нормамі словаўтварэння і формаўтварэння, спалучальнасці слоў у словазлучэннях і сказах, выкарыстання ў маўленні лексічных сродкаў, дастаткова доказна абгрунтоўвае свае практычныя дзеянні, маўленне ха-

рактарызуецца разнастайнасцю сінтаксічных канструкцый, дакладнасцю словаўжывання, але ў працэсе яго афармлення вучань дапускае адзінкавыя нягрубыя памылкі; імкнецца да творчага пераносу ведаў, з адказнасцю і самакрытычна ставіцца да вучобы.

"5–" (8 балаў) — ставіцца, калі вучань, аперыруючы вучэбным матэрыялам у знаёмай і незнаёмай сітуацыі, самастойна і правільна выконвае поўны аб'ём задання, у працэсе яго выканання захоўвае слова- і формаўтваральныя нормы, нормы ў канструяванні словазлучэнняў і сказаў розных тыпаў, ужыванні слоў у адпаведнасці з іх лексіка-стылістычным значэннем, можа дакладна і доказна абгрунтаваць свае практычныя дзеянні, яго маўленне характарызуецца разнастайнасцю канструкцый, дакладнасцю словаўжывання, пры творчым прымяненні ведаў і ўменняў дапускае адзінкавыя памылкі, якія выпраўляе самастойна, добрасумленна; з адказнасцю ставіцца да вучобы, здольны да адэкватнай самаацэнкі.

"5" (9 балаў) — ставіцца, калі вучань свабодна аперыруе вучэбным матэрыялам у незнаёмай сітуацыі, самастойна ў поўным аб'ёме выконвае прапанаваныя заданні рознай ступені складанасці, нарматыўна правільна ўтварае формы слоў, валодае нормамі дапасавання, кіравання, нормамі канструявання слоў і пабудовы сказаў розных тыпаў, пры пабудове і пашырэнні словазлучэнняў і сказаў улічвае спалучальнасць слова з іншымі, выбірае слова ў адпаведнасці з яго лексіка-стылістычным значэннем, лагічна і доказна абгрунтоўвае свае практычныя дзеянні, пісьмовае маўленне характарызуецца разнастайнасцю канструкцый, дакладнасцю словаўжывання, пры выкананні творчых заданняў дапускае адзінкавыя памылкі, якія можа выправіць самастойна.

"5+" (10 балаў) — ставіцца, калі вучань свабодна аперыруе праграмным вучэбным матэрыялам, можа зрабіць самастойныя вывады і абагульненні, здольны выканаць практыкаванні любой ступені складанасці з улікам міжпрадметных сувязей, умее свядома і аператыўна трансфармаваць атрыманыя веды для рашэння праблем у нестандартных сітуацыях; творча ставіцца да вучобы, праяўляе мэтанакіраванасць, адказнасць, пазнавальную актыўнасць.

ЛІТАРАТУРА

Агульная сярэдняя адукацыя: Беларуская мова // Общее среднее образование. Социально-гуманитарные дисциплины / Руководящие документы Республики Беларусь (Образовательные стандарты). Мн., 1999. С.3—24.

Праграмы агульнаадукацыйнай сярэдняй школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы / Пад навук. кіраўн. д-ра пед. навук В.У. Протчанкі. Мн., 2000. 127 с.

І.І. Яўменава

АБ ПРЫЧЫНАХ УЗНІКНЕННЯ ЭНАНТЫЯСЕМІІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Энантыясемія — гэта наяўнасць супрацьлеглых значэнняў у семантычнай структуры слова. Вывучэнне гэтай лексічнай з'явы пачалося ў канцы XIX стагоддзя, і першым у рускім мовазнаўстве яе апісаў на матэрыяле індаеўрапейскіх і некаторых іншых моў прафесар В.І. Шэрцль, ён таксама прапанаваў тэрмін "энантыясемія". Трэба адзначыць, што праблема энантыясеміі ў сучасным мовазнаўстве вывучана даволі мала: даследчыкі выказваюць часам абсалютна супрацьлеглыя погляды на сутнасць энантыясеміі і яе адносіны да сумежных лексічных з'яў (полісеміі, аманіміі, антаніміі), спрэчнымі застаюцца пытанні аб прыродзе і класіфікацыі энантыясемічных фактаў. Мэта дадзенай працы — прааналізаваць асноўныя прычыны ўзнікнення супрацьлеглых значэнняў у семантычнай структуры слова і тым самым акрэсліць межы энантыясеміі ў сучаснай беларускай мове.

Адразу адзначым, што энантыясемія — з'ява складаная і неаднародная. Яна абумоўлена асіметрычнасцю моўнага знака: план выражэння не мае адназначнай адпаведнасці плану зместу. Фактары, якія нараджаюць энантыясемію, надзвычай разнастайныя. Яшчэ В.І. Шэрцль звяртаў увагу, што "энантыясемія абавязана сваім існаваннем не адной толькі асноўнай прычыне, а цэламу складанаму камплекту ўтвараючых фактараў, якія ўзаемна папаўняюцца, перакрыжоўваюцца і зліваюцца" [Шэрцль, 1883, *3*].

Асноўную прычыну энантыясеміі В.І. Шэрцль бачыў у тым, "што карані і ўтвораныя ад іх словы ў старажытныя эпохі мелі агульныя, вельмі шырокія і крайне неакрэсленыя значэнні, з якіх потым, пры паступовым узнікненні шматлікіх адценняў... утвараліся значэнні, якія пры больш дакладным азначэнні іх ў мове нярэдка, нягледзячы на прыналежнасць іх да вядомай, агульнай для іх сферы, шляхам дыферэнцыравання выражалі супрацьлеглыя адзін аднаму паняцці" [Шэрцль, 1883, *3*]. У сучаснай беларускай мове засталася невялікая колькасць слоў, якія можна лічыць рэшткамі гэтага працэсу: напрыклад, *дваіць* 'рабіць парнымі' і 'дзяліць папалам' (спец.), *траіць, слаіць* (разм.) 'рабіць слаі з чаго-н., дзяліць на слаі' і 'складваць слаямі', *пячы* 'моцна грэць' і 'прычыняць боль холадам'. Супрацьлегласць значэнняў у семантычнай структуры слоў са старажытнымі каранямі часта звязана з канструктыўнай або дэструктыўнай накіраванасцю дзеяння на дасягненне выніку: *біць* 'разбіваць, ламаць' і 'ў некаторых рамёствах — вырабляць пэўным

спосабам', *сячы* 'ударaючы з размаху чым-н. вострым, раздзяляць на часткі, рассякаць' і 'вырабляць (з камення) абчэсваннем, высякаць' (спец.). Трэба адзначыць, што большасць такіх дзеясловаў ў сучаснай беларускай мове маюць адпаведныя сінанімічныя прыставачныя ўтварэнні для кожнага з супрацьлеглых значэнняў. Так больш ранні па часе ўтварэння дзеяслоў *дваіць* існуе побач з дзеясловамі *раздвойваць* і *здвойваць*, дзеяслоў *біць* — побач з *разбіць* і *збіць*, *узбіць*, а *сячы* — побач з *рассячы* і *высечы*. Як заўважае А.М. Сакалоў, "антанімічная супрацьпастаўленасць пры гэтым можа аказацца адноснай, паколькі называюцца дзеянні, акты, якія... накіраваны на розныя аб'екты" [Сакалоў, 1980, *38*].

Энантыясемія можа ўзнікаць у залежнасці ад проціпастаўлення значэнняў дзеяслоўных прэфіксаў. Адной з самых вялікіх з'яўляецца група дзеясловаў з антанімічнымі значэннямі прыстаўкі *за-*, якія маюць супрацьлеглыя значэнні пачатку дзеяння і давядзення яго да максімума, завершанасці: *задыміць* 'пачаць дыміць' і 'напоўніць дымам', *запятляць* 'пачаць пятляць' і 'заблытаць след (сляды), рухаючыся не па прамой лініі, а робячы петлі' (разм.), *заказытаць* 'пачаць казытаць' і 'замучыць казытаннем' (разм.). У семантычнай структуры дзеясловаў з прэфіксамі *аб-*, *аба-*, *пра-* вылучаюцца энантыясемічныя значэнні 'дзеянне з поўным ахопам аб'ектаў' і 'дзеянне, накіраванае на тое, каб абмінуць аб'екты': *абнесці* 'абходзячы, надзяліць, абдарыць усіх, кожнага' і 'надзяляючы чым-н. усіх, прамінуць каго-н.', *аб'ехаць* 'едучы, пабыць усюды, у многіх месцах' і 'праехаць збоку, абмінаючы каго-н., што-н.', *праслухаць* 'успрыняць слыхам' і 'не пачуць, прапусціць'. У сферы іменных часцін мовы таксама можна знайсці прыклады марфемна залежнай энантыясеміі. Так у назоўніку *бясцэннасць* прыстаўка *бяс-* уносіць значэнне адмаўлення якасці, якое ў сваю чаргу ацэньваецца або як станоўчае, тады слова *бясцэннасць* мае значэнне 'тое, чаму няма цаны, высокая каштоўнасць чаго-н.', або як адмоўнае — 'тое, што страціла сваю вартасць, стала малакаштоўным'.

У пэўнай групе дзеясловаў энантыясемія абумоўлена неразмежаванасцю суб'екта і аб'екта дзеяння. Напрыклад, *пазычыць* 'даць каму-н. што-н. у доўг' і 'узяць у каго-н. што-н. у доўг', *вярнуць* 'аддаць узятае' і 'атрымаць назад што-н. затрачанае': *Чымся грошы траціць на адзежу, я лепей іх каму пазычу* (Я. Купала). *Маці кінулася да суседзяў, каб пазычыць у каго сена* (А. Якімовіч). *Вярнула смелая Марылька гаспадару каня і ўсё дабро* (А. Якімовіч). Такія семантычныя апазіцыі выражаюць "узаемаадваротныя" адносіны ўдзельнікаў адной сітуацыі і могуць разглядацца як семантычныя канверсівы.

Энантыясемія некаторых дзеясловаў звязана з іх адносінамі да суб'екта дзеяння. Так дзеяслоў *прысвоіць* мае значэнне 'зрабіць што-н. чужое сваёй уласнасцю', калі деянне выконвае суб'ект: *Аднойчы... [Іван], прабраўшыся ў друкарскі цэх, дацягнуўся да наборнай касы і прысвоіў поўную жменю літар* (І. Навуменка). Калі ж дзеяслоў *прысвоіць* абазначае дзеянне, якое выконваецца над суб'ектам, то мае значэнне 'надзяліць чым-н., даць што-н. (званне, імя, чын і пад.)': *Неўзабаве [Лескаўцу] прысвоілі званне старшага лейтэнанта* (І. Шамякін).

Супрацьлеглыя значэнні поўнай ступені ўпэўненасці і меркавання, дапушчэння маюць словы *напэўна, пэўна, відавочна,* якія ўтвараюць суадносныя пары прыслоўе — мадальнае слова, і энантыясемія пры гэтым "абумоўлена зменай сінтаксічных пазіцый, але захоўвае асацыятыўныя і матывацыйныя сувязі паміж словамі" [Бяссонава, 1982, *31*]: *Бо калі чалавек пачне разважаць, дашукваца прычын таго стану, у якім ён знаходзіцца, ён напэўна не пагодзіцца са сваёю доляй і будзе стараца адваяваць сабе лепшае месца на свеце* (Я. Колас). *У седлавіне, напэўна, быў перавал, туды вяла сцежка* (В. Быкаў). *Кадэты відавочна цягнулі за цара, але, не зважаючы на гэта, адносіны паміж самаўладствам і думаю пагоршваліся* (Я. Колас). *Голас, у якім чулася шчырая жаласць і спачуванне, відавочна, належаў пажылой жанчыне* (А. Васілевіч).

Асноўнай прычынай узнікнення энантыясеміі ў сферы маўлення з'яўляецца змяненне эмацыянальна-экспрэсіўнай канатацыі слова. У стылістычным аспекце пры гэтым найчасцей можна адзначыць з'яву іроніі — ужыванне слоў са станоўчым значэннем у супрацьлеглым сэнсе. Гэты працэс вельмі актыўны ў аказіянальным ужыванні. Змяненне канатацыі на супрацьлеглую пры іранічным ужыванні слова звязана, як правіла, з патрэбнасцю экспрэсіўнага выражэння думкі. Прывядзём некалькі прыкладаў: *Мой тата дык думае, што ён вельмі разумны і спрытны, лепшы за ўсіх. А тут сам не ведае, што як пачне ён гэты свой розум паказваць, дык аж смешна робіцца* (К. Чорны). "Розумам" Чорны з іроніяй называе глупства. *Ашчаслівіў, мярзотнік, свет сваёй асобай* (М. Паслядовіч). "Ашчаслівіў" тут мае значэнне 'зрабіў няшчасным'. *"А ну, падымайся, галубчык!" — раптам крыкнула [Люба], тупнуўшы нагой* (А. Марціновіч). "Галубчык" — 'нягоднік'.

Некаторыя аказіянальныя ўжыванні, якія часта выкарыстоўваюцца ў аналагічных моўных сітуацыях, замацаваліся ў мове як узуальныя значэнні. *Ваяка* — 'воін, баец; салдат' (разм.) і 'той, хто не апраўдвае звання воіна, байца' (іран., пагард.). *На гэты ж пясок упаў Сёмка-матрос, камандзір партызанскіх атрадаў, слаўны ваяка і бальшавік...* (М. Лынькоў). *"Ваякі, трасца вашай галаве!" — сказаў сам сабе дзед*

Талаш, калі заціхлі стрэлы (Я. Колас). Частаваць — ‘даваць каму-н. есці, піць, выказваючы ўвагу, гасціннасць’ і ‘рабіць каму-небудзь прыемнае або непрыемнае’ (разм.): *Антось сам... частаваў дзяўчат цукеркамі (А. Васілевіч). Ведаюць людзі, за што цябе Крупеніч з раз'езду гарэлкаю частуе, каб цябе лейцамі частавалі* (Я. Колас).

“Граматычны склад энантыясемічнай лексікі з’яўляецца сведчаннем таму, што энантыясемія характэрна для слоў з шырокай і адноснай семантыкай, якія абазначаюць дынамічную або статычную прыкмету, што можа ў сваім развіцці (у колькасных і якасных адносінах) дасягаць палярных кропак, таму энантыясемія не ўласціва, напрыклад, канкрэтным назоўнікам, навуковым тэрмінам, словам з канкрэтнай колькаснай семантыкай” [Клімава, 1975, *11*]. У сучаснай беларускай мове энантыясемія найбольш часта праяўляецца ў сферы дзеясловаў, што звязана з іх катэгарыяльнай семантыкай — працэсуальнасцю. Для назоўнікаў і прыметнікаў больш характэрнай з’яўляецца эмацыянальна-экспрэсіўная энантыясемія. Замацаванню энантыясеміі ў мове садзейнічаюць такія лінгвістычныя фактары, як тэндэнцыя да экспрэсіўнасці моўных сродкаў і сістэмныя адносіны ў лексіцы.

ЛІТАРАТУРА

Шерцль В. О словах с противоположными значениями (или о так называемой энантиосемии) // Филологические записки. 1883. Вып. V—VI.

Соколов О.М. Энантиосемия в кругу смежных явлений // Научные доклады высшей школы: Филологические науки, 1980. № 6.

Бессонова Л.Е. Энантиосемия как особый тип в системе лексических противопоставлений // Проблемы лексической и категориальной семантики. Симферополь, 1982.

Климова Л.И. Антонимичные значения полисемантичных слов в современном русском языке. Автореф. на соиск. учен. степени канд. филол. наук. Л., 1975.

УДК 483.2(06)
ББК 81.2Беи.я43
П70

Зборнік заснаваны ў 2001 г.

Рэдакцыйная калегія:

А. Я. Міхневіч (адк. рэд.), *З. І. Бадзевіч* (нам. адк. рэд.),
Ж. Я. Белакурская, С. А. Важнік, Ю. С. Бушлякоў, У. І. Куліковіч,
В. П. Красней, У. М. Лазоўскі, А. А. Лукашанец, В. М. Ляшук,
А. А. Падлужны, М. Р. Прыгодзіч, А. А. Радзевіч, Т. Р. Рамза,
І. І. Савіцкая, Г. К. Чахоўскі, В. Я. Шкілёнак,
І. Р. Шкраба, С. М. Якуба

Працы кафедры сучаснай беларускай мовы (да 80-годдзя БДУ)
П70 Вып. 1 / Рэдкал.: А. Я. Міхневіч, З. І. Бадзевіч, Ж. Я. Белакурская і інш.; Пад рэд. А. Я. Міхневіча. — Мн.: БДУ, 2002. — 219 с.

"Працы кафедры сучаснай беларускай мовы" філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта змяшчаюць рознатэматычныя даследаванні супрацоўнікаў кафедры, яе аспірантаў, выкананыя ў 2000—2001 гг.

УДК 483.2(06)
ББК 81.2Беи.я43

© БДУ, 2002

Навуковае выданне

ПРАЦЫ КАФЕДРЫ
СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ
(да 80-годдзя БДУ)
Вып. I

У аўтарскай рэдакцыі

Тэхнічны рэдактар *Т. К. Рамановіч*
Карэктар *А. А. Тарадзейка*
Камп'ютэрная вёрстка *А. А. Мікулевіча*

Адказныя за выпуск *С. А. Важнік, А. А. Радзевіч, Г. К. Чахоўскі*

Падпісана да друку 15.02.2002. Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Ум. друк. арк. 12,7. Ул.- выд. арк. 14,7. Тыраж 40 экз. Зак.

Беларускі дзяржаўны універсітэт.
Ліцэнзія ЛВ № 315 ад 14.07.98.
220050, Мінск, праспект Францыска Скарыны, 4.

Надрукавана на капіравальна-размнажальнай тэхніцы
філалагічнага факультэта БДУ.
220030, Мінск, вул. К. Маркса, 31.